ВІКТАР ВАЛЬТАР

# Выбраныя творы

Мінск
«Кнігазбор»
2009

УДК 821.161.3
ББК 84 (4 Беи)
В16

Укладанне, каментар
Міхася Казлоўскага, Сяргея Панізніка

Прадмова
Лідзіі Савік

Мастак
Анатоль Акулік

**Вальтар, В.**
**В16** Выбраныя творы / Віктар Вальтар ; уклад. М. Казлоўскага, С. Панізніка ; прадм. Л. Савік. — Мінск : Кнігазбор, 2009. — 280 с. — (Бібліятэчка альманаха «Куфэрак Вілейшчыны». № 13).
ISBN 978-985-6930-26-6.

У зборнік выбраных твораў Віктара Вальтара (1902–1931) — беларускага пісьменніка, які пражываў у міжваеннай Латвіі, — увайшло ўсё лепшае, створанае ім за яго такое кароткае, але змястоўнае жыццё. З небыцця вяртаецца яшчэ адно імя багдановічаўскага лёсу, на яшчэ аднаго цікавага творцу пабагацее наша літаратура.

Прадмову да выдання напісала пісьменніца, кандыдат філалагічных навук Лідзія Савік. Кніга ілюстраваная архіўнымі матэрыяламі з Прагі, Рыгі, Даўгаўпілса, фотаздымкамі і малюнкамі з Прагі, слайдамі. Прыгодніцкі сюжэт, любоўныя інтрыгі, прароцкія палітычныя высновы аўтара…

**УДК 821.161.3**
**ББК 84 (4 Беи)**

**ISBN 978-985-6930-26-6**

© Казлоўскі М., уклад., камент., 2009
© Панізнік С., уклад., камент., 2009
© Савік Л., прадм., 2009
© Акулік А., мастак, 2009
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2009

# РАМАНТЫК З НАДДЗВІНСКІХ БЕРАГОЎ

За прыязні даўняй азнакі,
за кажнага Крывіі сына —
прымі сяння, Прага, падзяку
ад ўнучкі Францішка Скарыны!

*Ларыса Геніюш*

Дзякуючы нястомным пошукам, даследаванням энтузіястаў, якім неабыякавы лёс Бацькаўшчыны, нацыянальнага адраджэння, беларускаму народу вяртаюцца сёння многія мастацкія скарбы, забароненыя або незаслужана забытыя імёны, Больш за 70 гадоў таму таленавіты беларускі пісьменнік Віктар Вальтар напісаў свой раман «Роджаныя пад Сатурнам». Але знаёмства сучаснага чытача з творам адбылося толькі ў 1992 годзе праз газету «Голас Радзімы».

Віктар Вальтар надзіва прадбачліва і з глыбокай праніклівасцю праз характар і лёс галоўнага героя, студэнта Тугоўскага, змог паказаць ментальнасць беларуса, задумацца над пытаннем: ці не таму мы такі шматпакутны народ, што народжаныя пад Сатурнам? Па філасофіі дзейных асоб рамана аказваецца, што жыццё чалавека залежыць ад таго, пад якой планетай ён нарадзіўся. «Нарадзіўся ён пад Сонцам — значыць, жыццё яго будзе светлым, радасным, шчаслівым; нарадзіўся ён пад Сатурнам — жыццё яго пойдзе па крывой арбіце, будзе нясталым, поўным непрыемнасці і напоўніць чалавека песімізмам і меланхоліяй…» Горка ўсведамляць, што герой рамана і сам аўтар, жыццёвыя сцежкі, думкі, перажыванні якіх шмат у чым супадаюць, відаць, нарадзіліся ўсё ж пад нешчаслівай зоркай. Трагічна кароткім быў іх лёс, няспраўджанымі аказаліся мары і спадзяванні.

Віктар Бенядзіктавіч Вальтар… Імя яго сёння па справядлівасці ўпісваецца ў слаўную плеяду таленавітых пісьменнікаў 1920–1930-х гадоў, якія сваімі першымі аповесцямі, раманамі, п’есамі,

вершамі, паэмамі ўвайшлі ў беларускую літаратуру: М. Гарэцкі, Ц. Гартны, У. Галубок, М. Зарэцкі, П. Галавач, Я. Нёманскі, С. Баранавых, Б. Мікуліч, Л. Калюга, Т. Кляшторны, Я. Пушча, У. Хадыка, В. Шашалевіч, А. Мрый і многія іншыя, творчасці якіх не суджана было расквітнець. Можна не сумнявацца, што і В. Вальтара спасціг бы лёс рэпрэсіраваных пісьменнікаў, бо па нараджэнні, выхаванні, адданасці беларускай справе і з-за таго, што ён вучыўся за мяжой, пільныя чэкісты залічылі б маладога пісьменніка ў самыя актыўныя «нацдэмы».

Пачынаў Віктар Вальтар з вершаў, і гэтыя першыя спробы пяра, вядома ж, адлюстроўвалі яго юнацкія пачуцці, успаміны дзяцінства, вучобу ў пачатковай школе, Дзвінскім рэальным вучылішчы. Сям'я перажыла бежанства: у час Першай сусветнай вайны давялося выехаць у Харкаў. У 1921 годзе вярнуліся ў Дзвінск (цяпер Даўгаўпілс), дзе В. Вальтар скончыў рускую гімназію і ў 1922 годзе стаў студэнтам каморніцкага факультэта Пражскага тэхнічнага ўніверсітэта. Аднак з-за цяжкай хваробы вучобу скончыць не змог і ў 1926 годзе вярнуўся ў Латвію.

Працаваў настаўнікам у беларускіх школах вёсак Плейкі і Келава, у Дзвінску, Дадатковай беларускай школе ў Рызе, быў яе дырэктарам з 1930 года.

У друку пачаў выступаць з 1923 года. Газеты «Голас беларуса» (Рыга), «Наша доля», «Новы шлях» (Дзвінск), часопісы «Крывіч», «Замежная Беларусь» (Прага), «Родныя гоні», «Студэнцкая думка» публікуюць яго нарысы, невялікія апавяданні, абразкі, вершы («Аднабочнікі», «Леснікова сена», «Песня гладыятараў», «Хмары стромныя павіслі…», «Покліч сялянскага сына», «Дух часу» і інш.). Пра гэты перыяд творчасці В. Вальтара пісаў К. Езавітаў, які на той час жыў і працаваў у Рызе, у пасмяротным нарысе «Віктар Бенядыктавіч Вальтар», што стаў прадмовай для апавядання «Леснікова сена», выпушчанага «Беларускім выдавецтвам у Латвіі» ў 1932 годзе. Аднак найбольш актыўна В. Вальтар удзельнічаў у літаратурнай групе «Першакрокаўцы» і зборніку «Першы крок» (1929). В. Вальтар, як і многія пісьменнікі таго часу, імкнуўся садзейнічаць сваімі творамі ўмацаванню нацыянальнай свядомасці беларусаў, у паэзіі заклікаў да барацьбы за незалежнасць, лепшую долю. І ўсё ж, мяркуючы па яго першым буйным творы — рамане «Роджаныя пад Сатурнам», сапраўднае прызванне В. Вальтара — проза.



З першых старонак раман захапляе незвычайнасцю стылю, мовы, глыбінёй пранікнення ў духоўны свет герояў, займальнасцю ў лепшым сэнсе. Гэта першы ў беларускай прозе твор, прысвечаны зусім не даследаванай тэме: беларуская Прага пачатку 1920-х гадоў, беларускія студэнты, эмігранты, дзеячы БНР. Кампазіцыйна ён складаецца з 3-х квадраў, вызначаецца храналагічнай паслядоўнасцю жыцця асноўных дзейных асоб, рэтраспектыўнымі адступленнямі дзеля грунтоўнага і ўсебаковага раскрыцця характару галоўнага героя — Тугоўскага, студэнта філасофскага факультэта Пражскага ўніверсітэта. Гэтыя рэтраспекцыі дапамагаюць лепш зразумець лёс здольнага, але беднага юнака, які быў накіраваны на вучобу за мяжу. І пачынаецца наша чытацкае суперажыванне за жыццё героя, паступова мы ўваходзім у ягоны ўнутраны, духоўны свет, багаты супярэчнасцямі, роздумам, маладымі памкненнямі і страсцямі. Што азначала апынуцца ў цудоўным, вясёлым, але чужым горадзе студэнту без стыпендыі, без усялякай дапамогі, можа ўявіць кожны. В. Вальтар, які сам некалі перажываў падобнае становішча, не проста апісвае, а пераканаўчымі мастацкімі сродкамі перадае змрочны стан Тугоўскага, якому адпавядаюць такое ж змрочнае восеньскае надвор'е, халодны манатонны дождж, слата, сум, што навяваюць думкі аб самагубстве ад гэтай неўладкаванасці, адзіноты, беднасці. Быццам трапляеш у інтэрнат для студэнтаў і эмігрантаў, які знаходзіўся ў адным з найпрыгажэйшых пражскіх паркаў. Тут жылі рускія, украінцы, беларусы, сярод якіх было нямала здольных музыкантаў, паэтаў, мастакоў. І быццам акунаешся ў іх нялёгкае жыццё, студэнцкі побыт, думкі, перажыванні, ўзаемаадносіны.

Тугоўскі пачынае ўспамінаць сваё жыццё і разумее, што нянавісць да задаволеных людзей нарадзілася ў дзяцінстве, калі ён з маці жыў у цёмным падвале каменнага дома, чуў сумныя матчыны песні, а наверсе ў багатых пакоях раскашавала сям'я Загорскіх. Яму, прачкінаму сыну, зрэдку дазвалялася гуляць з іх сынам Янам, які пагардліва ставіўся да свайго аднагодка. І пазней, калі разам з Янам вучыўся ў рэальным вучылішчы, ён увесь час адчуваў сваю беднасць і прыніжэнне: не было чым плаціць за вучобу, хоць, у адрозненне ад Яна, Пётра Тугоўскі быў выдатнікам. Пад час бежанства ў Харкаве і пазней, калі пачалася рэвалюцыя, яны апынуцца па розныя бакі барыкад: Тугоўскі паверыў у дэмакратычныя лозунгі бальшавікоў, Загорскі ж вітаў белых генералаў. Але прыглядзеўшыся, як жывуць бальшавіцкія камісары ў былых барскіх палацах, Тугоўскі страшэнна

расчараваўся ў рэвалюцыі: ці ж можна зноў параўнаць жыццё яго маці, якая па-ранейшаму цяжка працавала, каб сын мог вучыцца, з жыццём новых паноў? «Рэвалюцыя, як мора, ускалыхнуўшае ўсё, што было на дне, зноў апусціла на дно тое, што там было. Хто быў нічым, той і застаўся нічым…»

Не вытрымаўшы жыцця ў чырвоным Харкаве, Тугоўскі вярнуўся на Бацькаўшчыну, дзе пачынаў свой поступ беларускі рух. З натхненнем і радасцю ён слухаў словы дырэктара беларускай гімназіі, які выпраўляў яго на далейшую вучобу ў Прагу, казаў, як патрэбны адукаваныя людзі і каб ён вяртаўся адтуль прафесарам…

Але ў Празе няма на што жыць. Тугоўскі зноў становіцца жабраком, бадзягам з сярэдняй адукацыяй. Ён параўноўвае жыццё чэшскага пралетарыя са сваім: у таго чыстыя прыгожыя пакоі з добрай мэбляй, з кветкамі на вокнах… Зноў пачынае згадваць жабрацкае жыццё, зноў авалодваюць ім настойлівыя, неадчэпныя думкі — відаць, як і ўся беларуская нацыя, нарадзіўся Пётра пад Сатурнам.

Гэтыя яго думкі атрымалі пацвярджэнне, калі ў Празе ён сустрэўся з Янам Загорскім, які стаў студэнтам-медыкам, вёў разгульнае, багатае жыццё, быў заўсёды добра апрануты, сыты, задаволены, меў поспех у жанчын, асабліва ў прыгожай беларускай студэнткі Галены Вярхоўскай, у якую закахаўся і Тугоўскі…

І вось тут пачынаюцца самыя цікавыя старонкі рамана. Беларускі рух, беларускія партыі, суполкі сярод студэнтаў і эмігрантаў у Празе, праблемы нацыянальнага адраджэння, незалежнасці, служэння Бацькаўшчыне — усё гэта незвычайна нагадвае нашу сённяшнюю сітуацыю на Беларусі. Каторы раз мы зноў пачынаем размовы пра аднаўленне культуры, мовы, гісторыі, імкнёмся даказаць, што мы старажытная еўрапейская нацыя, незалежная і ад Расіі, і ад Польшчы, усімі сіламі адраджаем, уздымаем нацыянальную свядомасць; шукаем і спадзяёмся, што прыйдзе той прарок, той Маісей, хто выведзе нас у зямлю запаветную… Мы, быццам тыя пражскія студэнты на сваіх вечарынах і сустрэчах, марым, што хутка скончыцца зіма, якая скавала нашу Беларусь, трэсне пад гарачым дыханнем сонца ўласнай культуры лёд, які пакрыў тоўстым слоем думкі і сэрца народа. А між іншым, мы забылі нават сваю мову…

Сярод пражскіх «младабеларусаў», якія тады смела ішлі за прарокам адраджэння Купалам, вылучаўся «айцец» Кірыла Бурачэўскі, якога ўсе паважалі і любілі за памяркоўны характар, добразычлівасць, імкненне дапамагчы. Ён заклікаў усіх да цішы і брацкай згоды,



папярэджваў адвечны раскол у беларускім асяродку, дзе заўсёды былі крайне правыя і крайне левыя, прадстаўнікі прарускай і прапольскай арыентацыі, непрымірымыя разбуральнікі і тыя, хто заклікае да адзінства перад пагрозай развалу, страты хісткай незалежнасці. На той час Беларуская грамада ў Празе развалілася і падзялілася на дзве варожыя групы: адна — Таварыства беларускіх студэнтаў, утворанае Янкам Станкевічам, куды ўвайшлі больш заможныя, якія адмаўлялі сацыялізм, другая група — Тамашэвіча (Тамаша Грыба) — выступала за сацыялізм і лічыла, што спачатку трэба ажыццявіць сацыяльнае вызваленне, а потым нацыянальнае.

У групе Тамашэвіча сышліся сацыялісты ад самых левых да марксістаў. Да марксістаў належала і Галена Вярхоўская, якая не аднойчы заяўляла, што думае аддаць усе сілы за вызваленне беларускага народа. Гэту ідэю дэкларавалі прадстаўнікі ўсіх партый і груп і, як водзіцца, шмат спрачаліся пра тое, што такое нацыянальнасць, незалежнасць, нацыянальная культура… Адны казалі, што беларусы не нацыянальнасць, гэта абмаскаленыя палякі ці апалячаныя маскалі. Другія сцвярджалі, што жаданне, воля самога народа мець сваю дзяржаву ўжо ёсць акрэсленая нацыянальнасць. Каб нас лічылі нацыянальнасцю, мы павінны развіваць у народзе волю, жаданне быць вольнымі. Трэція даказвалі, што трэба ісці ў народ, што толькі паветра ўласнай хаты дасць нам магчымасць развівацца духоўна, толькі на ўласнай зямлі дрэва беларускай культуры пусціць ва ўсе бакі свае магутныя галіны. І менавіта сябе пражскія студэнты, якія далучыліся да еўрапейскай культуры, лічылі першымі ластаўкамі, што панясуць культуру ў родныя хаты. Чацвёртыя даводзілі, што толькі свядомая жанчына выхавае свядомага беларуса, што толькі з малаком маці ўвальецца ў кроў свядомасць тых, хто пойдзе за шматпакутную Беларусь, і ніякай агітацыяй не дабіцца таго, чаго можа дабіцца свядомая беларуска ў сям'і, не дабіцца тых уплываў, якія яна можа зрабіць на мужчыну. Будзе ў нас свядомая жанчына — будзе і беларускі рух… А патрыцый Ян Загорскі, які не прызнаваў ніякай Беларусі, хоць і ўдзельнічаў у беларускім руху, спакойна рэагуючы на ўсе гэтыя гарачыя спрэчкі, заўважаў: «Рана ці позна вы ўсе прыйдзеце да вышэйшай расійскай культуры…», на што яму дружна адказвалі: «Мы, беларускія студэнты, стаім на платформе незалежнасці Бацькаўшчыны». Незалежнасць — але якая? Прымусіць усіх гаварыць па-беларуску ці змяніць сацыяльны лад?.. Як усё гэта знаёма нам сёння і як дакладна аўтар змог перадаць дух

той эпохі, што так блізкая да нашых дзён, нашых ідэйных спрэчак пра адны і тыя ж балючыя праблемы беларусаў: нацыянальнасць, незалежнасць, культура, мова, гісторыя, да вырашэння якіх мы не наблізіліся, а аддаліліся яшчэ на 70 гадоў.

Але тут узнікае пытанне: як на ўсе гэтыя інтэлігенцкія разважанні «младабеларусаў» рэагуе непасрэдны прадстаўнік народа, выхадзец з самых нізоў Пётра Тугоўскі? Беларуская грамада ў Празе палічыла, што яго чулая душа не павінна быць страчана для іх барацьбы за волю Бацькаўшчыны. Яму дапамаглі атрымаць стыпендыю, перасяліцца з халоднай садовай альтанкі ў інтэрнат, ён пачаў рэгулярна наведваць лекцыі, сходы Грамады. Аднак, паслухаўшы бясконцыя размовы землякоў, ён яшчэ больш упэўніваецца ў сваёй даўняй тэорыі бессэнсоўнасці жыцця і вырашае скончыць жыццё самагубствам. Для Тугоўскага самагубства стала ідэяй. За свой кароткі век ён, «паглядзеўшы жыццё ад пачатку да канца, пабачыў, што ўсё ў ім невыпадковае, што ад самага маленства да старасці чалавека вядзе нейкая сіла акрэсленымі дарогамі — аднаго да шчасця, а другога да няшчасця. Сабраўшы, нарэшце, усе жыццёвыя факты, ён стварае тэорыю шчасця і няшчасця ў жыцці і бачыць, што тэорыя няшчасця пацвярджаецца, тады — нашто яму жыць?»

Гэту яго тэорыю горача падтрымлівае «астральны чалавек» — жыхар інтэрната, спірытыст, які ўвесь час ляжыць у ложку пад коўдрамі, але ніхто не здагадваецца, што ў яго апошняя стадыя сухотаў. Ён палічыў Тугоўскага за геніяльнага чалавека, бо той сваім дзіўным сэрцам і халодным розумам знайшоў вялікі закон жыцця: заканамернасць чалавечага існавання. Аднак такая пасіўная жыццёвая пазіцыя выклікае водпаведзь «айца» Кірылы, які думаў, што Тугоўскі, маючы моцную дзедаўскую працоўную аснову, гатоў чапляцца за жыццё, нягледзячы на мукі і болі, уліцца ў беларускую грамаду без усялякіх «інтэлігенцкіх» хваробаў. Угаворваючы Тугоўскага пакінуць сяброўства з «астральным чалавекам», «айцец» Кірыла даказваў, што няма ніякіх уплываў Сатурна, што чалавек сам каваль свайго шчасця. Галена Вярхоўская таксама лічыла, што нельга плыць па цячэнні, бо, як сказана ў М. Багдановіча, «проціў цячэння можа толькі жывое паплыць». На гэта Тугоўскі адказаў, што ў паэта жыццё таксама было нешчаслівае, відаць, і ён нарадзіўся пад Сатурнам. Аднак і Вярхоўская, і «айцец» Кірыла быццам пераканалі Тугоўскага: ён не скончыў жыцця самагубствам, але сваёй «Споведзі самагубцы» не спаліў, схаваў далёка. Усё ж тэорыя «роджаных пад Сатурнам» глыбока ўвайшла ў яго псіхіку, стала яго светапоглядам: ён вырашыў праверыць гэту тэорыю практыкай на ўласным жыцці.



Далей пісьменнік паказвае свайго героя ў студэнцкім асяроддзі, і тут яго найбольш цікавяць думкі, перажыванні, бясконцыя ваганні, супярэчнасці, ад якіх пакутуе ўся Пётрава істота. Аўтар, ідучы за ўнутранымі зрухамі яго душы, быццам прымаючы погляды Тугоўскага, дае характарыстыку людзей, роджаных пад Сатурнам: яны не выносяць падуладнасці, не пужаюцца думкі аб сабе грамады, але баяцца быць смешнымі; недаверлівыя, працавітыя, любяць землясробства і навукі, не любяць вайны і жаўнераў, цікаўныя да ўсяго і разам з тым сумныя. Меланхолія заўсёды кладзе на іх твар сваю пячатку. Нічым не задаволены, ні адна партыя не будзе ім па душы, ні адзін палітычны лад не задаволіць іх. Гэта вечна ўсім незадаволеныя, усё крытыкуючыя людзі, рэвалюцыянеры па духу. Людзі такія доўга не жывуць.

Апынуўшыся ў самым цэнтры беларускага руху, Тугоўскі крытычна ставіцца да ўсіх яго ідэй, праграм, палітычных напрамкаў. Ён бачыць, што моладзь, нават тая, што выйшла з сялян, рабочых, вельмі хутка ператвараецца ў беларускую буржуазію: больш гаворыць пра кар'еру, вечары, насіць фракі, ганяецца за арыстакратамі і прыгожымі дзяўчатамі. Нават «айцец» Кірыла пачаў сумнявацца, ці выйдзе з іх пражскага супольніцтва прарок, які павядзе Бацькаўшчыну да незалежнасці, лепшага жыцця. Тугоўскі задумваецца, а што такое ён сам у велізарнай чашы жыцця? Самотная пясчынка, адзінокі чалавек, які не знайшоў шчасця.

Вярхоўская, якую ён моцна пакахаў, быццам і сябравала з ім, але больш сімпатызавала прыгожаму і багатаму Яну Загорскаму. У яго ж нічога не засталося свайго: ні дому, ні жанчыны, і толькі калі ўспамінаецца Бацькаўшчына, жыццё яго зноў набывае сэнс. Пётра вырашае здабываць навуку, тым больш што і «астральны чалавек» перад смерцю заклікаў яго верыць, змагацца за жыццё, за ўніверсітэцкі дыплом.

Тугоўскі — сапраўдны, чысты, не разбэшчаны жыццём беларус — страшэнна пакутаваў ад усведамлення, што маладыя, таленавітыя сыны Бацькаўшчыны, якія цягнуліся ў Празе да навукі, паміралі ад сухотаў.

Над многімі пытаннямі прымушае задумацца раман Віктара Вальтара. Пісьменнік жыў і пакутаваў усімі складанасцямі свайго часу. Галоўнай для яго, як і для ўсіх свядомых беларусаў, тады і цяпер, была і застаецца праблема нацыянальнай незалежнасці.

Таму ёй у творы і большая ўвага, што сведчыць пра імкненне аўтара разабрацца, усвядоміць, знайсці сапраўдныя шляхі для яе ажыццяўлення. Раман заканчваецца на песімістычнай ноце, і гэта абумоўлена рэаліямі тых гадоў, калі ўрад БНР апынуўся на эміграцыі і толькі там яшчэ можна было ўслых разважаць пра ідэі беларускасці. На Беларусь насоўвалася змрочная хмара сталінскіх рэпрэсій, пад час якіх вынішчаўся цвет нацыі, а незалежнасць Беларусі нават не праглядвалася за далёкім гарызонтам. І ўсё ж народ жыў, сеяў жыта, размаўляў на роднай мове, хоць яго ўсімі сродкамі імкнуліся адвучыць ад яе. Жылі і героі рамана «Роджаныя пад Сатурнам». І не толькі палітыкай. Іх, маладых, захаплялі вясна і каханне… Былі спрэчкі, сумненні, туга па радзіме, дзеля якой яны ахвяравалі сваімі юнацкімі жыццямі, навечна ўваходзячы ў яе гісторыю, навечна застаючыся ў памяці ўдзячных нашчадкаў.

Нельга не адзначыць і своеасаблівую мову рамана. Ён напісаны той мовай, якая гучала на першапачатковым этапе беларускага адраджэння. Ёсць у ёй паланізмы і русізмы, яна набліжана больш да размоўнай беларускай стыхіі, чым да дыстыляванай літаратурнай мовы. І ў гэтым значнасць і адметнасць моўнага каларыту рамана.

Сёння мы можам парадавацца, што ў літаратурны працэс вяртаецца з небыцця цікавы, змястоўны твор таленавітага беларускага пісьменніка.

*Лідзія Савік*



# ДУХ ЧАСУ



## Паэзія, пераклад

## ПОКЛІЧ СЯЛЯНСКАГА СЫНА

Заўтра ты выйдзеш, мой брат, Беларус,
Кінуць у скрыню жыцця свайго лёс!
Заўтра убачаць суседзі твае,
Жыў ты яшчэ ці памёр мо ад слёз!

Здаўна, казалі, цябе ўжо няма:
«Беларусы?» — «Якія?» — «Даўно ўжо памёрлі!» —
«Нават косці знайсці не турбуйцесь дарма!»
І ад злосці клахтала у ворага ў горле.

Гнулі цябе, сагібалі ў дугу,
Ганьбілі, білі, кідалі ў турму!
Цяжка гараць і бугры, і далы!
Сумна звіняць на нагах кандалы!

Дык скажы ж ім усім, сябра мой, Беларус,
Што дарэмна іх праца й надзея!..
Падымісь за сябе, за жыццё, за свой лёс —
І гані не свайго дабрадзея!

Выйдзі смела і вольна за спісак свой, брат, —
Хіба ж ты і цяпер прамаўчыш?
Чуеш? Суседзі гатовы распяць
І паставіць на ўсім вечны крыж!

Заўтра, заўтра ты кінеш усім
Сваё слова, жыцця свайго лёс…
Заўтра крыкнеш усім, і чужым, і сваім:
Беларус ўжо ад мёртвых ўваскрос!..

*23.IX.25 г., Прага*

# НОВЫ АГАСФЕР

Ідзі!.. і ты ідзеш, жыццю ўсяму адданы,
Ідзі!.. ты чуеш нейкі голас у імгле.
І ты ідзеш… хай сэрца поўняць раны,
Хай кроў твая на змучаным чале…
Ты ўсё ідзеш… мяняюцца так годы,
Дарогі новыя звіваюцца змяёй,
Мігаюць вёскі, месты і народы,
І камяні ляцяць з гары тваёй!
А ты ідзеш… твой шлях, як Агасфера[1],
Блукаць па свеце з сумам у грудзёх, —
Ідзі… ідзі!.. няма пакуце меры,
Няма, няма канцоў тваіх дарог!..
І ты ідзеш… ты новы сімвал веры
Ствараеш з слёз, з разбітых старых вер,
Ідзеш далей, ідзеш ў шуканнях веры,
Ты — эмігрант, ты — вечны Агасфер.

* * *

Хмары страшныя навіслі,
Быццам рыхтуецца гром…
Эх, як уздоймуцца мыслі
З гэтым дажджом!
Нават паўстане з маланкай
Раб і зняверaны трус, —
Толькі ці ўстанеш ты з спанку,
Брат-беларус?
Хмары страшныя навіслі,
Але ж, няпраўда жа, гром
Ўдара ў прагнілыя мыслі
І абліе іх дажджом!

*1925 г., Прага*



# У ЛЕСЕ

Я ведаю, што дрэвы, а не мы,
Жывуць свабодна і глядзяць у неба.
Яны — вялікія. У іх няма турмы.
У іх няма пакуты за кавалак хлеба!

Ім дадзена не поўзаць, а расці
Без працы, без турбот, у насалодзе сонцам.
Ім невядомы бруд і гвалт ў штодзённаму жыцці
І мураваны склеп з глядзячым у зямлю ваконцам!

Ім дадзена магчымасць дасканальна жыць,
У іх адных велічыня і гордасць волі.
Не ім! — «царам прыроды» трэба ўсё тужыць,
Кайданамі звінець і не знаходзіць долі.

Так, «цар прыроды», як чарвяк, між іх
Паўзе па царству лесу, поўны свайго гора,
Але жыве спакойна, быццам стары мніх,
Раскрыўшы кнігу Бога ў глыбіні прастора!..

Як ціха тут… Якое царства сноў…
Які тут храм гармоніі і згоды…
І што яму да гэтых брудных і мізэрных чарвякоў,
Што самі паднялі сябе ў «цары прыроды»!

Ён іх не ведае. Задуманы Мудрэц
Не чуе крыкаў рабства й здзеку!..
Так вось чаму жа нейкі наш Тварэц
Даў столькі шчасця дрэву, а не чалавеку!..

*1926 г., Дзвінск*

# НЕ ПЛАЧ, МАТАНЬКА!

Не вярба стаіць
падламаная
на высокі дуб
абапёршыся,
не раса з яе
буйна крапае,
па грудзёх цячэ
дубу крэпкага, —
гэта матанька
абнімаецца,
з сынам родненькім
развітаецца,
адпраўляючы
ў войска варажжа
служыць недругам,
пакараціся,
за іх — ворагаў —
заступаціся.
Гэта матанька
плача горанька,
сыну на грудзі
льючы слёзанькі,
на яго плячо
абапёршыся,
да яго твару
прытуліўшыся.
— Ты ідзеш, сынок,
чужынцом служыць,
ляхаў-ворагаў
бараніць ў бядзе,
і за іх правы
заступаціся,
і жыццём сваім
наражаціся.
Ў службі варажай
сілай, здзекамі
убіваць пачнуць
у галованьку,
што ты — хам, мужык
і нявучаны,
прападзеш без іх
з сваім разумам,
што па ласцы іх
ты навучышся,
як на свеце жыць,
кім лічыць сябе,
з панам роўнымі.
Тваё сэрданька,
сэрца чыстае,
крыўдай людскаю
не заплямлена,
атруцяць паны
непашанаю
да бацькоў тваіх,
да мяне старой,
сіваволасай,
што жыццё сваё
аддала табе,
ў беднаце-бядзе
выгадоўваўшай
і чакаючай
сабе радасці,
ў старасць помачы
і заступніцтва.
А цяпер адну,
безбаронную,
пакідаеш ты —
і хто ведае?
Можа, ворагі
адбяруць ў мяне
сына роднага;
абяцанкамі,
чынам, грошамі
тваё сэрданька
у палон вазьмуць?
Астанешся ты
назаўсёды там
паслугоўваць ім
і старацiся
дагаджаць паном,
нашым ворагам.
І сам панам ты,
глядзі, зробішся
к сваёй матаньцы
ўжо не вернешся,
ад братоў сваіх
ты адмовішся,
ад зямлі бацькоў
ты адвыкнеш там.
У чужым краі
закахаешся,
там ажэнішся
на палячцы ты
і ў свой родны край
ўжо не вернешся,
ты чужым яго
ўжо лічыць будзеш…
Або пойдзеш ты
на братоў сваіх
з сілай варажай,
каб прымусіць нас
ўсіх запамятаць
хто мы ёсць,
кім павінны быць?..
Або, можа, дзе
ты галованьку
зложыш, недругам
дагаджаючы,
у вайне за іх
заступаючысь?..
Я ж з малымі тут
паджыдаючы,
цябе, роднага,
ўсё чакаючы,
ад тугі памру
з сэрцам высахшым,
у труну сайду
з жалем горанькім…
— Не плач, матанька,
не плач, родная!
Не пайшоў бы я
ў службу варажжу
і уцёк бы я
у далёкі край,
каб душы свае
не прадаць паном,
здзеку, сораму
не цярпець ад іх, —
да шкада цябе,
маю родненьку,
пакідаць адну,
безбаронную:
што ўцяку ад іх, —
яны спомсцяцца,
на табе зжануць
злосць звярыную,
павядуць ў турму
цябе, біць пачнуць,
каб сказала ты,
дзе шукаць мяне.
Адбяруць ў цябе
хлеб астатні твой,
зямлю, коніка
і карованьку.
І ты з дзеткамі
пойдзеш з голаду

жабраваць у свет,
прасіць міласці…
Ось, пайду ж я лепш
ў службу воражжу,
з дзвёх бед лепшую
выбіраючы,
жыццё матчына
ашчаджаючы.
Не служыць я йду,
не карыціся,
свайго імені
адмаўляціся,
мовы матчынай
выракаціся,
ад свае зямлі
адкалоціся
і лічыць яе
зямлёй польскаю,
а не нашаю,
беларускаю.
Не служыць я йду,
а вучыціся
ваяваць умець
супраць іх самых, —
адплаціць паном
за навуку іх,
як пара прыйдзе
рахавацiся,
жалем, крыўдамі
разлічаціся.
Я ў палон душы
не аддам свае:
злотам, серабрам,
абяцанкамі
не купіць паном
чэсці, гонару
беларускага,
грамадзянскага!..
Не плач, матанька,
слёзы высушы
ты надзеяю
на ўжо блізкі час
нашай вольнасці
і на мой ўзварот
з весткай мілаю,
што ўжо наш народ
з панскай сілаю
можа мерыцца,
з зямлі роднае
выганяючы
і свае правы
здабываючы…
Будзь здарова ты,
не тужы па мне!
Хмары чорныя
ты з свае душы
адганяй туды,
скуль прышлі яны…
Па навальніцы
сонца вольнасці
засмяецца нам
смехам ласкавым
і абсушыць вам
слёзы горкія,
мацяркам, жанкам
нашым родненькім…



## ДУХ ЧАСУ

Нехта няведамы ходзе.
Вось не злавіць, не забіць.
Думкі аб новай свабодзе
Стаў ён людзём гаварыць.

Што яму войска, што межы,
Што тыя варты прад ім?
Ён жа, як дым, без адзежы,
Ён жа хутчэйшы за дым….

Зляцца на варце, як зверы,
Мсцяць ўсё людзём — не яму,
І праз зялезныя дзверы
Гоняць нявінных ў турму.

Дух жа ўсё ходзе ды ходзе!
Не — яго ў век не злавіць…
Нехта аб новай свабодзе
Ў вёсках пачаў гаварыць…

*1927 г., Дзвінск*

***З Івана Франко***

*Пераклад з украінскай мовы*

* * *

У тую ноч, з цяжкою думкай пры акне
Сядзеў я, сэрца мучыла трывога:
Пытання сумныя насоўваліся мне,
Ці правідлова наша, ці хібна дарога;
Ці праца наша падыйме, дзвігне
Наш люд, ці, моў калека гэтая бэзнога,
Жыць будзе ў тым калецтве, мо й усхне?..
Чаму адступнікаў у нас так многа?
Чаму ж таіх адступства не страшыць,
Чаму іх родны сцяг не цягне да сваёга,
Чаму на ўласнай глебе працаваць ім стыд,
Але не стыд — у наймітах, ў чужога!



# АДЧУВАЮ ЦЯБЕ, АЙЧЫНА!



Проза, публіцыстыка

# АДНАБОЧНІКІ

*Літаратурны нарыс*

I

«…У наш крытычны век трудна мець сталае перакананне. Сёння яшчэ ведаеш, што існуе Бог, што два разы два ёсць чатыры, што існуюць нейкія атамы, што зямля круціцца каля сонца, а заўтра раптам прыйдзе нейкі вучоны, можа, толькі смелы махляр, разаб'е вашыя перакананні, веру дый дакажа вам, што Бога няма, што два разы два ёсць пяць і г. д. і г. д.

Каго падтрымаць, каму паверыць?..

Ніхто, здаецца, так і не вырашыць.

Яшчэ і цяпер, напрыклад, вучоныя спрачаюцца паміж сабой аб паходжанні чалавека…

Адны вучоныя-багасловы даказуюць, што чалавек зроблены з зямлі, другія — што ён паходзіць ад маўпы.

Гэтак, здаецца, чалавек і не даведаецца, ці ён з зямлі, ці з маўпы.

Адно перакананне, якое ўсё ж ткі трэба мець у нашы часы, ёсць, здаецца, прычыннасць падзей, нейкі прагматызм жыцця.

Здавалася б, ёсць падзеі, якія ніяк не могуць мець прычыны, але ж як паглядзіш глыбей, дык пабачыш, што нічога без прычыны не бывае.

Напрыклад, усім вядома палітыка імператара Цэзара[1]. Ніхто ніколі не падумаў бы, што такая малая прычына, як нос першай прыгажухі, Клеапатры[2], меў уплыў на ўсю рымскую гісторыю, а — між тым — гэта так. Каб нос Клеапатры быў на некалькі міліметраў даўжэйшы, можа, уся гісторыя пайшла б інакш. Таксама калі б не зляцелі анекдатычныя яблакі з дрэва перад самым носам Ньютана[3], можа б, ён і не знайшоў законаў прыцягання.

Пад гэты закон прычыннасці можна падвесці каханне.

Чаму яно з'яўляецца? Таму, што прычынай ёсць дзяўчына ці хлапец?

Зусім не… Таму, што ёсць ціхія, зарослыя куточкі саду з асаблівымі паэтычнымі барвамі, з глыбокім нябесным сном-казкай, з невядомай таемнасцю стаўка, да якога дрэвы схілілі свае зялёныя кароны і, быццам думаючы глыбока, заснулі моўчкі; таму яшчэ, што ёсць вясна, калі кожная кветка смяецца і штосьці гаворыць аб кволым, аб нябесным, аб каханні. Не было б гэтай завадзі — не было б кахання, не было б паэзіі і, я думаю, не было б жыцця…»

На гэтым мейсцы прамоўца спыніўся.

Гэта быў кіраўнік сённяшняга ўсеп'янейшага кангрэсу, як яго звалі, студэнт Рабскі.

Высокі, з шырокімі плячыма, з раскошнымі доўгімі валасамі на вялікай круглай галаве, ён рабіў уражанне моцнага энергічнага чалавека.

Куды толькі ён не пападаў, ён заўсёды пачынаў граць адну з першых роляў, выказуючы розныя, датуль яшчэ невядомыя таленты. Ён быў і весялун, і гумарыст, і спявака, і прамоўца, і арганізатар.

Каб не яго арганізацыйны талент, дык, пэўна, прыехаўшае на вакацыі беларускае студэнцтва Энска (павятовага места Вітабшчыны) так і не пабачыла б адзін аднаго.

Толькі ён яго разрухаў, злучыў і заахвоціў арганізаваць святкаванне.

Выбралі недалёка ад Энска прыгожы маёнтак, дзе Рабскі вучыцеляваў і меў кватэру, а затым у нядзелю і пачалі сваё «п'янейшае» паседжанне…

Рабскі чуў сябе як рыба ў вадзе. Прамова яго як гаспадара быццам адчыняла сённяшні кангрэс і таму павінна была даць праграму дня.

Не ведаючы, чым яе скончыць, ён спыніўся і пачаў пільна аглядаць сяброў.

Сярод цёмнай гушчы саду бялелі столікі. Некалькі галоў, схіліўшыся, ціха шапталі і ўсё з усмешкай паглядалі ў староны. За адным сталом вялася нейкая надта вясёлая гутарка, так што паненка ажно занасілася ад смеху, кідаючы на кавалера іскрыстыя погляды.



За некаторымі столікамі падымаліся рукі з чаркамі, якія цішком апаражнялі бутэлькі. Усім было дужа прыемна, што мовіцца прамова. «Што гэта значыць?» — пытаў вясёлы погляд кожнага.

Рабскі зразумеў значэнне гэтых поглядаў і таму далей перайшоў на самае істотнае.

— Без кахання няма жыцця, без жыцця няма паэзіі. Дзе каханне, там і паэзія, і наадварот: дзе паэзія, там і каханне. Хто згодны з гэтым, падымем свае чары вышэй і вып'ем за каханне. Слава!

— Слава! — пракацілася па ўсім садзе і апошні водгук мужчынскага голасу дзесь знік у напаленым сонцам паветры.

За гэтай чарай пайшлі другія, а за імі пачаў пераліваццa ўсімі танацыямі малады гучны смех, які толькі вядомы адной загуляўшай моладзі.

Малады філолаг Лебядзёк, даволі высокі, але худы юнак з шэра-блакітнымі вачыма, не даваў спакою сваёй паненцы. Ён напружаў усю моц сваіх мазгоў, каб толькі задаволіць, зацікавіць яе, такую дарагую для яго істоту. Загінуў увесь глыбокі песімізм, засмяялася зноў маладая фартуна, зноў запаліліся далёкія надзеі…

Ён цешыўся, як дзяцёнак, калі спамінаў, што сядзіць каля такой прыгажухі за адным столікам і адзін у яе шукае кахання. Тут няма яму канкурэнта, тут яго, а не Рабскага, не каго іншага, гаспадарства.

Чаго толькі смешнага і арыгінальнага сёння ён не прыдумваў. Займаўся імправізацыяй, перарабляў на свой лад беларускіх паэтаў, падбіраў смяхотныя запытанні, прыказкі… А пачакаўшы, калі гарэлка пачала мацней уплываць, ён асмялеў і пачаў схіляцца да яе; урэшце і зусім нахіліўся.

— Багіня мая, сімвал паэзіі, сімвал хараства, дай мне ручку тваю пацалаваць.

Ён браў яе за руку і, гладзячы, цалаваў ценкія мяккія пальцы.

— Панове, сябры, слова прашу, слова, — крыкнуў Лебядзёк, калі хмель яшчэ больш яго разабраў.

— Сябры! Я прапаную выпіць чарку лікёру за жанчыну.

Панове! Вялікая творчая прырода стварыла не толькі чалавека як ідэал скончанасці, розуму, яна стварыла ідэал хараства, ідэал красы. Гэтакім ідэалам на зямлі ёсць жанчына.

Сябры! Што ёсць вышэй на свеце за красу, што стаіць вышэй усяго на зямлі: жанчына! Перабярыце, панове, нават вышэйшыя паняцці — і вы пабачыце, што яны ўсе жаночага роду. Воля, паэзія, навука, мараль, этыка, бацькаўшчына і шмат іншых. Хіба вы не бачыце тут закону? Не бачыце таго, што людскасць спрадвеку ўжо з жанчыны рабіла багіню красы і пакланялася ёй? Паклонімся ж і мы сёння перад жанчынай, перад ідэалам кволасці, хараства і моцы.

Я п'ю за жанчыну! Слава!

— Слава! — зноў прагучала яму ў адказ.

Зноў пачалі талохацца чаркамі, зноў паліліся гарэлка, віно, і яшчэ вальней пачула сябе кампанія.

Ужо не адна галава ківалася над сталом, выйшаўшы з-пад усялякай улады свайго гаспадара.

Абнімі ты мяне, дарагая,
Абніманнем гарача-агністым, —

дэкламаваў Лебядзёк, цалуючы рукі сваёй «багіні». «Багіні» таксама пачынала ўжо кружыцца галава. Яна ўжо не памятала добра, што рабілася навокал, бо ў вушах штось звінела, гудзела і нейк пылала ўсярэдзіне.

Ледзь адышоўшы ад стала, яна зараз жа мусіла абаперціся аб плечы Лебядзька.

— Пойдзем, прагуляемся, — сказала яна, калі Лебядзёк устаў, хіляючыся ад стала.

— Пойдзем, пойдзем, мая багіня, мая паэзія, пойдзем.

І яны пайшлі.

— Ты ведаеш, я цябе не сёння кахаю, — казаў Лебядзёк па дарозе, — ты даўно ўладаеш маім сэрцам. Будзь таварышкай жыцця майго, зоркай праводнай. Зразумей, што маё сэрца сціскаецца, плача па табе, адзіная радасць мая…

Ён пахіліўся ды пацалаваў яе ў плячо. Яна ціха крыкнула і адняла сваю руку ад яго.

— Мы яшчэ не так блізка знаёмы, — сказала яна, — ты сам толькі што казаў, што жанчыны — багіні. Хіба так паступаюць з багінямі? Усякі мужчына, нават такі ідэаліста, як ты, глядзіць на жанчыну як на пахучую кветку, якую можна сарваць і прынесці ў пакой, каб пахла. А потым, калі ссохне, выкіне вон… А ты зараз жа памыкаешся да пацалункаў…



— Пачакай, — прамовіла яна, — не думай, што я нічога не памятаю. Хоць у мяне галава кружыцца, але ж я ў розуме…

Лебядзёк змяшаўся. Ён думаў, што сёння, калі ён асмялеў і калі ў яе галава закружылася, будзе яго перамога… Ён здабудзе сабе права карыстацца яе каханнем. Ужо з самага пачатку ён, значыць, рабіў нетактычна. Але ён адважна зноў падышоў да яе.

— Слухай, мая ты каханая, мой квеце. Чаго ж ты на мяне гневаешся? Хіба няможна да цябе прыміліцца?.. Ну, даруй мне, даруй… Дай руку тваю за гэта пацалаваць.

Ён узяў за пальцы і паднёс руку да вуснаў. Яна не працівілася. Закрыўшы вочы, яна стаяла не то пакорная свайму лёсу, не то маральна вышэйшая за свайго прыхільніка.

— Пойдзем, сядзем, вун, каля бэзу, — сказаў Лебядзёк. Яна ціхай поступьпю пайшла з ім.

Яны ўвайшлі ў клёмбы і селі на траву, закрытыя ад сонца, ад людзей, ад усяго на свеце. Як тут было прыгожа! Знізу было цёмна, прахалодліва, а наверсе, быццам прыгожая страха, вісела зялёнае лісцё. Дзе-нідзе праглядала сонца, граючы сваімі прамянямі, ды квола-блакітныя кавалачкі неба пазіралі ў люстра стаўка.

Лебядзёк, падаслаўшы плашч на траву, папрасіў сваю багіню, Кляру, сесці і сам лёг кале яе. Адразу на яго тхнула водарам парфум і жаночага цела, невядомай яму нейкай смагі кахання. Яму хацелася абхапіць Кляру, зацалаваць і ўзнесціся з ёй высока-высока ў царства не сённяшніх мар. Ён з нейкай хваравітасцю глядзеў на галоўку Кляры, на яе спушчаныя павекі і хоць хацеў прытуліцца, але нясмеліўся… Яна сама яму дапамагла.

— Ох, як мне цяжка пасля гэтых напіткаў, — казала яна, — галава баліць. Дрэнна. Спаць хачу. Дай дзе-небудзь прылегчы.

Ён ўзяў яе галаву і палажыў сабе на грудзі. Яна не пярэчыла. Схіліла галаву і закрыла вочы… Толькі чуў Лебядзёк падыманне ды апушчанне яе грудзей… Ён ляжаў і глядзеў на неба, на кусты, на паснуўшую прыроду, і яму паказалася, што жыццё ёсць толькі паэтычны сон, які нам, атамам адвечнасці, сніцца толькі адзін раз. І як прыйдзе час цвярозасці, час смерці, мы зноў ідзём у свой заўсёдны свет, называючы гэтую празаічную змену — смерцю. З гэткай істотай так прыгожа, так добра

жыць!.. І неўпрыцям вочы яго сталі вузейшымі, урэшце яны зусім зачыніліся.

Калі ўзбудзіўся, ён з жахам падняў галаву. Было ўжо цёмна. На ставок, на траву ляглі доўгія начныя цені. Зімныя каплі расы ўжо пачыналі збірацца на галінах. Рабілася вільготна. Кляра ўсё яшчэ соладка спала. Лебядзёк падняўся, потым знова лёг. Хмель трошку прайшоў… Успомніў ён, як тут апынуўся. «Вось і няўдачнік, песіміст!.. Ну, у добры час!» — падумаў ён і з усмешкай паглядзеў угару. Зноў зачыніў вочы, зноў падняўся… Трэба было, аднак, думаць, што рабіць з Клярай. Спаць было немагчыма, бо надышла ноч. Разбудзіць яе ён не адважаўся. Падумаўшы крыху, ён рашыў несці яе на руках сонную да кампаніі і пакінуць у Рабскага на кватэры. Паціху ўзяў ён яе абедзвемі рукамі, падняў і, як нейкі скарб, панёс. Яна збудзілася. Павяла соннымі вачыма навокал, зноў зачыніла іх, а потым, як бы спамінаючы штосьць, запытала сябе:

— Дзе я? дзе ж?

— Не пужайся, — адказаў Лебядзёк. — Ты са мной. Мы ідзём да Рабскага, пераначуем, не пужайся… Абдымі шыю рукамі, лягчэй будзе ісці… Мы хутка прыйдзем.

Яна абхапіла яго сваімі цудоўнымі рукамі. Зноў зачыніла вочы. Лебядзёк быў на сёмым небе.

Не ведаў, як ішоў. Ведаў толькі, што сённяшні дзень яго — велізарны паэтычны сон усяго жыцця.

Гэтакія моманты не паўтараюцца.

І карыстаючы з іх, ён цалаваў яе…

## II

Калі ён прыйшоў з Клярай у сад, было зусім цёмна. Большасць кампаніі была разышоўшыся. На століках стаялі парожнія бутэлькі, талеркі, пабітыя шклянкі, валяліся кавалкі недаедзеных пірагоў, мяса, розных іншых перакусак. Навокал было накідана паперы, смецця. Карацей кажучы, агульны абраз пасля гульні…

Але ўсё ж ткі яшчэ было вясёла. Усе, хто быў, чыста ап'янелі, і таму смех ні на адну хвіліну не перарываўся. Рабскі пушчаў агнямёты.



Чароўнай стужкай узвіваліся яны ў паветры, пужаючы цемру, і гэтак жа прыгожа ляцелі на зямлю пад прывітанне прысутных.

— Прыгожа! Слава! — крычалі і ценкія, і грубыя галасы.

— Дзіўна, дзіўна, дзіўна, — басіў тэхнік Камяловіч.

Непрызнаны паэт Сухавейка меў выпадак выпаліць экспромт:

Ты сіпіш, як змяя Агнямёту,
І спадніцай, і словам сваім…
Але ж не… І з тэй вышкі палёту
Ўсё ж паклонішся вочкам маім.

Валасны пісар Свінка Анэмфадзім гутарыў з тэхнікам Плаўскім.

— Яно ведама, — казаў ён, калі цемра асвяцілася велізарным святлом агнямёту, — прыймаючы пад увагу, што зямля кружыцца каля сонца ў трыста шэсцьдзесят пяць дзён пяць мінут сорак шэсць хвілін і таму падобнае, значыцца, агнямёт мусіць адхіліцца ад свайго шляху… гм… таму падобнае.

— У-у-ух ты, як бахнула! Брава! — крыкнуў ён што было моцы. Язык яго ледзь ужо рухаўся, думкі блуталіся. Але ж ён належаў да тых людзей, што як вып'юць, дык пачынаюць кожнага чапаць і асабліва ахвотна апавядаюць аўтабіяграфію.

— Калі прыняць пад увагу, — пачаў зноў пісар, — што ў дзясятым ці адзінаццатым годзе нашага стагоддзя і таму падобнае мелася з'явіцца камета Галея, дык, браток ты мой, што тады пачалося твaward… Я памятаю, што ксяндзы ў касцёлах гаварылі казанні аб сканчэнні свету, аб прыходзе Антыхрыста, браток ты мой!.. Пісалі кнігі гэтакія, лістоўкі… Як пачалі мы тады гуляць і таму падобнае, дык што толькі не рабілі. Апошняе прапівалі. Канец свету, дык канчай усё… Хай будзе запраўды канец свету…

Аж не… Прыймаючы пад увагу, камета чамусьці не зачапіла зямлі, нас і таму падобнае. Але ж мы на славу, браток ты мой, пагулялі — з мужыкамі гулялі… Люблю, браток, сваіх мужыкоў… Ну, вось так люблю, што…

Ён палез цалавацца да Плаўскага.

— Прыймаючы пад увагу, браток ты мой, ну, мы ўсе ж людзі, усе брацця. Ведаеш, я ўсё магу зрабіць… Прыедзе му-

жык, папросіць паса, або там, разумееш, розныя падаткі. Пісар усё зробіць. Прынясі толькі троху гарэлкі ды перакускі, ну, скажам, парасёначка, яблачкаў, адным словам, будзь чалавекам і таму падобнае; разумей, што ўсім трэба жыць, што дарма нічога не робіцца. І ўсё добра… І я жыву, з кожным жыву… Прыймаючы пад увагу і таму падобнае…

Тут ён не мог прадаўжаць думкі.

Галава яго нізка схілілася над сталом, ён пачаў ікаць і зваліўся з лаўкі. Плаўскі яго падняў і, пасадзіўшы на мейсца, адышоў.

З усяе кампаніі адзін толькі тэхнік Камяловіч быў мала падгуляўшы. Праўда, ён добра й «цягнуў» гарэлку, бо быў моцнага фізічнага складу: вялікі, румяны, з вясёлымі вачыма. Але ж сёння яго цвярозасць тлумачылася простым спазненнем. Калі ўжо большасць ледзь трымалася на нагах, ён яшчэ толькі пачаў выпіваць. Паненка, з якой ён даўно быў знаёмы, сядзела за столікам неяк сумна. Яна чакала Камяловіча. Пабачыўшы яго, яна раптам змянілася. Вочкі яе зайгралі, заблішчэлі. Аблічча, не вызначаючэеся харaством, асвяцілася нейкай сімпатычнай жывасцю.

— Вы пэўна зачакаліся? — запытаў, падыходзячы да століка, Камяловіч.

— Але… Я вас доўга чакала…

Ён падышоў, пацалаваў яе ручку і, прывітаўшыся з другімі нахілам галавы, сеў блізка каля яе.

— Бачыце, вып'ем чарачку за нашую парачку. Вы, здаецца, не пілі без мяне зусім. Ну, добра, цяпер мы будзем другіх даганяць. Перакусім… Якое вам віно больш падабаецца, чырвонае ці белае?

— Мне? Гм… Чырвонае, — адказала паненка, не ведаючы добра, што ёй адказваць. Камяловіч спыніўся, не маючы матэрыялу для размовы. Усе думкі яго неяк вылецелі адразу, калі ён сеў за стол перад гэтай жанчынай.

Ён думаў, думаў, але не мог прыдумаць нічога важнага. «Не аб гайках жа, чорт пабяры, гаварыць з ёй, — разважаў ён. — Ну… зараз, гаварыў аб віне. Яшчэ што б гэтакае?.. Пятрушка, моркаўка, мяса, катлеты… Ага, піражкі».

— Скажыце, — сказаў ён моцна, — як вам падабаюцца мясныя піражкі?



— Гм… Нічога… Дужа добра, — адказала паненка.

Зноў паўза.

— А ведаеце, я дужа люблю зайца з брусніцамі.

— Але… Заяц з брусніцамі нішто. Смачна. Я бы й цяпер з апетытам з'ела.

— Але ж што за час прыйшоў… Якая дарагоўля… Няма нічога… Ну што ж мы да свайго будучага вяселля справім? — казаў Камяловіч.

— Вы ўжо і на вяселле пераехалі! Яшчэ бацькі нічога не адказалі, а вы сваё. Будзе час — усё будзе. Цяпер не тое, што раней. І з бульбы піражкі зрабіць можна. Я дужа люблю бульбяныя піражкі на масле…

— Але, мая дарагая.. Добра будзе і бульбяныя. Я іх таксама люблю. Але што ж мы… Загутарыліся… Трэба даганяць. — Ён наліў па чарцы віна. «Аб чым тут яшчэ гутарыць? — думаў ён паміж тым. — Піражкі, заяц, пятрушка… Пачакай?.. Што ж я чытаў такога? Ага… Памятаю… Штось пра Ніцшэ чуў. Думкі аб жыцці… Ну вось, як-небудзь разгутарымся…»

— Мне здаецца, — пачаў ён, — філасофія — цяжкая рэч, правідловей… — паправіўся ён, — непатрэбная рэч… Мне нічога не падабаецца. Адзін толькі яшчэ Ніцшэ. Той хоць заве жыць тут, на зямлі. Няма, кажа, магчымасці жыць, дык зрабіце, кажа, ілюзіі жыцця. Вось, разумееце, як сказана. Або кажа адкідваць усялякую няверу ў сваю моц. Вер, бо маеш дзясяткі сходняў, па якіх дойдзеш да веды… чаго больш… Жыві, дый усё тут.

— Не люблю я Ніцшэ. Дужа цынічна ён кажа аб жанчынах… Арыгінальны ён вар'ят і больш нічога.

— Так… Арыгінальны… Але ж аб жанчынах ён кажа праўду. Дарагая мая… Нашто ж нам філасофія? Далібог, непрыемна будзе бачыць у вашай асобе адваката… але ж затое як будзе прыемна пабачыць вас гаспадыняй… і есці зробленыя вашымі ручкамі піражкі… Пачакайце, пачакайце, не спрачайцеся… Вып'ем яшчэ… Трэба даганяць.

Паненка, уся пачырванеўшы, сядзела на лаўцы. Яна глядзела на гэты стары, рамантычны сад, у які ўжо схадзіла ноч са сваімі доўгімі ценямі, са сваім цудоўным месяцам, і хацела толькі спамінаць, адчуваць.

«Каб усе дні жыцця былі б гэтакія, як сённяшні, — падумала яна, — я бы сказала, што жыццё ёсць рай».

— Ведаеце, што, — пачула яна як праз сон голас Камяловіча, — мне ўсё ж ткі заяц з брусніцамі падабаецца лепш за ўсё, нават за Ніцшэ. Яно-то й нічога бульбяныя піражкі, зробленыя вашымі ручкамі. Але ж заяц ды яшчэ з брусьнічкамі…

— Ах… Слухайце. Ці можна цяпер гаварыць аб зайцу? Гэткая дарагоўля… Цяпер не толькі бульбяныя піражкі на масле, нават і бульба з капустай добра. Дужа добра… Мне вельмі падабаецца.

— Але, — сказаў Камяловіч, наліваючы яшчэ па чарцы, — добра будзе і бульба з капустай… І мне падабаецца.

Якраз у гэты момант падышоў Рабскі.

Ён быў ужо зусім вольны ад усякіх абавязкаў гаспадара. Нікога з гасцей не было: Лебядзёк пайшоў да хаты ў Энск, Кляру, якая жыла таксама ў горадзе, ён адвёў на кватэру, рэшта спала на сене. Аставаўся толькі адзін Камяловіч з паненкай.

І таму ён падышоў троху пагутарыць.

— Вітаю, — сказаў ён, параўняўшыся з імі. — Чакаеце пакуль месяц узыдзе?.. Рамантычная прырода, рамантыкі людзі! Дазволіце? — казаў ён, паказваючы на лаўку.

— Калі ласка, калі ласка, — адказалі Камяловіч з паненкай разам.

— Ну, дык вось… Хутка месяц ўзыдзе. Раскошна будзе… Вы дапівайце свае напіткі, даядайце перакуску… Калі хочаце, можаце начаваць у мяне: ты на сене, а панна ў пакоі. А пакуль што частуйцеся, не звяртаючы ўвагі на мяне. Я толькі эпізадычная асоба цяпер.

— Вып'ем усе разам, дзе там не йшло, — сказаў Камяловіч, дастаючы з-пад стала бутэльку моцнай гарэлкі.

— Вып'ем дык вып'ем, — прамовіў Рабскі і пачаў добрым тэнарам вядомую маскоўскую песню, перарабляючы на беларускі лад:

Мой бацька быў стралок,
А я — яго сынок.
Страляў ён птушанят,
А я страляў дзяўчат.

— Ха-ха-ха, вось гэта пра вас якраз, сябра Камяловіч. Страляеце ўсё, страляеце, — казаў Рабскі, апаражніўшы чарку. — Але ў гэтым толькі дробная маскоўская іронія. Больш няма нічога. Затое нашая народная, беларуская песня, э-эх! Тут табе і гумару, і сацыяльных пытанняў…

І яны доўга спявалі ўсім вядомую песню. Спявалі так, як спяваюць людзі з добрымі галасамі, калі яны добра прамачылі горла. Пэўна, таму і белы месяц, усміхаючыся, ціха выплыў на неба. Асцярожна, быццам хаваючыся, падплыў ён да хмары бліжэй, каб паглядзець на спевакоў, і сярэбраныя прамені асвяцілі тройку.

— Гэ-гэ, — закрычаў Рабскі, — вунь ён і хітры месяц узышоў. Ці не час нам ужо расхадзіцца? Пойдзем!.. Ці аставайцеся. А я пайду.

— Не, мы таксама пойдзем, — сказала паненка Камяловіча.

Яны памалу пайшлі дахаты.

## III

На другі дзень пачаўся «самааналіз». Хто ўстаў зусім хворы, так што ні цытрыны, ні кіслая капуста, ні агуркі не памагалі і прышлося пралежаць, енчучы, цэлы дзень. У каго балела толькі галава, ад чаго лячыліся той самай гарэлкай. А былі і такія, у якіх балела адна толькі свядомасць. Да іх належала «багіня» Лебядзька — Кляра.

Пры ўспаміне аб учарайшым на твары яе з'яўляліся то белыя, то чырвоныя плямы. Яна не памятала, што было ўчора; памятала толькі, што ішла за Лебядзьком, што па дарозе Лебядзёк пацалаваў у плячо, што яны разам сядзелі на траве каля стаўка. А далей — туман, імгла…

Толькі адчувалася ёй, што здарылася шмат непараднага, і злосць на сябе за блізкае дапушчэнне Лебядзька кіпела ў яе грудзёх.

Яна — такая кветка з надзвычайна прыгожай галоўкай, з цудоўнымі блакітнымі вачыма — магла дазволіць думаць Лебядзьку, што кахае яго.

Ён, той Лебядзёк, нязграбны мядзведзь з доўгім, вузкім тварам, што закручваўся неяк падбародкам, ён, гэты мядзведзь, які не ўмее трымаць сябе ў грамадзянстве, адважваўся яе цалаваць. Плямы выступалі на яе твары.

Яна падышла да люстра. Перад ёй была, безумоўна, прыгожая, кволая істота. Са смакам апранутая ў раскошнае дэкальтэ, са стройна абутай ножкай, у шаўковых пантофліках, яна запраўды прыпамінала багіню. Не адзін хлапец, пэўна, ішоў бы паміраць за яе і памёр бы толькі з іменем на вуснах, так яна была прыгожа! І яна з самаздаволеннем глядзела ў люстра…

— Ага, вось што, — сказала яна, адвярнуўшыся ад люстра, — пазаву яго да сябе… Пагутару, памучаю і ўрэшце адпушчу, каб не смеў не толькі думаць, але і жыць тут. Зраблю безумоўна.

Яна падбегла да пісьмовага стала і шпарка, нервова пачала пісаць:

«Дарагі Лебядзёк! (Выбачай, не ведаю твайго імя.) Прыйдзі сёння ўвечары а гадзіне шостай. Буду адна… Пагуляем… Чакаю… Твая Кляра».

— Адэльця! — крыкнула яна сваёй пакаёвай, злажыўшы запіску. — Аднясі, будзь ласка, да Лебядзька, ведаеш, дзе жыве? Ну, вось… Пачакай толькі адказу. Калі не на запісцы, дык на словах. Ну, бяжы!

«Цікава даведацца, — пачала яна на самоце разважаць, — як ён аднясецца да ўсяго гэтага, да слова “пагуляем”. Чаго, ласне, ён ад мяне хоча? Пэўна, аднаго цела. Дзе такім мужчынам шукаць духовага багацця. Што ж? Сёння даведаюся. Навяду пастку…»

І яна некалькі разоў прайшлася па пакоі.

— Вось што, — пачала яна голасна, — апрануся больш лёгка. Што тут прыдумаць гэткага хітрага. — І з небывалай яшчэ ніколі злоснай энергіяй яна пачала прыбірацца.

Праз гадзіну вярнулася Адэля і сказала, што Лебядзёк быў здзіўлены і што згадзіўся, як яна бачыла, з радасцю.

— Ён трошку хворы пасля ўчарашняга, — адцеміла яна.

Пачаліся шпаркія падрыхтаванні, за якімі яны не пабачылі, як падышла чаканая гадзіна. Адэля выйшла. Кляра засталася адна. Ціха чыкаў гадзіннік. Неяк таемна стаялі пальмы ў вазонах, і папугай у зялёнай клетцы, прыслухваючыся, глядзеў на іх.

Сонца кідала свае апошнія залатыя прамені. Стала неяк сумна і нават жахліва.

Кляра сядзела, не рухаючыся, на канапе і з нецярпеннем чакала прыходу.



Раптам пазванілі. Сэрца Кляры неяк забілася, сціснулася, і ледзь-ледзь яна ўтрымалася на нагах. Яна ўсё ж ткі хутка падбегла і адчыніла дзверы. Перад ёй стаяў Лебядзёк, прыбраўшыся, пачысціўшыся… і змяшаўшыся. Ён першы раз бачыў яе ў такой вопратцы і так змяніўшыся.

— Добры вечар, — як непрытомны, працадзіў ён.

— Добры вечар. Заходзьце. — Яна правяла яго ў пакой і села зноў на канапе каля вакна.

— Вы трошку спазніліся, праўда? — пачала яна, звяртаючыся да яго на «вы». — Я вас чакала дужа. Аднэй было сумна… Я думала ўжо, што не прыйдзеце. Але то нічога… Троху пасядзім, пагутарым. Ведаеце, мне адной дужа непрыемна, сумна неяк, нясвойска. Сёння вы вольны, праўда?.. Мы пасмяёмся, пазабаўляемся, добра?

— З вялікай прыемнасцю, — сказаў Лебядзёк. — Я часткова ў вашым становішчы і тым больш прыймаю вашу прапазіцыю. Я пад вашым загадам.

— Ну, вось і добра. Значыць, я зноў багіня, а вы толькі паж. І цудоўна! Сваё права я скарыстаю. — Яна залажыла нагу на нагу, і рысы пекных ножак яскрава адзначыліся.

Лебядзёк удаваў, што не бачыць, і глядзеў у яе вочы.

— Прыемна будзе дазнацца, як вы скарыстаеце, — засмяяўся ён.

— Пачакайце… Трэба да вас падысці дыпламатычна… Не магу ж я адразу схапіць быка за рогі.

— Эт, як сказалі?.. Значыць, вы мяне хочаце схапіць і прыймаеце за быка? Трэба быць з вамі асцярожным.

— Нічога вам не паможа, ні ваша асцярожнасць, ні ваша хітрасць, бо ў мяне ёсць засабы такія магутныя, што ўсё пераможуць. Скажыце, — вымавіла яна троху пачакаўшы і пільна гледзячы на Лебядзька, — кахалі вы дагэтуль каго-небудзь ці не?

— О-ё! Як ставіце пытанне. Не магу адказваць усё ж ткі. Не памятаю… Здаецца… не.

— А цяпер кахаеце каго-небудзь? — і нейкая ўсмешка, змяшаная з энергіяй, засвяцілася ў яе вачах.

— Гэта завецца схапілі мяне за рогі? Але я дазволю сабе не адказваць. Не магу вам выказаць сваёй тайны.

— Ну, не можаце, дык як хочаце. Скажыце, будзьце ласка, мне адно: каго вы цалавалі ўчора ў плячо? — Яна зноў з

усмешкай паглядзела на Лебядзька. Той ад гэтакага пытання заёрзаў у крэсле. Твар лёгка пачырванеў, але хутка зноў прыняў нармальны выгляд.

— А хіба ж вы не ведаеце? — адказаў ён, злуючыся. — Што й пытаць, калі самі добра ведаеце…

— Ласне… Я толькі сама хачу сказаць, каго вы кахаеце, хто сядзіць у вашым сэрцы. Якія ж тут яшчэ тайны!

— Дык вы хочаце і напіраеце на тое, каб я сказаў, што — вы? Хай будзе так.

— Не тое, што я хачу, каб вы сказалі чаго не было ці няма. Канстатуйце факт. Ну, скажыце, чаму вы пацалавалі мяне ў плячо? Чаму? Не таму, што кахалі, не таму? Дзеля гульні, ці што?

— Ох, не пытайце так… Дзе вы навучыліся гэтак весці допросы? Хіба я магу адказваць на гэтакія пытанні… Для чаго, ласне кажучы, вы клікалі мяне? — Ён пачаў стукаць пальцамі па крэсле.

— Слухайце, Лебядзёк. Не хачу я вас ні дапрашваць, ні ведаць вашай тайны. Скажыце мне адну толькі праўду. — Яна села ў крэсла каля крэсла Лебядзька. — Толькі праўду! Што вы рабілі са мной, калі я ўжо нічога не памятала? Я памятаю, мы сядзелі на траве, каля стаўка. А больш нічога не памятаю.

— Ну што я вам, ці з вамі, мог зрабіць? Вы заснулі, і я заснуў. А пасля прыйшла ноч… Я вас правёў да Рабскага ў пакой… І ўсё. Цікава! Што я вам мог зрабіць?..

— Значыць, вы спалі… Вы, здаецца, былі моцна падвыпіўшы. Хіба вы памятаеце ўсё, што рабілі? Але ж вы праўды не скажаце… Цікава толькі, — пачала яна зноў. — Адно цікава, чаму вы мяне пацалавалі ўчора? Няўжо не адкажаце?..

Яна квола схіліла галоўку і вабна пачала ўглядацца ў яго вочы. Ножка між тым мімавольна даткнулася да яго нагі. Лебядзёк хацеў прытуліць яе ў гэты момант і зацалаваць. Але павінен быў устрымацца.

— Чаму ж вам так хочацца ведаць, не разумею. Чаму вы на гэта напіраеце? — казаў ён. — Няўжо не ведаеце, вы ж самі сказалі, што ведаеце, як запаланілі маё сэрца? Чаго ж яшчэ? Якіх прызнанняў чакаеце?



— Ну дык вось! Дзякаваць Богу, так-гэтак сказалі. Значыць, вы мяне кахаеце… Але як вы мяне кахаеце? — пытала яна ўсё з тым самым кволым нахілам галавы. — Моцна ці не?

— Але ж вы ўжо занадта, — адцеміў Лебядзёк. — Здаецца, маеце справу з маім сэрцам і маімі нервамі. Я пайду, калі так.

— Так і пойдзеце? Ці ж праўда? Пойдзеце і не пажалееце? І мяне кінеце, якую кахаеце, вашую багіню сэрца? А? Пойдзеце?..

— Прымушаны буду пайсці… Дзе ж. Гэтакія пытанні. Даведаліся, што я кахаю, а цяпер яшчэ хочаце ведаць, як моцна. Хто ж так пытае?

— Але ж сказаўшы адно, не цяжка сказаць другое. Каго ж пужаецеся? Скажыце, я вас прашу, не адмаўляйцеся!

Яна схапіла яго за руку.

Лебядзька як агнём запаліла.

— Ну, калі ўжо так просіце, скажу: моцна!

— Ну, а пакажаце, як моцна?

«Што за глупства, — пранеслася ў галаве Лебядзька. — Чаго яна хоча? Дзіўна. Я б ёй паказаў, як я кахаю».

— Дзіўна, — прамовіў ён. — Усё дзіўна. І вашыя пытанні, і вашая запіска, і вашае захаванне… Абсалютна нічога не разумею.

— Вы ўсё не разумееце. Чаго ж вы хочаце? Самі кахаеце ды яшчэ моцна. А паказаць нават тут, калі мы на самоце, не можаце. Пакажаце ці не? А то я пайду. Ну, пакажыце, як моцна?

«Паказваць ці не паказваць? — думаў Лебядзёк. — Я сам даўно хачу паказаць, як кахаю. А тут яшчэ яна сама просіць. Але ж ці будзе добра, бо відаць, яна штосьці задумала».

— Дык хіба вы не пакажаце? Ну, пакажыце, як моцна. Няўжо цяжка? — не адставала яна.

— Хочаце ўсё ж ткі… Ну, пакажу. — І ён абхапіў яе гібкі стан, потым прыпадняў і пачаў моцна салодка цалаваць.

— Годзі, годзі… Добра… Бачу… — шаптала яна ў ягоных абоймах.

Ён адпусціў яе і сеў зноў на крэсла. Яна падышла да люстра і пачала папраўляць валасы. Ён радасна глядзеў на яе і думаў, які ён шчаслівы, прынамсі, будзе шчаслівы. Цяпер ужо няма ніякага сумлеву, што яна яго кахае, бо сама прагнула яго

кахання. А яна пасля яго кахання толькі з агідай спамінала пацалункі. Цяпер ужо біццё сэрца прайшло, уся нясмеласць згінула. Засталася толькі вялікая злосць на чалавека, зрабіўшагася абрыдлым…

— Вось цяпер я бачу, як вы мяне кахаеце, — казала яна, падыходзячы да канапы. — Вось вам і нашае першае каханне. Найлепшае, што ёсць на свеце… О, вы, здаецца, умееце казаць на гэту тэму.

— Казаць не ўмею. Здаецца, умею толькі выказваць.

— Ах, вось як… А я нават падумаць не магла… Паглядзеўшы на ваш твар і мядзведжую фігуру, так цяжка падумаць…

Лебядзька штось балюча ўшчыпнула. Але ён прыняў гэта за жарт.

— Няўжо пасля таго, што было, можна так казаць? — пачаў ён. — Давайце пагаворым сур'ёзна.

Ён устаў і падышоў да яе.

— Я вас бязмежна кахаю. Каб я быў цар, кінуў бы карону да вашых ног, бо вы ёсць вышэйшае за ўсё на свеце, вы ёсць хараство. Цяпер я маю толькі адзін скарб: жыццё, і яго я кіну да вашых ног. Што ж вы яшчэ хочаце? Чаго, якіх прыхільнікаў шукаеце? Я веру, пасля ўсяго, што было тут, што вы таксама мяне…

— Годзі, годзі, — перарвала яна. — Што за сентыментальнасці? Нават немагчыма падумаць, што вы такі сентыменталіст. Кажаце старымі збітымі сказамі. Кінеце ўсё да маіх ног: жыццё сваё і г. д. Дзеля чаго мне вашае жыццё? Вы — майстры казаць толькі такія словы, а потым, калі не жыццё трэба ад вас, а толькі супрацоўніцтва, дык з вамі проста жыць няможна, да таго вы слабенькія. Не мужчыны, а якаясь надаедлівая камедыя. Дзе ж жыць з вамі?

— Я ўсё ж ткі вас не разумею. Быў момант. Здавалася, шчасце так магчыма, а цяпер вы…

— Пачакайце, — сказала Кляра, устаючы. Лебядзёк сеў. Яна пачала хадзіць па пакоі. — Скажыце мне адно, толькі адно. Не трэба мне ні вашага жыцця, ні вашай кароны, нічога абсалютна. Толькі скажыце па праўдзе. Што вам ува мне падабаецца, што вы кахаеце?

Яна стала перад ім, гледзячы цвёрда ў вочы. Вусны яе былі сціснуты. Твар бледны. Толькі цяпер Лебядзёк пабачыў усю



роскаш маладога, здаровага цела. «Што ёй сказаць? Ясна, што мне падабаецца», — думаў ён, і малюнкі з мінулага жыцця плылі перад вачыма.

— Адно слова, толькі адно слова, — сказаў ён, складаючы рукі на грудзёх. — Толькі выслухайце мяне… Сядайце, калі ласка.

Яна не села.

— Кажыце, кажыце, я слухаю, — прамовіла толькі і пачала зноў хадзіць па пакоі.

— Дарагая мая… Мы з вамі знаёмы не сёння… Памятаеце яшчэ трынаццаты год у Петраградзе? Нашае першае знаёмства… Успомніце толькі паседжанні беларускага гуртка… Як блізка мы былі, як весёла гутарылі… Няўжо гэта для вас нішто? Мы ж так даўно бачыліся… А цяпер… Няўжо вы сур'ёзна?.. Малю… Не разбівайце майго і ўласнага шчасця. Мы абоя будзем шчаслівы…

— Што за трафарэтнасці? — перарвала яна са злосцю. — Гаворыце як гімназіст… Напіраеце ўсё: бачыліся, бачыліся… Гурток… Дык хіба я магла з вамі не размаўляць… з усімі сябрамі гаварыла, гаварыла і з вамі. Вы зноў енчыце… На што ўсё гэта?

— Маё вам апошняе слова… Я бачу, што ўсё ж ткі надзея мая звалілася, загінула. Я быў яшчэ такі ідэаліст, што верыў у вашую мяккасць… не мяккасць, але не такую… не такую каменнасць сэрца. Я бачу, што я разбіты і ашуканы. Але ж… Хачу яшчэ ведаць адно… — Кляра перастала хадзіць і стала перад ім. — Толькі адно… — Лебядзёк падняў голас. — Калі б вы пабачылі, што гіне чалавек і што толькі вы адна, адно вашае каханне можа яго ратаваць, зрабілі б вы ахвяру, пакахалі б яго, ці не?..

— Ахвяру? Гм… Кахаць толькі дзеля ахвяры? О, гэта такая вялікая ахвяра… Няўжо вы яе ад мяне чакаеце… Вы хочаце, каб я прыйшла да вас, як матыль на вагонь, толькі апаліць крыллі? Тады вы праўда ідэаліст. Шкодны ідэаліст.

— Слухайце… Я б не казаў усяго гэтага, каб вы не былі маёй апошняй саломінкай. Верце… Прайшло ўжо шэсць, сем гадоў ад нашага спаткання. Я — не той. Ступіць не маю куды… Верыце?.. Раз хацеў страляцца… Для мяне няма жыцця. Вы бачылі, які я быў сумны, калі прыйшоў на гульню. Толькі вы

зрабілі мяне вясёлым. І толькі вы можаце мяне вярнуць да жыцця. Інакш смерць…

Яна хацела штось сказаць…

— Пачакайце, калі ласка. Я зараз скончу. Сказаць, што вы седзіцё ў сэрцы яшчэ з 905 году… Мне было тады толькі дзесяць гадоў. Вось гэты самы Энск… падымаюць дырэктара гімназіі, каб выкінуць праз вакно. Я пужаюся… бягу ад вучняў на вуліцу і… спатыкаю вас, стройную гімназістачку з доўгай касой… Яшчэ тады я зрабіў з вас багіню. Няўжо цяпер… Паверце мне, далібог, вы мая апошняя саломінка… Я згублю сябе…

— Ах, які надаедлівы сум… Няўжо вы мяне хочаце расчуліць? Я добра ведаю, як кожны мужчына кажа: «застрэлюся», «павешуся», «гіну», «ратуйце», каб толькі расчуліць жаночае сэрца. Дарма… — Яна адвярнулася да вакна і пачала нервова круціць фіранку. Твар яе паліўся, як у вагне, вочы моцна блішчэлі.

Лебядзёк сядзеў, апусціўшы пакорна галаву. Цяпер яму як бы стала ўсё роўна, што будзе далей.

«Чаму я яшчэ верыў, што магчыма шчасце?» — запытаў ён сам сябе. Папугай, быццам адказваючы, пракрычаў сваё традыцыйнае «Дурны!». Стала зноў ціха. Толькі сумна чыкаў гадзіннік.

— Няўжо вы чакаеце ад мяне ахвяры? — абярнулася Кляра.

Лебядзёк спакойна на яе паглядзеў.

— Чаму ж вы самі не можаце яе зрабіць? Чаму вы, напрыклад, не можаце адмовіцца кахаць мяне?..

— Адмовіцца кахаць? — перапытаў Лебядзёк і замаўчаў. Кроў кінулася яму да твару.

— Але… Адмовіцца кахаць.

Лебядзёк не адказваў.

— То вы маўчыцё?! — Голас яе неяк трэснуў. — Вы мяне яшчэ кахаеце! Але я добра ведаю, нашто я вам патрэбна. Што вы кахаеце. Гімназістка, курсістка — для вас усё роўна. Вам падабаецца толькі маё цела, вы толькі ганяецеся за маімі ножкамі, за формамі майго стану, за абрысамі маіх грудзей… А дзе ж, прапаведнік пашаны жанчыны, дзе ж духовыя багацці? Іх вы не шукаеце. Вам усё роўна…



Лебядзёк ускочыў.

Яна стала перад ім і крыкнула:

— Станьце зараз тут каля тых ножак, якія для вас — сэнс жыцця, за якімі вы не бачыце нічога другога. І вось на каленьках дайце абяцанне, што ніколі не будзеце блізка, што пакінеце наша места і аба мне забудзеце думаць. Абяцайце зараз!

Лебядзёк кінуўся да дзвярэй.

— Не, не! пачакайце, — схапіла яна яго за рукаво. — Дзверы ўсё роўна зачынены. Не выскачыце. Будзеце вар’яцець — пазаву людзей. Не адпушчу, пакуль не споўніце абяцання. Станьце хоць апошні раз перада мной і дайце абяцанне. Не будзеце тут болей, забудзеце мяне? Абяцаеце?

— Адпусціце… Хутчэй… Не магу… Хачу падняць на вас руку… Адпусціце ці не? — закрычаў на ўвесь пакой не сваім голасам Лебядзёк.

Кляра адскочыла і пазваніла. Прыбегла Адэля.

— Стой тут, каб не пабіў. Абяцаеце ці не?..

— Ну, ужо… абяцаю… Дайце дарогу хутчэй… Дрэнна будзе…

— Нічога. Павінны як належыць разысціся са мной, з маімі ножкамі. Вось вам яны. Цалуйце.

Яна паставіла іх да ягоных вуснаў.

Ён мімаволі нахінуўся і пацалаваў.

— А цяпер канец знаёмству. Бывайце!

Яна прыгожым жаночым рухам падала яму руку. Ён падаў ёй руку, але не сціснуў і не пацалаваў. Толькі зараз жа кінуўся да дзвярэй. Дзверы былі зачынены.

— Вы ўжо леціцё? Вось дык кавалер! Ты бачыла такога, Адэля, га? Думае вылецець… Але ўжо адчыні яму. Хай ляціць па-мядзведжу… Падай капялюш… З Богам!

## IV

Камяловіч між тым шчасліва дайшоў да сваёй мэты. Не толькі паненка, але і бацькі яе пабачылі ў ім прыгожага і прынаднага чалавека і згадзіліся звязаць з ім свой лёс.

Яны папрасілі яго пераехаць на вёску кіраваць працай да таго часу, калі ён сам стане запраўдным гаспадаром. Вяселле было назначана праз тры месяцы. Да яго маладыя пакуль

што не падрыхтоўваліся, а толькі цэлыя дні разам гулялі ды дурэлі…

Звычайна ў прыгожы, ціхі ранак, калі яшчэ ўсе спалі і было цёмна, толькі дзе-нідзе пазіралі апошнія зоркі, яны прабіраліся праз сад, садзіліся ў лодку і ціха плылі па возеры.

Лодка застаўляла пасля сябе мігаючы след, вёслы плёскаліся гучна ў вадзе, але і гэта не прыдавала жыцця малюнку: усё яшчэ спала. Спаў малады лес, спаў, гледзячы ў ваду, аір, спаў небасхіл, зацягнуты сіняй імглой.

— У такія хвіліны жыць хочацца, праўда? — казаў Камяловіч паненцы ў адну з гэтакіх паездак.

— Але… Дужа добра. Сёння асабліва свежа. Так добра, так добра!..

Камяловіч адкінуў вёслы. Лодка з разгону ціха плыла. Маўчанне было поўнае.

— А ўсё ж ткі мы з табой людзі шчаслівыя, — пачаў ён зноў. — Не ўсякі мае магчымасць ездзіць шторанак на возера. А мы вось з табой… гуляем… А пасля паедзем дахаты, пасядзім, падурэем… Ты ведаеш, што ты моцна паправілася за гэты тыдзень?

— Няўжо?.. Ты таксама стаў паўнейшы.

— Ну, вось бачыш! Чаго ж нам трэба больш? У асягненні прыемнага супакою і ёсць сэнс жыцця. Ведаеш, — цягнуў ён, бачучы, што нарачоная не хоча гутарыць, — я цяпер сярод гэтай дзіўнай прыроды думаю сабе: нашто гэта людзі падымаюць рэвалюцыі, вядуць палітыку, змагаюцца за перамогу партый? Каму патрэбны турбуючыя ідэі, высокія філасофіі?.. Шукалі б сабе спакою, пілі, елі, радаваліся, карыстаючы кароткім жыццём, дык не!.. Усё шукаюць нейкіх «шляхаў».

Ён замаўчаў. Нарачоная таксама маўчала.

— Я думаю, — цягнуў ён далей, — як нашае жыццё пойдзе? Мы з табой — маладыя! Нам трэба ўзяць ад жыцця ўсё, што магчыма. Ведаеш, я хацеў спытаць цябе… Хацела б ты мець парку рысакоў? А? Праехацца?.. — Ён рассмяяўся.

— Чаму ж не? Добра, — смеючыся, адказвала нарачоная.

— Ну, дык вось: завядзем парку рысакоў. А потым: гэй, на бок людзі! Ха-ха-ха!..



— Як ты сёння празаічна настроены, — засмяялася паненка.

— Наадварот… Паэтычна! Рысакі — гэта ж паэзія… Ну, а кухню мы з табой будзем мець! Гэ-гэээ! Па тры пуды сабе вагі нададзім. — Ён зноў рассмяяўся.

— Ого! Я цяпер важу чатыры пуды з паловай, а тады сем з паловай, што ж тады! Ты таўстухай хацеў бы мяне зрабіць?

— Прынамсі саліднасць… Будзе коням што везці.

— Я не хачу быць такой таўстухай.

Лодка зусім станула. Небасхіл ужо цалком пачырванеў. Лёгкі вецярок парухаў аір.

— Што ж, як хочаш, — казаў ён пачакаўшы. — А ўсё ж ткі мы з табой людзі шчаслівыя, га? Не ўсякі будзе, як мы.

— Кожнаму сваё. Што нам другія?.. Я ні на каго не звяртаю ўвагі. Але ж ад’едзем троху.

Ад’ехалі.

— Ведаеш, — зноў нахіліўся да нарачонай Камяловіч, — я чытаў, дый сам Рабскі, здаецца, казаў, што багацце — праступак, рабунак… Ну, а я сабе думаю: няхай вытвараюць маё багацце другія, што з таго. Я тысячам людзей дам работу. Чаму тут абавязкова павінна загаварыць сумленне? Я ні перад кім нічым не абавязан. Такі парадак рэчаў.

— Я ж кажу, што нам да другіх. Нашае багацце для нас. Не мы вінны, што мы — багатыя. Толькі дурні застаюцца беднымі… Яны самі й вінны, што бедныя.

— Мы з табой дзіўна аднадумны. Гэта, ведаеш, парука добрага сямейнага жыцця. Дай я цябе за гэта пацалую…

Яны пацалаваліся.

Сонца ўжо зусім узышло, дзень пачынаўся ў поўнай гожасці.

— Але ж, глядзі, ужо й час снедаць, — сказаў Камяловіч, гледзячы на чырвоную кулю сонца.

— Трэба ехаць!

— Ну, паедзем…

Павярнулі лодку і шпарка паехалі на снеданне.

## V

Лебядзёк пражыў тыдзень нікуды не выходзячы. Сорамна было перад самім сабой, перад тымі вынікамі, да якіх даходзіў аналіз сцюдзёнага розуму.

Што такое ён, калі жанчына можа зрабіць з ім такую непрыемную гісторыю? Дый што за жанчына Кляра? Чаму так спляліся абставіны і так трагічна, смешна перарвалася вясёлае жыццё? Чаму так хутка прыйшоў канец яго залётаў? Абрыўкі думак без парадку пачалі насіцца ў галаве. Спачатку ён не мог зусім думаць… Першыя два дні ён праляжаў на пасцелі, закрыўшы твар рукой, і толькі часам ускокваў з клічам «Які сорам!».

Сорам быў надзвычайны. Пэўна, усе цяпер у месце ведаюць пра яго… Што рабіць?

Паляцець бы куды-небудзь ад людзей, ад неправідлова склаўшагася жыцця, можа б, ад самога сябе і там, у той благаслаўлёнай зямлі, пачаць новае жыццё…

Ды няма гэтага мейсца.

Усюды людзі, благія людзі, і ўсюды няпраўднае жыццё. А якія гэты людзі аднолькавыя… Звяры можа нават чысцейшыя. Што ж Кляра, хіба звер? Так… Звер таксама. Яна як жывая ў сваім харастве праплывала перад ім… Ён толькі нервова парываўся з боку на бок і стагнаў. Потым, у другія дні, ён пачаў думаць больш аналітычна. Праглядзеў сваё мінулае, кінуў вокам на сваю будучыню, ці няма там хоць якіх-небудзь балотных аганькоў, пашукаў хоць нейкай веры ў сваю моц, але нічога не знайшоў.

Разабраў свае адносіны да людзей, прааналізаваў сваё мейсца ў жыцці, сваю ролю ў грамадзянстве і таксама прыйшоў да самых песімістычных вынікаў. З людзьмі тут ён не можа жыць. Ці ён толькі рамантык, ці ён толькі слабы, без розуму ды волі чалавек, але ж ён гіне ў гэтай таўпе…

Наперадзе сцежак ужо няма. Мінулае ж — адны непаразуменні… Значыць, нашто жыць?..

Так, усё цяпер ясна, зразумела. Не можа ён яшчэ раз зрабіць глупства ды жыць.

Хіба толькі каханне магло б вярнуць яго да жыцця і прымусіць забыцца прыкрае, асабліва каханне такой прыгажухі, як Кляра, але яно так смешна і хутка абарвалася, трэснула…



Засталося цяпер і ў жыцці, і ў сэрцы дапаленае вугаллё, попел.

І пад цяжарам песімізму ён часта за гэты тыдзень валіўся на пасцель ды плакаў.

Раз ён сядзеў перад вакном.

Быў сонечны, прыгожы дзень. Блішчэла далёкая рэчка пераліванмі сваімі, прыгожа глядзелі хаткі далёкага мястэчка, звонка крычалі гудкі параплаваў. Усё якраз як калісь у гады чароўнага дзяцінства… Які ён быў тады шчаслівы, якімі светлымі вачыма глядзеў на свет. А цяпер няма яму будучыны. Ён успомніў песціўшую яго матку-старушку. Колькі яна ўлажыла ў яго ласкі, кахання, і няўжо толькі дзеля таго, каб ён цяпер зразумеў, што жыць не трэба?

Балюча стала. Закіпелі, загутарылі глыбокія, дзесь схаваныя творчыя струны, і ён захацеў выліць свае мукі на паперу.

Ён падышоў да стала, задумаўся.

Потым пачаў:

«Апошняе “даруй”

Эх, вы, коні мае, коні! З вамі мая надзея, думка, маё жыццё… Паімчымся сёння ноччу адсюль, далей, далей, ад гэтых бедных людзей, паімчымся ад гэтага смеху й барацьбы, ад мора крыві, асветленага сонцам… далей ад людажэрства… Тут няма для нас бацькаўшчыны…

Мы — толькі госці сярод ворагаў…

Мы — занадта чыстыя, занадта ідэальныя для гэтага свету, дзе паядае слабых практычны, прагавіты звер — чалавек, дзе з лепшых, сьвяцейшых імкненняў смяецца брухаты залаты дзіватвор… Мы тут лішнія, нам няма мейсца… Пэўна, мы не адны… Можа, шмат ёсць чыстага, маладога, што гіне пад гукі музыкі ды чарак з гарэлкай…

Адсюль, адсюль!..

Я абыду сёння свае родныя абшары, абгледжу малады сасняк, пушчы, дзе ў дзяцінстве слухаў байкі-праўды, і тады апошні раз прыйду да вас.

Эх вы, коні мае, удалыя коні!.. Я гладзіў вашыя грывы некалькі гадоў назад, а які я быў чысты, бойстры, як светла глядзеў на людзей… Я ўваходзіў у жыццё як tabula rasa[4], а

людзі надпісалі паганыя словы і зламалі мяне. І стаю я адзін у жыцці і мушу загінуць ад чалавека, ад жыцця чалавечага. Як дзіўна…

І няўжо мог прыйсці да гэтакіх людзей Хрыстос?.. Няўжо могуць прышчапіцца сярод іх яго ідэі?.. Не. Хрысціянства не было жыццём і не будзе. Я загіну…

Але я — вольны сёння… Я магу кінуцца цяпер хоць у самыя глыбіны мора, падняцца арлом да неба, а потым разбіць свае крыллі аб скалы…

Я — вольны, людзі! Няма тых сумаў, няма тых кайданаў, няма тых тысяч звярачых галоў, якія прыдумалі б спосаб здушыць маю волю… Я пытаю вас, людзі, чаму я цяпер гіну? Чаму мне няма куды ступіць? Вас гэта не датычыць?.. Так… Вы смеяцеся, скачаце, апранутыя ў шоўкі ды атласы; вы носіце васьміпудовыя кодабы, ходзячы наверсе грамадскай драбіны… а я ўжо не маю паветра жыцця… Я гіну… Вы ж прыціснулі мяне да зямлі, і мой піск заглушаюць вашыя вясёлыя рагатанні… А пад вашымі вялікімі будынкамі, пад вашым вясёлым, раскошным жыццём, пад вашымі пахучымі фігурамі бадзяюцца, як я, забітыя, закінутыя шкілеты, без радасці ды надзеі на заўтрашні дзень, бадзяюцца сярод чорных вільготных муроў… Гэта яны стаяць убогія, стаяць з шарманкамі, з піламі, чакаючы ў кутах вуліц вашага датку…

Так ёсць!

Вы пабудавалі турмы, нарабілі кайданаў, газаў, стрэльб; вы б'яцё, забіваеце адзін аднаго… Вы садзіце ў турмы людзей, скоўваеце ланцугамі, б'яцё, як прыйдзецца — вешаеце, здзекуецеся…

Вы адрываеце людзей ад бацькоў, ад сясцёр, ад братоў, запіраеце ў вамі збудаваныя вастрогі-казармы. А потым зноў, як знак найвялікшай справядлівасці, гоніце іх на біццё братоў і бацькоў.

Мала таго… Вам усім, бедным і багатым, трэба збрудзіць душу, разбіць яе, замучыць. Вы стварылі сучасную прастытуцыю. Гэта найвялікшы прагрэс, да якога дайшла ваша гуманнасць.

Вы намножылі сірот, калек, сухотнікаў, самагубцаў… Толькі паслухайце, што кажа вам зямля, якімі марамі слёз яна поўніцца…



Але вам нецікава… Вы можаце не думаць аб гэтым, бо вясёлыя гукі раялю вам будуць казаць аб вашым гожым жыцці.

Пракляцця вам!

Вы чуеце мой голас, мой кліч?!.

Я ўзлячу сёння на сваіх конях-крозах і кіну свой перадсмертны крык…

Вам усім: вясёлым, бойкім, румяным, тоўстым, п'яным, не чуючым майго стогну, не ведаючым, што ёсць мукі, што значыць біцца ў болесці аб зялезныя сцены склепу, вам усім крычу я мільёнамі галасоў: "Пракляцце!"

Я жыць хацеў…

А я не магу жыць так, як хачу, бо кожны раз на мяне ціснуць зверху ўсё большыя ды большыя масы змагаючыхся звяроў… Вы смеяцеся над маёй слабасцю, вы хутка мяне прыцісневе…

Я не дыхну… Але я сам палячу ад вас…

Я не прыймаю вашага жыцця на вашай зямлі…

Я палячу сёння на маіх белагрудых конях, палячу высока і далёка ад вас…

Эх вы, коні мае, маланкі-коні!..

Мы палцім з вамі праз лясы ды горы, над галовамі людзей, свішчучы ды пужаючы. Паляцім да той, якая прымусіла нас аканчальна не верыць у кабет і людзей…

Я пашлю ёй пацалунак ў паветры і скажу сваё апошняе "даруй"…

А тады — шырокае мора — шырокая і мяккая пасцель…»

Тут ён спыніўся… Рукі дрыжэлі, усяго агарнула нейкая слабасць…

«Вось што значыць натхненне, — падумаў ён. — Выказаў, што так мучыла мяне. Не мог не пісаць, як не мог не плакаць. Цяпер аж лягчэй стала… — Ён прачытаў напісанае. — Слабавата ўсё ж ткі… Не так моцна, як хацелася. Але годзі… Усё роўна людзі нічога не прызнаюць. Пасмяюцца толькі. Ніхто не будзе ведаць, ніхто не захоча прызнаць, што я ў душы — паэт… Эх, людзі!»

Ён кінуў пяро.

Потым пачаў хадзіць па пакоі. Пакой быў нізенькі, вузенькі, з цемнаватымі старымі шпалерамі. Толькі дзе-нідзе малюнкі

добрых мастакоў на сценках ды кіпы кніжак у куце паказвалі, што тут жыве студэнт. Адно вакно выхадзіла на двор, але было так высока, што праз яго магчыма было бачыць толькі стрэхі дамоў ды коміны. Другое ж вакно адкрывала шырокі спазор на раку і далёкае мястэчка за ёй. Направа ад вакна былі дзверы. Перад вакном проста ад уходу стаяў стол да пісання, побач яго было некалькі крэслаў. Недалёка ад стала ў куце стаяла шафа. На сценцы каля яе вісела люстра. Побач з шафай, пад люстрам, стаяў просты драўляны ложак. Больш нічога не было. Лебядзёк лёг на ложак. «Чорт яго ведае, — думаў ён. — Можа, трошку і хваравіты гэты песімізм… Я ж яшчэ не ўсё спазнаў у жыцці. Не ведаў кахання… Не, яшчэ трэба жыць. Хоць пакахаць яшчэ каго-небудзь… Але ж ці магу я пасля Кляры кахаць каго-колечы? Пэўна, магу. Заўтра апранусяі пайду ў места. Не стрымаў абяцання… дык што? Што мне яна? Я аб ёй і так забыў».

## VI

Але ж на другі дзень нічога не здарылася. Ён устаў з такім самым песімізмам. Проста сціскалася сэрца і заміралі думкі, калі ён памыкаўся што рабіць.

Жыццё склалася няправільна. Нічога ён дагэтуль не зрабіў дадатнага і зрабіць не мог. Што ён ні рабіў, усё гінула. Нейкі закон пракляцця вісеў над ім. Ён пачаў думаць аб гісторыі з Кляраю. Да знаёмства з ёй ён быў, безумоўна, песіміст і думаў раз кончыць з сваім бескарысным жыццём.

Неўспадзеў ён бачыць яе. Знаёміцца з ёй. Ён — новы чалавек… Усё жыццё дагэтуль не было нічога вартым. Ён жыве і радасней глядзіць на жыццё. Потым сад Рабскага, маёўка, салодкія пацалункі… Як чароўна… Але ўсё не больш, як агнямёты жыцця. Ён безумоўна яе кахаў.

Шчасце было магчымым, але не прыйшло. Яна не магла яго кахаць… Яшчэ быць знаёмай, гутарыць, нават пайсці разам на маёўку і там падурэць яна магла б…

Заўсёдныя спевы дыфірамбаў, адбіванне паклонаў перад ёй — толькі гэта будзіла яе прыхільнасць. Трэба ж было мець гэткія цэннасці душы, перад якімі яна сама магла б пакланіцца. Ён іх не меў.



Яна не магла спакойна глядзець, што ён так заўзята дабіваецца яе кахання. У час гульні, калі яна нічога не памятала, ён мог ёй Бог ведае што нарабіць.

Просты сорам дзявочы змусіў яе паспяшыць і выбіць назаўсёды дур з галавы. Лебядзёк жа, думаючы аб гэтым, бачыў толькі нейкую наканаванасць, закон праклящця.

Так з ім усё, так выйшла з каханнем Кляры, так будзе далей… Безумоўна, сама прырода абышла яго, не даўшы яму ні характва, ні розуму, наагул нічога. Ён тут ні пры чым, але жыць далей проста немагчыма.

Ён устаў і падышоў да люстра. Велізарныя змены кінуліся зараз у вочы. Твар быў жоўта-зялёны. Вочы неяк паглыбелі і пацямнелі.

Постаць уся выказывала нейкую змучанасць. Раптам пазванілі. Прынеслі ад Камяловіча запіску. «Дарагі Лебядзёк, — пісаў Камяловіч буйным, прыгожым характарам. — У нядзелю за тыдзень спраўляю сваё вяселле. Будзь ласка, не адмоўся прыйсці. Як стары сябра заву цябе спаткаць мае ўходзіны ў новае жыццё. Чакаючый цябе Камяловіч».

— Прасілі напісаць адказ на другой староны, — сказаў прысланы хлопчык.

— Адказ? — здзівіўся Лебядзёк. — Добра, напішу.

Ён сеў пісаць, але задумаўся. «Ісці ці не ісці? Яна там пэўна будзе… Сустрэнемся… Але цяпер усё роўна. Я рашыў зачыніць ім вусны».

Ён напісаў: «Дзякую за запросіны. Абяцаю быць. Лебядзёк».

Правадзіўшы хлопца, ён зноў сеў за стол. «Мне цяпер усё роўна. Такі настрой, што мог бы пайсці пад расстрэл, на фронт або кінуцца з сёмага паверху. Так. Я гатоў».

Ён паглядзеў угару на вакно. Потым прайшоўся некалькі разоў па пакоі. Нічога нават не думаў. Усё было скавана гнеўнай роспаччу і здавалася такім спакойным, звычайным.

Толькі вочы занадта напружана пазіралі з цемнаватым блескам з-пад нахмараных павек.

«Можа, мяне яшчэ што астановіць?.. — думаў ён, падышоўшы да вакна. — Не… не можа… Скончана».

Дастаў паперу, раскроіў на два лісты. Потым прыгожа вывеў: «Дарагія сябры!»

«Але нашто пісаць? — падумаў ён. — Хоць усё роўна… Рабіць няма чаго… Супакою душу, а магчыма на ўсялякі выпадак…»

Ён пачаў пісаць ліст: «Яшчэ адно апошняе слова — і дапаліцца лучынай маё бескарыснае жыццё…» Потым закрэсліў усё і напісаў:

«Мілая Кляpачка!

Пэўна, Вы будзеце здзіўлены такім зваротам да Вас і выкажаце зноў сваю добрародную агіду.

Але пачакайце… Хутка Вы будзеце не так яшчэ здзіўлены і не тое яшчэ пабачыце. Будзеце, можа, тады жалець мяне, плакаць, пытацца, ці не Вы былі прычынай такога выпадку. Не, мая Кляpачка, не, мой міленькі Выгрык[5]!.. Зусім не…

Адзін я — вінавайца, стаю перад Вамі на каленях і звяртаю да Вас сваё апошняе “даруй”.

Адпусціце мне ўсе мае грахі, бо я адыходжу ад Вас, я болей Вас не пабачу.

Можа, я скончу жыццё самагубствам, але будзьце пэўны, што не Вы — прычына гэтага.

Не Вы — прычына, не…

О, Вы — чароўная, прыгожая Мадонна, Вы — святое хараство, Вы — анял на зямлі… Вы тут ні пры чым. Гэта не Вы разбілі маю адзіную надзею, можа, мару жыцця… Не Вы прымусілі пабачыць зноў адваротны бок жыцця і людзей. Не… Вы — далёкія ад гэтага, мая прыгожая крыніца цярпення.

Вашым тыгравым ножкам калі-небудзь злажыў бы паэму, а цяпер… цяпер…

Даруйце за ўсё, за ўсё… Спаўняю сваё абяцанне і разлучаюся з Вамі навекі.

Далёкі ад Вас і тут, і па за жыццём

Лебядзёк».

Потым напісаў караценькую запіску: «Прашу нікога не вініць».

Злажыў допіс, палажыў у канверт, надпісаў і ўжо хацеў адаслаць, ды пасля раздумаў.

«Можа, я аддам ёй на вяселлі. Так… Пабачу і аддам ёй у рукі».



* * *

Прыйшоў новы дзень. Лебядзёк устаў з той самай спакойнай роспаччу. Яму зноў маляваўся аднастайны дзень, як заўсёды. Нічога не прадбачылася цікавага, апрача мулкіх разважанняў і енку. «Не, з гэтым трэба скончыць хутчэй, — падумаў ён. — Далей немагчыма. Хіба ў мяне не хопіць волі? Доўга ўсё зрабіць?»

Гаспадыня з снеданнем перарвала думкі. Ён сеў за стол і паглядзеў на яе.

— Што з вамі? — крыкнула з жахам гаспадыня.

— А што?

— Не дай Бог, трэба можа паслаць па лекара. Вы ж бледны, ды вочы як у вар’ята, выбачайце.

— Слухайце, цёця, бачылі вы калі-небудзь самагубца перад смерцю?

— Крый Божа, ніколі не бачыла. — Старая набожна перахрысцілася.

— Шкада, — працадзіў Лебядзёк.

— Вы пэўна хворы? Скажыце, бо ў вас страшны выгляд, — казала гаспадыня.

— Не можа быць. Вам здаецца. Я зусім здаровы.

— Хто вас разбярэ, — замармытала гаспадыня і выйшла.

Ён паснедаў, пасля прылёг на пасцель і пачаў глядзець на сваё мінулае з свайго смяротніцкага пункту гледжання, як асуджаны на смерць апошні раз аглядае жыццё навокал.

Жыць яму яшчэ хацелася, але ж па-новаму, з маленства, можа, з новым розумам, тварам… новым чалавекам… Такому ж, як ён, жыць не было сэнсу. Што ж? Цяпер ён ступіць нікуды не можа. Не мае ні здольнасцяў, ні патрэбнай энергіі. Загіне ўсё роўна, незалежна ні ад чаго іншага. Значыцца, трэба толькі адважыцца і раз назаўсёды скончыць…

Гаспадыня зноў увайшла.

— Не, вы ўсё ж ткі нездаровы, — прамовіла яна, гледзячы на ляжачага Лебядзька. — Трэба лекара пазваць.

— Ай, цёця, нічога не трэба, — сказаў, злуючыся, Лебядзёк. — Я здаровы.

— Ага… вось… Чаму вы запыталі, ці не бачыла я самагубца? Якое гэта мае значэнне? Ці не думаеце вы?..

— Ой, далібог, якія вы. Мала што прыйдзе ў галаву чалавеку? Мне так цікава было ведаць, як гэтакі чалавек выглядае.

— Штосьвы ніколі так не пыталіся, а галоўнае, ніколі так дрэнна не выглядалі.

— Вучуся шмат… Ад гэтага… пэўна…

— Хто вас ведае, — сказала яна і пайшла з начыннем.

«Як падумаеш, — разважаў Лебядзёк на адзіноце, — жыццё — толькі насмешка лёсу.

Пусціла чалавека, як рыбу ў нейкі жбан, невядомая рука; апаражняе ды папаўняе патроху. А людзі думаюць, што яны самі твораць жыццё, што яны незалежныя ні ад чаго іншага. Шукаюць нейкіх сэнсаў існавання іхнага. Пытаюць, што ёсць жыццё.

А гэтага не зразумеюць, што яны толькі рыбы ў жбане вады вышэйшае іх істоты.

Так… Сэнс жыцця не існуе. Разумны чалавек не можа жыць. Жыве толькі маладумаючы або ашуканец! Чаго ж тады я баўлю яшчэ?..»

Ён падышоў да вакна, паглядзеў на крук, нават зрабіў пятлю. Хацеў прасунуць галаву, але яго лёдам абліло ад жаху… Ён адышоў і са злосцю кінуў вяроўку.

«Чорт пабяры!.. Яшчэ жыццё — дарага». Вусны яго былі пасінеўшыя. Вочы выказвалі нешта мефістофельскае[6]. Увесь твар быў зялёны.

«Не, я ануча, трус… Не магу, што парашыў, выканаць… Эх, такіх людзей расстрэльваць бы…»

Ён не мог ісці па пакоі. Ногі чагосьці дрыжэлі. Сэрца моцна білася… Хутка сеў ён на крэсла.

«Вось табе мужчына! Безумоўна, ні адна кабеціна не можа звязаць са мной лёсу.

Як гэта, аднак, людзі адважваюцца кідацца з пятага паверху або вешаюцца?»

Ён лёг на пасцель.

«Якія павінны быць моцныя людзі, — думаў ён. — Зялезныя людзі, не то, што я — трус!»

Так ён ляжаў аж да самага вечара, нават нічога не еў. Думаў толькі, што няма выхаду ў жыцці, а што скончыць самагубствам ён не мае моцы.



## VII

Шэрыя, аднастайныя дні прыносілі сумнае заспакаенне. Яны лагодзілі неяк Лебядзька з яго лёсам, з неўнікнёнай патрэбай усіх няшчасцяў, уганяючы глыбока ў свядомасць безнадзейную тугу.

Ён зрабіўся больш спакойным, нават весялейшым, быццам скінуў з сябе нейкі цяжар ці вырашыў вялікія пытанні.

Яго роспач стала не такая крыклівая, нервовая, а больш спакойная, ціхая і глыбокая… Свядома ён падышоў да апошняй мяжы страшнага Рубікона[7]. Людзі ўжо не пужалі яго. Ён глядзеў на іх зверху ўніз, і дробныя інтарэсы іх яму здаваліся смешным непаразуменнем.

Але пры ўсім гэтым ён пужаўся выйсці ў места. Яшчэ тры тыдні прабавіў нікуды не выходзячы.

Толькі ўночы ён выхадзіў з сваёй кануры, павяртаў на зялезнічны мост і сядаў на беразе Дзвіны.

Чорная вуаль ночы звычайна ўжо пакрывала палогія берагі. Пад ценкімі яе завесамі магчыма было яшчэ разглядзець рысы процілежнага берагу, нейкія чорныя цені лайб і рух бягучай вады.

А далей усё злівалася ў адну густую чорную цемру.

Навокал было ціха, ціха…

Толькі каля каменных быкоў моста клекатала вада, білася й круцілася ў злосці, але не змогшы іх, ляцела шпарка і сярдзіта далей.

Дзесь джурчэлі, збягаючы па каменнях, ручаінкі. Далёкадалёка ў чарнаце час ад часу глуха заліваліся сабакі. Па ўсім беразе пахла моцна рыбай, абгніўшымі бэлькамі, дзёгцем, вільгаццю, — але ўсё ж тут прыемна было сядзець…

Ні жывой душы, адна толькі глыбокая гутарка прыроды…

Лебядзёк клаўся на каменьчыкі, якімі быў засыпаны ўвесь бераг ракі, глядзеў у цемнату і разважаў.

Як усё дзіўна і прыгожа ў сваёй прастаце. Вось пачыналі ўжо з'яўляцца дзе-нідзе ваганькі; на другім беразе разлажылі вагонь — то, пэўна, «гэндзікі»[8] гатавалі вячэру. Вагонь нават асвяціў некалькі белых постацяў. Сіняваты дым узняўся ўвышку.

«Здаровае жыццё ўсё ж ткі, — падумаў ён. — Каб я цяпер меў гэтулькі беспасярэднасці, як гэты народ… Зрабіўся б бурлаком, «гэндзікам», гнаў бы ганкі ў Рыгу. Кашу гатаваў бы вось так на рацэ… Прэч тады песімізм… Усё ж ткі якая сіла гэты народ! Хто з яго бывае песіміст? І думкі аб гэтым няма. Якім далёкім я стаў цяпер ад народа. Неба і зямля…»

Па ўсёй рацэ запаліліся ваганькі. Рака стала падобнай да зграі ваўкоў, мігаючых у чарнаце сваімі бліскучымі вачымасвечкамі.

Штось моцна пялёхнулася. Лебядзёк павярнуў галаву. Потым зноў усё сціхла.

Ён лёг на плечы, падлажыўшы пад галаву рукі, і пачаў глядзець угару.

«Якая ўсё ж ткі насмешка, — падумаў ён. — Сам з таго самага народа, быў з ім… у беднаце й рос, і цяпер у беднаце. А ўсё не тое, не тое… Інакшая псіхіка, іншы чалавек… І то ж трошку толькі адукацыі, культуры… А ўжо чалавек незразумелы для свайго бацькі… Адыдзеш ад народа, ад гэтай моцнай беспасярэднасці. Іронія. Робішся інтэлігент».

Ён зачыніў вочы.

«Гэтыя інтэлігенты — усе слабенькія… Песімісты, сухотнікі, паралітыкі… Чаго толькі няма. Няўжо тут не будзе жыцця? Інтэлігенцыя што? Расліна, адарваная ад кораня… Гіне, сохне, а не жыве… Ну, што я?»

Пачуўся сплёск вёслаў на вадзе. Хтось праехаў недалёка ад берагу, насвістваючы вясёлы матыў.

Лебядзёк паправіўся. Зноў лёг.

«Чаму я так жыў? Бацькі — бедната, галота, а пусцілі мяне вучыцца. І вось, выўчылі! Плебей між патрыцыямі, басяк між інтэлігентамі… Які быў заўсёды сорам! Не ўмеў жыць сярод гэтых здаровых, чырвоных дзяцей адукаваных бацькоў… Эх, ты, гора маё!»

Ён падняўся. Пасядзеў крыху. Потым лёг на бок.

«Трагікамедыя дый усё… Што я? Ад варон адышоў, а да паваў не дайшоў. Пэўна, я смешны са ўсёй сваёй адукацыяй… Я ж і не жыў яшчэ… Хадзіў у школу, вучыўся, а болей нікуды не ішоў. І выйшаў з мяне не інтэлігент, а мяшок. Кавалачкі формул, абрыўкі думак чыіх-небудзь, вырваных адкульнебудзь — вось і духовы скарб. А сваіх?.. Эх, на чорта мне яшчэ жыць?..»



Ён перастаў крыху думаць, лёг зноў на плечы, гледзячы ў навіслую над ім чарнату.

«Чым я жыў… Яшчэ як-небудзь біўся за хлеб, але ж я не ўмеў жыць, як другія, для хлеба. Умеюць людзі неяк сабраць багацце, а я — нейкі слабенькі, рамантык… Я не мог жыць, падстаўляючы нагу другому. Толькі й жыў кнігамі, сярод кніг, а матэрыяльнага не ўмеў нічога дабыць. Мая бяда… І ніводнай карыснай ідэі за ўсё жыццё. Так, брат, куды ні кінь — усё клін…»

Дзвіна сярдзіта клыхтала, білася.

Цемень ночы зрабілася яшчэ больш чорнай і густой. Ужо недалёка ад сябе нічога немагчыма было пабачыць.

Толькі ярчэй зіхацелі вочы ракі.

Ён, лежачы, падпёр галаву рукой.

«Разрашы вось тут загадку жыцця… Рака жыве, б'ецца, ручайкі джурчаць. А тут вось я, чалавек, сяджу і разважаю. Усё жыве… чаго?.. Дзеля якой мэты?..

Над усім адзіны закон быцця. А хто яго знойдзе? Дзе той мудрэц, што разгарне ўсю кнігу жыцця і прыроды? Няма яго… Пэўна, людзям дадзена толькі такое бяссэнсавае, незразумелае для іх саміх існаванне. І жывуць сабе гэтыя чалавечкі, не думаюць ні аб чым. Плодзяцца, капаюцца дзесь у гнаю… трупехнуць…

Усё ж добра, што яны ні аб чым не думаюць. Можна, падумаўшы, чаго добрага, скончыць самагубствам. Але… што?.. Жывуць — хай жывуць».

Зноў лёг на плечы.

«Я ўжо не магу жыць. Цяпер не маю ніякіх матэрыяльных засабаў. Зарабіць іх не магу. Можа б, яшчэ змог бы дзе дастаць, але не патраплю са складам сваіх мазгоў. Ні фізічнай, ні ўмысловай працы я не магу мець. Не варона, не пава… Загінуў, брат. Ну, што ж…

Нічога… Адным непатрэбным будзе менш на зямлі».

Ён рашуча ўстаў. Каменьчыкі пакаціліся ўніз і бухнуліся ў ваду. Дзесь пачалі на розныя галасы залівацца сабакі.

«Ужо позна… Глыбокая ноч… Трэба ісці дахаты. Але не… Так позна… Не пайду! Буду тут начаваць».

Ён падышоў да велізарнага каменя, палажыў пад галаву шапку і лёг.

«Вось і мой ложак. Добра. Вось і я — брадзяга…

Усё цяпер разбіта, усё вырвана з каранём, дапалена… А я не зусім дрэнная натура… Толькі я дапамагаў другім без жаласці да сябе.

Не адзін, пэўна, пасля смерці прыпомніць альтруізм. Што ж, пасля смерці… Якая іронія…»

Ён ляжаў і пільна глядзеў у чорную гушчу, шукаючы там чагосьці. Усё пранасіліся перад ім малюнкі жыцця, быццам якійсь варажбіт круціў перад ім чарадзейскую стужку. Потым Кляра ў белым, як анял, паказалася ў чарной імгле…

«Кляра… Кветка майго жыцця… Кляра!..»

Яна глядзіць на яго бліскучым далёкім поглядам і ўсё далей плыве, плыве на якіхся ценкіх паветраных хвалях… Твар усё болей расплываецца, цямнее, белая вопратка залатым блескам дыямантаў знікае… Перад ім вялікі пакой, поўны моцнымі, слепячымі, як сонца, вагнямі… Чорныя ваконныя завесы… пальмы… зялёны папугай… вялікі гадзіннік… абразы… А там, каля вакна, штось чарнее… Вось выразней яно, выразней і ўжо яскрава ўстае, падыходзіць…

Гэта яна, яна…

Твар — чырвоны, паліцца… Вочы блішчаць… Вусны сціснуты… Глядзіць пільна, рашуча… страшна… Вось ужо стукае, стукае ў мазгу яе голас…

Часцей, часцей, моцна, як на тэлеграфе…

Ярчэй адбіваюцца агністыя словы: «Вы ганяецеся за маімі ножкамі, за абрысамі маіх грудзей».

Ён слабее… гатоў паляцець… Яна бледне, хапае яго. Зноў стукае голас у мозг: «Станьце зараз перад маімі ножкамі! Эх!..»

І зноў няма нічога. Ён ляжыць на вялікім камяні на беразе шырокай Дзвіны. Нясе вохкасцю, джурчыць дзесь унізе вада, штось плёскаецца ў рацэ.

Ён глыбока, цяжка ўздыхае і зачыняе вочы. А белы анял зноў з'яўляецца ў чарнаце.

Вось ён ужо ніжэй, ніжэй, спушчаецца над ім… Ужо заліваецца імгла белым блескам; паветра поўніцца цудоўнымі пахамі нябесніх зёлак… Яна плыве на скрыдлах у празрыстым сіняватым дыме, павісшы на залатых стужках і працягнуўшы да яго ручкі з белай лілеяй…



Бліжэй, бліжэй яна…

Ужо ён чуе дыханне, ужо да яго вуснаў прыцісnуліся вусны, гарачыя, свежыя… Ужо паліць яго салодкі, мілы пацалунак, а навокал спяваюць райскія птушкі і анёлкі кідаюць кветкі…

Шчаслівыя слёзы туманяць яго вочы.

— Кляра мая… Анял мой, — кажа ён ёй. — Ты прыйшла да мяне на зямлю… Анял мой… Я — чалавек… Я — бедны, маленькі чалавек… не варты цябе… Ты ў раі… Ты мыеш сваё цела пахучымі водамі, ты ходзіш па высокіх горах, ты п'еш з нябесных крыніц… ты сядзіш у раскошных садах, сярод залацістых дрэваў, люстраных вазёраў… Там шчабечуць табе птушкі гімн славы, там кадзяць табе анёлы з нябесных кветаў. А я… я — бедны чалавек тут, на зямлі… Паглядзі на мой дом… Знішчаны, абдзёрты, чорны, без паветра, нікчэмны… Я — сам… Я не маю нічога… Я — лішне бедны, каб пражыць жыццём маленькага чарвяка… Я —чарвяк… Кляра мая… Анял мой!

Я — чарвяк…

— Не плач, даражэнькі, — чуе ён яе нябесны голас.

І хтось пачынае граць невыказна прыгожымі мелодыямі на арфе. Гукі нясуцца роем у паветры, то гнеўна, то смеючыся, то спяшаючыся адзін за адным, усё вышэй, потым зноў зляцаюць і квола, мякка датыкаюцца да яго вуха. А яна салодкімі пацалункамі паліць яму вусны так міла, так моцна…

— Анял мой, — шэпча ён ёй. — Я кахаю цябе, як сваё шчасце, як рай… Ты прыйшла ў маё сэрца, у маю душу, але не можаш пайсці ў маю кануру… Ты не можаш мяне кахаць…

Анёл не можа кахаць чарвяка… Я — чарвяк… Кляра мая… Ты не можаш мяне пакахаць…

І ён плача моцна слязамі жалю, а яна гладзіць яго валасы сваімі белымі ручкамі.

— Не плач, даражэнькі… Не плач… Вось табе ад майго сэрца белая лілея. Я кахаю цябе… З гэтай лілеяй ты ўзляціш у рай і мы хоць па-за жыццём спаткаемся ў райскіх садах.

— Мой анял, — смяецца праз слёзы ён, — анял…

Толькі твая райская душа можа прынесці такую ахвяру… Толькі анял можа зысці з сваёй чыстай душой да душы грэшнай, бруднай і абмыць яе сваім каханнем… Я хутка скончу тут сваё жыццё… мой анял… Не магу цярпець тут ганебнага

існавання сярод чарвякоў, бо няма цябе, бо я сам чарвяк, бо я — бедны, як усе чарвякі… Мне яшчэ страшна кінуць зямлю. Не ведаю, што рабіць у сцюдзёным паветры бязмежнасці, але ўжо з белай лілеяй я хутка-хутка кінуся да цябе…

Ён горнецца да яе. А яна спявае яму якуюсь дзіўную песню аб хараstве кахання, аб адвечнасці шчасця, аб раі…

— Мы ўзляцім з табой у рай, — кажа ён на яе грудзёх, — а Рабскі застанецца на зямлі? Ты не можаш кахаць Рабскага, праўда? Не, не можаш! Са мной белая лілея…

— Я кахаю цябе, мой мілы… Я не буду кахаць Рабскага… Я абхаплю сваімі залатымі стужкамі і падымуся высока-высока… Мы будзем лятаць над людзьмі, над гэтым вось мейсцам і будзем зліваць нашыя душы ў адзіны пацалунак…

Яна схіляецца над ім і дзіўнымі гукамі арфы пачынае апавядаць яму невядомую казку.

А Дзвіна ўсё так сама клякоча… Так сама чуваць па каменьчыках вясёлыя ручаёчкі, так сама гараць вочы ракі…

Толькі над сонным Лебядзьком усё стаіць белы анял — Кляра, і ўсё апавядае казку…

## VIII

Прыйшло вяселле. З’ехаліся ўсе, што прыймалі ўдзел у маёўцы, ды яшчэ з’явіліся госці з вёскі.

Кляра прыехала раней усіх і адразу пачала граць пераважную ролю. Рабскі быў не менш выдатнай другой скрыпкай, дапаўняўшай Кляру: ён быў сват, а яна — сваццця.

Лебядзька яшчэ не было. Пачакалі яго, пачакалі дый пачалі вяселле. Лебядзёк прыйшоў толькі ў час самых скокаў. Што было моцы гралі два духавыя аркестры, скакалі падвыпіўшыя госці; усё круцілася, што толькі магло круціцца…

«Што ж я? — падумаў Лебядзёк, падыходзячы да саду. — Той шут, што скакаў на хаўтурах? У мяне толькі наадварот. Нябожчык на вяселлі…»

Апрануты ён быў у звычайны шэры касцюм, толькі нагруднік ды каўнер былі лепшыя, святочныя. Выглядаў ён хоць і дужа дрэнна, але ж лепш, як учора. Калі ён падышоў да саду, Камяловіч пайшоў на спатканне.

— Позненька, позненька… Ну, але лепш позна, чым ніколі.



— Выбачай, тысячу разоў выбачай, — адказваў Лебядзёк, паціскаючы моцна руку Камяловічу.

— Ну, нічога… нічога… Пойдзем да жонкі. Пазнаёмлю.

Яны пайшлі да сядзеўшай маладухі. Гэта была звычайная, досыць поўная кабеціна, з тых, якія троху рамансуюць маладымі, а потым робяцца занадта спраўнымі гаспадынямі і маткамі.

— Вось табе, Марачка, — казаў Камяловіч, паказваючы на Лебядзька, — яшчэ адзін госць.

— Язэп Лебядзёк, — прамовіў той, падаючы руку.

— Дужа прыемна, — адказала маладуха. — Уваходзьце, калі ласка, у нашую кампанію.

— Дазвольце мне перш за ўсё, хоць і спазніўшыся, прывітаць вас з шлюбам і разам з тым пажадаць вам найлепшага сямейнага шчасця.

— Дужа дзякую, — адказала яна.

У гэты момант падышла Кляра з Рабскім. Пабачыўшы Лебядзька, яна трошку пачырванела, потым усміхнулася. Лебядзёк быццам яе не прыкмеціў і не пакланіўся.

— Дабрыдзень, — казаў Рабскі, абнімаючы Лебядзька. — Але ж ты змяніўшыся… Ну, нічога, мы яшчэ пакруцімся, пагуляем… А дзе ж сваццця? Бачыў жа? — пытаў Рабскі, аглядаючыся.

Сваццця стаяла размаўляючы з маладухай.

— Паня сваццця! Бачылі гэтага пазненькага госця?

— Не ў свой час госць — горш за татарына, — сказала яна са злосцю, толькі трошку пасміхнуўшыся.

— Які шаблон! Вы ж яшчэ не бачыліся!

— Не, мы з госцям не дужа даўно бачыліся, — адказала Кляра, не рухаючыся з мейсца.

«Што-небудзь ёсць», — падумаў Рабскі.

— Тады пойдзем у мужчынскі аддзел, — сказаў ён. — Выбачайце нам, — звярнуўся Рабскі за ўсіх да кабет. — Мы на адну хвіліну.

Яны пайшлі і пачалі трактаваць Лебядзька гарэлкай.

— Што ж гэта творыцца з табой? Ты, брат, не таі. Адказвай па праўдзе. Вочы нейкія невыразныя, занадта напружаныя. Адказвай па-сяброўску.

— Абсалютна нічога… вучуся пільна.

— Не, брат, што-небудзь другое. А Кляра чаму злуецца?
— Не ведаю, браток. Жаночае сэрца — цёмны акіян.
— На. Пій яшчэ. Даганяй нас. Мы — п'яныя, а ты цвярозы. Цяжка размаўляць. Пій…
Лебядзёк хутка іх дагнаў. Ды аслабламу арганізму не трэба было шмат.
Кляра паміж тым села і пачала раздумваць.
Яна пабачыла Лебядзька занадта змяніўшымся. Ніхто другі не мог быць прычынай яго хваробы, як яна. Жаночая мяккасць і сумленне моцна загутарылі. «Ці добра я зрабіла з Лебядзьком? — падумала яна. — Не занадта па-зверску? Не… Я мусіла так зрабіць. Праўда, трошку горача… Але ж тады ўжо я не памятала… Злосць у мяне занадта вялікая… Аднак што ж? Пры чым я, калі ён мучыцца? Я ж не вінавата, што прыгожая і што ён пакахаў… Я яго кахаць не магу. Пры чым жа я, што ён захацеў жанчыны, з якой не мог мець нічога супольнага? Няхай мучаецца…»
Яна ўстала, рашуча пайшла, а ўсё ж ткі быццам нейкі чарвяк грыз яе сумленне.
Шкада ёй рабілася Лебядзька! Як паказнік благога чыну стаяў ён перад вачыма.
Яна, аднак, хутка забылася ў смеху ды скоках. Лебядзёк адышоў ад Рабскага і пачаў шукаць Кляру. Хутка ён яе пабачыў.
— Вашая дастойнасць, m-lle Кляра, — крыкнуў ён ёй моцна. — Вашая эксцэленцыя, не адмоўце…
Тая спынілася і здзіўлена паглядзела на п'яны твар крычаўшага.
Дзе-якія госці пачалі, смеючыся, глядзець на яе.
— Не адмоўце прыняць гэты допіс. Вялікую ахвяру зробіце… Дужа вялікую… Вартую трохпудовай свечкі.
Кляра хацела адысці.
— Вельміпаважаная панна Кляра. Цалкам сур'ёзна. Вам допіс. Потым я хацеў бы з вамі пагаварыць на адзіноце.
— Не, — казала яна, прыймаючы допіс. — Мы з вамі даўно ўсё сказалі. Канец. — Яна хутка пайшла ад яго.
— Дык прашчайце! Навекі! — крыкнуў Лебядзёк.
Кляра не абярнулася. Яна знікла дзесь сярод людзей.



Лебядзёк пастаяў, пастаяў на адным мейсцы, падумаў… Сумна яму чамусьці зрабілася. Яшчэ больш сумна, як было раней, гарэлка дадала яшчэ больш жалю. Ён праслязіўся.
Але потым падняў галаву і тупнуў нагой.
— Канец дык канец! — сказаў ён і без капялюха пайшоў дахаты.

## IX

Калі ён пастукаўся ў дзверы, было каля трэцяй гадзіны раніцы. Гаспадыня не хутка яму адчыніла дзверы.
— Добры вечар! — цяжка павярнуў ён языком.
— Не вечар, а ўжо пад ранак, — адцеміла гаспадыня.
— Калі ранак, дык чорт яго бяры… Хай будзе… Я змучаны… Спаць хачу…
Гаспадыня зноў зачыніла дзверы і выйшла. Ён раздзеўся. Сеў на крэсла. Падумаў троху.
Потым парыўся ў кішэні, дастаў вяроўку.
Паглядзеў на яе некалькі разоў бяссэнсава, затым прыпомніў сабе ўсё; дайшоў да ваконнага крука, перакінуў праз яго зробленую пятлю, падцягнуў крэсла. Узлез на яго. Спяшаючыся, усунуў галаву, адкінуў крэсла і павіс…
Гаспадыні ў гэты час штосьці не спалася. Нейкія сны жахлівыя сніліся, потым, узбудзіўшыся, яна бачыла проста нейкія мігаючыя цені… Правадзіўшы Лебядзька, яна доўга не магла заснуць.
Неўспадзеўкі грук ўпаўшага крэсла…
Яна хутка ўскочыла. Прыадчыніла троху дзверы — гарыць лямпа, значыць, не спіць… Рванула потым шырока іх і адкінулася назад: вісячы Лебядзёк адыходзіў у апошніх дрыганнях.
Страх абхапіў гаспадыню. Валасы паднімаліся. Пакуль адчыняла дзверы, мурашкі хадзілі па скуры. Яна на грэх не магла трапіць ключом. Нарэшце выскачыла ў калідор і не сваім голасам закрычала: «Ратуйце!..»
Суседзі збегліся, перапалохаліся, паляцелі за паліцыяй. Прыйшла паліцыя, знялі сіні труп, спісалі пратакол. Справа была зусім ясная: на стале ляжала караценькая запіска: «Прашу нікога не вініць…»

Набралася поўная хата народу. Далі ведама Рабскаму, Камяловічу, Кляры ды іншым знаёмым. Камяловіч прыехаць не мог, бо жыў за горадам. Кляра не прыйшла. Адзін толькі Рабскі з гаспадыняй рабіў усе хаўтуры. Іхнім стараннем было зроблена тое, што тутэйшы поп згадзіўся адпяваць яго. Дасталі чорную дарагую труну, добрую катафалку. Камяловіч прыслаў грошы і вянок са стужкай: «Дарагому сябру засмучаныя маладыя». Кляра прыслала таксама вянок: вялікую пальму з дзвемя даўгімі стужкамі, надпісанымі: «Толькі смерць дарує грахі і яднае сэрцы. Кляра».

На другі дзень пацягнулася жалобная працэсія з дзясяткаў двух студэнтаў і студэнтак.

Ішлі сумна, не гутарылі, не спявалі. Думалі кожны пасвойму цяжкую думу. Прыйшлі на магілкі, пачалі спускаць труну. Першы кінуў тры жмені зямлі Рабскі, за ім другія, потым труну пачалі засыпаць. Засыпалі, накапалі копчык зямлі, паставілі крыж, палажылі і павесілі на яго вянкі. Усе стаялі моўчкі.

Рабскі глухім голасам, у якім чуліся слёзы, прамовіў:

— Яшчэ адна свежая магіла.

Потым выйшаў наперад.

— Думаю сабе, — пачаў ён. — Жыў сярод нас, хадзіў, казаў часам цікавыя рэчы, а ў самога была чэрвяточына. Колькі гэтых крыжоў тут… І колькі сярод іх такіх самых маладых з чэрвяточынай, самагубцаў. Над гэтым задумацца! Сапраўды.

Ён падняў галаву.

— Самагубства разлілося шырокай хваляй па нашым краі, асабліва сярод моладзі…

Дзе ж прычына гэтага? Я думаю, не толькі ў псіхіцы людзей. Не… Шырокасць самагубства застаўляе думаць, што прычына ў цэлым укладзе жыцця. Нервовыя, чуткія асобы не зносяць уціску, цяжкіх варункаў і канчаюць з жыццём…

Як там не думаць, але ж мы — людзі — творым жыццё тут, на зямлі. Значыць, мы самі вінны ў заганах гэтых варункаў. Мы — людзі, мы — прычына смерці самагубцаў.

Яны крычаць нам сваім самагубствам: людзі, перарадзіцеся! Падумайце, куды вы йдзеце, як вы творыце сваё чалавечае жыццё…

Перарадзіцеся духова, бо не царства Божае, а проста шчасце ваша ў вас саміх ёсць.



Можа б, нават, тэарэтычна, сябры, вы спрачаліся б. Але ж вось свежая магіла хіба не крычыць нам сёння аб гэтым?

Перародзімся… А перарадзіўшыся, пакахаем перш за ўсё жыццё. Гэта праўда, не рамантызм. Тут мы ўсе занадта цвярозыя. Не рамантызм гэта, а першая патрэба для кожнага чалавека!..

Толькі тады ён будзе жыць. Інакш смерць, хутчэй усяго, самагубства… Можа, шмат ёсць людзей, якія не могуць пакахаць жыцця, але жывуць. Як ні горка, а трэба. І што ж? Сярод жудасных, чорных момантаў, сярод хмару разам прабіваецца сонца.

Так ідзе горкае з салодкім, чорнае з светлым… У гэтым жыцці…

А ёсць людзі, што, пажыўшы троху, свядома даходзяць да самагубства. Усякае самагубства ёсць «ідэйнае» адкіданне жыцця. Як бы цяжка ні жылося, а ўсё ж ткі ў чалавека ёсць пачуццё жыцця. Толькі свядомасць чалавека можа знішчыць іх і прывесці да самага рашучага канца.

Я кажу так таму, што ведаў добра Лебядзька. Магу проста зазначыць, што ён скончыў жыццё свядома, «ідэйна». Жыць няма што, калі ўжо сёння няможна нікуды ісці, калі надзея знікла… Што каханне? Яно не для мяне… А што мае пачуцці, мой розум? Драбніцы, нічога не вартыя ў абсалютным значэнні…

Выходзіць, жыць не трэба. Тут канец. Тут нейкі «ідэйны», свядомы канец.

Не, панове. Такі розум я завуаднабокім.

Такіх людзей — аднабочнікамі.

Як бы адна негатыўная палова мозга працуе ў такіх людзей. Яны бачаць толькі чорныя староны, яны аналізуюць і самааналізуюцца.

Пасля халодным розумам кажуць: тут канец!.. Выхаду няма… Значыць, смерць…

Дык вось, панове… Тут мы сярод крыжоў дадзім абяцанне, што будзем змагацца з такім песімізмам, з аднабочным жыццём, з ідэяй самагубства. Вы бачылі тут, панове, смерць, гэтую глыбокую яму з засыпаным трупам чалавека. Якім пасля гэтага чароўным ёсць жыццё…

Якімі вясёлымі музычнымі мелодыямі яно грае… Як будзіць думкі… Жыццё — гэта шматстаронны, як бы сказаць,

шматструнны акорд. Перад намі гэтулькі працы, гэтулькі заданняў… Гэтулькі будзе яшчэ цікавага, прыгожага…

Каб жыў яшчэ Лебядзёк! Але… Што рабіць? Лёс ахвяр выкупляючых просіць!..

Ён загінуў ахвярай нашых бяспросвіткаў. Спі ж, дарагі сябра! Хай будзе лёгкай табе зямля!

Ён закончыў і схіліў галаву. Слёзы выступілі на вачах. Не мог ужо выказаць таго, што адчуваў.

Ніхто болей нічога не сказаў. Усе пачалі разыходзіцца.

## X

Кляра не была на хаўтурах. Яна прыйшла позна з вяселля змучаная і зараз жа лягла ў пасцель. Хацела заснуць, але перад сном рашыла прачытаць допіс.

«Ад каго ён мог быць?» — думала яна.

Зразумела яна, што значыў нечалавечны выгляд яго, што значыла спазненне. «Але ж быць не можа, каб ён скончыў самагубствам…»

У гэтую хвіліну моцна пазванілі.

Пасля ўбегла Адэля і закрычала:

— Лебядзёк павесіўся!

— Не можа быць!!! — крыкнула Кляра і, закрыўшы твар рукой, завалілася на падушку.

«Вось дык нарабіла… Вось нягодная, — пакутавала яна і лаяла сябе. — Нягодная… Толькі нягодная… Загубіла чалавека. За нішто. Пачуцці найлепшыя абсмяяла. Праступак… Грэх…»

Яна не магла ўлежаць. Паднялася, асвяжылася, потым села на тую самую канапу, дзе сядзела з Лебядзьком.

«Няўжо я магу сабе даравацъ гэта? Ніколі. Калі толькі праўда, калі толькі ён праз мяне…

Я не дарую сабе. Няхай я яго не магла кахаць… няхай ён быў для мяне непрыгожым… Але ж ці можна было смяяцца? Так жорстка смяяцца? Яго няма… Што мне рабіць?

Якая пляма… які цяжкі ўдар… Ах ты, сэрца маё…»

Яна заплакала.

«І за што прыходзіцца мучацца… Усё каханне гэтае… Вечныя мукі, мукі…



Гэтыя мужчыны… Заўсёды яны прымусяць мучацца».

Яна абцёрла хустачкай вочы і пачала хадзіць.

«Ну і хто мне скажа, што я — нявінна? Хто дапаможа мне ў маіх муках?»

Яна, ламаючы рукі, хадзіла ад вакна да вакна.

«Яго няма… Хоць цяпер трэба ўшанаваць яго. Трэба хоць добры вянок заказаць. Жалобу надзець».

Яна паслала Адэлю заказаць вянок з вядомымі дзвюма стужкамі, а сама надзела на капялюш даўгую чорную вуаль.

«Усё мала, мала… Цяпер па часе… — думала яна. — Чаму я раней была такой? Сорам…»

Яна зноў пачала плакаць.

«Няўжо я, — ламала яна рукі, — няўжо я згубіла яго?.. Ах, хто мне дапаможа? Хто высветліць яго смерць? Хто мяне ўцешыць?.. Не, сабе гэтага я не дарую…

І чаму гэта так адразу, неспадзявана…

Было вясёла, а цяпер мукі. Няўжо я?

Не… Пайду да Рабскага… Можа, ён уцешыць…

Пэўна… Ён ведаў Лебядзька. Скажу яму па-сяброўску…»

На другі дзень пад вечар яна ішла на вёску да Рабскага.

Той здзівіўся, калі пабачыў яе ў чорнай даўгой вуалі, з сумнымі, крыху пачырванеўшымі вачамі.

— Пахвалі яго? — пытала яна, сядаючы ў крэсла.

— Пахвалі сёння…

— А я да вас у тэй самай справе… хаўтур… Вось у чым справа… — Яна дастала допіс. — Чытайце.

Рабскі здзіўлена чытаў допіс, потым з тым самым здзіўленнем паглядзеў на яе.

— Вы не разумееце, — прамовіла яна, — вам незразумела… Але бачыце, што мне цяжка. Я яго не кахала. Я не магла кахаць. Быў інцыдэнт… Ён мяне вінаваціць у сваёй смерці. Няўжо я запраўды тыгр? Няўжо я… Скажыце мне, даражэнькі, па-сяброўску… Мне занадта цяжка.

Яна заплакала.

— Я нічога пакуль што не разумею. Што сказаць?.. Не плачце, калі ласка, супакойцеся…

Яна яшчэ больш заплакала.

— Ах мне цяжка… занадта цяжка… Калі праўда, што я прычына… Я сабе гэтага не дарую. Я скончу як ён. Горш яшчэ. Скажыце мне толькі…

Слёзы не давалі ёй болей гаварыць.

Рабскі глядзеў на яе з жалем. Так непрыемна было бачыць гэту істоту такой няшчаснай, пакутуючай… Ён зрабіў бы ўсё, каб толькі не чуць болей гэтых прабіваючых душу жаночых слёз.

— Супакойцеся, даражэнькая. Супакойцеся… Трэба пагутарыць. Супакойцеся… Не нервуйцеся… Я ж яшчэ нічога не разумею. Трэба пагутарыць…

Яна пачала ўціраცца хустачкай, але ўсё не магла супакоіцца.

— Я хачу ад вас дапамогі, — пачала яна праз слёзы. — Я хачу ведаць аб яго смерці. Можа, вы ведаеце… Мне так цяжка… Няўжо ён запраўды вініць мяне?

— Даражэнькая… Раскажыце мне сваю гісторыю. Інцыдэнт. Тады я вас, можа, уцешу…

— Мне так цяжка апавядаць, — казала яна ўсё яшчэ праз слёзы. — Гэта такая сумная, хутчэй брудная гісторыя… Ён мне не падабаўся. З самага пачатку. Мы пазнаёміліся ў беларускім гуртку. І з таго часу не падабаўся. Ну, беларус, беларус… Гутару з ім… а ён так глядзіць на мяне ды ўсё кампліменты, кампліменты… Нядоўга мы там бачыліся. Але ж вы ведаеце… А потым, вось, маёўка… Мы з ім гуляем… Чаму, думаю, чалавек ўсё ходзіць за мной? Не адпушчае… Думае — так, ясна, — мець мяне сяброўкай жыцця. Я пазвала яго. Але тут вось я й вінаватая… Чаму я так хутка, жорстка зрабіла ўсё? Ён быў для мяне заўсёды такі маленькі, дробны чалавек… А я зрабіла Каінаву[9] працу.

Я ж смяялася з яго чысцейшых пачуццяў, з кахання смяялася. Я ўсё ж ткі цяпер гэткая нягодная… паскудная… — Яна зноў заплакала. — Але як я мусіла гэта зрабіць? Я не ведаю… Не магла кахаць… Занішто кахаць не… магла…

— Не плачце, супакойцеся. Ну чаго тут плакаць? Чалавек памёр невядома дзеля якой прычыны. Нават калі б праз вас… Няўжо вы будзеце плакаць? Вашыя слёзы зусім дарэмны. Супакойцеся… Чаму вы ўсё плачаце?

— Ах, няўжо вы яшчэ не ведаеце… Я ж загубіла нізашто чалавека. Абсмяяла… Я так нізка ставіла чалавека… Мне балюча… Я, можа, плачу не таму, што яго няма. Я плачу са злосці на сябе, з жалю за брыдкі пастулак. Мне цяжка… Таму мне цяжка. А можа, я й загнала яго ў труну…



Твар яе быў асунуўшымся ў гэтую мінуту. Фігурка зрабілася быццам ніжэйшай, вочы ўпалі глыбей.

Рабскі паглядзеў на яе пільна, як бы хацеў глыбока заглянуць у яе душу. Ён пачынаў ужо разумець гісторыю з Лебядзьком і бачыў яе грэх, але гэтая шчырасць плачу пераканалі яго ў яе нявіннасці, чыстаце.

— Бачыце, — пачаў ён, — па-мойму, вы ў гэтай гісторыі не вінаваты. Да вас яшчэ Лебядзёк мне казаў, што не верыць у жыццё, не хоча жыць. Рана ці позна ён скончыў бы самагубствам. Нават калі б вы яму не адмовілі, не асмяялі, а можа, выйшлі б за яго, дык і то невядома, ці згадзіўся бы ён з такім жыццём. Мне здаецца, ён усё роўна скончыў бы самагубствам. Не, не… паверце мне… Вы тут ні пры чым. Вы зусім у старане.

— Не… я — вінна, шмат у чым вінна… Смерць яго — мая маральная пляма. Што рабіць?.. Але няўжо я вінна ў яго смерці? Праўда…

— Не… не… Не вінны. Я вам раскажу крыху аб Лебядзьку…

Ён запаліў папяросу, паправіўся ў крэсле і пачаў:

— Гэта было не вельмі даўно, але цяпер здаецца далёкім мінулым. Я толькі што стаўся студэнтам і адразу трапіў у незвычайныя варункі. У гімназіі штолекцыю выклікалі, а тут ніхто, нічога… Хочаш вучыся, хочаш не… Нейкія маральныя нормы… Ну, а ведаеце, што для нашага брата мараль? Адкінуўшы на бок лекцыі, сшыткі, высокую матэрыю з абавязковым высокім «стылем», кінуліся мы з галавой у мора жыцця. Загутарылі маладыя сілы, што былі скаваны гімназіяй ды бацькамі. Мы пачалі, як пятушкі, выпушчаныя з клеткі, распрамляць крыллі.

Хто яго ведае, чым ён тады займаўся… Толькі заўсёды неяк баяўся людзей, трымаўся асобна і падняўшы горда галаву. Фізічна ён быў слабы, хваравіты, непрыгожы, і таму гэтая паднятая галава выглядала як заўсёдны вызаў другім.

«Не дзівуйцеся, — здаецца, казаў яго выгляд, — што я такі бледны, мізэрны, плебей, але я не горшы, калі не лепшы за вас».

Другія стараніліся ад яго, і ён жыў анахарэтам. Але мы сышліся з ім. Я яго пачаў цягаць у грамадзянства, і Лебядзёк мала-памалу змяніўся. Вочы яго глядзелі не так сурова ды не прылюдна, галава не выглядала так горда паднятай.

Раз мы зрабілі з ім чарговае вандраванне на вёску. Было ўжо пад вечар, калі мы папалі на дарогу паміж вялікага мяшанага лесу.

Ведаеце, такі летні, ціхі, з цудоўна жаўтавата-чырвонымі барвамі захаду…

Ідзем сабе, размаўляем. Бачым, хтось ідзе наперадзе чырвоны… Падыходзім бліжэй… відаць, кабета… ідзе шпарка, моцна, быццам ляціць…

Сустрэліся… Бачым — цыганка; такая сярэдняга ўзросту, стройная, моцная; вочы так і гараць, чорныя, як вугаль; сама румяная. Такая прыгажуха, з такімі цудоўнымі формамі цела, што я ў жыцці яшчэ не бачыў…

«Трэба спыніць», — кажу Лебядзьку. — «Трэба…» — «Куды так Бог нясе?» — пытаю. — «Сама, бачыце, іду. Ніхто не нясе…»

«Во ты, якая гордая», — думаю. Яна ідзе. Мы вярнуліся за ёй. «Пачакай, — кажам, — паваражы нам. Добра заплоцім…» — «Варажыць хочаце? Цяпер позна…» — «Ды не, не позна… Яшчэ можна… Мы ўдвая даражэй заплоцім».

Яна падышла да нас, выцягнула карты і села каля канавы. Лебядзёк сеў з аднаго боку, я з другога. «Варажы на мяне», — кажа Лебядзёк, а сам, як дзяцёнак, губу разінуўшы, глядзіць на яе.

Яна пачала варажыць… Ужо сцямнела. Пачалі пытаць яе. Даведаліся, што яна жыве тут, у бліжэйшым табары, што бацькі яе няма, што ёй дрэнна жывецца.

Пыталі яе, пыталі, нарэшце Лебядзёк як схопіць яе неўспадзеўкі — і пачаў цалаваць. Ну, што вы зробіце?.. Але ж яна, як вугар, выскачыла з яго абоймаў і выхваціла з-за пазухі нож.

«Толькі краніце…» Што вы думаеце? Лебядзёк стаў на каленькі і зложыў рукі: «Слухай, я цябе кахаю. Будзь маёй. Кінеш табар… Мы паедзем з табой у места… Будзем жыць…»

Яна схавала нож. «Не магу. Спяшаюся». — «Слухай, — кінуўся за ёй Лебядзёк. — Прыйдзі сюды заўтра. Я дам усё, што маю…» Ён выхваціў папернік з кішэні. «Не ведаю… Пабачу…» — і паляцела, як страла.

«Няма што, адбіў мне дзяўчыну. Вось і хадзі з табой», — жартаваў я. Лебядзёк маўчаў. А пасля таго яны сталі блізкімі запраўды… Праз месяцы два прыходжу да Лебядзька — і што ж вы думаеце? Знаходжу яго з пісталетам у руцэ.

«Што ты? Ці не страляцца»? — «Не», — кажа і дрыжачымі рукамі кладзе яго на стол. «Што задумаў? Няўжо жыццё замучала?» — «Ведаеш што. Са мной нядобрае… Нішто не для мяне». — «Ну што, можа, цыганка здрадзіла?» — «Ды што цыганка? Яна мяне кахае, а я яе — не… Нават цыганка цяпер нічога. Вось я сабе думаю… Добра. Я яе кахаю. Яна, можа, і не здрадзіць. Што тады? Якія перспектывы? Шлюб? Тады што? Дзеці, беганіна, турботы… Нашто мне тады яе краса? А так кахаць дык няма сэнсу… Жыццё, як паглядзіш, толькі жарт над людзьмі. Зусім не варта жыць…» Вось вам ужо самагубца. Як ёсць аднабочнік.

Ён запаліў папяросу і хвіліну замаўчаў.

— Чым жа кончылася ўсё? — зацікавілася Кляра, троху заспакоеная.

— Ах, вы хочаце канец? А канец, ведаеце, ужо мне належыць. Я ўжо гісторыю дакончыў.

— Як жа так?

— А так ужо выйшла. Прыходжу раз у той самы лес і бачу — яна сядзіць. Падышоў, гутару. «Дзе ж той… Чаму доўга не прыходзіць?» — «Яго, — кажу, — няма, болей не прыйдзе…» — «Як не прыйдзе? Зусім? — Троху пабляднела, потым пацягнулася, пазяхнула, устала. — Пойдзем, праўдзі мяне троху…» Я правёў яе. «Хочаш, каб я цябе кахала? На злосць таму буду кахаць мацней…» Абхапіла мяне сама і цалуе, цалуе… Аж непрыемна стала. З таго часу пачаў ужо я раманс. Хадзіў заўсёды да яе ў лес. Нават купіў раз для яе модную вопратку і прывёў на вечарыну.

Лебядзёк зусім замкнуўся. Нікуды не хадзіў. Нават са мной не хацеў гутарыць, чытаў толькі. Калі й пачынаў гутарку, дык толькі каб пасмяяцца: «Ну й адукаваная асоба… Звязаўся з цыганкай… Карагодзіцца і нават ніколі не падумае аб тым, чаго ўсё яно варта. Такая брыдота…»

Раз ідзём з ёй да рэчкі. Падыходзім бліжэй да моста ля самай дарогі. Ціха навокал… Толькі джурчыць вада каля камен-

ня. Цёмна. Нават мы не гутарым. Усходзім на мост. Я трошку ўперадзе, яна ззаду. Толькі знянацку трах! мяне чымсь вострым у плечы… Чую толькі смех. Яшчэ мог, абярнуўся… Яна скача з ножыкам у крыві. Я не магу стаяць… Але яшчэ гляджу… Яна раз! сябе па горле… Што было — не памятаю. Ужо збудзіўся на вёсцы ў свайго дзядзькі. Вылечылі… Толькі і цяпер яшчэ на плячох шрам. Фінал, як бачыце, зусім цыганскі.

— Ласне кажучы, я рамана тут не бачу. Мне здаецца, зместу няма, — сказала Кляра.

— Магчыма. Але гэта не важна. Важна тое, што тут фігуруе Лебядзёк. Бачыце, нават такая цыганка… яго не здаволіла.

Ён ужо не бачыць сэнсу самага кахання. Значыць, калі б нават вы і пакахалі яго, дык ён так сама пабачыў бы, што ніякага сэнсу няма ў вашым каханні. І, я думаю, ён усё роўна скончыў бы самагубствам. Вы тут ні пры чым, паўтараю…

— Мне ўсё ж ткі… Як падумаеш, цяжка. Павесіўся як бы ўсё ж ткі праз мяне…

— Вам толькі здаецца. А самая прычына смерці, можа, значна глыбей. Цяжка, безумоўна, у гэтым разабрацца. Але мне здаецца, ён не памер бы толькі ад аднаго кахання. Ён, мне здаецца, усё спаліў, што толькі было жывога, што яшчэ магло клікаць да жыцця. Усё было падведзена пад адзін паказнік, усё скасавана яго розумам. Такі розум і прывёў яго да лагічнага канца.

Я яго заву аднабочнікам. Але мне здаецца, што тыя людзі, якія жывуць яшчэ, ёсць таксама аднабочнікі. Усё жыццё гэтакіх людзей выходзіць толькі з аднаго боку. Вазьміце вось у грунце рэчаў Камяловіча. Параўнайце з ім Лебядзька. Як яны падобны ў гэтай аднабокасці. Адзін жыве толькі брухам. Другі — толькі кнігамі, думкамі, значыць, духам. Адзін толькі эгаіст, другі быў альтруіст. У іх няма тэй залатой сярэдзіны, якая патрэбна кожнаму чалавеку: падзелу працы паміж брухам і духам. Праўда, ёсць і рожніца. Лебядзёк, напрыклад, ужо дайшоў да лагічнага канца. Ён, можа, і натура лепшая, можа, толькі варункі такія спляліся, ці што… Але Камяловіч не можа дайсці да гэтага канца. Ён ужо страціў чалавечы твар. У будучыне ён такім і застанецца. Можа, зробіцца, праўда, капіталістам, пасля дойдзе да песімізму, ну, павесіцца-то ён не павесіцца, бо занадта кахае сваё бруха, але застанецца такім



самым… як бы сказаць… вечным самагубцам, аднабочнікам. Тут канца няма.

— Што мне Камяловіч, — сказала Кляра, амаль зусім заспакоеная. — Мне не важны вашыя параўнанні іх. Мне важна толькі тое, што я ўсё-ткі не прычына яго смерці. Можа, толькі бочная… Мне значна лягчэй.

Троху ўцешыў. Але я ўсё ж ткі мушу налажыць на сябе пакуту. Немагчыма зацерці ўсё. Я не магу другі раз смяяцца з чалавека, з душы яго. Як мне жаль Лебядзька! Што значыць гэта смерць? Так сумна цяпер… так страшна.

— З той ці другой прычыны яго няма. А пасля мы. Не кінем пасля сябе нічога. І з нас будзе смяяцца новае жыццё, як і з яго. І мы таксама забудзем сваё вяселле, гульні, будзем ляжаць там… на дне…

— Не… гэта страшна… сумна!..

— Нічога няма страшнага. Мы ўсе памром. Але ж затое трэба жыць так, каб не жаль было памерці. Жыць прыгожа, са зместам. Вось дзе мэта чалавека. Пражыць так, каб спаліць усё, каб усе сказалі: тут скончылася прыгожае жыццё. Што тады смерць… зусім нічога страшнога.

— Вы мяне ўсё супакаіваеце… — усміхнулася яна. — Дзякую вам… дзякую… Мне цяпер ужо лягчэй. Сумленне маё троху заспакоілі. Не маю хоць на сабе плямы смерці чалавека. Я магу ўжо пажалець яго як чалавека, як беларуса…

— Жалець? Ну, жалець усё ж ткі трэба. Усё ж людзі, былі так блізка каля нас, жылі, а цяпер іх няма… Але што ж… адышлі, Бог з імі… Думаецца, гэта апошнія людзі-самагубцы. Я пэўны, што сярод нас іх не будзе. Мне нават здаецца, што мы, беларусы, у працэсе страшэннай, напружанай барацьбы за наш нацыянальна-культурны дабрабыт вытварым моцную, здаровую нацыю.

У гэтым працэсе, пад вечныя пераразвоны змагання, пад крыкі падымаючыхся мільёнаў, пад радасным сонцам уласнай культуры знікне ўсё пакаленне песімістаў, аднабочнікаў, а выгартуюцца жалезна здаровыя, нацыянальна свядомыя беларусы.

Тады пералівамі чароўных фарб заіграе наша зямля. Так веру…

Ён падышоў да яе.

— Не будзем думаць аб тым, што было, аб смерці… Паўтараю: калі хочаце быць чалавекам, жывіце прыгожа. Калі б вы былі радасцю, падпорай другому ў жыцці і аднэй з матак новага, моцнага пакалення — вы б маглі сказаць, што жылі на зямлі…

Кляра не знайшлася што-небудзь адказаць. Яна была зварушана. У сэрцы яе пасля такіх слёз стала так свежа — так добра бывае толькі ў паветры пасля дажджу, калі вясёла смяецца сонца. Нічога не кажучы, яна глядзела на яго ўдзячнымі, блішчэўшымі ад радасных слязінак вачамі і толькі сціскала руку…

Рабскі, праводзячы яе, выйшаў на ганак.

— Выбачайце,— казала яна, стоячы ўжо на вузенькай дарозе, — за турбаванне вас… за слёзы гэтыя… Ведаеце, усё жаночая слабасць. Да пабачэння…

Яна павярнулася і пайшла.

— Не плачце ж болей… Да пабачэння, — крыкнуў ёй Рабскі ўслед.

Кляра абярнулася, усміхнулася і хутка схавалася за пыгоркам.

Праз тры месяцы Кляра стала паняй Рабскай.

## ПЕСНЯ ГЛАДЫЯТАРАЎ

Шуміць шырокі свет — амфітэатр і рассцілаецца жыццё — бязмежная арэна.

Яшчэ да нас шумелі тут накормленыя тоўпы і смерць табацькоў віталі воплескаў грамамі. Яшчэ да нас вялікі Цэзар неба стварыў шырокі свет свой — Калізей[1] і ўсё жыццё прымусіў нас гуляць, каб мы памерлі на вачох Яго, жорсткіх і сцюдзёных.

Мы засуджоныя на смерць яшчэ як толькі выйшлі на арэну цырка.

Выходзім мы штодня і адыходзім зноў, а Цэзар з неба ў ложы дзіўнай з сваёй абласканай таўпою харашух, з усмешкай пазірае зорамі вачоў, сцюдзёных і бясчулых.



Калі мы адыдзем і трупы нашы ў spolarium[2] пацягнуць, — на мейсца нашае ізноў прыйдуць з мячамі пацяшаць таўпу ў высокім небе, бо так жадае вялікі Цэзар неба, стварыўшы свой шырокі Калізей.

І мы памром усе на цыркавой арэне.

Мы гладыятары, і засуджоныя на смерць.

Адны з нас будуць пацяшаць нябесную таўпу змаганнем толькі за кавалак хлеба, другія без аружжа бойку распачнуць і тоўстымі рукамі здушаць больш бязвольных, худакроўных — і толькі частка нас пачне гуляць з мячамі і сеткай моцнаю аблытваць разбітых злоснікаў сваіх.

І ўсё ж мы ўсе памром на цыркавой арэне.

Што значыць смерць? Мы толькі выйшлі на арэну цырка — і нас вітаў народ, і вочы, як мільёны зор, паліліся ў амфітэатры, ўжо там бялела смерць з сваім вянцом і нам паветраныя слала пацалункі. А потым жа, калі жыццё сваё кідалі мы, як мячык, і цяжкімі мячамі пралівалі кроў, яна смяялася нам радаснай таўпой і нам вянок свой прынасіла.

І надзявалі нам на грудзі слаўныя таблічкі і медалі.

І так ужо з жыццём вучыліся кахаць мы смерці твар спакойны, ціхі.

Яна, праўдзівая, ўсіх роўна цалавала і ўсім аднолькава лілею белую нясла.

Мы ведаем яе, і нам прыемны твар яе праўдзівы…

Мы засуджоныя гуляць на цыркавой арэне.

Штодня падходзяць новыя і новыя грамады пакаленняў, і кожная вітае Неба песняю аднэй:

Ave, Caesar, morituri te salutant!

Цябе, о Цэзару, мы, засуджоныя на смерць, вітаем! Табою створаны шырокі Калізей — амфітэатр вялікі — і мы, прыйшоўшыя сюды тугу Тваю сваёй крывёй і мукамі сваімі развесці, змагацца толькі ў парах дзеля Твае пацехі і ўсіх Табой абласканых святых.

Мы, засуджоныя на смерць, Цябе вітаем!

Адны ўсё будуць прыкаваны да сваіх турэмных кратаў і ніколі не пабачуць свету, разводзячы далей нашчадкаў, яны не адыдуць ад інтарэсаў дробных і штодзённых; другія будуць саладзіцца ласкаю Тваёю і цела сытае пясціць пачнуць…

І толькі мы ўсе самахвотна выйдзем на арэну ў парах і, падышоўшы да Твае прыгожай ложы, крыкнем моцна:

— Мы — гладыятары, мы — сіла! Што значыць нашае жыццё?

Мы паміраем на арэне цырку… Калі апошнім цуркам кроў залье пясок арэны і зручна сеткай злоснік абаўе, і свой трызубец не адыйме і сціснe грудзі цяжкаю нагой у знак канца і перамогі, — мы не спужаемся ні воплескаў грамоў, ні шуму, ні крыкаў Неба.

Няхай прыстане ўся таўпа, няхай Нябесны Цэзар сам устане з ложы, няхай іскрацца вочкі харашух і ўсіх нявольнікаў, засуджаных на смерць, няхай дрыжыць магутна цырк:

— Дабі яго!

Мы не папросім у накормленай таўпы свайго ратунку.

І не сказаўшы ўжо нікому ціхага, апошняга «даруй», памром спакойна ў цырку на арэне…

Яшчэ апошні раз маланкай праляціць мінулае жыццё, далёкі край, сцяны і хаткі і тыя ўсе, што будуць нас чакаць дарэмна, ўвесь той край, дзе ўсё мы пахавалі, — і ужо ўвесь мільгануўшы бліск пагасне ў тумане страшэнным, цёмным…

Дык што тады для нас жыццё — драбніца, гора, турмы?..

Мы, засуджоныя на смерць, жыццём сваім гуляем…

Мы не пужаемся ні Цэзара, ні тых сцюдзёных зор — вачоў Яго святых, што так бясчула мукі нашы ловяць і дзеля пацехі выпускаюць на арэну цырка; мы ведаем, што толькі нашыя мячы — ўся сіла свету!

І дзеля гэтага няхай яшчэ ўжо засуджоныя на смерць сумяцца, плачуць…

Няхай шуміць на небе Цэзар у кругу прыдворных, — мы любім толькі звон мячоў і хочам буры, калі і скрып касцей, і енкі злоснікаў нясуцца паўнагучнаю каскадай, калі цурчыць вадаграем кроў!..

Жыццё — бязменная, шырокая арэна, і мы, грачы, пяём, збіраемся зайграць на дзіўных арфах бойкі; акорды смерці кінем мы ў сімфонію жыцця і крыкнем свету, ўсім засуджаным на смерць:

— Мы, гладыятары, жыццём сваім гуляем!..

Мы творым толькі ў барацьбе ўсю Славу Калізея — свету!



Мы вучым вас прыгожа паміраць, бо мы і так памром! Мы — ўсе памром на цыркавой арэне…

## АБ ПРАФЕСІЙНЫХ ШКОЛАХ

Школа ніколі не была нейкай замкнутай установай, далёкай ад жыцця і яго вымог.

Развіццё школы ішло не толькі разам з развіццём навуковых ідэй — з ростам педагогікі і псіхалогіі, — але разам з тым і з ростам сацыяльных патрэб рожных сацыяльных груп. Гісторыя школы і гісторыя педагогікі — гэта гісторыя змен сацыяльнага твару людскасці, гэта гісторыя змен рожных людскіх патрэб, сацыяльных і эканамічных… Кожнае пакаленне і кожны век ставіў школе новыя заданні, і кожны народ хацеў бачыць у школе тую кузню, якая выкоўвае патрэбных, карысных яму людзей.

І калі 19-ты век, шоўшы пад гегемоніяй дваранска-арыстакратычных класаў, вымагаў школ пасіўных, калі так можна выказацца, школ, якія рыхтавалі б паслухмяных бюракратаў, дык наш дэмакратычны 20-ты век вымагае школы актыўнай.

20-ты век пачаўся і ідзе пад сцягам працоўнай школы. З аднаго боку, вывады тэарэтычнай і эксперыментальнай псіхалогіі высунулі прынцып актыўнасці, самадзейнасці, самапрацы як найлепшы метад навучання. З другога боку, вырасшая і стаўшая вельмі складанай інтэнсіўнасць жыцця, складанасць сацыяльных праблем, рост прафесійнай канкурэнцыі вымагалі працоўнай і прафесійнай школы.

І якраз першыя працоўныя школы адчыняюцца там, дзе рост прамысловасці патрабуе спецыялістаў-прафесіяналаў: у Аўстрыі і ў Нямеччыне. Нямеччына пакрываецца цэлай сеткай прафесійных школ, і такія школы, як, напрыклад, школы Кіршэнштэйнера[1], даюць першапачатковую прафесійную адукацыю. Амерыканскія школы, зусім далёкія ад школ еўрапейскіх, праўда, не вузкапрафесійныя, але пабудаваныя на працоўным прынцыпе. Такія самыя школы пачынаюць расці ў Бельгіі, Францыі і ў іншых еўрапейскіх дзяржавах.

Пачынаецца рост новых працоўных і прафесійных школ, паступова, крок за крокам выцясняючых старыя школы і старыя метады педагогаў.

Што датычыць Латвіі, дык трэба сказаць, што ў ёй зроблена мала яшчэ для таго, каб школы зрабіць працоўнымі. Праўда, на старонках латышскіх газет і латышскіх педагагічных часопісаў усё часцей і часцей раздаюцца галасы за новую школу.

І шмат у якіх латышскіх школах, у вучыцельскіх інстытутах уводзяцца новыя метады працы. Ставяцца на грамадскую крытыку рэформы аб сярэдняй школе, якая дае дагэтуль сваім выхаванцам не практычныя жыццёвыя веды, а словы, словы і словы… Таксама ў праграмы латвійскіх пачатковых школ уведзены, напрыклад, ручная праца, маляванне, лепка — як дань новаму часу. Але ўсё ж мы яшчэ стаім далёка ад уцелаішчання працоўнай школы.

У апошнім праграма пачатковых школ нагадвае праграмы старых школ, дзе часта праграмы не звязаны з жыццём, дзе ёсць прадметы, даючыя вучню адны словы і словы, як, напрыклад, сучасныя праграмы гісторыі. Наогул, мне здаецца, не лішне мімаходам зазначыць, што наша школа перагружана сваёй праграмай. І таму не дзіва, што сярод бацькоў вучняў расце незадаваленне сучаснай школай; незадаваленне таму, што школа не адпавядае растучаму імкненню бацькоў да практычных і прафесійных ведаў.

Рост прафесійных школ у Латвіі, за апошнія часы так званых «arodu skola», паказвае растучую патрэбу ў іх, а значыць, паказвае і тыя шляхі, па якіх павінна ісці развіццё школы.

Але калі гэта так, калі школа ў Латвіі хоча стаць не толькі працоўнай, але працоўна-прафесійнай, калі жыхар Латвіі, маючы 40–50 га зямлі, у трывозе за сваю будучыню пасылае сына вучыцца якому-небудзь рамяству ў места, — дык што тады можна сказаць пра беднага селяніна Латгаліі[2], у якога ёсць не больш якіх-небудзь 10 га пяску, на якім павінна пракарміцца 5–6 душ?..

Ён не мае магчымасці вучыць свайго сына нават да 3-га класа пачатковай школы, бо мусіць пасля двух гадоў навукі ў школе аддаць сына вучыцца да якога-небудзь майстры: каваля, слёсара ці сталяра. Нягледзячы ні на якія законы аб абавязковым навучанні, кожны год па-за межамі школы застаецца



больш 50 % дзяцей. Інакш выглядала б справа, калі б у гэтых латгальскіх раёнах была прафесійная пачатковая школа.

Такім чынам, пытанне аб прафесійных школах у Латгаліі з'яўляецца асабліва вострым і жыццёва неабходным. І асабліва, трэба сказаць, вострым і балючым яно з'яўляецца для нас, беларусаў.

Калі мы хочам, каб нашыя школы развіваліся, каб яны маглі выконваць тую ролю ў асвеце народу, якая ім прызначана, нам трэба сабраць зараз усе высілкі ўсіх беларускіх вучыцялёў, без розніцы палітычных перакананняў, у адзіную моц, накіраваную на тое, каб пératварыць нашыя школы ў прафесійныя. Я бы стаў нават на крайні пункт погляду: толькі прафесійныя.

Зразумела, што нічога не робіцца адразу.

І самы пераход сучасных школ у прафесійныя можа ісці паступова.

Спачатку сучасным школам, на мой погляд, трэба было б надаваць усё больш прафесійны нахіл, на вёсках, напрыклад, сельскагаспадарча-рамесніцкі. А потым, па меры таго, як само вучыцельства набывала б пэўныя рамесніцка-прафесійныя веды, можна было б усё болей і болей пашыраць працу, ствараць пры школах цэлыя рамесніцкія аддзелы.

Мне не хацелася бы на старонках гэтага часопіса вырашаць усе дэталі тэхнікі пераходу сучасных школ у прафесійныя. Гэта справа ўсіх беларускіх вучыцялёў і ў першую чаргу справа нашага Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы[3].

Мне хацелася б толькі ў прынцыпе закрануць гэтае балючае, на мой погляд, наспеўшае, жыццёвае пытанне аб нашых прафесійных школах. І мне хацелася б, каб нашыя вучыцялі як мага хутчэй пачалі абгаворванне памянёнай тэмы.

Не толькі, паўтараю, тэарэтычна-педагагічныя праблемы вымагаюць ад нас новых метадаў, новай працоўнай школы, але, болей таго, само жыццё вымагае новай школы, працоўна-прафесійнага напрамку. Перад намі ўстае велізарная адказнасць. Кожны год кожнага з нас пытаюць бацькі, куды аддаць сына ці дачку, якому рамяству вучыцца, кожны год мы бачым, што аднаго-двух, а часам і болей вучняў старэйшых, 3–4-га класаў не хапае… Яго схапіла сваімі лапамі жыццё і не дае яму магчымасці вучыцца далей у школе. А потым тыя — найбольш, магчыма, упартыя і шчаслівыя, — якія нават дабіраюцца да

шостых класаў і канчаюць пачатковыя школы, перад якімі страшнымі пытаннямі стаяць яны, калі з пабялелым тварам пытаюць: куды ісці, як жыць?..

Мы самі часта бярэм на сябе адказнасць, калі «радзім» бацькам і вучням ісці туды вось і туды. Мы на вёсцы часта самі выконваем абавязкі інстытутаў па доследу дзіцячай псіхікі, якія існуюць у некаторых мястох. І безумоўна, было б не лішнім завесці і нам такую сістэму азнаямлення дзяцей і бацькоў (я думаю, і вучцялёў) з рамёствамі, як гэта практыкуецца ў Бельгіі.

Там, напрыклад, ужо ў чацвёртых класах пачатковых школ выкладаюць лекцыі па выбары і тлумачэнні прафесіі: раз у нядзелю з'яўляецца рамеснік і дэманструе сваю працу, якасць рамяства, апрацаваны матэрыял, знаёміць з усімі інструментамі працы, дабытымі, выпрабленымі прадуктамі, нарэшце, тым цяжарам працы, якая адбіваецца на чалавечай псіхіцы, яго інтэлігентнасці ці сацыяльным жыцці. Ён таксама зазначае, якія школьныя веды патрэбны для гэтага рамяства і ў якім узросце можна было б гэтую працу пачаць. Рамеснік паказвае таксама час навукі і тыя дапамогі, якія патрэбны, каб рамяству вывучыцца. Не запамятоўваюцца таксама прафесійныя хваробы ці няшчасныя выпадкі на працы. Зазначае, апрача гэтага, ці гэтая галіна прамысловасці і рамесніцтва развіваецца, ці не, які яго экспарт.

Карацей кажучы, ужо пачынаючы з 4-га класа ў Бельгіі даецца ўсебаковае азнаямленне з рамесніцтвам.

Зразумела, скажуць, што магчыма ў Бельгіі, немагчыма пры нашых абставінах, але, мне здаецца, пры нашым добрым жаданні і ў нас магчыма выканаць хоць некаторыя пункты з заходнееўрапейскай праграмы рамесніцкага навучання.

Канчаючы і рэзюмуючы свой караценькі нарыс, скажу адно: хай вырашаюць тэхнічныя пытанні тыя, хто можа ці хто павінен вырашаць.

Я толькі бачу будучае беларускай школы ў Латвіі ў тым, што яна стане прафесійнай. Або ў яе не будзе ніякай будучыні.

Толькі як прафесійная яна разаб'е ўсе нягодныя высілкі тых ворагаў, якія збіраюцца яе пахаваць ці насыпаць на яе бугор зямлі. У рэшце рэшт, нам не патрэбна за ўсялякую цану школа ў кожнай вёсцы. Будзем біць на тое, што не колькасць грае ролю, а якасць.



Толькі якасцю, толькі пастаноўкай навучання ў сваіх школах, толькі вялізарнай самаахвярнасцю вучцялёў, ідучых на здабыццё адукацыі і самаадукацыі, мы — пераможам.

Скажуць, зноў самаахвярнасць!

Колькі рук ужо апусцілася перад тым маўклівым сфінксам, якім з'яўляецца народ.

Што зробіш? Я ўспамінаю словы аднаго селяніна, якому я казаў, што народ не разумее таго добрага, што яму робяць, не разумее тых, якія ідуць да яго з адчыненым сэрцам.

«Не, — сказаў ён, — каб жа ж усе ішлі гэтак шчыра ў народ… Вы не думайце. Мы б яго хутка зразумелі…»

Я думаю, усё ж ён быў правы.

*1929, вёска Плейкі*

## ЛЕСНІКОВА СЕНА

Цяпер я не магу ўспамінаць гэтага без смеху, але тады мне было зусім не смешна.

Я толькі што перайшоў літоўскую граніцу. Памятаю, што бабуля, якая мяне перавяла акопамі праз самыя страшныя мейсцы і якая мне дала на дарогу добрую порцыю хлеба з маслам, пры расставанні сказала:

— Ну, далей я не пайду! Тут ужо латышы. Яны могуць мяне злавіць. Ідзі — вось гэтай дарогай, проста, нікуды не зварочваючы.

Яна паказала пры гэтым рукой па роўнай дарозе, выхадзіўшай з лесу ў адкрытае поле.

— Так гэта ўжо Латвія? — спытаў я ў надзвычайным здзіўленні.

Мне маляваліся надзвычайныя эпізоды — пагоня, пабег, стрэлы… І раптам зусім проста — быццам з мяжы аднаго поля пераходзячы на мяжу другога — я перайшоў граніцу. Мне хацелася расцалаваць ад радасці бабулю, але пакуль я агледзеўся, яна была ўжо далёка ад мяне. Толькі вецер развіваў канцы яе хусткі ды фалды спадніцы, нагадваючы нейкую гераіню рамантычнай фільмы.

Я спакойна адпачнуў і пайшоў. Праз які час зблудзіў, ледзь не наткнуўся на прахадзіўшага полем, з патупленай у зямлю

галавой, літоўскага пагранічніка, але нейкім цудам захаваўся за сасну і застаўся незаўважаным. Потым чуў у лесе нейкія выстралы — не то палявання, не то пагранічнай варты, — уцякаў. І вось, нарэшце, выйшаў на велічэзны гасцінец, што вядзе ў мой родны Дзвінск.

Я свабодна ўздыхнуў. Так вось яна, мая Бацькаўшчына, дзе калісьці ўсё пенілася, іскрылася ўсімі фарбамі вясёлкі, дзе прайшло (болей, чым мінуўшы — забыты час!) маё мілае, светлае plusquamperfectum[1]. І ўсё ж ткі цяпер Бацькаўшчына не тая, і я не той: няма пражытых гадоў, зламаных і знішчаных сіл.

Пакуль я так, поўны лірыкі, сядзеў на беразе дарогі, звесіўшы ногі ў канаву, калі гляну — што за ліха! — ляціць проста на мяне з усёй сілы падвода. На падводзе відаць некалькі чалавек, не інакш як мяне забіраць. «Што ж? — думаю, — уцякаць няма куды. Пайду смела наперад!» А ў галаве ўжо заскакалі магчымыя тлумачэнні, чаму я апынуўся ў гэтай пагранічнай паласе.

Пад'язджае падвода бліжэй, яшчэ бліжэй. У мяне сэрца замёрла — нават чую, што не б'ецца. Вось ужо ногі не магу падняць, язык адымае, горла сохне. Ну, думаю, вось і перайшоў граніцу!

Раптам падвода раўняецца са мной, і барадаты стараверы, кіруючы канём, крычыць:

— А, маладзец, чакай мяне на адваротным шляху!

І падвода пакаціла далей. Я нават людзей не паспеў разглядзець.

Іду далей, лаю сябе за трусасць, плююся на ўсе бакі дарогі ды лаю не ў час вясёла праглянуўшае сонца. Ісці стала зусім немагчыма, не тое што зранняя, калі дождж ліў як з вядра і ўсе пагранічнікі пахаваліся.

Іду. Да Дзвінска яшчэ далёка. Каб было весялей, лічу белыя камяні, пастаўленыя па баках гасцінца. Раптам чую, нехта едзе за мной. Аглядаюся — тая самая падвода, якую я спаткаў раней. Едзе адзін.

— Ну, паедзем? — пытае мяне той самы барадаты стараверы.

— Паедзем, калі падвязеш! — адказваю я.

— Ну так колькі дасі? — пытае ён зноў мяне.



Пачалі таргавацца. Я толькі тое і казаў, што хвост яго каню не адваліцца, калі ён мяне падвязе, бо ўсё ж роўна ён едзе паражняком. Ён, нарэшце, сцебануў па кані і паехаў.

Усе магчымыя і немагчымыя праклёцці сыпаў я на яго галаву, бо адчуваў, што ў мяне ўжо пяткі баляць і мускулы на нагах нацягнуліся да таго, што я хутка зусім не змагу ісці. Ну, усё роўна… Іду, поўны гневу на род людскі, і філасофскі разважаю, што чалавек — самая жорсткая жывёла. Ніколі ён лепш сябе не адчувае, як у часы інквізіцый, жорсткіх войнаў, жахлівага тэрору. Іду, а ў душы ўстае нота з «Дэмана»: «Пракляты свет, ганебны свет!»

Раптам — гляджу і не веру. Стараверы спыніў каня і чакае. Я іду міма, пэўны, што не мяне.

— Ну, сядай ужо! Так і быць — падвязу! — кажа ён знянацку.

Я быў проста збіты гэтым. Ну, думаю, усё ж ткі чалавек не такі дрэнны. Відаць — добрае сэрца. Не, свет зусім не такі дрэнны!

Едзем. Я пытаю, каго ён адвазіў. Ён кажа, што жыдкоў на кірмаш у Літву. Яны едуць туды кожную нядзелю. Пад'язджаем далей. Насустрач нам паўзе воз з сенам. Велізарны воз, а наперадзе вядзе каня нейкі худы высокі чалавек у форме лесніка. Баба сядзіць на возе і трымае лейцы. Мы хутка праехалі міма яго і праз нейкі час аказаліся ўжо ў значнай ад яго адлегласці. Гляджу, мой фурман спыняецца, выскоквае з возу і давай накладваць сена, толькі што пакошанае і ляжачае на краю дарогі для прасушкі, — у свой воз.

Убачыўшы, што мой прыяцель працуе, я адчуваю, што мне нязручна сядзець у гэты час на калёсах. Я саскакваю і, поўны ўдзячнасці да гэтага добрага чалавека, падвёзшага мяне, стараюся пакласці паболей ахапак сена на воз ды мяркую, каб кожная ахапка была як мага больш.

— Годзі! — кажа фурман.

У гэты час аглядаецца далёка ўжо ад нас ад'ехаўшы ляснік.

— Дзяржы іх! — крычыць ён. — Дзяржы! — І сам ляціць да нас.

Мой фурман сядае на каня і ўва ўвесь дух ляціць па гасцінцы. Ясна, што лесніку нас не дагнаць. Наперадзе не відаць

ні жывой душы. Мне робіцца смешна. Я сабе думаю: «Не зловіш! Насып каню солі на хвост!»

Тым часам на небасхіле паказваюцца дзве мужчынскія постаці, нешта нясучыя ў руках. Ляснік ува ўсё горла крычыць:

— Дзяржы іх! Дзяржы іх!

«Здаровыя лёгкія, — думаю, — у гэтага лесніка! Крычыць — аж за тры вярсты чуваць!» І зноў мне робіцца смешна. Я пэўны, што тыя мужчыны, якія ідуць нам насустрач, нас чапаць не будуць. Якая ім справа да нас!

Між тым дзве постаці ўжо набліжаюцца. Я бачу, што абедзве яны абцэпленыя фарбамі ды вапнай, з вёдрамі і пэндзлямі ў руках, — пэўна, маляры. Ляснік ужо не ляціць, а ідзе звычайным крокам. І вось разам: «Стой!» — маляры схапілі каня за морду і не пушчаюць.

Мне здавалася, што мой фурман зробіць нешта энергійнае, а потым — па каню! — і толькі нас бачылі. А ён сядзіць спакойна і чакае, пакуль падляціць ляснік.

— Ну, дзеля якога ражна вы затрымалі нас? — кажу я. — Якая карысць вам ад гэтага?

— А мы працуем у гэтага лесніка. Не можам! — адказваюць яны.

Здзіўлены, знішчаны ўсёй выпадковасцяй трапіўшагася, я таксама сяджу на крадзеным сене і чакаю лесніка.

— А, вам сена красці! Казённае сена, злодзеі! — закрычаў на нас ляснік. — Сядайце, хлопцы, павязём іх да дарожнага майстры.

Муляры з леснікам ускочылі ў калёсы, пацiснулі мяне як трэба быць, і мы ўсе пяцёра паехалі на суд гэтага вялікага чалавека, дарожнага майстры!

Я ўсю дарогу маўчаў. Толькі мне было неяк дзіўна, што ляснік усё нешта шаптаўся з старавeрам і потым усё скоса паглядваў на мяне.

Пад'ехалі да мураванага доміку. Навокал — сад, далей відаць засеянае поле, наагул чалавек жыве панам. Ляснік выскоквае і падымаецца па дарожцы. Насустрач яму выходзіць здаровы, тоўсты, сярэдняга росту мужчына з тыпічным тварам дзясятніка, а за ім выскоквае ўся яго дзетвара і, перавальваючыся з аднаго тоўстага боку на другі, як качка, выплывае жонка.



Ляснік зрабіў начальству нейкі даклад.

— А! так вы, так! Значыць, казённае сена красці?! Ды вы ведаеце, што вам за гэта будзе?

— Пан майстар! — кажа старавер, паказваючы на мяне. — Гэта не я, гэта — ён!

— А! так гэта ты, злодзей! Сёння сена ўкраў, а заўтра каня ў мяне ўкрадзеш!

Мяне забрала злосць. Я не мог выцерпець асабліва таго, што фурман мог сказаць такую брахню. Фактычна, навошта мне сена, калі ў мяне ні каня няма, нічога. Калі б мяне мой фурман папярэдзіў, што гэта сена казённае, ды калі б ён сам не браў яго, дык я ніколі б і не падумаў аб гэтым сене. Замеcта таго, каб адразу апраўдвацца, я проста пачаў грубіяніць майстру.

— Прашу не крычэць! — сказаў я. — Я не такіх бачыў, як вы, дый то!..

— А, то ты так! Камуніст, сукін сын! — крыкнуў ён на мяне.

Мяне быццам выцялі кнутом па твары. Так вось куды справа зайшла з-за простае ахапкі сена! Я зразумеў у адну мінуту сваё становішча. Усе прысутныя былі процiў мяне.

Фурман, я цяпер толькі дагадаўся, шэптам нагаворваў лесніку аб тым, што бачыў мяне каля мяжы і што я, пэўна ж, камуністы. Ён выгарадзіў гэтым сябе са справы з сенам. Уся сіла абвінавачання падала на мяне. А дакументаў у мяне не было ніякіх, апрача некалькіх літоўскіх пасведчанняў. Чым я мог давесці гэтым людзям, што я не камуністы?

І наколькі я раней смяяўся з усяго гэтага як з вясёлага здарэння пасля пераходу граніцы, настолькі цяпер зразумеў усю сур'ёзнасць свайго становішча. Сэрца маё ўпала. «Вось і перайшоў граніцу!» — мільганула іскрай у маім мазгу. А воддаль так прывабна, так прыгожа паднімаліся будынкі і бліщэлі цэрквы даўночаканага Дзвінску.

Я замаўчаў. Я кінуў некалькі поглядаў на жонку майстра і на яго дзяцей, і мне чамусьці падумалася: «Вось жа які зусім мірны, здаецца, чалавек, і жонка, і дзеці, а не — глядзі! так і хоча другога ўтапіць». Зноў успаміналася лацінская пагаворка: «Чалавек чалавеку — воўк ёсць».

Леснікова ж жонка стаяла нахмурыўшы чало і, здаецца, гатова была мяне пабіць.

— Адвесці яго ў паліцыю! — загадаў майстра.

— Трэба яго звязаць, а то ўцячэ, сукін сын! — сказаў мой фурман. Ён цяпер стараўся быць паслушным і ад радасці, што запамяталі пра яго злачынства, стараўся нават папярэдзіць усіх. Ён парыўся ў сваіх калёсах, але, на маё шчасце, вяроўкі не знайшоў.

Не ведаю, ці майстра не хацеў ісці сам дахаты, ці спадзяваўся, што я і так не ўцяку, толькі ён загадаў:

— Ды вязеце так! Годзе вам вазіцца з ім. Хутчэй, а то ўжо вечар!

Худы ляснік і барадаты старавер селі ў калёсы, пасадзіўшы мяне паміж сябе, і мы ўва ўвесь пыл паляцелі па гасцінцы. Майстра і муляры доўга глядзелі нам услед, пакуль мы не зніклі з іх вачэй.

І вось мы на Грыве. Шырокая Дзвіна вабіць мяне, хутка мы пад’едзем да перавозу. Я ведаю гэта мейсца. Вось бы лодка! Тады Дзвіна — найлепшы абаронца. Ляснік і фурман закурылі. Фурман усю дарогу маўчаў, і толькі збоку я бачыў, як ён усміхаўся ў сваю бараду. Ляснік перагнуўся зусім праз калёсы да фурмана дастаць агню.

У гэты момант я скочыў з калёс. Мінута — і я быў бы вольны. Але барадаты фурман неяк спрытна паспеў схапіць мяне за руку, ляснік апамятаўся і зноў уваліў мяне ў калёсы.

І так я ўсё ж ткі, з-за сена, апынуўся ў паліцыі.

Знялі допыт. Пасадзілі ў студзёную. І доўга яшчэ прымусілі пакутаваць мяне за пераход граніцы. А ўсяму віной была толькі маленькая ахапка сена.

Ну, што вы цяпер на гэта скажаце?

*1928 г., Інчукалн, санаторыя*



# РОДЖАНЫЯ ПАД САТУРНАМ



Раман

# КВАДРА ПЕРШАЯ

Все на свете, все на свете знают:
Счастья нет.
И который раз в руках сжимают
Пистолет!
И который раз, смеясь и плача,
Вновь живут!
День — как день; ведь решена задача:
*Все умрут*.
***А. Блок***

1

Дробны дождж выбіваў на стрэхах дамоў аднатонную музыку барабана. Асфальт блішчэў, як люстра, у якім адбіваліся ногі і фігуры рэдкіх прахожых. Было сумна. Слязлівая чэшская восень запанавала на вуліцах Прагі.

У гэты час ніхто не звяртаў увагі, што, хлюпаючы па мокрым асфальце дзюравымі ботамі і старонячыся ад усіх, ішоў, наставіўшы каўнер даўгаполага шыняля, высокі, худы, нязграбна складзены юнак.

Людзі знікаюць як планеты. Каму якая справа да іншых? Каму цікава запытаць шляхі іншых планетаў-людзей?

Юнак праходзіў па пустынных вуліцах, міма высокага каменнага будынка, на дзвярах якога было напісана «Беларуская грамада ў Празе»[1].

Мімаволі юнак застанавіўся каля гэтага надпісу і, нягледзячы на дождж, пачаў углядацца ў літары. Сэрца яго цікала мацней гадзінніка ў левай кішэні. Ён глядзеў на літары і думаў: «Ці магчыма? Ці магчыма шчасце?»

Ён ішоў у Беларускую грамаду даведацца, ці дадуць яму стыпендыю, і… цяпер дрыжэў ад трывогі. Ён успомніў сваё мінулае жыццё. Там так мала было шчасця, так мала сонца

сагравала і песціла яго праменнямі, што ён больш не верыў шчасцю. Ён рашыў, што ёсць пэўны закон жыцця, які кіруе людзьмі, і што гэты закон у адносінах да яго — закон няшчасця.

Як які-небудзь хімік, тэарэтычна ведаючы, што вада ёсць складнік двух газаў: кісліку і водзіку, — хоча злучыць іх разам, каб сапраўды атрымаць ваду, так гэты юнак, маючы сваю раней загатаваную тэорыю жыцця, хацеў сёння практычна праверыць тэорыю.

«Што будзе? — думаў ён, стоячы перад дзвярамі Беларускай грамады ў Празе. — Пацвердзіцца мая даўнейшая тэорыя ці не?»

І сэрца яго, беднае, маленькае чалавечае сэрца, казала: не. Няхай лепш не пацвердзіцца. Няхай лепш згіне ўся яго тэорыя, дзіцячая, гімназічная, дурная тэорыя, чым згіне стыпендыя.

Бо што азначала стыпендыя?

Ён ведаў, што не толькі ён, але яшчэ чыесьці вочы сачылі за ім з Бацькаўшчыны. Ён ведаў, што чыесьці душы, як радыёхвалі, несліся ў начным прасторы і не давалі яму спаць усю ноч: то былі душы яго бацькоў. Ён ведаў, што яны аддалі ўсё, што мелі, каб яго вывучыць, каб працягнуць яго праз гімназію, каб мазолістай рукой стварыць яму лепшае жыццё, больш культурнае і прыгожае, чым тое, у якім яны самі жылі… І цяпер стыпендыя азначала б, што гэтыя высілкі былі не дарэмныя. Але няхай! Няхай нават рушыцца маленькае шчасце, так бы мовіць, эгаістычнае, прыватнае шчасце старых. Няхай паплача маці і пакруціць вусы бацька, але ёсць яшчэ іншая бяда. Ён звязаны з грамадскімі беларускімі арганізацыямі. Дырэктар беларускай гімназіі[2], праводзячы яго ў Прагу, цалаваў яго і казаў: «Ну, вяртайцеся назад толькі прафесарам. З вас выйдзе добры прафесар…» І раптам… не будзе стыпендыі… Што тады? Ён не мог прадбачыць усіх вынікаў. Не, гэта немагчыма. Лепш аб гэтым не думаць.

Ён падняўся па каменных сходах і пастукаў у дзверы. Маленькая, поўная, з сівымі валасамі чэшка ўпусціла яго ў чыстую кухню і запытала:

— Вам — старшыню Грамады[3]? На жаль, ён хворы, ляжыць у пасцелі і не можа вас прыняць…



— Я вельмі патрабую пагутарыць з ім, — сказаў юнак. — Можа, ён удзеліць мне пару мінут. Пытанне майго жыцця і смерці…

Прыгожая пані-чэшка, спачуваючы, глянула на яго і задумалася.

— Ну, пачакайце крыху, — нарэшце прамовіла яна і ўвайшла ў бакавыя дзверы, направа ад уваходу ў пакой старшыні.

— Ваша шчасце, — сказала яна, выйшаўшы праз хвіліну. — Ён вас прыме. Заходзьце.

Хлопец увайшоў, асцярожна зачыняючы за сабой дзверы. Старшыня ляжаў на пасцелі, закутаны коўдрамі. Яго старэчы, досыць поўны твар зусім не выяўляў тае хваробы, якая чулася ў енках голасу: здавалася, ён енчыць наўмысля, у той час як твар яго свяціўся сваёй заўсёднай хітрасцю. «Можа быць, гэта дыпламатычная хвароба?» — падумаў юнак.

— А! Грамадзянін Тугоўскі! — прамовіў старшыня, выцягваючы з-пад коўдры сваю пульхлую руку. — Калі ласка, калі ласка, сядайце… Я, ведаеце, прыхварэў крыху… Сядайце, сядайце. Там, — працягваў ён, — з Бацькаўшчыны нават пішуць пра вас. Дырэктар вашае гімназіі прысылае мне сярдзітыя паперы з рознымі пратэстамі. Патрабуе, каб мы вас улаштавалі на стыпендыю. Але што мы можам зрабіць, вы самі падумайце…

«Ах, вось ад чаго ты захварэў — ад папераў дырэктара», — падумаў Тугоўскі і ўслых дадаў:

— Ведама, на Бацькаўшчыне зусім не паінфармаваны аб мясцовых абставінах…

— Мы самі хочам дабіцца для вас стыпендыю, — прадоўжваў старшыня. — Але гэта не ад нас залежыць. Гэта залежыць ад чэшскага ўрада[4]. Мы, на жаль, і дагэтуль для вас не дабіліся стыпендыі.

Старшыня нават споўз у адной бялізне з пасцелі і сеў на крэсла каля пісьмовага стала.

— Вось папера, бачыце. Вы стаіцё ў спісе, але вам адмоўлена…

— Чаму? — пабляднеўшы, спытаў Тугоўскі.

— Таму што, калі падаваліся спісы, вас не было ў Празе. Стыпендыя выдаецца толькі тым, хто ўжо пражывае ў Празе. Разумееце?

— Так… А ўсё ж дазвольце вас запытаць, пане старшыня, — прамовіў юнак Тугоўскі з перакасіўшымся ад злосці тварам, з заблішчэўшымі вачыма. — Чаму вы прынялі на маё мейсца некалькі эмігрантаў з Балгарыі, такога Шабунеўскага, напрыклад… Ці ведама вам, што яны беларусы? І ці ведама вам, што яны не сёння, дык заўтра пяройдуць у расейскі камітэт?..

Старшыня паморшчыўся і зноў палез на пасцель.

— Ну ведаеце, грамадзянін Тугоўскі, гэта ўсё складаныя пытанні… Як бы вы зрабілі, калі б да вас прыехалі людзі з Балгарыі і заявілі вам, што яны беларусы. Такі Шабунеўскі — сапраўдны беларус.

Старшыня гаварыў такім тонам, што далейшыя спрэчкі былі б бяссэнсавымі.

Тугоўскі падняўся з крэсла.

— Так як жа, пане старшыня, магу я ўсё ж спадзявацца калі-небудзь на стыпендыю?

— Так… абавязкова, грамадзянін Тугоўскі, абавязкова. Праз месяц будзеце мець стыпендыю. Ну, самае большае — праз два…

— Можа быць, праз тры, — усміхнуўся Тугоўскі. — Можа быць, тагды, калі якраз спыняцца заняткі ва ўніверсітэце?

— Ну што вы, што вы, — прамовіў старшыня і пачаў енчыць, хапаючыся за спіну. Тугоўскі паспяшыў выйсці.

— Так, да пабачэння, пане старшыня, — прамовіў ён, паціскаючы яго пульхлую руку. — Выбачайце за турботы.

— Калі ласка, калі ласка, — ветліва ківаў галавой старшыня. Тугоўскі ўжо ў дзвярах развітаўся з яго жонкай-чэшкай і паспяшыў хутчэй выскачыць на вуліцу. Зноў захлюпалі дзюравыя боты па мокрым асфальце. Так вось як вырашылася справа з стыпендыяй. Два месяцы! Гэта значыць, што праз два месяцы ў яго не будзе ботаў, гэта значыць, два месяцы ён будзе жыць напалову галодны падачкамі сяброў… Два месяцы… Гэта значыць, што яго сябры пройдуць курс універсітэта, тады як яму прыйдзецца даганяць іх. Два месяцы… Гэта значыць, што ён будзе жыць у альтанцы ў садзе, дзе жывуць усе бадзягі, студэнты без стыпендыі. Гэта значыць, што спаць ён будзе каля студэнцкага інтэрнату — і чакаць, што прыйдзе садоўнік з паліцыяй і прагоніць іх з кватэры, раскінуўшы ўсе рэчы…



Так жыць — гэта значыць, што ён будзе чакаць: яго ў кожную хвіліну могуць выкінуць на вуліцу… І так два месяцы… Цэлыя два месяцы!.. Якая трагедыя.

Ён ішоў, спыняючы пакрыху свае крокі, нягледзячы на дождж. Ён не чуў, як мокрыя кроплі цяклі з яго старога капелюша за каўнер. Ён не чуў, бо цягучыя, мокрыя думкі паўзлі горш за дождж у яго мазгу, і мучылі яго, і спынялі яго на вуліцы. Аказваецца, правідловая яго тэорыя! Значыць, сапраўды нейкі закон пракляцця вісіць над ім, як Дамоклаў меч, і яго спатыкаюць у жыцці толькі няўдачы! Ён не ведае, што такое шчасце; гэта слова для яго пусты гук…

Яму пачало здавацца, што ён толькі адзін такі ёсць на ўсёй зямной кулі, што ў кожнага чалавека ёсць сваё маленькае, ледзь прыкметнае, хай мікраскапічнае чалавечае шчасце, — але ёсць. Дзеля гэтага чалавек жыве і кахае жыццё. А ў яго, Тугоўскага, няма нічога… Так, нічога! Ні сваёй цёплай кануры, ні свайго шчасця…

Ён з зайздрасцю ўглядаўся ў адзінокія людскія фігуры на вуліцы. Вось стаіць у дзвярох свайго магазіна ў белым фартуху чырвоны мяснік. Эх, як яго раздула! Ён глядзіць з усмешкай з вышыні свайго задаволення. Зразумела, ён шчаслівы. Вось едзе на сваёй велізарнай калымазе з вугаллем чарнарабочы і сасе даўгую, як у турка, люльку з чубаком. Яму прыемна. Ёсць трубка. Ёсць грошы. Ёсць шчасце… Ён глядзіць на Тугоўскага прышчураным, насмешлівым паглядам!.. Вось паўнагрудая чырвоная сялянка памагае везці на гару свайму сабаку. Сабака запрэжаны, як конь, у невялікі вазок з малаком. Вось яна спынілася каля магазіну, падаслала сабаку падсцілку і сама панесла канку ўсярэдзіну. Малады прыказчык выйшаў разам з ёй і ўшчыпнуў яе за талію. Яна смяецца… Яна — шчаслівая. Тугоўскі ідзе і дзівуецца прыгожасцю яе формаў. Яна шчаслівая.

Як паглядзіш, у кожнага ёсць сваё маленькае чалавечае шчасце… І ў яго? Быццам ён нейкі адкінуты ад усіх, нейкі ўрод у сям'і людской. Так ён адчуваў сябе заўсёды… Ён стварыў сваю тэорыю, і ён адчуваў сябе зараз падуладным сваёй тэорыі. А калі гэта так?! Калі яго тэорыя аб тым, што жыццё ўсякага чалавека ідзе па пэўных законах, а не выпадкова, што ёсць для адных людзей шляхі шчасця, калі ім усё ўдаецца,

калі яны высоўваюцца наперад і робяцца «знамянітымі»; — і наадварот, што ёсць шляхі няшчасця, калі людзям нічога не ўдаецца, калі яны пры ўсіх сваіх здольнасцях не высоўваюцца наперад і гінуць невядомымі — дык нашто жыць? «Так! — паўтарыў Тугоўскі. — Нашто жыць?!. Папрабуйце жыць з боллю ў сэрцы, з раненай свядомасцю, з разбітымі крыламі… Папрабуйце разбівацца штодня аб жыццёвыя абставіны, як хвалі разбіваюцца аб скалы… Жыць! — хацеў ён сказаць усім гэтым людзям, якія несліся міма і насмешліва на яго паглядалі. — Каб перанасіць вашыя насмешкі — жыць… Вы кажаце: “Жыць…” — і зараз пускаеце ў ход свае філасофіі, ад якіх пахне смерцю і трупамі. Вы кажаце: “Цярпіце! Цярпеннем усё ачышчаецца!” Вы смеяцеся над тымі, якія канчаюць жыццё, завеце іх дурнямі. Вялікі філосаф Ніцшэ сказаў: “Вы кажаце, што жыццё — бяссэнсіца? Правідлова!.. Так паспрабуйце скончыць гэту “бяссэнсіцу”!” Значыць, толькі трусасць чалавека перашкаджае яму пакінуць жыццё… Інакш ён мог бы скончыць гэту бяссэнсіцу. Толькі трусасць!

Так не трэба быць баязліўцам, трэба скончыць жыццё… Так, памерці. Не думаць больш, не чуць, не бачыць… Стаць каменем».

Цяжкая думка аб самагубстве навалілася на ўсю яго істоту чорнай хмарай і папаўзла далей у мозг. Ён ішоў, патупіўшы галаву, ішоў памалу, не ведаючы сам, якімі вуліцамі, — ішоў, як прыбіты куляй, думаючы аб сваёй ране.

Так бацыла, папаўшая ў кроў, прыгнячае чалавека, прыхіляе яго галаву, яго залёты, робіць яго маларухлівым, адымае ад яго радасць, шчасце, смех і сонца, пакуль нарэшце не запануе ўсёй істотай і не прывядзе да аканчальнай загубы.

Так папала бацыла ў сэрца і мозг Тугоўскага, і так яна апанавала ім, так яна прымусіла яго схіліць да зямлі галаву і цягнуцца бязвольна дахаты. Бацыла самагубства, папаўшая ў мозг, не так хутка пакідае чалавека. Яна папала ў мозг Тугоўскага і грызла, грызла яго ўсю дарогу…

А дождж ліў. Дождж выбіваў аднатонную музыку барабана…



## II

Поўны, у залатых акулярах, у шапцы, абшытай залацістымі галунамі, швейцар адчыніў Тугоўскаму зялезную браму саду. Не спяшаючыся, Тугоўскі пайшоў па шырокай алеі, углядаючыся ў велізарныя елкі і сосны, росшыя навакол дарогі. Клумбы кветак былі мёртвымі. Кусты дзіўных чырвоных руж, над якімі ўлетку спяваў салавей, стаялі голымі і жоўтымі. На ўсім велізарным садзе быў адбітак блізкай смерці. Адны альтанкі, абвітыя плюшчом і дзікім вінаградам, стаялі пышна, як сведкі яшчэ б’ючагася ў садзе жыцця. У канцы алеі стаяў жоўты двухпавярховы будынак, з пад’ездам, з двума велізарнымі ліхтарамі пры ўваходзе, з высахшым фантанам перад ім. Можна было б падумаць, што гэты пышны сад з швейцарам і гэты будынак з ліхтарамі служаць рэзідэнцыяй якога-небудзь пана ці якіх-небудзь паноў, стаячых на вяршыні грамадскай драбіны. А між тым, гэта быў інтэрнат для тых, што былі выкінуты за борт жыцця пасля вялікага рэвалюцыйнага землятрусу, для тых, якія згубілі «ўсё» і сталі «нічым» — людскім пылам, гноем, заплямаваныя ганебным словам «эмігрант». Тугоўскі падняўся па шырокіх мармуровых сходах. У вялікім даўгім калідоры яму сталі пападацца жыхары інтэрнату, апранутыя па-хатняму, у адных кашулях і нейкіх апорках, абутыя на басанож, у парваных мундзірах расейскай і аўстрыйскай армій. Смех, шум даносіліся адусюль з адчыненых дзвярэй пакояў. Ён увайшоў у свой пакой. Знаёмае жыццё агарнула яго, падхапіла яго, як хвалі трэску, і панесла ў нейкі вір, з якога ён быў бяссільны выбрацца. Ён стаў дзівіцца той вясёласці, якая панавала навакол. Адкуль яна бралася ў людзей? Здавалася, заўтра яны павінны былі быць выкінутымі на вуліцу без кавалка хлеба, заўтра несла ім страшэнную назву «бадзягі», — а між тым сёння яны ні аб чым не думалі. Яны заняліся мастацтвам, яны зрабілі нешта ў пакоі накшталт балету. Пасцелі, цягнуўшыся радамі побач сценак, былі прыстаўлены адна да адной, і такім чынам пасярэдзіне пакою стварыўся прастор, на якім можна было паказваць свой талент. Музыка была захапляючая. Яна ўдарыла па балючым сэрцы Тугоўскага, як смык па нацягнутых струнах, — і падняла яго над зямлёй, над цяжкай штодзённасцю. Здавалася, наўмысля для яго гукі несліся ша-

лёным скокам, адзін за адным, несліся задыхаючыся, у нейкім вакхічным, п'яным рытме.

Беларускі студэнт-мэдык Загорскі стараўся хутчэй вадзіць смычком па сваёй чароўнай скрыпцы. Галічанін Серада ў шэрым аўстрыйскім мундзіры таленавіта ўторыў яму на гітары. Але галоўную містэрыю тварыў галічанін Садоўскі, азартны карцёжнік, катораму трэба было б на спіну павесіць «бубновы туз» арыштанта. Хто мог падумаць, што нага гэтага бадзягі ведае законы рытму, што яна паслушна, як змяя, будзе згінацца пад музыку на чароўнае дзіўленне гледачоў.

«Ні даць, ні ўзяць "Мёртвы дом" Дастаеўскага[5]», — падумаў Тугоўскі. І раптам ён пачуў, што слёзы падступаюць пад яго горла, што вясёлая музыка настройвае яго на сентыментальна-слязлівы тон, — і цэлы рой сентэнцый апанаваў ім.

«Вось, — думаў ён, — паніжаныя, адкінутыя ўсімі людзі, а між тым колькі талентаў крыецца ў іх істотах. Яны "людзі дна"[6], але наколькі яны стаяць вышэй тых дабрародных душ, якія лічацца красой і гордасцю грамадзянства. Грош ім цана, гэтым адкормышам-мяшчанам, на падобе старшыні Беларускай грамады. Лепш быць "на дне" — бадзягай, але мець у сэрцы агонь, мець яшчэ святы парыў узлётаў…»

І раптам ён адчуў, што сам нават ніжэй гэтых бадзяг, што ў яго сэрцы патух агонь «узлётаў», — і ён не вытрымаў вясёлай дзікай пляскі, выскачыў у калідор і заплакаў. У гэты час па калідоры праходзіў беларускі студэнт Кірыла Бурачэўскі. У даўгаполым паліце, заўсёды з капелюшом, адкінутым на патыліцу, з насмешкай на сваім хітрым твары, — паходзіў на дзячка невялічкай захалуснай царквы. За гэта сябры празвалі яго насмешліва «айцом» Кірылам. «Айцец» Кірыла пачуў плач, спыніўся каля Тугоўскага.

— Эге, брат… Значыць, і ты гора бачыў, калі плачаш ад песні вясёлай…

— Так, айцец Кірыла, плачу — смяяцца ўжо не маю сілы, — сказаў Тугоўскі і, засароміўшыся, што яго бачылі, выскачыў і пабег з калідора вон. Выскачыў ён у сад і пачаў хадзіць па алеях і думаць аб сваёй тэорыі. «Тэорыя… — думаў Тугоўскі, блукаючы сярод велізарных таполяў. — Яна правідлова ўсё ж ткі…» Які вывад? Памерці? Але сёння сябры інтэрнату крычалі аб жыцці, жыцці без слёз, без разважанняў, жыцці



бяздумным, жыцці цыганскім, жыцці на сметніку, на якім вырастаюць таксама кветкі і часам праглядае сонца. І няўжо ў яго хопіць сілы, каб смяяцца, калі хочацца плакаць, скакаць, каля няма дарогі, спяваць, калі ідзеш на згубу… Не… «Жыць… Жыць…» — казаў ён сам сабе.

Было ўжо каля поўдня, калі ён расплюшчыў вочы. Адзін студэнт Загорскі стаяў каля вакна і прыводзіў у парадак свой туалет. Не было больш нікога з учарашніх артыстаў. Хто пайшоў на лекцыі ў вышэйшую школу, хто ў сталоўку, а хто ў Студэнцкі дом[7]. Пасцелі былі акуратна засланы, як у казармах жаўнерамі; толькі на адной ляжала нейкая бясформенная куча коўдраў. Гледзячы на яе, ніколі няможна было падумаць, што пад гэтакай кучай спаў чалавек. Загорскі стаяў перад люстэркам і завязваў свой модны і дарагі гальштук. Ён належаў да тых людзей, якія думаюць больш аб фраках, смокінгах, вясёлых балах, чым аб якіх-небудзь ідэях. Медыцына яго цікавіла пастолькі, паколькі яна давала яму магчымасць жыць у Залатой Празе, дыхаць шумным паветрам вялікага места. Як музыкант ён прыймаў удзел у розных квартэтах і часта іграў па розных карчомках. Капрызная фартуна какетліва ўсміхалася яму і пасылала прыемнасці жыцця. Ён прывык глядзець на жыццё як на жанчыну з рэстарана, якая за грошы рассыпае ласкі. […]

Тугоўскі доўга глядзеў на яго працу над сваім туалетам, нарэшце не вытрываў і прамовіў:

— Але вы тры гадзіны праводзіце перад люстэркам, як Венера, збіраючыся на баль.

— Слухайце, — абярнуўся да яго зараз жа Загорскі. — Не вынасіце на паказ старых рэчаў: мне здаецца, яны крадзеныя. Мне здаецца, вы адкульсьці ўкралі гэтыя словы.

Загорскі ніколі не лез за словам у кішэню.

— Ну, не ўсё роўна, украў я што-небудзь ці не? Гэта ўсё глупства. А вось давайце пагутарым сур'ёзна, грамадзянін Загорскі. Вы вось медык. Не раз і не два пападалі ў трупны пакой, каб застацца адзін на адзін з трупам. Скажыце, ці не задумваліся вы тады над пытаннямі жыцця і ці не рабілася вам тады крыху жудка ў гэтым суседстве ашчэраных чарапоў?

— Не, я нічога гэтага не перажываў. Я стараўся хутчэй працаваць анатамічным ножыкам. Асістэнт па анатоміі пахваліў мяне й сказаў, што з мяне выйдзе добры доктар. Трэба вам

наогул зазначыць, што медыкі менш усяго філасафуюць. Яны глядзяць, што смерць — гэта проста загана якой-небудзь матэрыі, смерць якіх-небудзь матэрыяльных клетак, якія мы можам пабачыць пад мікраскопам сваімі ўласнымі вачыма, і ўсё.

— Значыць, па-вашаму, нічога няма там?

— Гэта мы прапануем вырашаць гадалкам, папам і ксяндзам, старым у футлярах забабонаў.

— Значыць, калі так, скончыць жыццё самагубствам — простая штука. Раз там, на небе, нічога няма, дык узяў узвёў курок — і ўсё…

— Самагубства — гэта іншая рэч. Па-мойму, самагубства часцей усяго бывае самагубствам.

— Як так? — прыўстаў Тугоўскі на пасцелі. — А калі ў яго самагубства ідэйнае? Калі ён, паглядзеўшы жыццё ад пачатку да канца, пабачыў нейкую заканамернасць ува ўсім, пабачыў, што ўсё жыццё не выпадкова, што ад самага маленства да старасці чалавека вядзе нейкая сіла акрэсленымі дарогамі — аднаго да шчасця, а другога да няшчасця, калі, нарэшце, сабраўшы ўсе жыццёвыя факты, ён стварае тэорыю шчасця і няшчасця ў жыцці і бачыць, што тэорыя няшчасця пацвярджаецца, тады скажыце — нашто яму жыць?

— Ну, ведаеце што… — не даў яму скончыць Загорскі. — Выбачайце, я не маю часу з вамі больш гутарыць. Але я вам раджу с вашай тэорыяй звярнуцца ў Празе ў Інстытут псіхічных доследаў.

Ён насмешліва і горда, напарфумлены і папудраны, прыгожы, як малады бог, выйшаў з пакою, не даўшы Тугоўскаму апомніцца ад выстралу апошніх слоў: «Інстытут псіхічных доследаў».

«Значыць, ён зрабіў з мяне вар'ята», — падумаў Тугоўскі і, абяссілены, паваліўся на пасцель. Аказваецца, прадстаўнік «залатой моладзі», думаўшай толькі аб смокінгах і рэстаранах, аказаўся не такім пустым, як спачатку падалося Тугоўскаму. На славеснай дуэлі з ім цяжка было справіцца. Дый ці толькі на адной славеснай. Магчыма, і шмат магло быць дуэляў, з якіх Тугоўскі не выйшаў бы пераможцам. Ён ляжаў на пасцелі разбіты і абражаны. «Інстытут псіхічных доследаў…» — неслася ў яго галаве.



«Вар'ят, вар'ят… А можа быць, і сапраўды ў мяне ёсць нешта ненармальнае? І гэта ненармальнае прабіваецца ў маёй тэорыі». Ён пачуў, што твар яго пачынае паліцца. Яму здалося, цяжкі камень зваліўся на яго, і яму цяжка стала дыхаць. Цяжка думаць, цяжка гутарыць.

У гэты момант заварушылася куча коўдраў і з-пад яе паказалася смешная, высокая, злахмачаная, уся ў пуху, белакурая галава. Чалавек ляжаў цэлымі днямі на пасцелі; ніхто не чуў ад яго слова. Ніхто не ведаў, чым займаўся, як жыў, адкуль атрымліваў грошы на жыццё. Калі насмешкі сяброў па пакоі пачыналі яго выводзіць з цярпення, ён казаў: «Я не падобны да вас. Я — астральны чалавек». «Астральны чалавек» займаўся рознымі астральнымі навукамі: астралогіяй, хірамантыяй, чытаў пра Індыю і жыццё розных ёгаў і цэлымі днямі вывучаў асновы рэлігіі Буды. Здавалася, пад уплывам Буды ён сапраўды мала звязваў сябе з жыццём, не ведаючы ні гора, ні радасці, усё прымаючы спакойна, усё філасофскі благаслаўляючы. Здавалася, цвёрдая інтэрнацкая ложа з шэрай жорсткай коўдрай пад уплывам усходняга бога стала для яго самым прыемным мейсцам — «нірванай», у абдоймах якой ён адчуваў райскую насалоду.

Злыя языкі казалі, што ў яго быў туберкулёз і ён згубіў ужо магчымасць рухацца, але ён тлумачыў сваю прывязанасць да ложа «ідэёвымі», «астральнымі» матывамі. Пачуўшы размову Тугоўскага з Загорскім, ён выйшаў з звычайнай раўнавагі, высунуў галаву з-пад коўдраў, якімі ён закутваў сябе, каб гэтакім спосабам заглушыць гукі грэшнага свету. Ён акінуў падазронымі светлымі сваімі вачыма з-пад белакурых броваў пакой і, пабачыўшы аднаго Тугоўскага, смела сеў на пасцелі.

— Паслухайце, — пачаў ён размову — першую за ўвесь свой час жыцця ў інтэрнаце. — Паслухайце, я чуў вашыя спрэчкі. Вас абразіў Загорскі. Добра, што яшчэ не ў прысутнасці сяброў пакоя, і вы, бачу, вельмі блізка прынялі гэтую абразу да свайго сэрца. Кіньце. Паслухайце астральнага чалавека. Паслухайце, што скажу вам я — вучань вялікага прарока. Я — маўчальнік. Запісвайцеся ў наш гурток чэшскіх спірытыстаў, куды ўваходзяць чэшскія, украінскія студэнты ўсіх факультэтаў і іншыя паважаныя грамадзяне. Яшчэ не

было ні аднаго беларускага студэнта. Запісвайцеся! Бо вы геніяльны чалавек, грамадзянін Тугоўскі. Так, не смейцеся, — запраўды геніяльны. Хоць Загорскі адаслаў вас у Інстытут псіхічных доследаў. Можа быць, часткай ён быў правы, бо геніяльнасць і вар'яцтва — вельмі родныя сёстры і для шмат звычайных людзей геній — не больш як вар'ят. Вы геній таму, што інтуітыўна, гэта ёсць самі, без дапамогі падручнікаў, сваім дзіўным сэрцам і студзёным, за ўсім паглядаючым розумам знайшлі вялікі закон жыцця: заканамернасць.

Вы пэўны, што жыццё чалавека ідзе роўным, так сказаць, матэматычным шляхам, і, як бы чалавек ні хацеў, ён не сыдзе з гэтага шляху, які ляжыць перад ім ужо з калыскі. Вы фаталіст. Вы верыце ў сілу, што кіруе чалавекам на яго шляху, не дазваляе яму сысці на іншы шлях, сілу, якую адны называюць лёсам, другія выпадкам, трэція, можа быць, Богам. Вы лічыце, што выпадковасцяў няма… Праўда! Ну вось, у той час, як большасць людзей лічаць, што выпадкі існуюць. Яна, большасць, прыбягае да гэтых выпадкаў як да ратунку, калі не можа растлумачыць з'явішча. Так, скажам, будавалі дом. Інжынер, стары ўжо, добры спецыяліст, пабудаваўшы не адзін дом, прадугледзеўшы, здаецца, усё, што трэба, кажа ўзвесці трэці паверх. Раптам дом абвальваецца. Назначаецца камісія, справа разглядваецца, нічога не могуць знайсці канкрэтнага. Магчыма, дрэнны матэрыял быў віной, і дом не вытрымаў цяжару. Усе дзівуюцца, усе пацінскаюць плячамі — і ўсе кажуць, гледзячы на старога інжынера: «Выпадак. Проста выпадак». Пад домам ляжаць раненыя работнікі. Адны ранены, другія — забіты. Забітых прывозяць у хату да іх жонак і дзяцей — і жонкі, ірвучы на сваёй галаве валасы, крычаць: «Чаму забіла майго Янку, а чаму Пётра астаўся жывы?» Ім адказваюць: «Выпадак. Няшчасны выпадак». Слова «выпадак» раз'ясняе ім, што так і павінна быць. І далей ніякіх разважанняў, што хаваецца за гэтым магічным словам «выпадак», не робіцца. Я знаў аднаго афіцэра расейскай арміі, які даўно казаў, што ў жыцці яму «не вязе», пытаў яго: «Чаму?» — і ён адказваў проста: «Выпадак». Напрыклад, ён вельмі дабіваўся «звёздачкі». Ведаеце — чалавечая псіхалогія: «нашыўкі», «звёзды», «медалі», «чыны»… Вось усё, здаецца, было ўжо на добрай дарозе. Начальства ставілася да яго добра. Яму ўжо ўсміхаліся



сваім радасным бліскам «звёзды», «чыны». Як раптам — «няшчасны выпадак»: быў парад, і ў аднаго жаўнера развязаліся на парадзе абмоткі на назе.

Замест «звёздаў» і «чыноў» афіцэр атрымаў строгую вымову. Вось вам «выпадак»!.. Нядаўна ў Празе па адной з вуліц ішла дама з малымі дзяцьмі. Праходзячы каля велізарных дамоў з рознымі аздобамі і статуямі, яна спынілася і пачала паказваць прыгожы дом сваім дзецям. І вось раптам адламалася адна статуя і забіла даму. Засталіся толькі дзеці. Народ збегся, пачаў крычаць: «Выпадак! Няшчасны выпадак!»

А між тым, каб усе гэтыя людзі, якія крычаць «Выпадак, выпадак!», падумалі б і прааналізавалі жыццё чалавека ад яго нараджэння, каб яны паспрабавалі ўсе гэтыя паасобныя выпадкі запісаць і сабраць у адно, яны б пабачылі, што гэтыя выпадкі і ёсць толькі паасобныя звенні аднаго ланцуга, што яны толькі паасобныя рухі адной сілы, што дае напрамак шляху. Яны, вобразна кажучы, іскры той самай электрычнай сілы.

— Я пераканаўся, — прамовіў Тугоўскі, увесь час уважна слухаўшы, — што выпадкаў няма. Усё заканамерна, нават матэматычна. Напрыклад, у мяне не толькі шчаслівыя дні, як у іншых, але шчаслівыя тыдні мяжуюцца з нешчаслівымі проста надзіва, як цотныя і няцотныя лічбы ў арыфметыцы.

— Так, так, — падхапіў астральны чалавек. — Дужа добра! Вам не хапае літаратуры. Вы не ведаеце шляхоў тых, якія жылі да вас. Я вам магу прапанаваць некалькі кніжак, якія дадуць вам апору.

Ён выцягнуў з-пад падушкі некалькі кніжак і даў іх зацікаўленаму, здзіўленаму Тугоўскаму.

— А цяпер слухайце, слухайце далей, што скажа вам астральны чалавек. Кожную ноч, калі шумныя месты і спакойныя вёскі зачыняюць вочы і бачаць дзіўныя, неразгаданыя сны, над светам праносяцца велізарныя сілы, настолькі велізарныя, што, напэўна, спячыя вёскі і месты навекі заплюшчылі б вочы ад страху, каб пабачылі іх сапраўдныя памеры. Мільёны зор пачынаюць свяціць і мігаць дзіўнымі агнямі.

Выплывае Месяц і пачынае аглядаць паню-Зямлю. Яна, наша шэрая, непрыгожая Зямля, напэўна, здаецца яму найлепшай, прыгажэйшай у свеце, бо прыцягвае яго да сябе, бо прымушае Месяц круціцца каля сябе. І так будзе да самай іх

смерці… А паміж гэтымі зорамі і гэтым Месяцам блішчаць спакойныя мігаючыя вочы, чырвоныя і жоўтыя вочы, якіх мы не заўсёды бачым, — дзіўныя, неразгаданыя, невядомыя вочы планет. Планеты, як жывыя істоты, звязаны паміж сабой працягнутымі рукамі: яны цягнуць да сябе адна другую, як родныя сёстры, — гэта закон усясветнага прыцягнення. Дзіўны ўплыў планет на нашу Зямлю настолькі значны, што ўсе вялікія астраномы, як Кеплер, Ціхо-дэ-Браге[8] і іншыя, больш вялікія, чым сучасныя прафесары ўніверсітэтаў, звязвалі людское жыццё з рухам планет. Яны ўмелі скласці «гараскоп» — каляндар чалавечага жыцця па зорах. Пазнейшыя вучоныя заклямавалі гэтыя погляды вялікіх астраномаў. Іх метады назвалі «гаданнем», а іх навуку — «астралогіяй».

Адкіньце на бок усе кніжкі, усе тэорыі нашых педагогаў і паклічце на дапамогу логіку. Падумайце: вучоныя-географы знайшлі, што ад уплываў Месяца залежаць марскія прылівы і адлівы, якія правідлова чарадуюцца праз шэсць гадзін. Значыць, Месяц мае вялікі ўплыў на мора. А калі гэта так, калі нават мора можа раскачаць свае магутныя хвалі і з шумам, з пенай кінуць іх на камяністы бераг толькі пад уплывам Месяца, дык, мне здавалася б, логіка павінна прызнаць, што слабы чалавек павінен падпадаць пад яшчэ большы ўплыў. Чаму б, напрыклад, пад уплывамі Месяца не мог бы чалавек, так сказаць, «забурліць», падняць свае настроі — кінуцца ў жыццё з радасцей; чаму, напрыклад, праз пэўны час гэтыя настроі не маглі б і апасць у яго, як хвалі мора. Але калі маленькі Месяц можа аказаць такі ўплыў на Зямлю, на мора, дык што можна сказаць тады пра вялікія планеты, у некалькі разоў большыя за Зямлю? Логіка, здаецца, павінна была б сказаць, што гэтыя ўплывы могуць быць яшчэ большымі. Зразумела, што ўплыў планет на людзей павінен быць значна большым. — Астральны чалавек адкінуў коўдры, устаў з пасцелі. — Так, уплыў планет на жыццё чалавека ёсць падобны ўплыву Месяца на марскія хвалі, — сказаў ён. — І ўсё жыццё чалавека залежыць ад таго, пад якой планетай ён радзіўся. Радзіўся ён пад Сонцам — жыццё яго будзе светлым, радасным, шчаслівым; радзіўся ён пад Сатурнам — жыццё яго пойдзе па крывой арбіце, будзе нясталым, поўным непрыемнасці і напоўніць чалавека песімізмам і меланхоліяй. Што гэта ўсё так — можаце ўзяць дату нараджэння знаёмага вам чалавека, месяц, год і адшукаць вось у гэтай кнізе. — Ён паказаў цененькую кніжачку, на вокладцы якой была намалёвана планета Сатурн з абручом. — Пад якой планетай радзіўся знаёмы вам чалавек або самі, вы знойдзеце правідловы малюнак вашага жыцця. Тады не трэба вам будзе казаць аб «выпадку», аб «няшчасным выпадку». Тады жыццё ваша атрымае дзіўны сэнс, закон, па якім вы зможаце адзначаць нават сваю будучую дарогу ў жыцці…

Ён замаўчаў. Тугоўскі ўжо не слухаў яго і шукаў нешта ў кніжцы…

— Ну што, знайшлі? — спытаў астральны чалавек. — Давайце я памагу вам. Паглядзім, пад якой планетай вы радзіліся…

Тугоўскі з цікавасцю пачаў пералістваць старонкі кніжкі. Ён хаця яшчэ не зусім пераканаўся «логікай» астральнага чалавека, але ўсё ж зацікавіўся ёй.

«Можа быць, я радзіўся пад Сонцам? — думаў ён. — Усё ж тады больш прыемнасці…»

— Сатурн, — сказаў астральны чалавек і паглядзеў на яго пільна, з нейкай трывогай. — Так! Вы радзіліся пад Сатурнам. Гэта не зусім прыемна.

Тугоўскі паблядней і не мог прамовіць ні слова.

### III

Беларуская грамада ў Празе стала папаўняцца чароўным полам. Жанчыны, як кветкі вясной, пакрылі беларускае поле ў чэшскай Празе, і поле запрыгажэла — зацвіло, ажывілася, напоўнілася араматам. Мужчыны ўраз змяніліся: сталі менш спрачацца і лаяцца на сходах, а калі і трэба было паспрачацца, дык стараліся паказаць сябе далікатна і спакойна. Зразумела, што кветкі не былі роўнакаштоўнымі, не вабілі аднолькава сваімі фарбамі, формамі і пахам. Адны з іх былі сапраўднымі кветкамі беларускіх палёў. Перанесеныя на чужы грунт, не маглі зацвісці яшчэ больш пышнымі бутонамі; яны малапамалу сохлі, гіблі, гублялі красу і выклікалі толькі насмешкі з боку сваіх жа сяброў. Другія, наадварот, — пускалі карэнні ў чужы грунт, выжывалі, правіліся, расквіталі і ўжо нічым не адрозніваліся ад прыгожых і пахучых кветак Чэхіі.

Праўда, такіх было мала, але ўсё ж было, і сярод іх самым пышным бутонам выглядзела Галена Уладзіміраўна Вярхоўская[9]. Усяго некалькі дзён таму назад, калі яна прыехала, па Студэнцкім доме ішоў погалас. На прыгожым і шырокім балконе, дзе стаялі столікі для шахмат, па кафельнай падлозе прахаджвалася разнамоўная маса чэхаў, мадзьяраў, немцаў, армян, грузінаў, украінцаў, палякаў, расейцаў, невялікая грамада беларусаў збілася ў кучку і шапталася.

— Бачылі? Бачылі? — казаў Загорскі. — Да нас прыехала каралева. — Ён блішчэў у лакірках і ў новым чорным касцюме.

— Няпраўда, — зазначыў Кірыла Бурачэўскі, неміласэрна плюючы на падлогу і пасоўваючы капялюш на патыліцу. На ім быў зялёны касцюм, выдадзены камітэтам разам з стыпендыяй, які вісеў на ім, як на калу. — Я вам зазначу, — прадоўжваў ён, — што прыгожыя жанчыны выходзяць замуж, а не лезуць ва ўніверсітэт. Сапраўды, паглядзіце на нашых студэнтак. Яны — усе ўроды! — Ён засмяяўся. — На іх мужчыну глядзець брыдка. Таму, зразумела, няшчасныя ў каханні, яны шукаюць шчасця ў навуцы, у працы…

Студэнты засмяяліся:

— Ай да айцец Кірыла.

— Паглядзіце, гараджане, — сказаў Загорскі, — айцец Кірыла палысеў у Празе. І цяпер выглядае з сваім доўгім носам што міністра замежных спраў.

З Кірылам Бурачэўскім студэнты яшчэ больш павесялелі. Пасыпаліся колкасці, спрэчкі, смех.

Падышоў сюды лысы і паважаны студэнт філасофіі Янка Станкевіч[10]. Студэнты паднялі яго на смех:

— Разыдзіцеся, грамадзяне! Аўтар беларускага лемантара крывіньдзіляе, — крыкнуў насмешлівы, маленькага росту, з выцягнутым і вострым тварам Малевіч.

— Што гэта за слова «крывіньдзіляе»? — запытаўся Станкевіч.

— «Крывіньдзіляе» — так у нас на Вітабшчыне кажуць пра тых, у каго крывыя ногі.

— А хіба ў мяне крывыя ногі? — усміхнуўся крыва Станкевіч.

Студэнты замест адказу рассмяяліся.



— Слухай, дзядзька Янка, — перабіў смех Загорскі, — ты калісьці казаў, што абышоў усю Беларусь пехатой з торбай за плячамі. Скажы, калі ласка, ці сустракаў ты ўва ўсёй Беларусі хоць пару стройных жаночых ножак?..

— У цябе толькі і стаяць у галаве жаночыя ногі, — сярдзіта агрызнуўся Янка.

— Ой, які ты стары ўжо, дзядзька Янка, — адказаў Загорскі. — Што скажа пра цябе твая жонка, калі даведаецца, што ты не звяртаеш увагі на жаночыя ногі? Гэта не робіць табе чэсці як філосафу, дзядзька. Успомні: немец Гейнэ[11] знайшоў, што ў немак ногі як палены, маскаль Пушкін[12] пісаў, што ўва ўсёй Расеі не знойдзеш пару стройных ног. Ну, а скажы, як на Беларусі? Напэўна, у беларусак ногі — што дзве калоды?

— Няма мне часу з вамі цадзіць ваду рэшатам, — сказаў Станкевіч і пайшоў у залю Студэнцкага дому, адкуль даносіліся шум і гукі раялю.

— Слаба, слаба, філосаф, — панесліся яму ўдагонку крыкі і смех.

— Таўкачы! — засмяяўся айцец Кірыла, плюючы зноў. — Сапраўды, беларусы ўсе таўкачы!

У гэты момант на балконе паказалася Вярхоўская. Усе замоўклі і ўпіліся ў яе вачыма.

Яна была проста апранута, але ў гэтай прастаце чуўся смак, чуўся голас мастака, які наўмысля збягаў крыклівых фарбаў і формаў.

Чорнае шоўкавае паліто прыгожа абцягвала яе стройную фігуру. Чорны капялюш з маленькімі скрыдламі, як у амурчыка, вельмі добра падкрэсліваў белізну і круглясці твару, на якім гарэлі сінія вочанькі-вочы. Праз паліто віднелася сіняе ўбранне з прыгожа адцяняўшай форму шыі кружаўной устаўкай. На нагах былі жоўтыя чаравікі.

Вобраз быў цікавы. Самае вабнае ў ім вочы. Яны смяяліся раней, чым яна хацела смяяцца. Здавалася, яны заўсёды былі насмешлівымі, крыху вострымі і калючымі. Ад іх прамяніўся дзіўны сіні свет, які, здавалася, ішоў здалёку, з нейкай глыбіні. Калі б змясціць гэтыя вочы ў цёмны пакой, яны, напэўна, асвяцілі б усё дзіўным, фарфарэсцыруючым святлом. Асабліва яны пачыналі цікава блішчэць, калі яна смяялася ўва ўсю моц сваіх лёгкіх, — дзіўным, звонкім, як песня жаўранка, смехам.

Загорскі першы выйшаў да яе, прывітаўся і павёў прадстаўляць беларускай грамадзе. Студэнты з прыемнасцю пацiскалі яе пульхлую руку ў рукавіцы. Нават айцец Кірыла ветліва сагнуўся і з застыўшай усмешкай на сваім твары прамовіў: «Вельмі прыемна».

— Наша грамада, як бачыце, невялікая, — зазначыў Загорскі, калі працэдура знаёмства скончылася.

— Ну, справа, я думаю, не ў колькасці, а ў якасці, — засмяялася Вярхоўская.

— Зразумела, — адказалі студэнты.

— Вы, напэўна, яшчэ не паспелі агледзець нашага Студэнцкага дому, — галантна нахіліўся да яе напарфумлены Загорскі.

— Так, я сюды толькі што прыйшла. Але мяне дзівіць маса народу тут, паўнагучнасць жыцця і разам з тым тая свабода, з якой тут трымаюцца ўсе…

— Так, тут паўнейшая свабода, — адказаў Загорскі, які стараўся высунуцца перад усімі. — Так дазвольце вас азнаёміць з нашым Студэнцкім домам…

— Калі ласка, — засмяялася яна ізноў, — з вялікай прыемнасцяй. Але мне трэба было б пабачыць некаторых нашых з Вільні, перш за ўсё грамадзяніна Станкевіча.

— Так і пабачым, — усміхнуўся Загорскі.

— Тады пойдзем, — сказала яна, гледзячы на групу студэнтаў як каралева глядзіць на сваю світу.

Усе пайшлі за ёю ў залю. Засталася толькі невялічкая частка на чале з айцом Кірылам.

— Н-да, — прамычэў Кірыла, калі працэсія схавалася ў зале, — важная птушка, — і неміласэрна сплюнуў на падлогу.

— Нічога асаблівага. Але, здаецца, недурная, — сказаў Малевіч.

У зале Студэнцкага дому было шумна: трашчаў пінг-понг, стукалі більярды, рассыпаў хвалі гукаў раяль, спявалі і гутарылі людзі. У другой канцэртнай залі былі пастаўлены рады крэслаў, зроблены памост, на якім стаяў таксама раяль, што адчыняўся толькі пад час канцэртаў. Над памостам вісеў вялікі плакат з зялёнай матэрыі, напісаны на лаціне: «Ut omnes unum sunt» («Няхай усе будуць як адзін»). На памосце, на



крэслах, за столікамі ўздоўж сценак, па ўсіх кутках сядзелі групамі студэнты і грызлі граніт навукі. Тут можна было спрачацца, можна было разам высветліць незразумелыя пытанні, у адлічча ад тых пакояў Студэнцкага дому, якія называліся «студоўнямі», у якіх была магільная ціша.

— За гэтай залай, — сказаў элегантны Загорскі, ідучы побач Вярхоўскай, — ёсць спецыяльныя пакоі для жанчын. Вы не жадаеце туды пайсці?

— Не, дзякую. Пакуль што я не жадаю сябе аддзяляць ад мужчын, — яна засмяялася. На яе глянулі з здзіўленнем усе ў залі, на адну хвіліну адарваўшы вочы ад кніжак, каб паглядзець на дзіўную працэсію, што цягнулася за жанчынай. Потым усе зноў пачалі займацца сваёй справай.

Яе звонкі смех пачуў Станкевіч. Ён сам пайшоў ёй на спатканне.

— А, Галена Уладзіміраўна, — сказаў ён з больш вясёлым выразам твару, чым калі гутарыў з студэнтамі. — Прыехалі? Ну дзякаваць Богу. — Ён пацiснуў яе руку.

— Напэўна, не чакалі мяне? — сказала вясёлая Вярхоўская.

— Як жа? Чакалі, яшчэ як… Вы нам вельмі патрэбны былі. Вам не хацелі выдаць стыпендыі, таму што вас не было ў той час у Празе, але я пастараўся абараніць вас. Вам ужо ёсць стыпендыя. Вы толькі зараз павінны звярнуцца да старшыні Беларускай грамады ў Празе. Вы ведаеце, дзе ён жыве?

Вярхоўская пакачала галавой.

— Я магу правесці, — паспяшыў Загорскі. Яму вельмі не хацелася адпускаць ад сябе Вярхоўскую.

— Ну вось і добра. Вам зараз трэба будзе ісці.

— Якая вы шчаслівая, — зазначылі падышоўшыя ў гэты час беларускія студэнткі. — Толькі прыехалі, а ўжо маеце стыпендыю. А вось мы жывем у Марыянскім кляштары ўжо са жніўня. Лічыце, колькі гэта будзе да лістапада; маліліся Богу, пасцілі, спаўняем усе загады манашак і аканчальна губляем чалавечую годнасць.

— Вы жывяце ў кляштары? — здзівілася Вярхоўская.

— А як жа?! — адказалі ёй студэнткі. — Вось як пойдзеце ад Студэнцкага дому направа — у маленькай, вузкай сярэднявечнай вуліцы пабачыце стары каменны дом з дубовымі

варотамі, з вузкімі вокнамі, з кратамі. Вось за гэтымі кратамі мы і жывём, як у турме, — і высоўваем галовы на свет Божы, як арыштанткі.

— Мусібыць, нам прыйдзецца доўга яшчэ жыць у кляштары, — зазначыла маленькага росту, ужо досыць пажылая студэнтка-медычка. — У мяне ўжо даўно не плачана за стол і кватэру. Маю доўгу каля 380 крон.

— А ў мяне больш 500, — сказала другая, высокая і худая, з непрыгожым жоўтым тварам.

— Сапраўды гэта цяжка, — хітнула галавой Вярхоўская. — На такое жыццё трэба нямала геройства.

— Ведаеце што? — прапанаваў Станкевіч. — Вы падайце заявы і папрасіце дапамогі. Я думаю, што вам якія-небудзь сумы адпусцяць і ўлаштуюць на стыпендыю.

— Мы пісалі ўжо, — і ніякай карысці.

— Пішыце яшчэ раз. Стукайце часцей, і адчыняць вам.

— Відаць адразу, што вучыўся ў духоўнай семінарыі, — насмешліва паглядзеў на Станкевіча Загорскі. Яму было прыемна бачыць блішчэўшыя бяссільным злобным агнём вочы Станкевіча. Загорскі ведаў, што Станкевіч нічога не можа яму зрабіць, нягледзячы на свае ўплывы. — Але нам час ісці, — звярнуўся ён да Вярхоўскай, каб перабіць адказ Станкевіча. — Мы можам не знайсці старшыні ў хаце.

Яны развіталіся. Усю дарогу Загорскі стараўся весяліць Вярхоўскую. На сходах, што вялі на высокую гару да дому старшыні, ён узяў яе за локаць, дапамагаючы падняцца. Але каля самага дому яна сама пажадала збавіцца ад няпрошанага праваднікa:

— Дзякую вам. Цяпер я ўжо сама знайду кватэру. Да пабачэння! — і працягнула яму руку.

Ён глядзеў на яе, поўны здзіўлення. «Як? Яна сама мяне пакідае?» — падумаў.

— Усяго добрага… — прамовіў ён сумна. Зняў капялюш і павярнуў зноў да Студэнцкага дому.

Старшыня сядзеў за сваім пісьмовым сталом, апрануты ў чорны касцюм, з вялікай белай хустай у левай кішэні, і выглядаў вясёлым і памаладзеўшым.

— Я толькі што з міністэрства, — сказаў ён, пасадзіўшы Вярхоўскую ў мяккае крэсла ля стала. — Добра, што вы зараз прыехалі. Якраз вас мы сёння зацвердзілі на стыпендыю. Вітаю! — Ён працягнуў ёй руку. — Цяпер вам толькі дарога ва ўніверсітэт. На які ж вы думаеце паступіць факультэт?



— Я? — І не думаючы, хутка адказала: — Вядома, на філасофію.

— Чаму «вядома»? — усміхнуўся старшыня.

— Таму, што я не належу да тых, якія глядзяць на навуку як на дойную карову. Я ведаю, што ў вас тут усе толькі тэхнікі ды медыкі. А між тым на Бацькаўшчыне патрэбны грамадскія працаўнікі, знаёмыя з гісторыяй. Я думаю аддаць усе сілы барацьбе за вызваленне беларускага народу. А калі гэтага будзе патрабаваць справа — я заўсёды змагу быць міласэрнай сястрой.

— Вось вы як… Не чакаў, — глядзеў на яе расшыранымі, бясколеравымі вачыма на атлусцелым старым маршчыністым твары старшыня. — Ці ў Вільні там усе такія? — І, не чакаючы адказу, пачаў запісваць у паперы яе факультэт. — Стыпендыю можаце атрымаць ужо заўтра, у Чэшска-Украінскім камітэце[13], — падняў ён галаву над паперамі. — А што датычыць паступлення ва ўніверсітэт, дык вам дапамогуць вашыя сябры.

— Дзякую. Гэта ўсё? — Яна сабралася ісці.

— А як у вас з кватэрай? — запытаў, устаючы, старшыня. — Калі няма, дык пакуль што ў мяне… Можаце паставіць хаця б свае рэчы.

— Не… Не… Дзякую. У мяне тут ёсць знаёмыя студэнты і студэнткі. Я ў іх, — адмаўлялася Вярхоўская.

— Можа, будзеце ў нас абедаць? — казаў ён, адчыняючы дзверы ў кухню. — Маша, прыгатуй нам абед. — Яго прыгожая жонка-чэшка паспяшыла да пліты.

— Не, не, — рашуча адмаўлялася Вярхоўская. Чэшка старалася ўгаварыць яе на ламанай чэшска-беларускай мове: трымала яе за руку, міла гладзіла, нават казала, што яна прыгожая, і гатова была, здаецца, абняць і пацалаваць.

— Ну, не хоча, дык што будзеш рабіць? — сказаў старшыня. — Ах, пачакайце, я зусім запамятаў. Ёсць тут у нашай Грамадзе чалавек па прозвішчы Тугоўскі. — Ён паморшчыўся. — Вы мо не ведаеце? Не?

Вярхоўская паківала адмоўна галавой.

— Кажуць, што ён дзесьці загінуў, што яго ўжо няма ў Празе. Ён нідзе не паказваецца, ніколі не бывае ў Студэнцкім доме, словам — прапаў чалавек і толькі… Я вельмі хацеў ведаць, што з ім, бо яму якраз цяпер з вамі выпісана стыпендыя. Дык вось, да вас мая вялікая просьба: расшукайце яго якім-небудзь чынам праз студэнтаў. Яны, напэўна, ведаюць, дзе ён, і паведаміце, што ў яго ёсць стыпендыя. Няхай ён зойдзе да мяне.

— Добра… Тугоўскі яго прозвішча? Так, я пастараюся. Добра. Да пабачэння!

— Усяго добрага, усяго добрага! — казалі ў адзін голас старшыня і жонка. — Заходзьце да нас часцей, — запрашала чэшка, зачыняючы дзверы.

Вярхоўская ішла зноў у Студэнцкі дом па вялікіх сходах. Яна думала аб студэнтах, якіх спаткае, і пра тое, каб хутчэй пачаць шуканне незнаёмага Тугоўскага.

## IV

У Студэнцкім доме толькі зараз, пад энергічным націскам Вярхоўскай, успомнілі, што запраўды існаваў на свеце юнак па прозвішчы Тугоўскі. Запраўды, некалькі разоў бачылі яго ў залі. Тады ніхто не звярнуў увагі на яго, і шмат у каго гэты вобраз зусім знік з памяці. Адзін айцец Кірыла з трывогай успамінаў таго, хто плакаў пад час вясёлай мінуты пад сцэнкай інтэрнату.

Толькі адзін ён зразумеў, што душа ў Тугоўскага досыць чулая, што яна, можа быць, па-свойму заслугоўвае ўвагі, ва ўсякім выпадку, яна не павінна быць загублена для Беларускай грамады ў Празе: яе трэба знайсці. Але ўсе шуканні не мелі поспеху. Было вядома, што ён больш не жыў у інтэрнаце, бо нават для інтэрнату ў яго не хапала грошай. Ён спаў дзесьці ў альтане, у садзе, і штодня мяняў сваю «кватэру», каб яго не знайшоў садоўнік і не адправіў у паліцыю як бяздомную і падазроную асобу. Казалі, што ён прыходзіў спаць у альтанку позна, калі было зусім цёмна, і яго быццам бачылі штодня, але зноў ніхто напэўна нічога не мог цвердзіць. Як бы там ні было, айцец Кірыла рашыў знайсці закінутага і вярнуць да жыцця.



Быў прыгожы асенні ранак. Сонца залаціла апошнія жоўтыя лісты дрэў на алеях. Усё памірала. Акорды смерці несліся ў апошніх парывах ветру, што шумеў у елках і таполях саду.

— Мне здаецца, гэта не вецер шуміць, гэта іграе віяланчэліст «Песню трубадура» Чайкоўскага[14], — сказаў Тугоўскі. Ён успомніў Бацькаўшчыну, успомніў, як на адным канцэрце прафесар кансерваторыі калісьці іграў «Песню трубадура». Успомніў, што тады ў гэтых гуках віяланчэлі яму пачуўся чалавечы голас, і яму здалося, што сыплюцца лісты, агаляюцца дрэвы, з кожным новым акордам апускаюцца рукі… Астральны чалавек не прамовіў ні слова. Ён пазяхнуў, выцягнуў руку з-пад коўдраў, але зараз жа схаваў назад: было зімна ў альтане. І замест адказу ён пачаў дэкламаваць «Брацця-разбойнікаў»[15]:

Нас было двое:
Брат і я…

Тугоўскі ўслухваўся ў словы, вымаўленыя смешным галіцыйскім акцэнтам, і параўноўваў становішча «братцяў-разбойнікаў» з сваім. Дзіўная аналогія! Усё, што казалі яны, увесь іх пратэст проціў жыцця, людзей і іх мяшчанскіх радасцяў так быў блізкі яго сэрцу…

Цяпер ужо ён не мог без агіды глядзець на людзей у лакірках, у фраках, сытых і чырвоных. Ён гатоў быў выхапіць нож і нанесці ім рану, як разбойнік з вялікай дарогі.

Часамі ён думаў: чаму? Адкуль у яго такая нянавісць да людзей, задаволеных жыццём. Няўжо ён гатовы зрабіць казарму для ўсіх і забараніць усім смяяцца, няўжо ж ён павінен адняць ад іх вопратку, калі на ім вісяць лахманы? Хто вінны гэтаму? Сацыяльныя варункі? Несправядлівая капіталістычная сістэма? Бог, стварыўшы гэтую сістэму, ці ён сам, не маючы сілы палепшыць жыццё, як іншыя? І пакуль астральны чалавек дэкламаваў «Брацця-разбойнікаў», ён успамінаў пад шум ветру, які гуляў па мёртвым садзе, успамінаў пад гукі «Песні трубадура» сваё жыццё. Ён пачынаў разумець, што гэтая нянавісць да сучаснага ладу жыцця, да задаволеных людзей радзілася ў яго нават не цяпер, а ў дзяцінстве, у цёмным падвале каменнага дома, з матчынай песняй над яго калыскай. Яна радзілася, гэтая нянавісць, у яго сэрцы і разам з ім таму,

што над сабой і навокал сябе ён чуў іншыя песні. Над ім, над цёмным склепам, жыла сям'я Загорскіх, у пакоях якой штодня гучэў раяль. Ён заходзіў толькі часам у гэтыя вялікія пышныя пакоі, у якіх пахла асаблівым прыемным пахам, казытаўшым нервы, праходзіў, чапляючыся за фартух маткі, што прыносіла вузел вымытай бялізны.

Матка яго была прачкай у Загорскіх, і яна заўсёды прыводзіла свайго Пётру ў надзеі, што вучыцельніца — сама пані Загорская — паглядзіць на яго і дазволіць пагуляць з яе сынам Янам. Звычайна так і бывала. Маладая, прыгожая, уся прапахшая парфумамі, пані Загорская выходзіла да Тугоўскай, лічыла бялізну, а потым брала маленькага Пётру за падбародак.

— Іш які прыгажун падрос?! — казала яна.

— Так, панічка, расце, — пацвярджала шчаслівая Тугоўская, складваючы рукі на жываце. — Падрасце — мне дапамога…

— Так, падрасце — дапаможа, — казала Загорская. — Дык пакіньце яго пагуляць з маім Янам…

— Ах, дзе там, панічка, ён вам набрудзіць толькі, наробіць шкоды, — адмаўлялася Тугоўская.

— Ну што там, пакіньце… Ён сам потым зойдзе дахаты. Гэта ж на адным двары…

— Ды ён зойдзе, — згаджалася шчаслівая Тугоўская. — Ну, дзякую вам, — і з радасцяй глядзела, як маладая, прыгожая вучыцелька адводзіла яе сына за руку ў іншыя пакоі. Цэлы новы свет адчыняўся хлопчыку Пётру!.. Ах, колькі там конікаў, мядзведзяў, аўтамабіляў, стрэльбаў, розных прыгожых кніжак, малюнкаў, кветак… Як хочацца яму ўсё пазнаць, усё абмацаць сваімі рукамі, прылажыць да свайго языка — пакаштаваць ці праехацца праз увесь пакой. Але яму гэта не даюць!..

— Не руш! — крычыць Янка Загорскі, аберагаючы сваю ўласнасць, і б'е Пётру па руцэ. Ён незадаволены, што плебей Пётра ўвайшоў у яго пакой патрыцыя і яшчэ рухае бруднымі рукамі рэчы.

— Ян! — крычыць Загорская. — Не трэба біцца! Гуляйце з Пётрам добра.

— Ён рухае мой аўтамабіль, — адказвае Янка. Матка замаўкае і выходзіць з пакоя. Яна таксама прызнае за сынам права ўласнасці.



Ян садзіцца ў аўтамабіль — развальваецца, бы дырэктар фабрыкі.

Пётра з вінаватым выглядам глядзіць на яго і хоць ціханька датыкаецца маленькім пальчыкам да тоўстых шынаў, да бліскучай паліраванай паверхні аўтамабіля.

— Гу-гу-гу, — гудзіць Ян і ляціць праз увесь пакой, круцячы нагамі. Пётра ляціць за ім бокам, увесь час стараючыся не адстаць ад аўтамабіля. Ён свішча, падскоквае і стараецца падпіхнуць рукамі машыну хоць ззаду, але Ян горда адштурхоўвае яго. Пётра нейкі час скача, але ўсё цішэй і цішэй, і потым сумна спыняецца ў кутку. Ён, напэўна, думае, як дрэнна радзіцца пралетарыем… У яго маленькую душу закрадваецца нянавісць да тых, хто мае маленькі ўласны дзіцячы аўтамабіль.

А што будзе, калі ён вырасце? Што будзе, калі дзіцячая нянавісць вырасце разам з ім у помсту?

Праходзяць гады… На ім паяўляецца такая самая, з жоўтымі галунамі і гузікамі, форма рэаліста, як і ў Яна Загорскага. Але згоды няма паміж імі. Роў паміж двума процілежнымі светамі не засыпаны. Ян Загорскі рэдка размаўляе з Тугоўскім і рэдка гуляе з ім як роўны з роўным, — хоць яны і сядзяць разам у адным класе. Ён, здаецца, наўмысля хоча падкрэсліць сваю перавагу, калі на вялікай перамене купляе сабе шклянку гарбаты і катлеты, а Тугоўскі не мае нават капейкі, каб купіць сабе «жулікаў»… Яму прыемна, што Тугоўскі забіваецца ў кут і толькі глытае слюнкі. Колькі смеху і радасці дастаўляе яму мінута, калі інспектар рэальнай школы прыходзіць і заяўляе, што Тугоўскі ні адной хвіліны не можа заставацца ў школе — за няўзнос платы. Тугоўскаму не даюць нават магчымасці дасядзець да канца лекцыі, яго гоняць, як нягодніка, як хворага дрэннай хваробай, перадаюць швейцару ў залатых галунах, каб той са злосцю мог бы зачыніць за ім дзверы.

Хто ведае, колькі разоў ён плакаў, прытуліўшыся да белай бясчулай сцяны казённай рэальнай школы.

Колькі разоў смяяўся за яго плячыма швейцар!

Апошні раз (гэта было ўжо перад самай вайной), калі яго выгналі і ён прыйшоў, плачучы, дахаты, бацька сказаў:

— Ну, сынок, як хочаш! Грошай у мяне няма, больш вучыць я не маю сілы…

Пётра плакаў, не еў нічога, маліў бацьку, але нічога не дапамагала. Нарэшце ксёндз, вучыўшы ў рэальнай школе, зжаліўся і заплаціў за яго за паўгода. Так Пётра давучыўся да канца году і быў пераведзены ў другі клас нават з пахвальным лістом.

Вучыцелька Загорская не без зайздрасці рабіла ўвагу свайму сыну Яну:

— Вось, Ян, ты просіш асобнага пакоя вучыцца: табе ўсё перашкаджае… Паглядзі на Тугоўскага. Ён жыве ў падвале, і ў яго там разам і спальня, і зала, і сталовая, і кабінет. Назбіраецца часам поўны падвал людзей, а Пётра заб'ецца ў куток і вучыцца. Затое глядзі: ён пераходзіць з класа ў клас з пахвальным лістом. Вось бяры з яго прыклад, Ян.

— Не хачу я браць прыкладу з прачкінага сына, — сярдзіта агрызаўся Ян і, бразнуўшы дзвярыма, выходзіў з пакою.

І тут ударыў гром. Настала вайна. Па вуліцах места папаўзлі падводы з мірным жыхарствам, гружаныя розным скарбам. Інтэлігенцыя і панства выязджалі раней, пакідалі свае кватэры на дагляд дворнікам і незаможным.

Пані Загорская, якая ўжо стала ў гэты час удавой, прасіла Тугоўскую дагледзець за кватэрай.

— Мілачка, — казала яна, — вайна хутка скончыцца. Нашыя войскі ўжо занялі Прусію. Хутка немцы запросяць міру. Мы едзем дзеля гэтага недалёка, у Вялікія Лукі. Думаю, праз месяц, ну, самае большае, праз паўтара мы будзем зноў на старой кватэры. Дык прыглядзіце за ўсім, мілачка. Вось вам ключ. Будзьце як у хаце. Я зусім пакладаюся на вашую чэснасць.

Маленькі Пётра правёў паню на фурманцы на вакзал. На станцыі ў першым класе Пётра згубіўся. Там было столькі афіцэраў, і яны так блішчэлі, што ў беднага Пётры пацямнела ў вачох. Пані Загорская да гэтага часу, седзячы з ім побач, прыемна размаўляла, але ў першым класе яна стала старацца як мага хутчэй развітацца з ім. Ён і сам хацеў хутчэй выскачыць з гэтага праклятага класа. І таму, калі яна працягнула яму руку, ён, не памятаючы сябе ад радасці, пацалаваў яе і кінуўся ўцякаць праз дзверы.

Між тым вайна зацягнулася. Праз месяц, самае большае, паўтара, як думала Загорская, немцы не толькі не запрасілі міру, але занялі цэлую паласу расейскай тэрыторыі.



Прыйшлося выязджаць з Вялікіх Лук, папаўшых ужо ў прыфрантавую паласу. Загорская прасіла перасляць рэчы і ўсе грошы ёй у Харкаў, куды едуць з сынам. Тугоўская пераслала грошы ў хуткім часе, але ёй самой давялося падумаць, куды ўцякаць ад вайны. Была склікана сямейная нарада, на якой Пётра прапанаваў таксама Харкаў. Яму хацелася паступіць у рэальную школу разам з Загорскім. Матка згадзілася з ім, і так большасцю галасоў яны перамаглі бацьку, не жадаўшага нікуды ехаць з Бацькаўшчыны. У Харкаве трапілася спатканне. Прачкін сын сеў на адну лаву з сынам вучыцелькі-дваранкі. Цяпер ужо не давялося прачкінаму сыну плакаць пад сценкай школы за няўзнос платы. Яго звальнялі поўнасцю як уцекача з Бацькаўшчыны. І вось — раптам рэвалюцыя. Асвяжаючая навальніца пранеслася ў паветры, шмат смелых сэрцаў запаліла смагай волі і святла. Тугоўскі ажыў, ён пачуў, што ў яго выраслі крылы. Ён хадзіў на мітынгі, хадзіў на дэманстрацыі. Арганізоўваў вучняў і насіў чырвоную стужку.

Але не ўсе роўна віталі рэвалюцыю. Ён памятае: калі ішоў на Петраград з войскам Карнілаў, ён быў у цэлым класе адзін. Сабраліся вучні ўсіх школ і педагогі. Ён сядзеў у ліку меншай грамады з чырвонай стужкай за сталом прэзідыума. На сцэне — ён, «прачкін сын», «плебей». Загорскі з балкона з'ядаў яго насмешлівымі вачыма. Камісар прасветы Украіны Затонскі[16] чытаў даклад аб адзінай працоўнай школе. Як толькі ён скончыў, пачуўся шум воплескаў: уся зала, нават частка педагогаў, вітала ідэю працоўнай школы. Раптам да гэтых воплескаў з таго боку далёкай галёркі, дзе сядзеў Загорскі, пачуўся свіст на ўвесь тэатр. Затонскі, белы ад злосці, папраўляючы пенснэ на сваім мясістым носе, паспешна ўзышоў на кафедру:

— Нас не запужаеце, — пачаў ён. — Мы ведаем, што гэта свісталі папенькіны і маменькіны сынкі, але ў рабочым класе ёсць проціў іх вось што, — ён выцягнуў з кішэні рэвальвер, гледзячы проста на галёрку. На момант уся зала замёрла…

Чулася, як цяжка дыхаюць людзі. Тугоўскаму здалося, што зараз Затонскі будзе страляць у натоўп. Але праз хвіліну ён сышоў пад магільнае маўчанне.

Пачаліся прывітанні і зноў даклады, як быццам нічога дрэннага не было. Галёрка на гэты раз была спакойнай. Так

скончыўся дзень адзінай працоўнай школы. І так памерла ў Харкаве старая школа, не стала гімназіі.

Потым сацыяльная рэвалюцыя стала паглыбляцца: у Харкаве пачалося забіранне заложнікаў. Мала гэтага: у жахлівы мароз, якраз тады нябачаны ў Харкаве, «буржуі» былі сагнаны на пляцы перад саборам капаць магілы для ахвяраў рэвалюцыі. У люты мароз, дзьмухаючы ў пальцы, разводзячы велізарныя кастры, напужаныя людзі бралі непрывычна кіркі і білі па замёрзлай зямлі пад насмешкі натоўпу. Але не ўсе смяяліся.

— Далі бы лепш нам, беспрацоўным, пакапаць яму, — казалі з натоўпу рабочыя патрулям, што праходзілі міма. — Мы б хоць зарабілі грошы. А то яны не ўмеюць нават трымаць у руках кіркі. Так і за месяц нічога не выкапаеш.

Усе маўчалі. Адна толькі сацыял-дэмакратычная газета «Наш голас» пісала аб старым строі, перавернутым дагары нагамі.

Праз некалькі дзён малюнак змяніўся: бальшавікі, напэўна, паслухалі беспрацоўных. «Буржуі» былі адпраўлены па турмах, а іх места занялі ўжо рабочыя, якія ўзвялі велізарную чырвоную урну з надпісамі: «Паўшыя за Радавую ўладу».

Гэта урна заняла ўвесь пляц перад самым саборам і засланіла сабой чырвоны каменны дом, дзе змяшчаліся ўрадавыя ўстановы. Але нядоўга лёс судзіў ёй красавацца. Ужо чуўся на поўдні гром гарматаў, ужо траўшчалі кулямёты, ужо крок за крокам набліжаўся да Харкава Дзянікін[17]. Харчоў не стала. Рынак памёр.

Грошы сталі нявартымі паперкамі. Загорскі пацяшаўся… Ужо аднаго гэтага было досыць, каб Тугоўскі з трывогай сачыў за падзеямі.

І раптам, нечакана, кінуўшы некалькі бронецягнікоў, пакінуўшы трупы на вуліцах, бальшавікі здалі Харкаў… Усё жыхарства вітала першыя казачыя часці, увайшоўшыя ў места, багатыя людзі выносілі дзесьці схаваныя булкі, пячэнне, віно. Усе смяяліся, віталі адзін аднаго з збаўленнем.

І ва ўсіх цэрквах званілі ўва ўсе званы. У саборы адпраўляўся ўрачысты малебен за збаўленне ад Антыхрыста. Урна ламалася на дровы, магілы зроўніваліся з зямлёй і забрукоўваліся каменем. Па самай галоўнай Нікалаеўскай вуліцы хадзілі грамадой паны ў цыліндрах, дамы прыгожа, па-бальнаму адзетыя.



У адной кучцы Тугоўскі заўважыў Загорскую, ішоўшую пад ручку з афіцэрам. Яна часам рукой паказвала на якога-небудзь бедна апранутага чалавека: «Камуніст!» — і афіцэр зараз арыштоўваў яго на вуліцы.

Тугоўскі паспяшыў схавацца. Хто ведае, што яшчэ можа быць? Досыць якой-небудзь даме наўмысля паказаць на яго пальцам, каб яго забралі і павялі. А там спрабуй тады апраўдацца! І ў сэрцы Тугоўскага рабілася горка. Вось якая псіхалогія ў гэтых людзей, якія называюць сябе інтэлігентамі. Вось яны, прыгожыя дамы! Яшчэ на іх вачох валяліся прыкрытыя рагожай, акрываўленыя трупы матросаў і жаўнераў, а яны хацелі новых ахвяр, новай крыві. Па вуліцах гналі на расстрэл кучкі людзей (хто ведае, вінаватых ці не), нёслых галаву за ідэю ці, можа быць, проста за якую-небудзь помсту якога-небудзь узлаванага абываценя. Іх вялі светлым, радасным, сонечным днём, калі ўсё казала аб жыцці, калі ў мясцовых садах гуляў разубраны натоўп і чырыкалі весела птушкі, вялі на круты бераг… і там кулямётам касілі, як жывёлу.

— Распніце іх! — крычаў абывацель і радасна благаслаўляў булку белага хлеба.

У Загорскага радасці не было канца. Ён хадзіў качаць генералаў Май-Маеўскага і Куцепава[18], ён запісаўся санітарам у асобны студэнцкі батальён і прымушаў гэта самае зрабіць Тугоўскага.

— Мне няма часу. Я хачу вучыцца, — адказваў Тугоўскі. Гімназіі і рэальная школа якраз пачалі сваю дзейнасць, хоць вучняў у іх было вельмі мала. Усё вярталася на старое, разам з старым правапісам і літарай «ять».

Што было рабіць? Трэба было жыць… Трэба было прытарнавацца да новых абставінаў! І Тугоўскі, згубіўшы веру ў чалавека, з сумам у грудзёх пачаў жыць, пачаў вучыцца. Ён быў ужо ў апошнім класе рэальнай школы, і яму заставалася толькі некалькі месяцаў да яе сканчэння. Вучцелі ўжо абяцалі атэстаты з царскім арлом. Як раптам… Дзянікіна пагналі з-пад самага Арла.

Не паспелі нават апамятацца, як фронт апынуўся пад Харкавам і генерал Куцепаў абвясціў мабілізацыю ў першую чаргу вучняў апошніх класаў гімназіі, рэальнай школы.

Загорскі паступіў дабравольцам на бронецягнік. Тугоўскі разам з некалькімі жыдкамі-вучнямі рашыў дэзерціраваць.

…І ён спомніў цяпер у альтане, колькі перажыў за гэты час, спомніў, як ён дрыжэў ад кожнага скрыпу варотаў, спомніў, як дзянікінцы разбівалі магазіны і вінныя крамы, успомніў, як за дэзерцірства павесілі аднаго юнака на вулічным ліхтары. З таго часу ён больш нічога не ведаў аб Загорскім. Ён думаў, што яго ўжо не было ў жывых, як не засталося нікога з тых, з якімі ён вучыўся. І раптам яны спаткаліся ў Празе, на беларускім грунце. Як дзіўна! Тугоўскі ламаў сабе галаву над пытаннем: як магло стацца, каб дзянікінец і патрыцый мог папасці ў беларускі рух. Зразумела, Загорскі быў ужо не той: рэвалюцыйная бура зламала яго панскую гордасць і самазакаханне, але ўсё ж да чалавека з новай душой, беларуса, яшчэ было далёка. Прорва паміж імі ўсё-такі заставалася вялікая. Яна не стала меншай, чым была ў той час, калі на твары Тугоўскага загарэлася чырвоная пляма — «плебей».

Праўда, цяпер яна не была такой жахлівай, бо якраз душа Тугоўскага цярпела, яна пачынала перажываць мукі расчаравання.

Рэвалюцыя ўвайшла ў свае берагі… Рэвалюцыя, як мора, ускалыхнуўшае ўсё, што было на дне, зноў апусціла на дно тое, што там было. Хто быў нічым, той і застаўся нічым. І з сумам думаў Тугоўскі, як ён жыў пры бальшавіках, як кожны ранак ён нёс сваёй матцы бялізну ў чырвонаармейскую пральню. З сумам думаў ён, як заходзіў у склеп, поўны духаты, смуроду і пары, цёмны і шумны, дзе ў куце выцягвала бялізну з машыны, надрываючы свае апошнія сілы, матка.

— Гэта ваш сын? — пыталі работніцы ў пральні.

— Каб я мела такога сына, — сказала маладая работніца, — я б у гэтай пральні не працавала…

— Што рабіць? — уздыхнула Тугоўская. — Я працую, каб ён меў магчымасць вучыцца. Можа быць, вывучыўшыся, успомніць сваю старую матку.

— А на каго ж ты яго вучыш? — цікавілася другая работніца, больш пажылая.

— На інжынера…

— Ну, цяпер усе вучацца на інжынера, — зазначала пажылая работніца. — А хто ж тады боты будзе шыць? Вучыла б ты лепш свайго сына на шаўца.

Матка нічога не адказвала, ізноў бралася за бялізну.



Тугоўскі не мог перанесці гэтых размоваў. Яны рэзалі яго жывога ножыкам па горле і сэрцы, прымушалі ледзь не са слязамі на вачох хадзіць па ўстановах і прасіць сабе службу. Ніякай службы ён сабе не мог знайсці…

Тугоўскі сумны ішоў па вуліцах, а ў гэты час міма яго праносіліся аўтамабілі, у якіх сядзелі «спецы», адукаваныя людзі «добрых старых часоў». Хто чымсьці быў раней, той і зараз займаў добрае палажэнне. Не заставалася нічога рабіць. Тугоўскі паступіў у адчынены бальшавікамі Тэхналагічны інстытут, дзе выдавалі студэнтам пенсіі і паёк. Кожны дзень ён атрымліваў фунт чорнага хлеба і ішоў у сталовую, дзе падаваўся суп, прасквараны барановым лоем. За сталовай інстытуту пачынаўся белы прыгожы палац, у якім жыў камісар Украіны — Ракоўскі[19]. Наваккол яго размерана хадзілі вартавыя. І ў гэты час, калі Тугоўскі выходзіў з сталовай, наеўшыся бараняга супа, пад'язджаў на аўтамабілі камісар Ракоўскі з сваёй прыгожай жонкай, падаваў пропуск вартавым і знікаў у палацы. Як патаўсцеў ён за гэты час на вачох Тугоўскага! Прыехаў адкульсьці з Еўропы ў шыкарным аўтамабілі і ў бабровым футры такім худзенькім інтэлігенцікам! На пляцы, дзе прыняў парад арміі, яго віталі шматлікія масы народу. Але ў бабровым футры сярод убогіх хадзіць было няззручна. І Тугоўскі пабачыў, як ён зараз жа перапрануўся ў жаўнерскую гімнасцёрку, нацягнуў боты і накінуў шынель. Аднак і жаўнерская вопратка не магла схаваць таго, што ён таўсцеў, калі ўсе худзелі. Як было параўнаць жыццё яго ўласнае і жыццё яго маткі з жыццём Ракоўскага! Як было перацярпець яму, «плебею», вітаўшаму рэвалюцыю, гэтыя кантрасты! Так, нічога няма новага пад сонцам. Усё старое, як сам свет. І ён спомніў дзесьці вычытаныя словы нейкага філосафа: «Рабства на свеце не знікае. Мяняюцца толькі яго формы». Запраўды, ці не аднолькавае рабства, калі яго матка раней мыла бялізну пані Загорскай, а зараз мые бялізну чырвонаармейцаў… Змянілася толькі форма, нават стала горшай, але істота рабства, эканамічнага рабства — тая самая. Хто быў нічым, то і стаўся нічым.

Хутка ён не вытрымаў жыцця ў чырвоным Харкаве. Ён пачуў, што нешта цягне яго на Бацькаўшчыну, няхай у буржуазнае белае гаспадарства, але ўсё роўна. Ён чуў яшчэ востры пах вялікіх пакояў Загорскіх, ён бачыў перад сабой

разубраныя натоўпы народу, прыгожых паненак, і брыдка яму стала ад гімнасцёрак, памазаных ботаў, лаянак і семак, налусканых на падлогу. Хай будзе на новай Бацькаўшчыне рабства. Не страшна. «Рабства на свеце не знікае. Мяняюцца толькі яго формы».

І ён паехаў на Бацькаўшчыну. Беларускі рух пачынаў ужо свой поступ. Ён падхапіў Тугоўскага, падняў яго на свае хвалі і кінуў у абоймы беларускае гімназіі. Беларуская гімназія выбіла з яго меланхолію, натхніла жыццём і радасцей. Дырэктар гімназіі, вясёлы чалавек з доўгай чорнай барадой і залатымі акулярамі на доўгім, досыць тоўстым носе, больш падобны да грузіна, чым да беларуса, заўсёды казаў:

— Школа павінна даць сваім выхаванцам перш за ўсё веру, каб яны хадзілі смела з горда паднятай галавой.

І, выпускаючы яго ў Прагу, ён цалаваў яго і казаў:

— Ну, вяртайцеся назад толькі прафесарам. З вас выйдзе добры прафесар.

А вось цяпер што стала з ім? Ён ляжыць у зімнай альтане, восенню, калі нават звяры хаваюцца ў свае норы… Ён ляжыць пад коўдрай, калі няможна высунуць рукі. Хутка, напэўна, выпадзе снег… Няўжо яго доля спаць на снезе і, можа быць, на снезе замёрзнуць? Не… Ніколі! Звярыным гневам поўняцца яго грудзі. Узяць бы нож і, падобна «брацццям-разбойнікам», ісці па местах і вёсках…

Хто ён? Бадзяга з закончанай сярэдняй адукацыяй! Ён радзіўся пралетарыем, а стаў горш за пралетарыя. Хіба ён можа параўнаць сябе з чэшскім пралетарыем? У таго — чыстыя прыгожыя пакоі з добрай мэбляю, з каберцамі, з белымі пышнымі пярынамі, што красуюцца на пасцелі, з кветкамі на вокнах і птушкамі ў клетках. А ў яго…

У гэты час астральны чалавек скончыў сваю дэкламацыю. На хвіліну ў альтане стала ціха. Нарэшце Тугоўскі прамовіў:

— А вы ўсё ж такі добра дэкламуеце… Ведаеце, як жывых пабачыў «брацццяў-разбойнікаў». І пад уплывам вашай дэкламацыі ўспомніў усё сваё жыццё.

Астральны чалавек маўчаў.

— Я ўспомніў сваё жыццё, — прадаўжаў Тугоўскі, — і мне проста хочацца трапятаць і плакаць. Колькі памылак… Ах, колькі памылак… Якое няўдалае жыццё, якое цёмнае жыццё на дне, дзе капошацца чэрві… Так, роджаныя поўзаць — лётаць не могуць. Я радзіўся поўзаць. Я радзіўся пад праклятым Сатурнам.

— Сёння ў нас важнае паседжанне спірытычнага гуртка, — прамовіў астральны чалавек. — Пойдзем…

— Не… Сёння я дрэнна сябе чую, — адмовіўся Тугоўскі.

Астральны чалавек замаўчаў і як мага хутчэй пачаў апранацца. Праз хвіліну ён паляцеў у інстытут, пакінуўшы ў альтане аднаго Тугоўскага. Тугоўскі паляжаў крыху, але потым таксама ўскочыў, хутка апрануўся, накінуў на сябе коўдры і, дастаўшы аркуш паперы, пачаў пісаць. «Споведзь самагубцы. Кніга для ўсіх і ні для кога», — прыгожа вывеў ён на вокладцы. «Сёння, калі прыгожы восеньскі дзень разалье сваю чырвоную кроў на захадзе, і калі ён пачне сінець, і калі наступіць вечар, у лес да соснаў прыйдзе чалавек, каб пагутарыць апошні раз. Ён скажа так: “Роўна 24 гады таму назад у маленькім месцы, у сям’і работніка, у склепе, радзіўся чалавек”. Якой пароды быў гэты чалавек? Кажуць: “Чалавек родзіцца для шчасця, як птушка для палёту”. Але пароды птушак бываюць розныя, і палёты бываюць розныя. Адны роджаны для таго, каб стаць вераб’ямі, і як бы яны ні хацелі, ім не падняцца вышэй страхі маленькай хаты, не адляцець далей нейкага мейсца чалавечага жылля. Другія ж родзяцца каршунамі, каб лётаць высока пад небам, каб у пэўны момант накінуцца на слабейшых і адняць ад іх жыццё і шчасце. Людзі родзяцца і жывуць, як птушкі… Ніхто не ведае, што вылупіцца з яйка, ніхто не ведае, чым стане чалавек. Як птушка, у гняздзе якой пакладзена зязюлінае яйка, не ведае, што яна выседзіць зязюлю, так ніхто не ведае, што выйдзе з растучага чалавека: зязюля ці каршун. Але чалавек расце. Ён чуе, што ў яго адрастаюць крылы. Ён бачыць, што пад небам лётаюць сакалы. І ў сэрцы яго кладзецца жаданне: чаму я не сокал, чаму я не магу лётаць над светам… Паляту… І ён ляціць. Ён прабуе зрабіць гэта раз… Не выходзіць. Ён чуе, што яго крылы слабыя; ён прабуе падняцца другі, трэці, чацвёрты, дзясяты раз — і не можа. Тады ён пакідае сваё жаданне. Ён пачынае задумвацца і знаходзіць, што ён ужо зусім не сокал, ён жа радзіўся вераб’ём… Так пазнаюцца законы жыцця.

Зразумела, што гэтыя законы кіруюць чалавекам з самага малку. Скажам, радзіўся чалавекам вераб’інай пароды. Калі ён вырасце, будзе не больш, як верабей, як бы ён ні імкнуўся, якія б універсітэты ні канчаў (і дурні канчаюць універсітэты),

але ён не можа стаць сакалом. Так рашыла прырода, такі закон жыцця. Аднак мы прарочым дзяцёнку вялікую будучыню, мы кажам: ён будзе інжынерам, прафесарам.

Хоць між тым лёс чалавека ўжо вырашаны: ён будзе ўсё жыццё канцылярскім чыноўнікам. Здаецца, так проста і ясна: лёс чалавека існуе ракой яго жыцця. Адны будуць вераб'ямі, другія сакаламі… А ўсё ж што вельмі проста, то вельмі мудра. Людзі не хочуць прызнаць, што лёс існуе і кіруе жыццём. Яны кажуць: мы вольныя птушкі, давайце будзем лётаць пад небам, над нязведанымі краямі. Можа быць, гэта і хвароба, можа быць, трэба спяваць гэтай безразважнасці песню, але ўсё ж гэта безразважнасць. Закон жыцця строгі і бязлітасны, як суддзя. Цяпер трэба даведацца, дзе ў чалавека знаходзяцца крыллі? Крыллі гэтыя знаходзяцца ў мозгу. Так, у мозгу… Мудрыя сосны, слухайце, шуміце сваімі пышнымі галовамі… У мозгу пачынаюцца ўсе палёты, ад мозгу залежыць якасць народа, але ад чаго залежыць якасць мозгу?

Я бачыў калісьці фатаграфію мозгу ангельскага пісьменніка Шэкспіра[20] і простага ангельскага работніка. Мозг быў аднолькавых памераў, але ў Шэкспіра звіліны ішлі правідловымі і выразнымі лініямі, у той час як у работніка яны былі невыразныя і зусім не правідловыя. Дык ад чаго залежыць праца мозгу — ад звілінаў, ці ад іх колькасці, ці, можа, ад якіх-небудзь іншых прычынаў?..

Кажуць, што ў геніяльнага нямецкага матэматыка Гаўса[21] мозг важыў больш за ўсіх вядомых дагэтуль мазгоў — каля 3-х кілаграмаў; маскоўскага пісьменніка Тургенева[22] — каля 2-х з паловай, а італьянца Дантэ, вядомага на ўвесь свет сваёй «Боскай камедыяй»[23] — толькі 1,5 кілаграма. Зразумела, што такі чалавек, галава якога ледзь трымаецца пад цяжарам 3-х кілаграмаў, павінен быць геніяльным. Значыць, з другога боку, праца мозгу залежыць ад яго вагі.

Кажуць яшчэ, праца мозгу залежыць ад маленькай жоўтай матэрыі, называемай мазжачком. Хто ведае? Самі вучоныя, здаецца, на гэтыя пытанні не могуць нічога адказаць пэўнага. І дурань, і мудры нічога не ведае. Яшчэ Сакрат[24] сказаў: «Я ведаю толькі тое, што я нічога не ведаю». Але як бы там ні было, палёты людскія і парода людзей залежаць ад мозгу.

І можа быць, мілыя сосны, праз 300 гадоў, калі ўжо і вас не будзе, у лес прыйдзе чалавек і раскажа, што ён прыдумаў



такія праменні, як зараз рэнтгенаўскія, якія праходзяць праз чарапны кошык і адразу паказваюць, што гэты чалавек будзе вераб'ём, гэты — каршуном ці сакалом… Можа быць, тады вераб'ёў будуць нішчыць, як непатрэбных? Тады запануе толькі здаровая, разумная людскасць і жыццё стане прыгожым. Аб гэтым нават думае новая навука. Але пакуль гэтага няма. Вераб'і жывуць і спакойна сабе чырыкаюць…

Так вось якой пароды быў чалавек, што радзіўся ў склепе. Ён быў самы звычайны шэранькі маленькі верабей. Ён хацеў, каб ад яго аднялі яго жыццё: ён не хацеў быць больш вераб'ём. Мудрыя сосны! Вы жывяце 100 і больш гадоў, вам дадзена магчымасць шмат ведаць, што робіцца ў вашых гушчарах; вам дадзена магчымасць паднімацца высока ў вечнае неба… Скажыце мне, ці прыходзілі да вас такія, як я, ці прыносілі яны сваю душу вам, як я, ці прасілі яны развяваць іх тугу, як я?..

Маёй тугі вам не развеяць, як не зламаць магутнаму ветру вашых стваловў. Так, мудрыя сосны! Сёння ўночы, у 12 гадзін, да мяне прыйдзе прыгожая паненка ў белым, імя якой — Смерць. Яна пацалуе мяне і ахопіць мяне ў свае абоймы. Я пачую яе моцнае дыханне і яе смех. І я скажу ёй у яе абоймах: "Я — маленькі шэранькі верабей. Я не хачу чакаць таго часу, калі ты, Смерць, паклічаш мяне. Я сам іду да цябе, я ляту ў твае абоймы. Я зразумеў, што без цябе жыць няможна. Як жыць курыцы з яе мозгам, калі яна ведае, што існуе каршун, хітрэйшы за яе. Усякая курыца павінна была сама ляцець у твае абоймы, магутная Смерць. Яна гэтага не робіць. Тым горш для яе. Я прыйшоў да цябе. Я маленькі шэранькі верабей. З маленькіх шэранькіх вераб'ёў я яшчэ належу да той пароды, якая заўсёды пападаецца ў няшчасныя сеткі, якая апутана няшчаснымі выпадкамі, і распутаць іх мяшае ім іх маленькі мозг. Дык я адзін іду да цябе, мая збавіцельніца Смерць. Я не клічу за сабой маіх братоў — людзей, маленькіх людзей вераб'інай пароды. Няхай яны жывуць… Няхай дыхаюць паветрам… Няхай хваляць сонца і прыклікаюць жыццё… Шчасліва заставацца… І скажа мне прыгожая Смерць: "Мілы мой, любы. Бачу, ты шчыра пакахаў мяне. Вазьмі моцную вяроўку, абві каля свае шыі і падыміся разам са мной на моцны сук. Я абдыму цябе моцна за шыю, і мы так заснём, і будзем калыхацца на суку. Сосны будуць спяваць нам свае гімны. Сонца будзе асвячаць

золатам сваіх праменняў. А заўтра зранку, ледзь зачырыкаюць птушкі, прыляціць у лес пастушка з каровамі, пабачыць, што ты качаешся на суку, ахне, спужаецца, паляціць дахаты клікаць людзей… Здымуць нас з табой з арэляў, але мы будзем з табой вечна, вечна разам: ты будзеш спаць у маіх абдоймах, мой мілы, бескаштоўны Пётра Тугоўскі”. Так, мілыя, мудрыя сосны, адкажа мне паненка, якую я выбраў сам і якая прыйдзе сёння ў дванаццаць гадзін ночы… Слухайце: я кажу яшчэ вам аб тых, якія будуць плакаць аб маленькім чалавеку вераб’інай пароды… Далёка яны адсюль…»

— Стой! Хто тут? — крыкнуў чыйсьці вясёлы голас настолькі моцна, што ён аж уздрыгнуў і выпусціў з рук аловак. А, вось яна, прапаўшая грамата. Вось калі знайшоў, — крычаў вясёлы айцец Кірыла.

Тугоўскі спужана і незадаволена глядзеў на няпрошанага госця.

## V

— Пішаш? — пытаў айцец Кірыла, прысаджваючыся на вялікую лаву ў альтанцы і паглядаючы на Тугоўскага сваімі насмешлівымі вачыма: — Ён усё піша, піша, і нагой усё калыша…

Тугоўскі маўчаў.

— Што ж ты пішаш такога? Дысертацыю якую-небудзь? Можна паглядзець?..

— Не, — суха адказаў Тугоўскі. — Гэта ліст дахаты. — І схаваў паперу ў кішэню.

— Тэк-с… Але ты спальню выбраў знамянітую, — айцец Кірыла сплюнуў. — Відаць, тут нямала павукоў начуе… Вунь якія кросны насучылі яны.

— Так, лепшай спальні не знойдзеш у Празе, — зазначыў Тугоўскі.

— А ты пераязджаць не збіраешся? — І не даўшы адказаць Тугоўскаму, прадоўжыў: — Ведаеш, цябе шукаюць у Празе. Не паліцыя, не, а Беларуская грамада ў Празе. Ніхто не мог мне сказаць, дзе ты. Я толькі выпадкова цябе знайшоў…

— Не трэба было знаходзіць, — сярдзіта сказаў Тугоўскі. — Я яшчэ нічога ні ў каго не ўкраў, каб мяне шукалі.



— Вось як… Табе дабра жадаюць, а ты надуваешся, як індык. Так ты, брат, у жыцці загінеш, і ніхто не захоча цябе падтрымліваць.

— Я не прашу дабра ў людзей, — прадоўжыў Тугоўскі. — Я ні ў каго нічога не прашу. Калі я й загіну ў жыцці, дык загіну… Ад гэтага нікому не будзе ні студзёна, ні горача. Я прашу пакінуць мяне ў супакоі. Мне ўжо абрыдла людская ўвага. Я ведаю цану людскому спачуванню.

— Ды кінь ты, — сплюнуў айцец Кірыла, насунуўшы капялюш на патыліцу. — Не накрывай на сябе плашча Гамлета — табе гэта зусім не падыходзіць. Такія Гамлеты, ведаеш, страляюцца… А страляцца, — ён сплюнуў, — глупства. Тым больш, што табе жыццё ўсміхаецца. Другі на тваім месцы пацяшаўся б. Ведаеш, што табе прызначана стыпендыя, і не частковая нават, а поўная, з выдачай ботаў, касцюма і паліто? Ведаеш ты гэта?..

— Стыпендыя? — зарухаўся Тугоўскі. — Поўная стыпендыя?!. Вельмі дзякую! Скажы ім, калі ласка, што яна мне не патрэбна.

— Што ты, звар’яцеў? — ускочыў Кірыла. — Табе не патрэбна стыпендыя? Нашто ты тады ехаў у Прагу?

Тугоўскі змаўчаў.

— Я думаю, ты не герцаг які-небудзь, якому не патрэбна стыпендыя, не Загорскі які-небудзь, якому можа прыслаць матка з хаты. Ты з такой самай працоўнай грамады, як і я.

— Слухай, айцец Кірыла, — прамовіў Тугоўскі з бліснуўшымі слязінкамі на вачох. — Не старайся мяне пераконваць. Я ўсё ўжо ўзважыў, усё падлічыў. Падвёў усе балансы ў той момант, калі быў адзін па начох у сваёй альтане. Ведаеш, ёсць моманты, больш важныя за хлеб, за ежу, за стыпендыю. Ёсць моманты, калі не хочацца ні піць, ні есць. Ты, напэўна, чуў, што ў турме часам арыштанты аб’яўляюць галадоўку? Так вось, брат: значыць, ёсць мукі і больш цяжкія, чым голад, ёсць так званыя й маральныя мукі. Вось гэтыя мукі прымушаюць мяне адмовіцца ад стыпендыі. Ты робіш зноў здзіўлены твар… Ну добра… Дапусцім, што я згаджуся атрымаць стыпендыю, стану студэнтам. Ну й што пасля гэтага? Жыць, калі ты чуеш поўны ўпадак сіл, калі ў цябе баліць сэрца, мучыцца свядомасць… Слухай, айцец Кірыла: жыць без таленту, без аднаго

хоць якога-небудзь таленту, жыць разачараванаму ў самім сабе, жыць з пэўнасцю, што табе ўсё роўна нічога не ўдасца, згадзіся сам — немагчыма.

— Цьфу! — плюнуў айцец Кірыла. — Адкуль ты ведаеш, што табе нічога не ўдасца? Бяры, што ты можаш зрабіць, бяры па сваіх сілах — і табе ўсё ўдасца. Каб табе нічога не ўдалося б — так-такі зусім, зусім нічога — гэта немагчыма. Ні адзін жывы чалавек гэтага не скажа. Калі ты так думаеш, тады ўжо ты, запраўды, нежывы чалавек, тады толькі рухомы труп. Тады я ў табе вельмі памыліўся.

— Так, айцец Кірыла, я стаў ужо трупам. Я — чалавек, катораму толькі што мінула 24 гады, стаў ужо трупам!.. Трагедыя, годная пяра Шэкспіра, праўда? А калі гэта так, дык нашто трупу яшчэ бадзяцца па свеце?.. Нашто яму стыпендыя?.. Няхай карыстаюць з яе тыя, хто яшчэ жывы, хто думае ў імя чагосьці разбіваць сабе галаву. Няхай твораць камедыю комікі, якія ўмеюць смяяцца…

— Так, брат, неўрастэнія ў цябе, вострая неўрастэнія. Можаш ісці да любога доктара: ён скажа табе тое самае. Ты думаеш, што кажаш страшэнна мудрыя рэчы. Нікольк і, выбачай. Твая, з дазволу казаць, філасофія не мае ў сабе нічога цікавага. Хоць бы што-небудзь годнае ўвагі, над чым трэба было б прызадумацца. Пустата… Пагляд на жыццё неўрастэніка.

— Паважаны айцец Кірыла! Ты толькі пацвярджаеш маю думку аб самім сабе. Чым далей, тым больш пераконваеш мяне, што мне жыць не варта…

— Калі так, дык памірай. Я ў табе памыліўся. Я думаў, што ты з працоўных, з сялян ці работнікаў, што ты моцна, па-дзедаўску, гатоў чапляцца за жыццё, нягледзячы ні на якія мукі й болі. Я думаў, што ты прыйдзеш у нашу грамаду і станеш у шэраг тых, хто гатоў гінуць за работнікаў, як кажуць, за вялікую справу ўсялюдскага кахання… А ты — інтэлігент, хворы інтэлігентнымі хваробамі. Такіх інтэлігентаў я цярпець не магу. Тады жадаю табе шчаслівай смерці, як і ўсякаму інтэлігенту. — Ён падняўся, каб ісці.

— Пачакай, айцец Кірыла… Пачакай, — прамовіў Тугоўскі, ужо не жадаючы, каб ён сыходзіў. У яго патроху ўжо праходзілі настроі, навеяныя пісаным лістом. Ён быў заварушаны словамі Кірыла аб інтэлігентах. — Пагутарым па-сяброўску. — Кірыла



зноў сеў. — Ведаеш, ты нагадваеш таго чалавека, каторы зняў з пятлі самагубцу і зараз стараецца вярнуць яго да жыцця. Але гэтаму самагубцу не так лёгка прымірыцца з жыццём: павінен прайсці пэўны час. Так і для мяне павінен прайсці пэўны час, пакуль я звольнюся ад уплыву маіх ідэй. Справа ў тым, што я радзіўся пад Сатурнам… — Ён расказаў Кірылу тое, што вычытаў з кніжак, дадзеных астральным чалавекам.

— Кінь ты, — засмяяўся айцец Кірыла, — не вер ніякім уплывам Сатурна! «Чалавек — гэта гучыць горда», разумееш?.. Кожны — сам каваль свайго шчасця, і зусім начхаць на Сатурн. Гэта тэорыя знайшла ў тваім «я» адпаведны грунт, таму што ты хворы інтэлігент. Але ўсё ж, думаю, пакалупаць цябе пальцам — дык усярэдзіне тваёй акажацца здаровы селянін. Не… Ты не павінен тут заставацца! Чым хутчэй пераедзь на прыватнае памяшканне ў Прагу, бо стыпендыя ў цябе ёсць. І, апрача таго, павінен парваць адносіны з гэтым «астральным чалавекам». Разумееш? А цяпер апраніся лепш і пойдзем разам да мяне. Я цябе не пакіну. А калі ты застанешся, дык я пайду і заяўлю ў паліцыю пра тое, што ты толькі што збіраўся скончыць жыццё самагубствам. Ты ў маіх руках! — Ён рассмяяўся.

— Ну што ж, — усміхнуўся таксама Тугоўскі, — спрабую цябе паслухаць. Спрабую яшчэ атрымаць стыпендыю і стаць студэнтам. Паглядзім, што з гэтага будзе. Зробім, як казалі бальшавікі, «перадышку».

— Будзем жыць, — зазначыў айцец Кірыла. — Пераедзеш на кватэру, станеш чалавекам, а не такім бадзягай. Станеш і думаць зусім інакш. Я цябе пазнаёмлю з паненкай. Дзіўная паненка, каб ты ведаў… Нядаўна толькі прыехала. Усе студэнты пераcталі з-за яе вучыцца, далібог. Толькі й ходзяць да яе ў Студэнцкі дом фліртаваць. Яна якраз вельмі хоча з табой пазнаёміцца. Яна выганіць з цябе ўсякую неўрастэнію! Вылечыць з гарантыяй. У такіх выпадках, як у цябе, калі не хочацца ні піць, ні есці, адзінае лякарства — жанчына. Захочаш і піць, і есці…

VI

Тугоўскі не скончыў жыццё самагубствам. Але сваёй «Споведзі самагубцы. Кніга для ўсіх і ні для каго» ён не спаліў. Ён толькі схаваў яе далёка ў папку разам з сваімі дакументамі, магчыма, не веручы, што стыпендыя і ўніверсітэт могуць вярнуць яго да жыцця. Ён чуў поўны ўпадак сіл, чуў, што тэорыя астральнага чалавека аб «роджаных пад Сатурнам» не выпадкова апанавала ім, не зацікавіла яго як жарт, але глыбока ўвайшла ў яго псіхіку і кіруе яго думаннем, яго светаглядам. Кожнага чалавека, якога ён спатыкаў на вуліцы, ён зараз жа стараўся падвесці пад астральную тэорыю, пытаючы, пад якой зоркай гэты чалавек радзіўся. Яму было цікава праверыць тэорыю на жыццёвых фактах. І цяпер яго ўласнае жыццё стала не больш, як толькі праверкай тэорыі. Ён згубіў ужо тую непасрэднасць пачуццяў, тую жывасць адчуванняў, якая бывае ў жывога, зацікаўленага жыццём чалавека; другімі словамі, ён глядзеў на жыццё, як даследчык глядзіць на марскую свінку, робячы над ёй розныя аперацыі. Яго не цікавіць самая свінка, яе пачуцці, радасці і болі, а цікавіць, як адпраўляюцца функцыі яе органаў згодна ягонай тэорыі.

«Што ж, — думаў Тугоўскі. — Я магу яшчэ жыць. Паглядзім, ці спраўдзіцца тэорыя аб “роджаных пад Сатурнам”». І ён адклаў часова набок увесь сум «тэорыі» і стаў жыць, Кірыла Бурачэўскі «ўводзіў» яго ў грамадзянства. За гэтыя часы свайго жыцця ў альтане Тугоўскі адвык ад людзей і таму трымаў сябе вельмі няпэўна ў Студэнцкім доме: яму здавалася, што рукі ў яго былі задоўгія, ногі вельмі крывыя і смешныя, і сам ён паходзіў на коміка, прывезенага з вёскі.

— Ну й шынель у цябе, — засмяяўся востратвары Малевіч, падмятаючы падлогу Студэнцкага дому.

— Адразу відаць, што з Азіі прыехаў, — падхапілі некалькі студэнтаў.

Тугоўскі пачырванеў і са страхам глянуў на Вярхоўскую, якая сядзела на крэсле, акружанаю навокал студэнтамі: ён пужаўся, што яна засмяецца сваім звонкім смехам. Мужчыну цяжэй усяго перанесці насмешкі жанчыны. Але яна не засмяялася. Бачачы, што ён пачырванеў, яна, быццам дакараючы студэнтаў, наўмысля гучна запытала, каб перамяніць размову:



— А скажыце, грамадзянін Тугоўскі, на які факультэт вы думаеце паступіць?

Гэта пытанне адразу дало яму тэму і падняло яго пэўнасць. Ён глянуў на яе з удзячнасцяй і ўспомніў, што з ім здарыўся такі самы выпадак, як з адным бадзягай, аб якім ён дзесьці чытаў. Два бадзягі ішлі па вуліцы нейкага ангельскага места, гатовыя напасці на першага прахожага. Раптам з-за кута выйшла нейкая дама з карзінай і стукнулася з бадзягай настолькі моцна, што той ледзь утрымаўся на нагах.

— Выбачайце, — прамовіла дама. Бадзяга зняў капялюш і застаўся нерухомым на вуліцы.

— Што з табой? — зарагатаў яго сябра. — Ты ніколі нікому не здымаў капелюша…

— Не ў тым справа, — адказаў бадзяга, — а ў тым, што яна мне, бадзягу, сказала «выбачайце». Разумееш? Яна і мяне палічыла за чалавека. Вось што ў мяне стукнула, а не яе карзіна…

Успомніўшы гэта, Тугоўскі з задавальненнем глянуў на прыгожую паненку. Яна ў ім пабачыла чалавека… Мілая, невымоўна мілая паненка… Яна не засмяялася з яго так, што ён, напэўна, больш не паказаўся б у Студэнцкім доме. Яна пачала з ім гутарку, нягледзячы на тое, што навакол сустракала насмешкі і здзіўленне чужаземных студэнтаў. Яе, модна апранутую, прыгожую і пэўную ў сваіх руках, лічылі сапраўднай еўрапейкай. Але яго — у доўгім шынялі, у фрэнчы, у шапцы з бліскучым казырком?.. Яго маглі палічыць толькі за бадзягу. Між тым гэта еўрапейка ніколькі не адцяняла сваёй перавагі над ім, — наадварот, яна гутарыла з ім як роўная з роўным. Размова лёгка пераскочыла на літаратуру, у якой шмат тэхнікаў і медыкаў былі прафанамі, і ім давялося замаўчаць, потым перайшлі на філасофію. Студэнты пачалі расходзіцца.

— Глупства пляцеш, — казаў Малевіч, адыходзячы з групай тэхнікаў. — Ну, што ж, філасофія ёсць навука аб ні для кога не абавязковых ісцінах.

— Можаце ісці, — адбіваў удар Тугоўскі.

— Правідлова, правідлова, — казала Вярхоўская, — давайце пагутарым мы з вамі. Нам з вамі цікава.

Яны засталіся адны гутарыць і перайшлі ў залю. Тугоўскі, як яшчэ не сябра Студэнцкага дому, гатоў быў сесці куды-

небудзь у куток, каб іх ніхто не бачыў, але яны — усіх. Вярхоўская ж смела заняла ў зале самае цэнтральнае мейсца — на мяккім круглым дыване, ішоўшым навокал стаўба, што быў убіты ў падлогу і падымаўся аж да столі; некалькі студэнтаў у фраках пасунуліся, каб даць мейсца Тугоўскаму ў фрэнчы. Тугоўскі застаўся адзін з прыгожай паненкай, пахі ад якой казыталі яго нервы і цела якой датыкалася да яго. Ён сядзеў як на іголках. Ён гутарыў дрыжачым голасам, але на твары і ў вачох яго свяцілася задавальненне. Доўга, больш паўгадзіны, ён развіваў перад ёй сваю тэорыю «роджаных пад Сатурнам». Каб паказаць сябе вучоным, ён ужываў розныя астранамічныя тэрміны і назовы зор. Яна слухала яго ўважна, час ад часу павяртаючы свой прыгожы твар у яго бок, асвячаючы яго пытлівым сінім агнём сваіх вачэй. Яна горда запратэставала, як толькі ён скончыў.

— Ваша тэорыя, — прамовіла яна, — здаецца мне тэорыяй чалавека, які чуе сябе страшэнна змучаным, кінуў вёслы і думае плыць па цячэнні. «Няхай будзе так, як будзе», — у гэтым ваша тэорыя. У гэтым істота і фаталізму. А гэта не правідлова. Трэба жыць проціў цячэння: «Проці цячэння вады зможа толькі жывое паплыць», — у Багдановіча[25].

Тугоўскі ўспомніў пра Максіма Багдановіча. Размова перайшла на яго жыццё і выдатныя творы.

— Мне здаецца, калі ўважна ўдумацца ў яго жыццё, яно было нешчаслівае, — сказаў на развітанне Тугоўскі. — І я думаю, што ён, напэўна, радзіўся пад Сатурнам…

— У вас усе радзіліся, напэўна, пад Сатурнам.

— Чаму? Не… Талстой[26], напрыклад, радзіўся пад Сонцам. І таму жыццё яго было сапраўды сонечнае. А вось Дастаеўскі[27] радзіўся пад Сатурнам. І таму жыццё яго было сапраўды жахлівае. Катарга, потым падучая хвароба, матэрыяльныя турботы. Што можа быць горш за гэта, скажыце?..

— Цікава, пад якой планетай я радзілася? — засмяялася звонка Вярхоўская.

— Скажыце мне ваш месяц і год нараджэння, — прапанаваў ён, — і вам я зараз дам адказ.

— Я радзілася… — Яна спынілася, пільна гледзячы на Тугоўскага, какетліва схіляючы галаву, — у ліпені месяцы…



Году… А вось году якраз я вам не скажу. — Яна зноў засмяялася.

— Чаму?

— Таму што вы будзеце вельмі старым, калі ўсё будзеце ведаць.

Яны рассталіся задаволеныя. У абодвух захавалася ад першага спаткання мілае ўражанне. Тугоўскі быў на сёмым небе. Ён усю дарогу чуў яе пах, ён бачыў перад сабой дзіўныя глыбокія сінія вочы… Ён сапраўды пачуў, што пачынае ажываць і нейкая бадзёрасць ахоплівае яго. У Студэнцкім доме ён спаткаў Кірылу.

— Ну як першае ўражанне?

— Ой, айцец Кірыла, надзвычайнае… Гэта прыгожая жанчына мае яшчэ мазгі Саламона. Ведаеш, такую бы пацалаваць раз — і памерці.

— Ого, ужо інакш гутарыш. Я казаў, што дам добрае лякарства. Ну што, вылечыць?

— Так, брат. Сёння я першы раз пакаштаваў гэтае лякарства, адну кроплю толькі, але думаю, што вылечыць.

— Ну вось… Я так думаў. Цяпер бы толькі як-небудзь яе заманупь да нас на кватэру, каб бліжэй з ёй пазнаёміцца… Інтымна, хе-хе, — засмяяўся Кірыла.

— Імяніны бы якія-небудзь улаштаваць, ці што, і яе запрасіць, — засмяяўся таксама Тугоўскі.

— Ага… Ідэя. Праз тыдзень я вытрымаю першы дзяржаўны іспыт і буду інжынерам-кандыдатам. Вось па гэтым выпадку можна будзе склікаць каго-небудзь з беларусаў на ўрачыстасць і яе запрасіць, хе-хе…

— Лоўка, айцец Кірыла, — пляснуў у далоні Тугоўскі, — далібог, лоўка. Будзем вітаць першага беларуса з чынам інжынера і паненку зацягнем у свае сеткі. Лоўка. Прыемнае, як кажуць, з карысным. Недарма ты ў нас інжынер.

— Толькі ўгавор. Улаштаваць урачыстасці давядзецца табе, бо я зараз заняты іспытамі.

— Мне? — Тугоўскі паморшчыўся. — Няма ў мяне, брат, арганізатарскіх талентаў. Я гэтым ніколі не займаўся. А першы блін заўсёды комам.

— Нічога… Гарэлкі й закускі толькі болей — і ўся арганізацыя.

— А можа быць, яна гарэлкі не п’е? — запытаў Тугоўскі, не жадаючы здавацца.

— Ну… тады віна… Словам, мы аб гэтым пагутарым, што купіць. А цяпер бывай… — ён працягнуў руку Тугоўскаму на развітанне. — Вельмі добра будзе, — сказаў ён у дзвярох. — Мы якраз улаштуем і ўрачыстасць з прыгоды атрымання табой стыпендыі.

Тугоўскі нічога не адказаў. Ён весела пайшоў дахаты. Ён пачынаў думаць аб жыцці, закідваючы думкі аб самагубстве.

## VII

Кірыла жыў на акраіне Прагі, у рабочым раёне, так званым Кошыжэ, у маленькім пакойчыку. Яго гаспадар пан Бэран, кравец па прафесіі, быў халасцяком і жыў толькі са сваёй састарэлай маткай. Дзеля таго, што матка не магла ўжо нічога ні варыць, ні гаспадарыць, ледзь шаўкала сваім бяззубым ротам, ён рабіў усё сам і ў гэтым напрамку выказваў надзвычайныя здольнасці. Ён сам пёк булкі, ён сам смажыў мяса, сам падмятаў і прыбіраў пакой Кірылы. Пан Бэран быў высокі, стройны чалавек з чырвоным тварам, рудымі кучаравымі валасамі, як у барана, і з фіялетавым носам, што сведчыла аб яго немалым заляцанні да алкаголю. Аб сваім каханні да алкаголю ён казаў, што навучыўся піць пад час вайны, на сербскім фронце, дзе як жаўнер аўстрыйскай арміі быў ранены, трапіў у палон — і толькі нядаўна вярнуўся ў Чэхію. Было гэта так ці не — невядома, але факт кахання існаваў, і не было амаль што нядзелі, каб яны не выпівалі з айцом Кірылам. Пан Бэран быў інвалідам. Сусветная вайна выбіла яго з каляі жыцця і, можа быць, таму, што ў яго жыцці нічога больш не заставалася, апрача чакання свайго канца, ён любіў маладосць, любіў маладых, бадзёрых студэнтаў і іх забавы, любіў і сам яшчэ прыняць у іх удзел. Хто бачыў смерць, той умее кахаць жыццё. Пан Бэран умеў кахаць жыццё, нават у самых маленькіх яго праявах, і таму не дзіва, што ён з радасцей згадзіўся прыняць удзел у арганізацыі «свята», як казаў яму айцец Кірыла. У назначаную нядзелю пакой Кірылы блішчэў ад чыстаты, ад белага абруса на стале, ад розных каробак кансерваў, ад чарак і бакалаў.



Са смехам сапраўднага гастранома пан Бэран наставіў розных запечаных каўбасаў, цяляціны, вінегрэту, а самае галоўнае, дымíўшыхся парам кнэдлікаў з капустай. «Кнэдлікі» — гэта першае і апошняе слова чэшскай кухні. Яны падаюцца заўсёды, у будныя дні і ў свята, у беднага і ў багатага, калі чалавек родзіцца і калі памірае. «Кнэдлікі» — звычайнае поснае цеста з пшанічнай мукі — замяняе чэху хлеб, бо звычайна ён за полуднем хлеба не ўжывае (за выняткам так званых «гоўсэк» — булак, пасыпаных солей). «Кнэдлікі» служаць як прыправа для мяса, як асобнае блюда з соусам. Нарэшце, аблітыя чым-небудзь салодкім, — як дэсерт.

Апрача закусак пан Бэран паставіў розных бутэлек з вішнёўкай, з лікёрамі і з асобнай сербскай гарэлкай. Як ён казаў — «слівовіцэ». Гэтую сербскую слівовіцу ён прапануе дамам, калі і яны будуць.

У назначаны час госці не сабраліся, прыйшоў толькі адзін Тугоўскі, якога цяпер няможна было пазнаць. Ён скінуў з сябе сваю даўгаполую «азіяцкую» шынель, шапку з казырком і закрыты фрэнч. Цяпер на ім было кароткае «еўрапейскае» паліто, атрыманае з камітэту разам са стыпендыяй, зялёны касцюм, каўнер з манішкай і з гальштукам. Пан Бэран хадзіў каля дому, паглядваў на дарогу і, бачачы, што госці не ідуць, лаяўся па-руску: «Чартаўшчына! […]»

Хто яго навучыў з студэнтаў так казаць, было невядома, але гэта былі два словы, якія ён ведаў па-руску. Госці збіраліся пакрыху. Толькі праз гадзіну, якая падалася цэлым днём, нарэшце ўсе сабраліся і загаманілі. Калі ўсе расселіся за сталом, шчоўкнуў фатаграфічны апарат — і Загорскі, смеючыся, прамовіў: «Гатова». Апарат тут быў вельмі патрэбны, бо сабралася амаль што не ўся Беларуская грамада ў Празе, апрача толькі больш самых выдатных і паважных яе сяброў. Тугоўскі не сядзеў за сталом. На яго былі пакладзены вельмі сур’ёзныя абавязкі лёкая, і ён бегаў с пакоя на кухню за гарэлкай і закускай. Вярхоўская сядзела паміж Загорскім і айцом Кірылам, у самым, што завецца, «чырвоным кутку» — на самым ганаровым месцы. Тугоўскі падышоў да яе з бутэлькай слівовіцы. Яна пачала рашуча адмаўляцца.

— Ну, што вы, — упрошвалі айцец Кірыла з Загорскім. — Адмаўляцца немагчыма.

— Для вас гэта выпісалі з Сербіі, — казаў Тугоўскі, — з самай Сербіі, так званую «слівовіцу». Вось выпісаў пан Бэран. Пакаштуйце, калі ласка…

Пан Бэран, хоць ні слова не разумеў па-беларуску, але бачачы, што на яго паказваюць, і разумеючы, у чым справа, устаў і, як падабае старому кавалеру, галантна схіліў галаву.

— Мейтэ таковоў ласкавост, смелно, — сказаў ён. — З Србска, то е з Србска[28].

Вярхоўская толькі засмяялася:

— Каб я толькі сёння не трапіла ў гэтую Сербію, калі зямля пачне круціцца пад маімі нагамі.

— Нічога не здарыцца, — адказваў Тугоўскі, наліваючы гарэлку. — З Сербіі зноў можна трапіць у Прагу.

Айцец Кірыла падняўся з чаркай у руцэ.

— Дазвольце мне абвясціць, што наша сённяшняя ўрачыстасць пачалася. Дазвольце мне падняць гэтую чарку за здароўе ўсіх, прыйшоўшых наведаць мяне… Няхай жыве Беларуская грамада ў Празе!

Усе крыкнулі з падоймам «Няхай жыве!» і чокнуліся чаркамі. Пасля выпітага ўсе пахіліліся і пачалі так шчыра працаваць нажамі і відэльцамі, што толькі звон пайшоў па пакоі. У пярэрве паміж звонам чуліся пахвалы мастацтву і пану Бэрану. Падняўся студэнт Тамашэвіч[29]. Ён паправіў свае доўгія «філасофскія» валасы на галаве, кашлянуў і пачаў. Усе ведалі, што ён пачне доўгую прамову, бо ведалі, што ён умее гутарыць, як былы міністр унутраных спраў ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі. Загорскі шапнуў Вярхоўскай па-руску, глянуўшы на Тамашэвіча: «Всегда восторженная речь и кудри черные до плеч…» Вярхоўская ўсміхнулася, але паправілася ў крэсле, каб лепш слухаць.

— Я падымаю, — пачаў Тамашэвіч, — сваю чарку за здароўе нашага юбіляра. Грамадзяне, у яго асобе мы вітаем нашага свядомага сябру, першага беларуса, стаўшага інжынерам. Хоць кажуць: адна ластаўка паказвае, што вясна блізка. Хутка скончыцца зіма, якая скавала нашу лапцюжную Беларусь, трэсне лёд, які пакрыў тоўстым слоем думкі і сэрца народу, трэсне і на вялікіх беларускіх рэках паплыве, топлячыся і гінучы, пад уздоймам разбушаванай народнай стыхіі, якая затопіць берагі і зламае ўсе перашкоды, усе парканы, якія



ставяць ёй на шляху. Лёд трэсне пад гарачым дыханнем сонца, сонца ўласнай культуры. Грамадзяне, мы ўсе імкнемся да гэтага. Увесь наш беларускі рух ад самага пачатку яго, ад доктара «вызваленых навук» Скарыны[30] і да нашых дзён, ёсць барацьба за нашую ўласную культуру. Калі шмат нашага старога пакалення стаяла і стаіць яшчэ за «аўтаномію» Беларусі, калі старая літаратура якога-небудзь Пшчолкі[31] не ішла далей збірання забабонаў народных і выяўлення народнай цемнаты ў жартах, каб пасмяшыць паноў і расейскае дваранства… Калі нават нашыя выдатныя акадэмікі, як прафесар Карскі, яшчэ і зараз кажуць, што беларуская літаратура будзе жыць толькі як мясцовая, толькі не болей як практычны матэрыял — для збіральнікаў этнаграфіі. Мы, «младабеларусы», ідзём далей і смела кажам словамі Янкі Купалы, прарока нашага адраджэння: «Годзе заходняй ці ўсходняй культуры. Для беларуса цана ім адна»[32]. Мы хочам, мы павінны тварыць уласныя беларускія культурныя каштоўнасці. Ніякія аўтаноміі, ніякія палавінчатыя хаўрусы з чужымі культурамі і дзяржавамі не дадуць нам нічога добрага, і мы заўсёды пойдзем на повадзе ў іх, не маючы магчымасці ўздыхнуць свабодна сваімі грудзямі. Толькі паветра ўласнай хаты дасць нам магчымасць развівацца духова, толькі на ўласнай зямлі дрэва беларускай культуры пусціць ва ўсе бакі свае магутныя галіны. Кажуць, грамадзяне, што беларусы — не нацыянальнасць. Адны кажуць, што беларусы — гэта толькі абмаскаленыя палякі, другія кажуць, што апалячаныя маскалі… Бедныя беларусы! Каму верыць? Сапраўды, яны губляюць свае галовы і махаюць рукой: «А чорт іх ведае, якой я нацыянальнасці. Пішыце, як ведаеце…» І па вялікім абшары зямлі беларускай пры ўсіх перапісах, ува ўсіх камісіях беларусаў запісваюць так, як хочуць. Але давайце разбяром навукова пытанне аб нацыянальнасці. Што такое нацыянальнасць? Зразумела, грамадзяне, мы сабраліся сёння не для заслухвання навуковых дакладаў. Дзеля гэтага я не затрымаю вашай увагі на імёнах тых вучоных, якія займаліся гэтым пытаннем. Трэба зазначыць, што гэтае пытанне паднялося толькі ў другой палове і ў канцы XIX стагоддзя, усяго, значыць, якіх-небудзь 50 гадоў таму назад. Вучоныя яшчэ зараз спрачаюцца аб прыметах нацыянальнасці, але ў апошнія часы запанавала сярод вучоных такая думка, што не мова, урэшце, не тэрыто-

рыя з’яўляюцца прыметамі нацыянальнасці; ёсць народы, якія не маюць сваёй тэрыторыі, як жыды, напрыклад, — а вось што: воля самога народу. З’яўляецца ў народзе група адукаваных людзей, з’яўляецца ў групе пэўная воля, моцнае жаданне да жыцця, і гэта воля перадаецца народу. Вось тады з’яўляецца і нацыянальнасць. Значыць, як бы там ні было, — воля, жаданне самога народу ставіцца на першае мейсца. Калі народ хоча мець сваю дзяржаву, значыць, і ўсё: ён яе павінен мець, ён ужо ёсць акрэсленая нацыянальнасць. Так вось, грамадзяне! Каб нас лічылі нацыянальнасцей, мы павінны развіваць у народзе волю — упартасць, жаданне быць вольным. Седзячы тут, у чэшскай Празе, мы павінны развіваць перш усяго ў саміх сябе гэтую волю, каб потым перадаць яе нашаму народу. На нашай Бацькаўшчыне, паўтараю, зараз зіма. Не адзін і не два чалавекі выходзяць на дарогу і глядзяць, куды паварочваецца сонца, калі ж прыйдзе, нарэшце, сапраўдны дзень, калі засмяецца, заселянее радасна зямля, калі прыляцяць ластаўкі — першыя весніцы вясны…

Мы ўсе з вамі — гэтыя ластаўкі, грамадзяне; мы панясём культуру, уласную культуру ў свае родныя хаты. І што тады будзе, глядзіце, калі мы ўсе, далучыўшыся да сучаснай еўрапейскай культуры, з’явімся цэлай грамадой на родных палёх. Сапраўды, грамадзяне, будзе нешта новае ў гісторыі!.. Дык вып’ем за гэтае новае, вып’ем за вас, вып’ем за творцоў і змагароў беларускай культуры.

Гучнае «ўра» было яму адказам. Пачуўся звон бакалаў і шэпты задаволеных слухачоў. Трэці круг ужо значна падняў настроі прысутных і развязаў языкі. Ужо ўсе гутарылі за сталом, усе прымалі ўдзел у дыскусіі з прыгоды толькі што сказанай прамовы. Нарэшце, прыгожым тэнарам Тамашэвіч пачаў:

Пад гоман вясёлы, пад звон чары поўнай,
Пры зборы усіх на бяседзе такой, —

і хор дружна і моцна падхапіў:

Успомнім мы, брацці, аб долі няроўнай,
Пра ўсіх тых, хто церпіць за край родны свой.

Песня палілася прыгожымі хвалямі, падымаючыся ўсё вышэй і вышэй у столь, выходзячы праз адчыненыя дзверы



вузкага пакою ў калідор, і панеслася далей у чужое ёй чэшскае паветра. Чулася, што разам з песняй падымаліся думы спевакоў і несліся на далёкую Бацькаўшчыну, у далёкае мінулае…

Адных ужо крыюць курганы-магілы,
Другія сасланы за краты, у турму…[33] —

пакрываў усіх моцны голас Тамашэвіча. Ён паглядаў на Вярхоўскую з нейкай бравурнасцю і, здаецца, для яе стараўся выдзеліць свой голас з агульнага хору. Тугоўскі, стаўшы ў баку, пільна лавіў погляды ўсіх звяртаўшых увагу на Вярхоўскую. Яна сядзела чырвоная ад сваёй слівовіцы, і вочы яе гарэлі надзвычай сінім святлом.

Улучыўшы хвіліну, падняўся сказаць свой тост і Тугоўскі — за свядомых беларускіх жанчын. […] А на заканчэнне прамовіў:

— Грамадзяне! Я не баюся палітыкі, як гэтыя прадстаўнікі дваранска-памешчычых колаў на нашым грунце, — ён паказаў пальцам на Шабунеўскага з Загорскім, — як гэтыя вось беларусы з расейскіх камітэтаў.

— Я пратэстую, — крыкнуў Загорскі, стукаючы чаркай па стале.

— Так… Так… Вы пратэстуеце… процiў праўды… Можаце… — Ён працягваў: — Я, грамадзяне, пэўны, што толькі свядомая жанчына выхавае свядомага беларуса, што толькі з малаком маткі ўвальецца ў кроў свядомасць тых, хто пойдзе за лапцюжную Беларусь. Ніякай агітацыяй мы не даб’ёмся таго, чаго можа дабіцца свядомая беларуска ў сям’і, не даб’ёмся тых уплываў, якія яна можа зрабіць на мужчыну. Будзе ў нас свядомая жанчына — будзе і беларускі рух. Дык вып’ем за здароўе беларускай жанчыны.

— Брава! Брава! — запляскала ў далоні Вярхоўская. — Я п’ю, грамадзяне, таксама за здароўе жанчыны.

— Дазвольце вашу руку, грамадзянка Вярхоўская, — папрасіў Загорскі.

Вярхоўская пачырванела… На хвіліну яна згубілася, не ведаючы, што ёй рабіць. Нарэшце схавала сваю руку. Ён, гледзячы на яе нахабным поглядам, дэманстратыўна чакаў. Потым, не дачакаўшыся, пад насмешкі прысутных, прадоўжыў:

— Але я пратэстую, — ён паглядзеў са злосцю на Тугоўскага, — процiў нягодных слоў гэтага пана. Сёння я не хачу

хавацца. Тут Тамашэвіч клікаў нас кудысьці, як той чыжык у казцы Максіма Горкага. Але я ведаю, грамадзяне, што ёсць вышэйшыя культуры, да якіх імкнуцца маладыя народы.

— Старая песня! — крыкнуў Тамашэвіч.

— Рана ці позна, — прадаўжаў Загорскі, — вы прыйдзеце да вышэйшай расейскай культуры. Не плюйце ў старую студню, прыйдзецца вады напіцца.

— Мана! — закрычаў Тамашэвіч.

— Дваранска-памешчычым сынкам не мейсца ў нашай сям'і. Вон! — закрычаў Тугоўскі, не памятаючы больш сябе ад злосці.

— Што? — крыкнуў Загорскі і паляцеў да Тугоўскага са сціснутымі кулакамі. За ім падняўся і Шабунеўскі. Усе ўскочылі са сваіх месцаў… Але не паспелі прысутныя крыкнуць ад здзіўлення, як паміж дзвюма варожымі арміямі стаў пан Бэран. Ён моцна трымаў за рукі Загорскага.

— Цо сэ стало? — казаў ён спакойна. — Не разумею, каб інтэлігентныя людзі даводзілі б справу да дракі. Гэта бачу першы раз.

— Я яму пакажу, — дрыжэў Тугоўскі. — Я яму пакажу плебея… Няхай ён успомніць, што плебей стаў чалавекам.

Ён расказаў усім, як калісьці Загорскі пабіў яго, назваўшы «плебеем».

— Супакойцеся, супакойцеся, — казала Вярхоўская, трымаючы яго за руку. — Сядайце, — казала яна, прытуляючыся да Тугоўскага, усаджваючы яго на крэсла. Яе блізкасць зрабіла на Тугоўскага самае супакойнае ўражанне. Ён прысеў побач.

— Сядайце! — пачуўся рэзкі і сярдзіты голас айца Кірыла. Усе селі. Загорскі з Шабунеўскім змясціліся побач з панам Бэранам. — Я, грамадзяне, як гаспадар, — прадаўжаў Кірыла, — вельмі шкадую, што здарыўся падобны скандал на нашай урачыстасці. Я хацеў бы, каб на нашым свяце запанавала зноў ціша і брацкая згода. Але, з другога боку, грамадзяне, я задаволены. Скандал ускрыў цёмны бок нашага грамадскага жыцця: уласне, прысутнасць чужых, шкодных нам элементаў. Ім мейсца сапраўды, як казаў сябра Тугоўскі, у расейскім камітэце. Дзеля гэтага я па-сяброўску папрашу іх пакінуць мой пакой.



— Свіння ты, хам пасля гэтага, — крыкнуў Загорскі, хапаючы свой апарат і капялюш. — Я ніколі не думаў, што пападу ў такое грамадзянства.

— Гэтае хамства магчыма толькі ў беларусаў, — пагражаючым позіркам акідваў усіх Шабунеўскі.

— А вы, — звярнуўся на выхадзе Загорскі, — Галена Уладзіміраўна… Вы яшчэ можаце заставацца ў гэтым беларускім бядмлеі?

— Я не пайду з вамі, — адказала яна, чырванеючы і хвалюючыся, — вы зусім п'яны.

— Ах, так: і ты, Брут, праціў мяне. — І ён, лаючыся, выскачыў з Шабунеўскім у калідор. Іх ніхто не правёў. Чулася, як вонкі пачаў ліць дождж. Яны захлюпалі сп'яна па калюжах…

— Будзем весяліцца, — працягваў айцец Кірыла, — будзем думаць, што нічога не здарылася. Вы нешта засумавалі? — спытаў ён замоўклую Вярхоўскую.

— Не… Я так. — Яна сумна ўсміхнулася.

— Не звяртайце ўвагі, — сказаў Тугоўскі, — гэта не варта нашай увагі. Лепш вып'ем. — Ён заспяваў:

Налей, налей
Бакалы паўней;
Хай наша сям'я
Сабярэцца цясней…

Пан Бэран прынёс адкульсьці патэфон.

— Вальс Штрауса, — засмяяўся Тамашэвіч. — Першы вальс нашаму юбіляру з грамадзянкай Вярхоўскай…

Вярхоўская засмяялася: яна, відаць, нічога не мела праціў. Айцец Кірыла пратанцаваў у першай пары. Пачалося агульнае ажыўленне. Прыехаўшая разам з Вярхоўскай маленькая студэнтка-медычка, сядзеўшая ўвесь час моўчкі, таксама ажывілася і пачала смяяцца.

— «Лявоніху»[34], грамадзяне, «Лявоніху»! — закрычаў Тугоўскі.

Зараз жа стварылася група жадаючых, зараз жа заспявалі ўсе, зараз жа панесліся па пакоі і нават калідорах вясёлыя пары…

— Вы спачуваеце Загорскаму? — спытаў раптам Тугоўскі Вярхоўскую падчас скокаў.

— Не, што вы, — паглядзела яна на яго строга і замоўкла. Да канца скокаў яны не прамовілі ні слова.

Скокі прадаўжаліся без канца. Скокі змяняліся выпіўкай і закускай, выпіўка зноў скокамі. Усе быццам наўмысля стараліся весяліцца і хоць штучна ствараць вясёласць, каб толькі загладзіць тую непрыемнасць, якая засталася ад скандалу. У дванаццаць гадзін Вярхоўская пажадала ўжо ехаць дахаты. Да яе далучылася частка гасцей, і так пачаўся агульны раз'езд. Айцец Кірыла праводзіў, стоячы ў сянёх. На вуліцы ліў густы, безупынны дождж.

— Вы куды? — спытала Вярхоўская, стоячы пад парасонам з сваёй сяброўкай. Большая частка гасцей напраўлялася за Прагу ці на яе акраіны.

— Я ў Прагу, — адказаў Тугоўскі.

— Тады правядзіце нас, — сказала Вярхоўская.

Яны пайшлі па мокрых вуліцах, глуха адбіваючы крокі ў начным паветры. Трамваі ўжо не хадзілі. Места здавалася мёртвым, як пасля нейкай чумы, з зачыненымі стаўнямі велізарных дамоў.

— Бліжэй да нас пад парасон, — казала Вярхоўская. — Інакш вы прамокнеце…

— Утрох цяжка схавацца пад адным парасонам, — адказаў Тугоўскі, не адважваючыся прытуліцца да Вярхоўскай і ўзяць яе за руку.

Яны прайшлі некалькі кварталаў і выйшлі з Кожышэ. На Тугоўскага ліў не толькі дождж, але яшчэ капала з парасона. Трэба было шукаць якога-небудзь ратунку. Ён дарэмна ўглядаўся ў начную цемру ў надзеі пабачыць хоць дзе-небудзь ваганёк таксі. Нарэшце нешта зачарнела і пачуўся стук конскіх капыт.

— Фурман! — крыкнуў з усіх сіл Тугоўскі.

На яго шчасце, гэта быў ён на сваёй дапатопнай, аджываючай век карэце. Ён падляцеў, адчыніў дзверы.

— Залязайце, — смяяўся Тугоўскі. — Але як мы ўтрох змесцімся ў гэтай карзіне?

— Адна паненка няхай сядзе на калені, — сказаў фурман. — Інакш нічога не будзе…



Вярхоўская агледзелася і села на калені Тугоўскаму. Усё выйшла само сабой, вельмі проста і натуральна. Тое, аб чым яшчэ пару гадзін Тугоўскі не мог і думаць, цяпер раптам стала здзейсненым фактам. Ён гатоў быў благаславіць і свой лёс, і гэты пракляты дождж, які ліў як з вядра і стукаў у вокны карэты.

— Вы дарэмна так зрабілі, — казала Вярхоўская, паварочваючыся ў профіль да Тугоўскага. — Мы маглі зайсці пехатой дахаты.

— Дзе бы вы зайшлі, такі дождж!.. Мне то нічога, я зайшоў бы, — я мужчына. Але вы б напэўна расталі, бо жанчыны зроблены з цукру…

У гэты момант ён сапраўды верыў, што Вярхоўская зроблена з цукру. Намазаў бы яе, здаецца, мёдам, і выйшла б зусім цукерка! Але гэты чорт — яе сяброўка, сядзіць яе чучала побач з ім і звязвае яго рукі.

Каб не яна, ён, здаецца, зацалаваў бы Вярхоўскую, ён засмактаў бы, як цукерку!..

Вярхоўская сядзела ціха і спакойна павярталася на каленях пад час размовы. Ёй і ў галаву не прыходзіла, што яна выклікае электрычны ток у целе Тугоўскага і кожны яе рух прабягае па ім, як электрычная іскра. Яна вельмі смяялася. Тугоўскі быў пад уплывам шчаслівай мінуты, што завецца «ўдарам», жартаваў без канца. Нават задуменная і сур'ёзная медычка, сядзеўшая каля яго, пачала смяяцца.

Яны доўга ездзілі па Празе, бо Тугоўскі шапнуў фурману, каб ехалі даўжэй, і тайна сказаў маршрут. Яму хацелася, каб шчаслівая мінута не скончалася. Калі яны ўсё ж нарэшце прыехалі да дому Вярхоўскай і дзве жанчыны схаваліся ад яго вачэй у велізарным каменным доме, ён дзякаваў фурмана: «Маладзец, — казаў ён, — зразумеў справу». На развітанне ён адпусціў яму чэшскіх крон больш, чым трэба было, так што нават фурман прамовіў:

— Дзякую пану…

## VIII

Загорскі пасля скандалу на вечары ў Кірыла ўсё-такі не парваў з беларускай грамадой. Хоць ён і належаў да арганізацыі «Адзінства рускай культуры»[35] і хоць яго аднаду-

мец Шабунеўскі больш не з'яўляўся ў грамадзе і стыпендыю сваю стаў атрымліваць ужо з расейскага камітэту, ён усё ж ткі не мог парваць з беларусамі. Не мог таму, што Вярхоўская заставалася свядомай беларускай. Каб не згубіць сувязі з Вярхоўскай, яму прыйшлося прымірыцца з айцом Кірылам і папрасіць выбачэння за інцыдэнт. Ён мусіў усю бяду зваліць на гарэлку і на Тугоўскага, з-за якога пачаўся ўвесь скандал.

Больш таго, яму прыйшлося дзеля Вярхоўскай увайсці ў зусім чужую для яго поглядаў групу беларускіх сацыялістаў рознага толку і хадзіць нават на паседжанні.

Трэба зазначыць, што Беларуская грамада ў Празе развальвалася[36]. Яна падзялілася на дзве варожыя групы: адна гуртавалася каля Янкі Станкевіча, другая каля Тамашэвіча і айца Кірыла. Адну групу — Янкі Станкевіча — называлі «правай». Туды ўвайшлі больш заможныя людзі, сяляне — «сталыпінскія мужыкі», у якіх былі то цэлыя фальваркі, то досыць вялікія хутары. Усе гэтыя […] змагаліся за рэлігію і сучасны буржуазны лад жыцця, усёй душой ненавідзячы сацыялізм.

— Нашто вам сацыялізм, — крычаў, напрыклад, на сходзе Янка Станкевіч, — калі ўсе гэтыя сацыяльныя справы вельмі лёгка можа вырашыць кааперацыя?

Другая група — Тамашэвіча — наадварот, казала, што ўвесь ратунак у сацыялізме. Беларускае пытанне ёсць пытанне галоўным чынам сацыяльнае. Спачатку сацыяльнае вызваленне, а потым ужо нацыянальнае. У гэтай групе сабраліся ўсе сацыялісты, ад самых левых да марксістаў — ледзь не камуністычнага напрамку. Да марксістаў стала належаць Вярхоўская.

Што было рабіць Загорскаму? Ён ненавідзеў усёй сваёй душой і марксізм, і сацыялізм, ён павесіў бы на адным суку ўсіх марксістаў і сацыялістаў, але яму прыемна было трымаць у сваіх руках глаштую, цёплую жаночую руку, прыемна было схапіць у свае абоймы мяккае жаночае цела. Ён пачаў хадзіць на сход ненавісных сацыялістаў, толькі каб потым быць з Вярхоўскай і адпраўляцца з ёю ў рэстаран. Адзін раз ён пайшоў на арганізацыйны сход групы Тамашэвіча.

У невялікай піўной, пасярэдзіне якой стаяў більярдны стол і на сценах віселі барадатыя Францы-Язэпы[37] з пенячыміся куфлямі піва, у піўной, служыўшай беларускім клубам, сабралася ўся група. Лысы айцец Кірыл згубіў сваю заўсёдную насмешку і, сур'ёзна гледзячы на ўсіх, чытаў тыя пункты, на якіх маглі б сысціся ўсе прысутныя, людзі з рознымі перакананнямі. Ён цвердзіў: «Мы, беларускія студэнты, стаім на платформе незалежнасці Бацькаўшчыны». Далей што «беларускі адраджэнчы рух ёсць выступ на арэну гісторыі беларускіх працаўнікоў і сялян», што «мы разумеем незалежнасць Беларусі толькі як вызваленне гэтых працоўных грамад…»

Загорскі ў гэты час выпіваў піва і шаптаўся з Вярхоўскай. Пачаліся спрэчкі. У доўгай прамове Тамашэвіч, патрасаючы сваімі філасафічнымі валасамі, заклікаў усіх аб'яднацца на гэтых пунктах айца Кірыла. Апошняй выступіла Вярхоўская.

— Мы разумеем Беларусь па-рознаму, — сказала яна. — Янка Станкевіч думае: дайце нам незалежную Беларусь, усё роўна якую, хоць з княгіняй Радзівіл як каралевай на чале, хоць з чортам, нарэшце, абы толькі на шыльдах жыдоўскіх крам красаваліся б беларускія надпісы і ў установах гутарылі б па-беларуску. Але я думаю: для беларускага селяніна і работніка такая станкевічаўская Беларусь зусім не патрэбна. Ці не ўсё роўна яму, што яго эксплуатуе расейскі і жыдоўскі капіталіст, ці што на фабрыцы будзе сядзець дырэктар фабрыкі — Янка Станкевіч — і размахваць залатым ланцужком на вялікім бруху, гутарыць па-беларуску і эксплуатаваць работнікаў па-старому. Я думаю, беларускі працоўны народ назаўтра пракляў бы такую Беларусь. Не, пакуль мы не зменім сацыяльных варункаў, пакуль мы не паставім у аснову нашай праграмы сацыяльнае вызваленне беларусаў, — мы будзем пустымі або беларускімі здраднікамі.

Вярхоўская села пад буру авацый.

— Брава! Брава! — крычалі з усіх кутоў.

— Вось так жанчына! — казаў заблішчэлымі вачыма Тамашэвіч і церабіў сваю бараду.

— Качаць яе, качаць! — крычаў Загорскі. Але гушкаць ніхто не згадзіўся. Пастанавілі назваць сацыялістычную групу «Паступовым аб'яднаннем»[38] і Вярхоўскую правялі ў прэзідыум большасцю голасу.

Нарэшце настаў чаканы для Загорскага час. Вярхоўская была вольная і чула сябе змучанай. Яна з прыемнасцей

згадзілася пайсці з Загорскім у рэстаран павячэраць. Ён павёў яе ў самы лепшы рэстаран, нядаўна адчынены на шумнай пражскай Водзічкавай вуліцы, — так званую «Акадэміцкую кавярну». Тут было вельмі шумна і прыемна. Скрыпкі плаўна разлівалі ў сэрцы свае сочныя, амаль што чалавечыя гукі. Пад гэтую музыку людзі вячэралі і скакалі, далей, у другім пакоі, ігралі ў більярд. Колькі тут было святла, асляпляўшага вочы, колькі бліскучых убранняў на паўголых дамах, колькі прыгожых і маладых мужчын. Загорскага тут ужо ведалі ўсе швейцары і лёкаі, ён тут быў «сваім чалавекам», ён толькі раскланьваўся направа і налева.

— Хоць вы і сацыялістка, а вас трэба ўвесці ў буржуазны рэстаран. Вы ж з добрай інтэлігентнай сям'і, і гэты сацыялізм і беларускасць у вас толькі налёты. Пачакайце… Трэба вас увесці ў чэшскае грамадзянства. Пачакайце…

Ён пасадзіў яе за столік і на хвіліну знік. А павярнуўся з некалькімі маладымі прыгожымі чэшскімі студэнтамі. Усе вячэралі за адным сталом, пілі віно, падымалі за яе тосты. Як прыемна!.. Потым яна скакала з імі модныя танцы пад такую дзіўную прыгожую музыку.

— Давайце будзем гутарыць на «ты», — запрапанаваў Загорскі. — Так вось ад гэтага шуму… тут ёсць асобныя пакоі. Давайце… ці не пройдзем адпачнуць?

— Пройдзем.

Яны прайшлі ў асобны невялікі прыгожы пакоік, зачынілі дзверы і селі на мяккі дыван.

— Тут досыць прыемна. Слухай, ты любіш палітыку… Так вось, пагутарым. Ты кажаш, што не можна завесці сацыялізму, пакуль няма капіталізму. Дык вось, па-мойму, трэба спачатку на Беларусі заводзіць паноў і купцоў. А потым іх абрабаваць.

— Рабуй награбленае, — засмяялася яна.

— Але я ўсё ж ткі не разумею. Які ж ты думаеш будаваць на Беларусі сацыялізм?

— Ай, слухай, — яна схапілася за галаву, — у мяне ад гэтага віна галава круціцца. Я нічога не магу думаць.

— Кінь думаць, — засмяяўся Загорскі, — ты павінна думаць аб адным: аб сваіх жаночых справах… Вось ножкі ў цябе прыемныя.



І ён лоўкім рухам падняў яе ўбранне.

— Ну… Не забывацца! — закрычала яна. — Шмат ты пачынаеш дазваляць сабе.

— Ого, тады ты не марксістка, — смяяўся Загорскі. — Марксісткі прызнаюць свабоднае каханне, а ты нейкая статуя з кляштару.

Яна маўчала, але не выходзіла з пакою.

Што было далей у пакоі, невядома. Толькі пасля гэтага іх заўсёды бачылі разам, як брат з сястрой, і яны заўсёды ў назначаны час хадзілі вячэраць у «Акадэміцку кавярню».

Загорскі вадзіў яе па Празе, паказваючы ёй усе выдатныя помнікі гэтага прыгожага гістарычнага места. На кожным кроку, на кожным мосце, на кожным доме, на кожным муры яны бачылі статуі, крыжы, подпісы ці таблічкі аб якіх-небудзь гістарычных падзеях. Часцей усяго ў сонечныя прыгожыя дні яны спыняліся на высокіх валах Пражскай крэпасці — Вышаградзе. Адтуль адчыняўся прыгожы від на Прагу. Людзі ўнізе здаваліся маленькімі паўзунамі-мурашкамі.

З другога боку валу ішлі скалы, на вышыні якіх, быццам гнёзды нейкага арла, стаялі старыя капліцы. Унізе праз тунель у скалах ляцеў трамвай, а далей серабрыстай стужкай звівалася шырокая Влтава — прыток Эльбы, альбо Лабы, сціснутая каменнымі прыгожымі набярэжнымі. За Влтавай раскідалася рабочае прадмесце Сміхаў дымячыміся комінамі сваіх фабрык і заводаў, з шумам і звонам ламавых фурманаў і аўто.

— Заўваж, — казаў Загорскі, трымаючы Вярхоўскую ў сваіх абоймах, — вось на гэтай скале — развалiны старажытнага замку.

Вярхоўская, каб пабачыць, мусіла высока падняць галаву.

— Ого! — сказала яна са страхам. — Як там маглі збудаваць?

— Так вось, у сярэднія вякі чэшскі кароль Отакар быў пасаджаны ў гэты замак сваімі ворагамі. Але адзін раз уначы дзякуючы вернай варце ён выбраўся з турмы і на белым кані адважыўся скокнуць з гэтай скалы проста ў Влтаву. Адважны кароль выплыў і на другім беразе голасна засмяяўся. Вось чаму тую частку і назвалі Сміхаў. Нядаўна чэхі захацелі зфільмаваць гэтую сцэну для кіно, але не знайшлося такога адважнага.

Вярхоўская слухала апавяданні з здзіўленнем і клала галаву на плечы Загорскага.

Бывалі мінуты, калі яны хацелі заставацца ў інтымнай блізкасці, тады яны падымаліся на высокую гару ў прыгожы парк з лавамі, з цяністымі стаўкамі, са скаламі, з якіх выцякала вада. Яны падымаліся ў частку Прагі, названую Градчаны, мейсца рэзідэнцыі чэшскіх каралёў, а зараз прэзідэнта рэспублікі Масарыка[39], падымаліся па сходах, якім, здавалася, ніколі не будзе канца. Загорскі, ведучы пад руку Вярхоўскую, весела шаптаў: «Вось па гэтых сходах чэшскі кароль Карл уцякаў калісьці ўначы ў карчомку, развaліны якой ёсць каля Студэнцкага дому».

— Не веру, — смяялася Вярхоўская, прытуляючы свой твар да твару Загорскага, — медык не можа чакаць гісторыка. Але калі гэта так… Уяўляю сабе гора яго жонкі, ад якой ён уцякаў. Але я ўяўляю сабе гора караля, калі ён, закутаны ў чорны плашч, краўся, як злодзей, уначы з палацу па гэтых ступеньках.

А ступенькам не было канца. І яны абодва смяяліся… Яны нарэшце падымаліся на Градчанскую гару і адтуль глядзелі, як зачараваныя, уніз. Уся велізарная Прага ляжала перад імі, як на далоні. Дзве пакатыя гары, паміж якімі знаходзілася места, зеленелі кучаравымі кудрамі маладога лесу. Велізарная калона фабрык і заводаў здавалася гіганцкімі папяросамі, якія завалаквалі сіняе неба густым дымам. Дым стаяў над Прагай густой шэрай хмарай, засланяўшай сонца, і часам здавалася, што з гэтай хмары будзе ляцець не сажа, а дождж. Пасярэдзіне ўсяго гэтага малюнку звівалася сіняя стужка Влтавы з папярэднімі шэрымі палоскамі мастоў, па якой поўзалі, як жукі, параходы.

Яны сядзелі моўчкі, зачараваныя малюнкам. І ім пачынала здавацца, што жыццё — прыемнае, радаснае вандраванне па месцах, каторых яшчэ не ведалі. Яны чулі сябе шчаслівымі бясконцым шчасцем, што яны робяць гэтае вандраванне ўдвох, як брат і сястра.

Зразумела, што ў Студэнцкім доме шапталіся.

Не адзін і не два студэнты заўважылі, што Загорскі з Вярхоўскай неразлучны, і не раз жартавалі:

— Ну, грамадзяне, у нашай грамадзе нешта вяселлем пахне…



Але гэтым усе прызвычаіліся і пакінулі іх у супакоі. Рашылі, што справа — самае звычайнае з’явішча прыроды, тым больш, што элегантны Загорскі і разубраная Вярхоўская не зусім дрэнная пара.

## IX

Пасля памятнай паездкі ў карэце Тугоўскі пачуў, што не можа жыць без Вярхоўскай. Куды б ён не ішоў, ён бачыў яе смяючыя вочы, ён чуў у сваіх вушах яе звонкі смех. Ён згубіў усякую магчымасць вучыцца. Кожны раз, калі ён сядзеў над глыбакадумнай матэматыкай і выводзіў сухія формулы, — прыходзіла яна, садзілася на яго калені і смяялася сваім звонкім смехам…

Ад гэтага смеху ён губляў усе свае думкі, усю сваю сцюдзёную стрыманасць і, як непрыстанны, кідаўся ў вір ахоплiваўшага яго пачуцця. Заместа матэматычнай формулы на паперы з’ўляліся жаночыя галоўкі… Яе вобраз з’яўляўся над кнігай і клікаў яго да сябе з прыветліва радаснымі вачыма. Ах, гэтыя жанчыны! Як вясна, як вясеннія кветкі, вабілі яны яго сэрца, ішлі міма, як ляцеўшыя дні маладосці.

Маладосць! Вясна! Два дзіўныя словы, у каторых было яшчэ столькі холаду, столькі нязведанага шчасця. Хто ж сагрэў бы яшчэ яго, хто мог бы яшчэ раскрыць дзіўны сэнс гэтага пахучага слова «вясна»? Няўжо ніхто? Ніхто… Няўжо маладосць завяне, не паспеўшы расцвісці, і ў студзяную, сівую, беласнежную зіму старасці ён скажа, падпёршы галаву рукамі: «Будзь тры разы праклята, мая вясна!»

А жанчыны ішлі ўсё міма, міма… Можа быць, ён хацеў зашмат шчасця? Можа быць, ён шукаў вельмі дарагіх каштоўных кветак, як прыехаўшы з вёскі селянін, што ў цяжкіх намазаных дзёгцем ботах увальваецца ў кветкавую краму і грубай рукой з прагавітасцю хоча як мага болей нарваць пахучых руж? Хто ведае?..

Толькі чаму ён заўсёды параўноўваў жанчыну з кветкай. Ён, гатовы трымаць жанчыну, як дарагую кветку, далікатнай рукой, не меў нічога. У той час як бачыў: у жыцці гэтыя кветкі рвалі грубыя рукі — бязлітасныя рукі мужчын. Чаму? Таму што гэтыя бязлітасныя рукі былі прыкрыты мяккімі

рукавічкамі, таму што гэтыя жорсткія твары ўмелі прыкрывацца маскай усмешкі і далікатнасці, таму што ні адна з гэтых жанчын-кветак не глядзела праз вочы ў душу мужчын. Усе ганяліся за вонкавасцю. «Ах, які прыгожы мужчына», — казалі яны, гэтыя сцюдзёныя жанчыны-кветкі, і чым на ім было болей бліскучак, тым даражэйшую кветку ён мог сарваць і кінуць сабе пад ногі.

Тугоўскі якраз не мог бліснуць сваёй вонкавасцю. Прырода не доўга думала над яго партрэтам і фігурай, ён быў высечаны грубым майстрам: нейкі квадратны твар з кантаватым падбародкам, зроблены быццам з простага каменя, ногі тоўстыя і кароткія, грудзі вузкія — словам, нейкі «брак» у майстэрні скульптара. І ўсё ж ткі гэта не замінала яму лічыць сябе не горш за тых, у каго была бліскучая вонкавасць. Зразумела, ён мог лічыць сябе не горшым за тых, якія блішчэлі ад валасоў да лакіраваных чаравік, — але яны рвалі кветкі ў садзе жыцця…

А ён стаяў, гэты нязграбны Тугоўскі, стаяў у куце, як сірата, як лішні чалавек, не прошаны на чужое свята. Жанчыны ішлі ўсё міма, міма. І ўсё ткі ці ж яго беднае, маленькае чалавечае сэрца не мела права на шчасце, на радасць, на каханне? Ён вырас і радзіўся на сметніку — гэта праўда. Але гэта ці не давала яму права любавацца красой Венеры Мілоскай? Ці ж яму маглі перашкодзіць яго паходжанне і яго выгляд пакахаць якую-небудзь прыгожу? Адзін раз, памятае, даўно, яшчэ пры бальшавіках, калі ён быў студэнтам бальшавіцкага інстытуту ў Харкаве, іх аглядаў рэктар разам з міласэрнай сястрой. Міласэрная сястра настолькі была стройная, поўная, чырвоная, настолькі прыгожы быў яе бюст, прыкрыты белым фартухам з чырвоным крыжам, так горда несла сваю галаву, што ўвесь інстытут глядзеў на яе, вывернуўшы вочы.

— Як яе прозвішча? — запытаўся Тугоўскі ў сяброў. — Гэта сапраўдная Венера!

— Нашто вам прозвішча, — раптам сярдзіта агрызнулася адна студэнтка. — Вы гэтай сястры і падмёткі не варты.

— А колькі каштуе яе падмётка? — агрызнуўся тады абражаны Тугоўскі пад агульны смех. Але гэтая фраза «і падмёткі не варты», сказаная яшчэ жаночымі вуснамі, прымусіла яго задумацца. Зразумела, гэта была праўда. З той пары ён пачаў думаць над сваім «я», — і з той пары махнуў рукой на прыгожых жанчын, як на недаступнае шчасце. «Жанчына…» — ён разгладжваў маршчыны на сваім шырокім чале. Пры адным слове, пры адным гэтым слове яго душу, яго сэрца напаўнялі парфумы і мімаволі вусны складаліся для смеху. Ён любіў, можа быць, не сам цялесны вобраз, а свой вобраз у гэтай жанчыне. Ён любіў у ёй сваю мару, свой ідэал.

Нарэшце ён спаткаў свой ідэал. Быццам казачны прынц, які гуляў па садзе, нарэшце пабачыў кветку, якая прыветліва хіліла перад ім сваю пышную галоўку. Ён нахіліўся над гэтай кветкай, каб яе панюхаць. А што ж будзе пасля?.. Каб не было так, як у казцы, што гэтая кветка стала адхіляцца ад яго далей і далей, як прывід. Што ж будзе пасля? Пакуль што ён пакахаў Вярхоўскую. Ён, бязверац, які насіў у сэрцы чарвяка, тугу, раптам паверыў, што шчасце магчыма. Усё паводжанне Вярхоўскай, здаецца, аб гэтым казала: яна ахвотна гутарыла з ім, яна весела смяялася пад час яго жартаў, яна ўжо садзілася на яго калені, яна паказвала, што ён для яе не з'яўляецца адкінутым, нецікавым. Яна на момант падняла ў ім веру ў самога сябе і, як міласэрная сястра, сваім сімпатычным словам, дотыкам сваёй мяккай рукі залівала, як бальзамам, яго старыя душэўныя раны. Яна цягнула яго да сябе тысячамі дзіўных прыгожых нітак.

І хоць над галавой вісеў востры меч камітэту на выдачу стыпендыю, хоць трэба было здаць пэўную колькасць экзаменаў, — ён не мог працаваць. Ён блукаў, як непрытомны, па шумных залах Студэнцкага дому — толькі каб пабачыць яе, пачуць гук яе голасу, яе звонкі смех і дыхнуць парфумы, што ап'яняла думкі, як віно. Ён быў шчаслівы, калі яна хоць на мінуту затрымлівалася з ім на мяккім дыване ў зале, дзе выбіваў свае гукі раяль і стукаў більярд, і хоць на смех, мімаходам кідала некалькі нічога не значных фраз. Ён запісваў у штодзённіку той дзень, калі яна гутарыла з ім даўжэй на якія-небудзь літаратурныя ці філасофскія тэмы. І ён быў зусім няшчасны, загублены, калі не мог знайсці яе ў Студэнцкім доме. Ён чуў сябе такім адзінокім, так агалялася перад ім пустата жыцця, што толькі чаканне заўтрашняга дня, спатканне стрымлівала яго ад таго, каб не кінуцца галавой уніз у чорную бездань… Ён гатоў быў, здаецца, аддаць ёй усе свае сілы, усе думкі, сваё жыццё. А яна?

Ні для каго не было сакрэтам, што яна кожны дзень гуляла з Загорскім. Тугоўскі не мог не чуць пашэптвання студэнтаў, якое даносілася да яго вушэй. Ён не мог без трывогі глядзець, як яна знікла з яго вачэй пад ручку з Загорскім. І ўсё ж такі ён песціў сябе надзеяй, што калісьці Вярхоўская зразумее яго душу, яна не прамяняе яго на Загорскага. Яна была перадавая жанчына, яна належала нават да сацыялістычнага «Паступовага аб'яднання», да якога належаў ён, і няўжо яна адкінула б яго за тое, што ён не быў элегантным, што ён быў нялоўкі, як селянін у ботах, трапіўшы ў паркетную залю. Напэўна, яна зразумела б яго, калі б ён напісаў ёй свае сумненні, калі б ён напісаў ёй, што радзіўся на сметніку, але ўсё жыццё сваё цягнуўся да сонца. Ён мог бы напісаць ёй, што кахае яе за яе погляды, за яе «свецкасць», за тое, што ў яе яшчэ ёсць ідэалы і яна гарыць чымсьці вышэйшым, не так, як іншыя жанчыны, якія ўяўляюць з сябе толькі, кажучы груба, кавалак мяса, якому мейсца толькі на кухні…

«Прывет вам і паклон, свядомыя жанчыны!.. — так пісаў ён у сваім штодзённіку. — Як кахаю вас!..» — І ўсё ткі пісаць гэтага Вярхоўскай не адважыўся. Ён чакаў. Ён толькі сачыў за яе рукамі, і сэрца яго лавіла яе лёгкую паходку і білася ў такт яе крокаў.

Між тым у Студэнцкім доме сталі яшчэ больш упарта гутарыць аб тым, што хутка павінна адбыцца беларускае вяселле. Настроі Тугоўскага апалі, як пажоўклыя лісты з дрэва.

— А што, калі гэта сапраўды магчыма? — ізноў зарухаўся чарвяк тугі і пачаў грызці яго сэрца.

Няўжо ён не варты яе? Няўжо ж ён не варты яе кахання?



# КВАДРА ДРУГАЯ

## I

Прыйшла цёплая чэшская зіма, падобная да беларускай восені. Снег закружыўся над вуліцамі ў безупынным скоку, быццам нейкая здань у прыгожым скоку смерці, бяссільны, валіўся на зямлю, сцякаў вадой па камянях. Вуліцы блішчэлі.

На балконе Студэнцкага дому было бязлюдна. Толькі час ад часу які-небудзь студэнт ці студэнтка прабягалі па мокрай кафельнай падлозе і адчынялі дзверы ў цёплую шумную залю. У залі студэнты стаялі гурткамі каля раялю, каля століка, каля більярдаў і ўносілі свае зацемкі ў гульню. Некаторыя хадзілі ўзад і ўперад, гутарачы аб справах. У далёкім кутку, згуртаваўшыся, стаялі беларускія студэнты і руплівa гаманілі. Па іх сур'ёзных і зацікаўленых тварах відаць было, што справа была важная. У цэнтры стаяў айцец Кірыла і са сваёй заўсёднай усмешкай выслухваў пытанні, ляцеўшыя адусюль.

— Ну як, як? — пыталі ўсе. — Як мая справа ў камітэце па праверцы экзаменаў?

— А як мая? Каго-небудзь скінулі са стыпендыі?.. Можа быць, мяне?

— Грамадзяне! — адказваў Кірыла. — Я як ваш прадстаўнік у камітэце па праверцы экзаменаў мушу зазначыць, што я з усіх сіл адстойваў студэнтаў. Але пры ўсім маім жаданні я не мог адстойваць Загорскага. Яго скінулі зусім са стыпендыі — за непрадстаўленне вестак аб поспехах. Гэта адзіны беларус, грамадзяне, якога скінулі са стыпендыі. Яшчэ вельмі дрэнная справа з Тугоўскім. Яго пакінулі на стыпендыі, але ён не прадставіў вестак, і таму яго перавялі з поўнай дапамогі на частковую, апрача гэтага, яму давядзецца пераехаць з прыватнай кватэры ў інтэрнат. А так, грамадзяне, усё добра. Адносна іншых студэнтаў ніякіх спрэчак не было. Апошнія іспыты прыйдзецца здаваць вясной. А да гэтага ніхто больш трывожыць нас не будзе.

Усе аблегчана ўздыхнулі. Кожны думаў: «Як добра, што мяне мінула горкая чаша».

— Што цяпер будзе з Загорскім? — спытаў высокі чырвоны студэнт Бурак[1].

— Ну, Загорскі не прападзе, — усміхнуўся Кірыла.

— Ведаеце, грамадзяне, навіну? — прамовіў, высунуўшыся наперад, маленькі тоўсценькі Малевіч. — Я чуў ад самога Загорскага. Ён зрабіў такую кар'еру, што можна зусім махнуць рукой на стыпендыю. Напэўна, ні адзін з нас не зробіць такой кар'еры. Ён закахаўся ў адну багатую чэшку, якая служыць дзесьці прыказчыцай у нейкай багатай чэшскай фірме, мае сваю вілу і, галоўнае, слухайце, грамадзяне, дала яму падпіску ў тым, што будзе выдаваць штомесячна 600 крон чэшскіх, пакуль ён не атрымае палову дактарату…

— Не можа быць! — крыкнулі студэнты ў адзін голас.

— 600 крон — гэта больш нашай стыпендыі, — прадоўжыў Малевіч. — Грамадзяне, мне сам Загорскі паказаў такую распіску, я бачыў яе ўласнымі вачыма. Я бачыў, грамадзяне, таксама гэтую пані, тоўстую, як усе чэшкі, і на гадоў восем старэй за яго, з якой яны ішлі пад ручку па вуліцы.

— Што ты? — засмяяўся Бурак. — Кахае, як павук.

— Чаму вы думаеце, — прадоўжыў Малевіч, не звяртаючы ўвагі на зацемку Бурака, — што гэта немагчыма? Вы падумайце. Яна ўжо пажылая чэшка, напэўна, небяспечнага ўзросту. Як усе чэшкі, яна прагне гонару: «cizinec» — чужаземец-студэнт, малады і элегантны, стане доктарам, кандыдатам. Яшчэ праз нейкі час ён будзе доктарам. «Чаму мне не дапамагчы яму матэрыяльна дакончыць навукі, каб потым стаць самой пані доктаравай?» Усё роўна чэх-доктар ніколі не захоча завесці «раману» з прыказчыцай. Такі «раман» магчымы толькі з «цызынцам». І яна кідаецца на шыю маладому студэнту і пераймае яго нават на сваё ўтрыманне.

— Так, гэта магчыма, — пацвердзіў другі высокі студэнт Карусь, з голасам як ерыхонская труба. — Я ведаю ў Падэбрадскай сельскагаспадарчай акадэміі некалькі ўкраінцаў, такім самым чынам улаштаваных на «паёк» да чэшак. Цяпер жывуць, маюць дзетак і канчаюць вучыцца.

— Ну, — умяшаўся айцец Кірыла, — гэтакая не па смаку Загорскага. Ён праз месяц уцёк бы ад сваёй «пані доктаравай», каб яна пачала б яму маляваць сямейнае шчасце мяшчанкі-чэшкі. Нават, грамадзяне, каб дапусціць, што дзеля грошаў Загорскі змяніў бы і свае смакі, дык няможна дапусціць, каб практычная чэшка доўга магла б кідаць грошы на вецер. Я думаю, што яна павінна была паставіць Загорскаму якія-небудзь варункі: перш за ўсё, вытрымаць усе экзамены ў свой час, каб стаць доктарам. Гэта такі, грамадзяне, кантроль, што ён горш самога камітэту. Жанчына кожны раз трымае цябе ў сваіх руках — кантралюе кожны твой крок, кожны дзень, абдымаючы цябе за шыю, пытаецца: «Які ты здаў сёння экзамен?»

А калі ёй не будзеш падабацца, яна пакажа табе пальцам на дзверы. Я гляджу, што гэта тое самае, што пайсці ў прымакі. А ў нашым беларускім народзе недарма склалася прыказка: «Прымацкі хлеб сабацкі». Я Загорскаму зусім не зайздрошчу, грамадзяне. Калі ён так зрабіў, я магу сказаць толькі: «Бедны Загорскі, як нізка ён упаў маральна, калі просіць хлеба ў жанчыны». Я, грамадзяне, лічу за лепшае зарабляць сваю бедную, жорсткую студэнцкую стыпендыю.

— Правідлова, — падхапілі студэнты. — Праўду кажа айцец Кірыла.

— А я не згодны, — зазначыў Малевіч. — Не так ужо страшны той кантроль, які намаляваў айцец Кірыла. Лепш, я думаю, апраўдвацца пацалункамі, чым дакументамі з пячаткай школьнай. Жанчына можа адкласці на адзін год, а прафесар экзамену не адкладзе. Што датычыць маралі, дык, па-мойму, у паступку Загорскага няма нічога амаральнага: ён бярэ ад яе грошы з самай добрай мэтай вучыцца на доктара і дапамагчы ёй у жыцці. Ён не просіць хлеба, а яму самі даюць. Цікава ведаць, калі б айцец Кірыла быў галодны і яму прапанавалі б такі «кавалак хлеба», як 600 крон, ці й тады ён не ўзяў бы яго? Значыць, лепш было б, — засмяяўся Малевіч, — ісці працаваць на стаўбы і насіць цэглы на будынкі, пакуль не з'явілася б кроў на далонях?

— Так, не ўзяў бы, — прамовіў сур'ёзна айцец Кірыла і насунуў капялюш на патыліцу. — Калі б у мяне было здароўе і маладыя рукі, я лічыў бы гэта нячэсным. Чым спаць на пуховых пярынах у прыгожай віле, так лепш кроў на далонях, чым гэта праціўная пярына. Лепш чэсны чорны кавалак хлеба, чым нячэсны мільён.

— Ну і сапраўды, грамадзяне: недарма мы яго завём «айцец», — сказаў Малевіч сярод гуртка студэнтаў, якія ўважна слухалі спрэчкі. — Яго б паслаць у вясковую царкву на Беларусь: добры быў бы поп. Але што такое чэснасць, айцец, што такое чэснасць? Ты жа яшчэ марксіст, — акідваў Малевіч Кірылу вокам пераможцы.

— Чэснасць быць самім сабой, сябра Малевіч. Ты мяне добра разумееш, — адказаў нахмурана Кірыла, збіраючыся ісці.

— Чэснасць… — пакруціў галавой Малевіч і зачасціў размову. — Дык з боку чэснасці атрыманне намі стыпендыі з камітэту ад чэшскага народу, можа быць, таксама нячэсна. Што мы, скажыце, зрабілі для яго? Ды што мы… Вунь беларускія міністры атрымліваюць палітычную стыпендыю, сядзяць у найлепшых чэшскіх кафэ, п'юць каву і гуляюць у шахматы. Гэта таксама, па-твойму, нячэсна?

— Нячэсна! — адказаў Кірыла.

— Ну, што і трэба даказаць, — засмяяўся Малевіч смехам пераможцы, горда гледзячы на натоўп. Але натоўп не смяяўся. Па яго сур'ёзных бліскучых паглядах відаць было, што ён больш стаіць на баку свайго любімага Кірылы. Кірыла нешта хацеў казаць, як у гэты момант падышоў Загорскі. Усе расступіліся, каб даць яму мейсца. Усе глядзелі на яго з цікавасцю. Напудраны твар яго ад нейкага хвалявання быў пакрыты прыгожым румянцам.

— Вось ён, — засмяяўся Малевіч, — краса і гордасць Беларускай грамады ў Празе.

— Вітаем, вітаем, — смяяліся студэнты.

— З чым, грамадзяне? З чым? — усміхаўся Загорскі. — Гэта зусім не варта ўвагі. Маё новае каханне? Што ж тут такога?

— А старое каханне як? — запытаў Кірыла.

— Старое каханне? Вярхоўская, ты хочаш сказаць? Ну што, грамадзяне, вы разумееце? Адной жанчыны мужчыну мала. Якое бы блюда смачнае ні было б, а калі яго ўжываць штодня, дык яно прыядаецца. Я вам раскажу, грамадзяне, адзін французскі анекдот. Жыў-быў на свеце кароль Людвік XV. Гісторыя кажа, што ён быў вельмі распутны.

— Як Загорскі, — патлумачыў чырвоны і высокі Бурак. Студэнты засмяяліся.



— Ну і з'асліў… Ты нічога разумнейшага не прыдумаў? — пахмурна прамовіў Загорскі і прадоўжыў: — Доўгі час, кажуць, не жыў з сваёй жонкай. У адным з гарадоў Францыі жыў вельмі набожны абат. Ён быў настолькі красамоўны, што да яго з'язджалася шмат народу з усіх кутоў Францыі. У сваіх казаннях з амбону гэты абат нападаў на распуснасць караля. Кароль змагаўся з ім усялякімі засадамі, але нічога не дапамагала. Бачачы, што ён бяссільны проціў абата, кароль рашыў запрасіць яго да сябе ў госці. Абата прынялі з каралеўскімі пашанамі і пачаставалі такім смачным абедам з падсмажаных курапатак, што абат толькі аблізваў пальцы. Ён згадзіўся на радасцях прабыць у караля цэлы тыдзень. На другі дзень абату зноў падалі курапатак. Абат таксама быў задаволены. На трэці дзень зноў былі курапаткі. Абат пачаў ужо дзівіцца, паглядваць. На чацвёрты дзень зноў курапаткі. На пяты і шосты зноў тое самае… Здзіўлены абат ужо не мог выцерпець. Ён рашыў пайсці да самога караля і запытаць, што гэта ўсё значыць.

Ён спаткаў караля ў садзе і незадаволена пачаў выказваць сваё здзіўленне: усё курапаткі ды курапаткі… Кароль паглядзеў на яго пільна і прамовіў: «А ў мяне ўсё Марыя-Хрысціна, Марыя-Хрысціна».

Набожны абат на гэты раз добра зразумеў караля.

— Якая ж мараль адсюль? — запытаў Карусь сваім, як раскаты грому, голасам.

— Так хіба не можаш сам дадумацца? — сказаў насмешліва Загорскі. — Шкада! — І прадоўжыў: —Жанчын, грамадзяне, трэба мяняць, як блюда: вось мараль гэтага анекдоту.

— Брава, Загорскі! — хлопаў у далоні Малевіч. — Брава! Ты ўсіх нашых беларусаў за пас заткнуў.

— А ведаеце, — усміхнуўся Кірыла, — што казаў Янка Станкевіч пра такіх, як ты?

— Ну?

— Ён казаў, што ад шлюбу беларусаў з полькамі, расейкамі ці чэшкамі дзеці родзяцца ідыётамі.

— Мусіць, ён сам — плод такога шлюбу, — засмяяўся Загорскі. Усе пачалі ўсміхацца на гэту тэму.

— Ну, дзядзька Загорскі, — перарваў смех і спрэчкі Малевіч, — канкрэтная прыпазыка: спыніць спрэчкі, зайсці ў клубоўню і выпіць за поспех тваёй кар'еры.

— Так, так, выпіць, — казала частка аматараў павесяліцца, — абавязкова выпіць.

— Ну што ж, я не адмаўляюся, — казаў Загорскі. — Калі вы паставіце — я таксама згодны…

— Грамадзяне, — усклікнуў Малевіч, — па кружцы піва! «Дружна-смела на свет цэлы песню запяём…»

— Пагуляйце, грамадзяне, — смяяўся Кірыла, — сёння якраз пасля атрымання стыпендыі…

Усе пайшлі ў клубоўню выявіць за півам сваю радасць за ўсё тое, што добра канчаецца. Усе былі шчаслівыя, што яшчэ ў гэтым годзе засталіся на стыпендыі. І ўсе хацелі выпіць за поспехі Загорскага, які аддаляўся, можа быць, надоўга ад Беларускай грамады ў Празе. Адзін айцец Кірыла не прыняў у гэтым удзелу, развітаўся з усімі і пайшоў дахаты.

## II

Тугоўскі пераязджаў у інтэрнат. Усё было яму знаёма. Той самы поўны, у залатых галунах швейцар вітаў яго, адчыняючы зялёную браму. Той самы платан стаяў перад пад'ездам. Тыя самыя ліхтары віселі каля дзвярэй. Тая самая альтанка моўчкі чарнела ў куту саду, нагадваючы аб тым, калі ён спаў у ёй. Усё было тое самае, толькі зіма ўжо пакрыла белай прасцінай сад і занесла дарожкі. Тугоўскі ішоў і думаў аб іроніі, аб насмешцы лёсу. Ён зноў вяртаецца на старыя сялібы, зноў каля разбітага карыта. «Па-людзьку», як казаў Кірыла, вельмі мала прыйшлося яму жыць. Цяпер ён зноў кандыдат у бадзягі. Яму трэба здаць экзамен да вясны, інакш ад яго адбяруць нават частковую стыпендыю і прагоняць з інтэрнату! І ўсё па міласці каго? Той, каторую ён кахаў. Яна — гэта прыгожая, з вытачанымі стройнымі ножкамі, — была вінавайцам яго цяперашняга правалу. Яна зрабіла тое, што ён перастаў вучыцца. З-за яе ён блукаў па месцы, пісаў вершы, маляваў жаночыя галоўкі і не мог падрыхтаваць сур'ёзных прадметаў.

Цікава, што гутараць пра яго ў Грамадзе? Напэўна, думаюць, што Тугоўскі адзін з самых нягодных сяброў Грамады, якога перавялі з поўнай на частковую дапамогу. Цяпер ён не будзе атрымліваць з камітэта ні чаравікаў, ні бялізны — нічога. Цяпер, напэўна, Загорскі смяецца з яго і радзіць сябрам адправіць яго ў Інстытут псіхічных доследаў. Ну што ж, няхай смяюцца з яго сябры! Урэшце, кожны жыве, як умее. Каму якая справа да яго жыцця? Ён кахаў і кахае, у гэтым ёсць для яго ўнутранае апраўданне. А сябры няхай думаюць, што хочуць… Ён падняўся па драбіне ў пакой. У пакоі было цёпла. Вялікая чыгунная печка была напалена да чырвонага, каля печкі, сабраўшыся наўкола, сядзелі з кнігамі і газетамі ўжо знаёмыя Тугоўскаму людзі. Галічанін Серада ў кутку граў на мандаліне і спяваў:

> Човен ківаецца сярод вады,
> Б'ецца аб бераг вясло.
> — Мілы, мой любы, прыйдзі, ах прыйдзі:
> Забудзецца дзённае зло…

Тугоўскі лёг на вольную пасцель, прызначаную для яго, кінуў свае рэчы на падлогу і пачаў азірацца. Навокал было тое самае, тыя самыя бадзячыя таленты глядзелі на яго з усіх бакоў, але на гэты раз ён не пачуў да іх ніякага сентыментальнага кахання, як калісьці… Цяпер ён, напэўна, не заплакаў бы пад сценкай, як калісьці ад іх грання і спеваў. Пасля прыветнага памяшкання ў чыстай чэшскай сям'і яму здалося, што ён папаў у нейкі вертэп, глыбока на цёмнае, бруднае дно. Ён пачаў прыслухвацца да размоў.

— Аб'ехалі мы з хорам Кошыця[2] ўсю Еўропу, — казаў нейкі прыгожы бледны ўкраінец з кучаравымі валасамі. — А трэба вам сказаць, што ўкраінскі хор Кошыця вядомы з замежных газет — нямецкіх, французскіх, бельгійскіх, ангельскіх. У Бельгіі на нашым канцэрце быў прысутны кароль з каралевай. Дык вось, прыязджалі мы з Кошыцем у Барселону. Слаўны горад, чысценькі, з прыгожымі аканіцамі. Грошаў у нас шмат (мы атрымалі ад урада Украінскай Дырэкторыі), але ўсё — украінскія грыўны[3]. Што рабіць? Сяджу ў рэстаране з адной паненкай — прыгожым начным матылём. Сяджу я, а ў самога жара так і падымаецца: чую — тэмпература каля 40, усё роўна як ад іспанскай хваробы. Дрэнная справа… Хочацца мне правесці шалёную іспанскую ноч у Барселоне, але за што? За ўкраінскія грыўны? Я пускаюся на хітрасць.

— Ведаеце, багаты амерыканец прыехаў з Аргенціны на ўкраінскі канцэрт. — Выбіраю партманет з набітымі грыўнамі і паказваю ёй.

— Якія гэта грошы? — пытае яна.

— Аргенцінскія!.. Яны па сваёй вартасці не ўступаюць далярам.

— Якія цікавыя грошы, — кажа іспанка. — Я такіх ніколі не бачыла.

Я выбраў і даў ёй адну ўкраінскую грыўну.

— Ах, як я рада, — казала яна. І схапіла мяне ў такія гарачыя абоймы, на якія можа толькі іспанка, што запамятаў усё: і хор Кошыця, і Украіну, і Барселону, і ўсё на свеце.

Так прайшла дзіўная ноч у Барселоне, за адну ўкраінскую грыўну!

Апавядальнік рассмяяўся.

— Лоўка, — усе засмяяліся.

— А яна не шукала цябе потым? — запытаўся чыйсьці голас.

— Дзе там шукаць… Назаўтра паўднёвым цягніком мы выехалі з Барселоны.

Настала ціша.

— Падсып там у печку, — прамовіў пажылы, з доўгімі папоўскімі валасамі і з доўгай люлькай у зубах чалавек да сядзеўшага каля печкі апавядальніка. — А я вам раскажу, грамадзяне, — пачаў ён, выпусціўшы з люлькі мора дыму, — больш цікавае здарэнне. Было гэта пад час грамадзянскай вайны на Украіне. Я служыў тады ў арміі Пятлюры[4], насіў чуб-оселэдэць, які можна было закласці за вуха, і змагаўся з бальшавікамі. Вось неяк ранкам пайшлі мы ў разведку. Яшчэ ўсход толькі пачынаў ружавець і над балотам падымаўся туман, калі мы падышлі да невялікага раз’езду. Чуем, у кустах крыху ўбаку ад чыгункі — галасы… Шэпчуцца… Мы абкружылі гэтае мейсца і раптам крыкнулі:

— Стой! Здавайся!

Нешта піскнула, і з травы паднялося трое прыгожых жанчын з паднятымі рукамі. Мы ледзь не прыселі ад здзіўлення. Вось якіх курат злавілі. Выхаджу я наперад, камандую:

— Зараз за намі ў штаб! Шпіёнкі вы.

Аказваецца, яны не шпіёнкі. Яны артысткі, займаліся спекуляцыяй. Узялі па торбе белай мукі сабе на хлеб, бо есці няма чаго: саветы ёсць, а есці няма чаго. Ды вось наткнуліся на савецкі загараджальны атрад. Каб уцячы, яны рашылі перайсці да нас з усімі торбамі мукі. Думалі, мы людзі інтэлігентныя, не дазволім сабе здзеку над імі. Але калі яны пабачылі нас, дык задрыжэлі, як асінавыя лісты. Напэўна, мы настрашылі сваімі «оселэдцамі». Прывялі іх у штаб. Чорт іх ведае: можа, сапраўды шпіёнкі якія-небудзь. Мы нават не маглі паверыць, што гэта жанчыны. Хто ведае, можа, гэта пераапранутыя мужчыны? Загадалі ім зараз распрануцца. Дрыжачы ад страху і сораму, яны распрануліся і стаялі перад намі, як пакорныя авечкі. Зрабілі допыт. Усё аказалася ў парадку. Мы ім паверылі. Начальнік, кончыўшы допыт, усміхнуўся і сказаў: «Ну, хлопцы, думаю, што на допыце вы пакажаце сябе інтэлігентнымі ў адносінах да гэтых трох дам. Іх трое — і вас трое. Выбірайце сабе любую».

З гэтымі словамі ён выйшаў з пакою… Засталіся мы адны, пераглядаемся, смяемся на свае ахвяры… Што ж рабіць з імі? Вазіць іх з сабой? Не такі час, але наогул у нас жанчын няма… Бог ведае, калі мы іх бачылі. Стаім і глядзім, выбіраем. Нарэшце, выбралі. Мне трапілася нейкая спявачка. Артыстка! Жыццё сваё не меў артыстак, нават не бачыў, а тут на табе — шчасце прываліла… Ну, вось і паспрабаваў я.

Апавядальнік замаўчаў і пачаў цягнуць раз за разам даўгую люльку.

— А далей што было? — нецярпліва запытаў чысты голас.

— Далей пайшло ўсё добра, яна мне на памяць дала залаты гадзіннік, яна спявала ў маіх абоймах, як птушка ў абоймах кошкі, рамансы аб каханні. Гэта была, напэўна, яе лебядзіная песьня, бо назаўтра зранку…

Ён замаўчаў і пачаў падкладваць вуголле. Вугаль успыхнуў, і ў чырвонай печцы загуло.

— Што назаўтра зранку? — запытала некалькі чалавек.

— Назаўтра мы адступілі ад гэтага мейсца.

— А яна? — запытаў Серада з кута. Кінуўшы гуляць, ён прыслухваўся да размовы. — Ты яе забіў?

— Яе? — неахвотна перапытаў апавядальнік, выбіваючы люльку. — Не… Я на развітанне толькі перацягнуў яе пару раз. Але яе, здаецца, потым расстралялі.

Усе замаўчалі. Тугоўскі глядзеў на сядзеўшых у пакоі людзей і вушам сваім не верыў. Куды ён трапіў? Гэта вяртэп нейкі, а не студэнцкі інтэрнат. І чаму ён раней так ідэальна

глядзеў на людзей?! Хоць і ў іх трэба знаходзіць што-небудзь людскага.

Серада паглядзеў на Тугоўскага і ўсміхнуўся. Ён парушыў нарэшце цішу:

— Слухай і вучыся!

— Гэтыя ўніверсітэты не для мяне, — адказаў Тугоўскі, пераварочваючыся на пасцелі спіной да Серады. Серада не стрымаўся:

— Ну скажы, Тугоўскі, што б ты рабіў, каб у цябе была дзяўчына? Ты, напэўна, не ведаў бы, што рабіць?

Усе засмяяліся. Гэтага смеху, напэўна, толькі і хацеў Серада. Ён пачаў смяяцца на ўвесь пакой. Тугоўскі маўчаў. Праз нейкі час смех заціх, і ўсе зноў прыняліся за апавяданні. Тугоўскі заплюшчыў вочы, стараючыся не слухаць. Ува ўсіх размовах фігурамі былі жанчыны… І тут ён не меў спакою ад жанчын, і тут толькі гутарылі аб іх. Але як брыдка, як нізка ставілі тут жанчыну, якую нявольніцу сваёй пахаці рабілі яны з яе. Проста жахліва! Як далёкі ён ад таго, што ведалі гэтыя людзі з усіх краёў і ўсіх частак свету. Як лоўка цанілі яны жанчын розных рас — і чорных, і белых, і жоўтых, і каштанавых — быццам разглядаючы калекцыю розных матылёў…

Тугоўскі ляжаў, а ў яго вушы ляцелі словы пра жанчын. Ён хацеў выкінуць усе думкі аб жанчынах. І чым грубей маляваўся інтэрнацкімі жыхарамі вобраз жанчын, тым мілей яна яму, тым яскравей выплываў сярод вобразаў жанчын розных рас і народаў вобраз Вярхоўскай! Дзе ж тут пасля гэтага вучыцца! Яго, напэўна, наўмысля перасадзілі ў інтэрнат, каб не мог здаць экзамены і каб яго выкінулі са стыпендыі гэтай вясной! Вучыцца можна было толькі ўночы, вечарам інтэрнат пусцеў, усе адпраўляліся шукаць шчасця ў начную Прагу. Адны ішлі на рандкі, напудраныя і напарфумленыя, у рукавічках на шырокай рабочай руцэ, другія садзіліся за столік рулеткі ці картаў. Інтэрнат пусцеў. Але якая навука была ўночы? Тугоўскі з жахам думаў аб гэтым і ляжаў нерухома на пасцелі з заплюшчанымі вачыма. Калі ён расплюшчыў вочы, у інтэрнаце было напалову цёмна, вісячая лямпа слаба асвятляла вялікі пакой. Пад лямпай каля велізарнага стала стаяў апрануты Серада і пудрыўся.

— Ну, Тугоўскі, — засмяяўся ён, калі пабачыў, што той глядзіць на яго, — уставай, пойдзем на рандку.



— Можаш сабе ісці, куды хочаш, — буркнуў Тугоўскі, не жадаючы з ім і размаўляць.

— Эх ты, сонька Тугоўскі, ты зусім нічога не цяміш адносна жанчын. Яны б цябе засмяялі і вадзілі вось так… — Пры гэтых словах узяў сябе за нос, пачаў вадзіць ува ўсе бакі па пакоі.

— Выходзь хутчэй, конскі партрэт, — злобна сказаў Тугоўскі. Ён ужо не мог больш цярпець гэтага спевака і карцёжніка, які прыставаў да яго і кусаўся, як муха. Яшчэ б хвілі — і Тугоўскі гатоў быў кінуцца на яго з палкай.

— Брава, брава! — закрычаў астральны чалавек з-пад кучы сваіх коўдраў. — Лоўка вы яго назвалі: конскі партрэт[5]. Сапраўды, у яго вочы вялікія, як у каня.

— Ты, зачыні коўдрай свой астральны дух, — смеючыся, глядзеў на яго Серада. І, смеючыся, паставіўшы люстэрка, як ні ў чым ні было, выйшаў напудраны з пакою.

— А, добры вечар, грамадзянін Тугоўскі, — казаў астральны чалавек, працягваючы яму рукі, калі яны засталіся адны зноў. — І вы тут апынуліся сярод нас. Ну як жывяце? Даўно мы не бачыліся.

— А ведаеце, — усміхнуўся Тугоўскі, — пацвярджаецца тэорыя роджаных пад Сатурнам.

— Гэта нічога, — гаварыў сур'ёзна тонам прарока астральны чалавек, — мы толькі павінны прызнаць, што над намі ёсць вышэйшая сіла, якая кіруе намі. Мы павінны ведаць свае недахопы, свае слабасці, характар, але мы сваімі ўласнымі намаганнямі павінны імкнуцца знішчыць іх. Калі ведаеш наперад, дзе павалішся, тады лягчэй можна аберагчы сябе і падаслаць салому, праўда?

— А ўсё ж такі гняце мяне псіхалогія. Я больш не магу глядзець на будучыню з верай, калі я радзіўся пад Сатурнам…

— Вось ад гэтага я хачу вас папярэдзіць, — прадаўжаў сваім скрыпучым непрыемным дыскантам астральны чалавек. — Гэта было б зусім неправідловае разуменне астралогіі як навукі, калі б вы, ведаючы, што радзіліся пад Сатурнам, апусцілі рукі. Зусім не… Нам трэба больш змагацца, трэба быць больш упартымі, калі мы ведаем, што на нашай дарозе не растуць ружы, а шыпы, і пападаюцца правалы велізарныя. Але кінем філасофію. Скажу вам я па-сяброўску: канчайце ўніверсітэт. Атрымлівайце хутчэй дыплом, бо інакш вас за-

труць у жыцці такія людзі, як Серада ці Загорскі. Мая справа, зразумела, убаку, але я не магу глядзець спакойна на вашыя хваляванні, няпэўнасць. Вы сталі нейкім змучаным, хворым, пажоўклым, быццам у вас пачаўся працэс сухотаў… Вы кашляеце? Не?

Тугоўскі адмоўна пакачаў галавой.

— Не?.. Тады добра. Мне самому стала непрыемна, што я вам адкрыў ісціну, а вы так блізка прынялі яе да сэрца, што зараз хварэеце за яе. Не рабіце гэтага. Больш веры ў сябе… Вы геніяльны чалавек, Тугоўскі! Так, не смейцеся! Вы яшчэ, можна сказаць, як дзяцёнак. І дзеля гэтага было б злачынствам, каб вы, чысты, ідэальны чалавек, не сапсуты жыццём, былі бы зацёрты такімі эмігрантамі, як тыя, што жывуць у нашым інтэрнаце. Адзіная зброя проціў іх — гэта дыплом. Змагайцеся зараз за дыплом. Усімі сіламі за дыплом інжынера ці доктара… Інакш вас заўтра ў жыццё не пусціць дурань з дыпломам. Дыпламаваны дурань. Разумееце вы гэта, так ці не?

— Выбачайце, — пачаў Тугоўскі, — я вучуся для навукі, а не для дыплома…

— Ах, як вы мяне не разумееце, мілы чалавек, — заварушыўся астролаг на коўдрах. — Справа не ў выразах, мы не гімнасты з вамі, каб спрачацца з-за слоў. Усё роўна, як вы там будзеце вучыцца: для навукі ці не, але вам патрэбны дыплом. Паверце мне, астральнаму чалавеку з дагарэўшым жыццём. Я не казаў бы вам усяго, каб не стаў сам перад варотамі могілак, перад канцом майго стракатага і бескарыснага жыцця. Цяпер, калі нікога няма ў інтэрнаце, я скажу вам: у мяне сухоты ў апошняй стадыі. Кожны дзень я выплёўваю чырвоныя кавалачкі крыві, кожны дзень я выхаркваю жыццё… Паслухайце, якія ржавыя петлі скрыпяць у маіх грудзёх. Хутка, хутка ад мяне застанецца адно астральнае цела. Але ж былі часы, калі я не валяўся так пад коўдрамі, як зараз. Вы не думайце, я студэнт апошняга курса юрыдычнага факультэту, я быў афіцэр аўстрыйскай арміі. Я жыву і лічуся студэнтам… Але што зробіш. Я атрымаю свой дыплом тады, калі буду ляжаць у магіле. Як прыгожа, праўда? Мне пакладуць мой дыплом доктара юрыдычных навук замест вянка на магілу. — Ён памаўчаў крыху, зноў прадоўжыў: — Дык вось, усё гэта кажу я вам для таго, каб вы зразумелі, што я зусім не



зацікаўлены ў вас: так, мне ўсё роўна, ці будзеце вы веруючым будыстам і астролагам, ці будзеце веруючым інакш або зусім бязверуючым. Абсалютна не зацікаўлены я ў тым, будзе ў вас дыплом ці не. Але я хачу вам даць раду… Даць раду, таму што як старэйшы і бачыўшы жыццё, па-другое, як чалавек, катораму час гніць. Жывіце, красуйцеся, гуляйце і расціце, мілы чалавек Тугоўскі. Гляджу я на вас і дзіўлюся: колькі ў вас яшчэ маладосці, сілы, энергіі, якія вы проста не пускаеце ў справу. Кіньце ўсе гэтыя сілы на завяяванне дыплома!

Тугоўскі маўчаў. Ён толькі ўздыхнуў, калі астральны чалавек скончыў сваю доўгую прамову.

— А вы, можа, кахаеце? — запытаў ціха астральны чалавек. — Выбачайце за нясціпласць.

— Прызнацца шчыра, — усміхнуўся Тугоўскі — кахаю…

— Кіньце, мілы чалавек, кіньце. Кахаць вы будзеце тады, калі ў вас будзе дыплом, — праўда. Падумайце самі, каго вы зараз можаце кахаць? У самога, кажуць, ні кала ні двара… Самі яшчэ дзяцёнак… Каго тут кахаць? Ды не, кіньце, проста адкладзіце гэтую справу на задні двор. Цяпер займайцеся больш паважнымі справамі. Будзе ў вас дыплом — будзе ахвота да гэтага дабра, а жанчын знойдзеце, колькі захочаце.

Тут ён закашляўся, зноў схаваўся пад свае коўдры. Тугоўскі задумаўся над яго словамі і выйшаў з пакою.

## III

Усё ж такі шмат правідловага казаў астральны чалавек! Дыплом! Гэта маяк у цемры яго жыцця! Не раз, можа, у бурную ноч жыцця, калі ён будзе гінуць і кідаць у свет крык «Ратуйце!», гэты дыплом пашле яму святло ратунку! Без дыплома яго «затруць у жыцці», як казаў астральны чалавек. Трэба сапраўды кінуць на час каханне і Вярхоўскую. Адно павінна стаяць перад ім зараз — гэта дыплом.

Ён пачаў акуратна хадзіць на лекцыі. Кожны ранак, калі яшчэ інтэрнат спаў і ў пакоях было цёмна, ён уставаў, мыўся, апранаўся і выходзіў на вуліцу. Прага ўжо шумела. Працоўная Прага ўставала вельмі рана. Па вуліцах валіла шумная армія чыноўнікаў, работнікаў і вайсковых. Дзе-нідзе трапляўся

прафесар. Чэшскія прафесары, напэўна, устаюць раней за ўсіх прафесараў, і нідзе не пачынаюць так рана лекцыі, як у Чэхіі.

У 7 гадзін зімой першая лекцыя чытаецца яшчэ пры электрычным асвятленні. Тугоўскі хадзіў на яе акуратна, з сістэматычнасцю з’яўляўшагася на ранняе набажэнства, але з кожным днём усё больш адчуваў расчараванне. Прафесары не давалі яму таго, што ён ад іх чакаў. Асабліва не падабаўся яму адзін прафесар народнай гаспадаркі, або палітычнай эканоміі. Ён увесь блішчэў: блішчэлі яго залатыя зубы, блішчэў новенькі касцюм, блішчэла залатая брошка ў гальштуку, блішчэлі лакіркі, блішчэла залатое пяро ў вечнай абсадцы, блішчэлі яго жоўтыя рукавічкі, калі ён выходзіў на вуліцу. Гэта быў прафесар, якога ён бачыў на вуліцы ў Празе, які ўвесь час жыў у Парыжы і Жэневе як сябра нейкага Міжнароднага бюро працы пры Лізе Нацый[6]. У час яго адсутнасці лекцыі чытаў яго асістэнт, з тварам круглым, як месяц у паўнату, — тыповы лавачнік гастранамічнага магазіну. Лекцыі прафесара вельмі цаніліся, і на іх было вельмі цяжка трапіць, бо прыходзілі студэнты з усіх факультэтаў, а часамі і прыватная публіка. Адзін раз ён пачуў гэтага залатазубага прафесара. Ён прыйшоў рана, ведаючы, што будзе прафесар. Высокі дом глядзеў на яго сваімі велізарнымі каменнымі глыбамі сцен, як сімвал вечнасці той навукі, якая папалася ў яго абоймах. Шырокія маршыроўкі з калонамі ў прыгожым архітэктурным стылю, які ён яшчэ не мог нават пазнаць — не то сафійскі, не то карынфскі з нейкімі моднымі дадаткамі лісткоў і завіткоў, прывялі яго ў шумную прасторную аўдыторыю. Прафесара яшчэ не было. Студэнты, як вучні, шумелі, смяяліся, жартавалі, хадзілі ўзад і ўперад, нават пералазілі парты. Больш усяго бестурботнымі і легкадумнымі здаваліся чэхі. У параўнанні з задуменнымі, сур’ёзнымі эмігрантамі яны выглядалі проста дзяцьмі. Беларусы з чырвонымі вясковымі тварамі, маладыя і вясёлыя, глядзелі на ўсё з адкрытымі ратамі, як вясковыя бабы на дзіва. Яны ўсё прымалі радасна, без задніх думак, яшчэ ні ў чым не расчараваныя, як дзеці, якія спакойна глядзяць на вагонь і не ведаюць, што гэты вагонь іх апаліць. Тугоўскі падумаў: «Як добра быць такім радасным, незадумным чалавекам, прыймаючы свет такім, якім ён ёсць». Ён быў іншым. Жыццё прайшло па яго душы цяжкім плугам, пакінуўшы барозны. Яму заўсёды давалі на выгляд больш гадоў, чым ён іх меў. Цяпер ён чуў, што стаў яшчэ больш старым, маладым гадамі, але старым душой. Жыццё ў Празе пакінула ў ім не адну баразну мукі і здавалася толькі пакутай.

Тугоўскі спыніўся і агледзеў аўдыторыю. Беларусы махалі яму рукой, даючы знак, што яны маюць для яго мейсца на партах. Высокі Бурак, махаючы сваімі вялікімі працоўнымі рукамі, крычаў на ўсю аўдыторыю. Тугоўскі неахвотна пайшоў на заклік да сваіх землякоў і зараз жа наваліўся на Бурака:

— Ты чаго крычаў, як быццам на полі пры моцным ветры? Памятай, што ты не на вёсцы.

У гэты час увайшоў прафесар. Настала магільная ціша. Усе замёрлі і заскрыпелі пёрамі па паперы. З самых першых слоў прафесара Тугоўскі пачаў яго ненавідзець. Прафесар абараняў капіталізм, лаючы марксізм. Ён злосна высмейваў сацыялістаў, паказваючы пры гэтым поўны рот залатых зубоў.

— Больш 30 гадоў, — казаў ён, — я вывяраў марксізм. На працягу гэтага перыяду параўнанняў, пасля доўгіх навуковых даследаў зрабіў выснову. У свеце пануе асоба-адзінка і эканамічныя інтарэсы гэтай адзінкі. Імкненні да эканамічнага росквіту адзінкі не пярэчаць грамадскім інтарэсам, наадварот, яно іх толькі развівае. Возьмем які-небудзь прыклад, з якога вам стане ясней мая думка. Возьмем, напрыклад, якога-небудзь півавара. У Пільзене жыве чалавек, маючы невялікі завод з дрэннымі старымі машынамі. Піва выходзіць горш, чым з іншых заводаў, праца дрэнна аплачваецца. Ён хоча выратаваць сваё прадпрыемства, ён хоча атрымаць больш зыску[7]. І вось ён завозіць новыя машыны, ён прывозіць новых інжынераў, ён павялічвае завод. Ён хоча павялічыць свой зыск. Але для гэтага ён павялічвае якасць піва. Машыны павялічваюць яму колькасць яго, а павялічваючы колькасць, ён павялічвае якасць піва, магчымасць выпускаць яго танней. Такім чынам, што ж сталася? Негатыўнае, чыста эгаістычнае імкненне півавара атрымаць як мага зыску прымусіла яго зрабіць шмат дадатных крокаў: павялічыць якасць піва, паменшыць яго цану, павялічыць плату рабочых. Значыць, яго эгаістычнае імкненне для нажывы мела зусім дадатнае грамадскае значэнне! Дык вось, вы бачыце, што імкненне адной асобы разбагацець — з’яўляецца карысным для ўсяго грамадзянства!..

Тугоўскі задумаўся: ці праўду кажа гэты залатазубы прафесар? Ён успамінае, што калісьці ў Харкаве, калі ён быў яшчэ рэалістам, у аддзеле прапаганды дзянікінскай арміі расейскі эканаміст прафесар Лявіцкі[8] даказваў гэтую самую думку. Як дзіўна аднадумны гэтыя два прафесары, аб існаванні адзін аднаго, напэўна, нават не ведаючых. Вось што значыць буржуазная навука. Гэты прафесар кладзе ідэйны фундамент усёй чэшскай тэхнікі! Так думае, напэўна, прафесар фізікі і хіміі, матэматыкі і астралогіі: так думаюць яны ўсе, выхаванцы маладога пакалення. Так пачынае думаць пакрыху і кожны студэнт, апраўдваючы ўсю існуючую сістэму эканамічнага панавання адзінак.

Значыць, эканамічнае рабства — у прынцып! Правідлова сказаў нейкі мудрэц: «Рабства на свеце не знікае, мяняюцца толькі яго формы». Ён, Тугоўскі, згодны з гэтым. Але каб людзі гэтае рабства ўзводзілі ў прынцып, каб яны яго ўзводзілі ў права, у закон, нейкі час будзе «сацыяльнае» пытанне. Значыць, няхай будуць вечна багатыя і бедныя, адны півавары і капіталісты ледзь носяць свае адкормленыя тушы, а на рагу вуліцы няхай стаяць убогія і галодныя. Няхай, значыць, вечна будуць войны, бо адзінкі хочуць багацець, хочуць рынкаў для збыту тавараў, а дзяржавы стаяць на варце іх інтарэсаў. Міністры і ўрады таксама нічым не адрозніваюцца ад людзей, жадаючых разбагацець. Значыць, няхай будуць калекі і убогія, няхай будуць сіроты і ўдовы, няхай льюцца слёзы і кроў па ўсім абшары зямлі. І гэтыя крывавыя прыкупы як апошняе слова навукі прыпадносіць прафесар моладзі. Гэтую атруту ўлівае ён у сэрца яе аўтарытэтам свайго слова і свайго палажэння. Так прывучае ён думаць усіх прысутных у гэтай аўдыторыі, тое ж ён прымусіць адказваць студэнтаў на экзамене. Так панясуць беларусы-студэнты яго думкі ў сваю лапцюжную Беларусь.

Ён глянуў на сваіх землякоў. Яны запісвалі кожнае слова прафесара, як фанограф запісвае гукі, ніколькі не задумваючыся над іх зместам. Яны не маглі ці не хацелі глыбей спыніцца над тымі словамі, якія патокам ліліся ў іх маладыя сялянскія мазгі атрутай. Можа быць, яны былі згодны з прафесарам? Недарма казалі пра аднаго студэнта з Прагі, які, заехаўшы да бацькі-селяніна, не мог апрануць кажуха.

«Смярдзіць», — казаў ён сярдзіта.



Гэты студэнт — правобраз тых, якія вернуцца пасля яго на Бацькаўшчыну. «Бедная Беларусь, — падумаў Тугоўскі, — калі яна мае такіх сыноў».

Тугоўскі наўмысля шапнуў сядзеўшаму каля яго Бураку:

— А як ты думаеш, ён праўду кажа?

Той здзіўлена падняў на яго вочы і сярдзіта агрызнуўся:

— Не перашкаджай!

Тугоўскі замоўк. Ён глядзеў на ненавіснага залатазубага прафесара, і яму хацелася пусціць з свайго мейсца на кафедру кнігай проста ў яго зубы. Ён не мог сядзець і хацеў пакінуць аўдыторыю ў знак пратэсту. Але не адважыўся стукаць дзвярыма. Ён сядзеў і думаў: для каго ж гэта тэхніка? Як вучыцца ў інстытуце сыну работніка і селяніна? Ён з палёгкай уздыхнуў толькі тады, калі нарэшце зноў загаманілі і прафесара не стала ў пакоі.

## IV

Сумна ішоў з лекцыі ў свой інтэрнат Тугоўскі. Снег абсыпаў яго, снег кружыўся перад ім, як думкі, бяссільна разбіваўся аб каменні вуліц. Што цяпер будзе з дыпломам? Пасля гэтай лекцыі ён пачуў, што не можа больш хадзіць у Політэхнічны інстытут. Яму чамусьці здавалася, што ўсё, што прыпадносіцца ў інстытуце, — мана і махлярства, прыкрытыя вэлюмам навукі. Як жа ён зможа вучыць тое, чаму ён сам не верыць, і як ён пойдзе на экзамен да гэтага залатазубага прафесара, якога ён ненавідзіць усёй сваёй душой? Што ён будзе адказваць яму? Тое, што казаў прафесар, — проста зазубрыўшы адказы, як папугай? Не, ён гэтага не мог бы зрабіць. Ён не пойдзе проціў голасу свайго ўласнага сумлення.

Перш за ўсё трэба заставацца чэсным з самім сабой. Тады спрачацца з прафесарам, даказваць яму, што ён памыляецца? Але… Ён яшчэ досыць слабы, можа быць, пасля такой дыскусіі прафесар выправіць яго з кабінету як за незадавальняючы адказ… Значыць, так ці інакш, выхаду няма. Ён трапіў у нейкае зачараванае кола, з якога не выбрацца. Што ж будзе тады з дыпломам? Наогул, што будзе тады з яго навукай, з яго ахвярамі на даўгім шляху? Ці ж у імя таго, каб ён кінуў універсітэт, працавала яго матка ў пральні і мыла чырвонаар-

мейскую бялізну, ці ў імя гэтага трэба было канчаць гімназію? Кінуць дабравольна ўніверсітэт — гэта ж было б самагубства, над якім смяяліся б усе сябры! Але, з другога боку, як у ім вучыцца, калі чуеш, што ён створаны для панавання нейкіх асоб над народам, над сялянамі і работнікамі, што ён толькі здзекуецца над дзецьмі гэтых сялян і работнікаў. Тугоўскі не мог разблытаць гэтага вузла думкі. Чым больш ён думаў, тым больш гэты вузел зацягваўся. Хто мог бы яму дапамагчы? А што, калі ён жорстка памыляецца, калі праў залатазубы прафесар? Урэшце, кожны чалавек хоча быць багатым. Нават узяць самага маленькага, нікчэмнага чалавека і запытаць, ці хоча ён быць багатым, напэўна, ён здзівіцца і скажа: «Што за пытанне? Вядома, хачу».

Кожны хоча быць багатым, але не кожны можа. Дык чаму ж нападаць на тых, якія могуць сабе нажыць багацце, чаму нападаць на іх за тое, што ў іх ёсць з большасці і розум, калі ў іншых гэтага няма. Недарма ён калісьці ў сваёй споведзі самагубцы параўноўваў людзей з птушкамі… Можа быць, гэтыя багатыя людзі і ёсць тыя, каму прырода дала крыллі лятаць пад небам. Дык ці павінны мы дабіваць іх за гэта?

Ён ішоў па занесеных снегам дарогах міма прыгожых, толькі што пабудаваных утульных вілаў. Так хацелася б у гэту студзёную пару забрацца ў адну з такіх вілаў, рассесца каля каміна, слухаць трэск агню і марыць, падняцца ў паэтычныя далі, пад шум буры, што ломіцца ў вакно. І што было б, калі б яму сказалі: «Вось вы, грамадзянін Тугоўскі, сацыяліст. Добра… Мы даём во гэтую вілу ў поўную ўласнасць. Жывіце ў ёй, колькі хочаце, перадавайце яе, каму хочаце, у спадчыну. Завадзіце пры віле сад, аб'ядайцеся яблыкамі і слівамі, таўсцейце. А мы паглядзім, што стане з вашымі сацыялістычнымі поглядамі». І што сталася б? Нейкі ўнутраны насмешлівы голас казаў: «Зразумела, ты адмовіўся б ад вілы. Праз пару гадоў ты сам лаяў бы сацыялістаў. Значыць, усе людзі роўныя па свайму складу. Чалавечае ёсць заўсёды чалавечае. І ўрэшце ўсё зводзіцца да аднаго агульнага назоўніка: кавалка хлеба. Значыць, тады прафесар праў». Не, не можа быць. Тугоўскі не мог дапусціць, адчуваў нутром, не розумам, а сэрцам, што ўсё ж трэба нешта дабавіць да яго, унесці нейкую папраўку. Але якую, ён не ведаў. З кім бы пагутарыць?



З сябрамі? Ён успомніў пра Вярхоўскую. Прыгожы вобраз прымусіў яго на хвіліну радасна ўсміхнуцца. Толькі дзе спаткаць яе? У Студэнцкім доме яе не відаць, дык ён і сам рэдка туды заглядвае. Усё ж давядзецца яе пабачыць, пагутарыць з ёй. Яна філасофка і шмат можа яму дапамагчы ў развязванні таго вузла, які так непрыемна завязаўся. Ён зноў пачаў думаць пра ўніверсітэт. Хто ведае, можа быць, расквітацца з ім, кінуць, на Бацькаўшчыну падацца… А можа быць, чым жыццё не жартуе, можа быць, яму засмяецца яшчэ каханне… Калі б магло стацца, што Вярхоўская ішла б з ім за руку як жонка, ён мог бы сказаць, што не дарма прыехаў у Прагу!

Пры гэтай думцы ён нават весялей зачасціў па скрыпучым снезе. Калі ён увайшоў у інтэрнат, яго сустрэлі напоўненае дымам папярос паветра, гоман, смех, гукі мандаліны. Страката касцюмаў, мовы, людскіх твараў на гэты раз яму здаліся асабліва цікавымі. Ува ўсіх кутах чуліся гутаркі аб жанчынах. Але самае цікавае было тое, што на пасцелі сядзеў Кірыла і граў на мандаліне. Побач яго сядзеў Серада, каля пасцелі стаяла кучка слухачоў.

— Якім чынам ты тут апынуўся? — здзівіўся Тугоўскі.

— У госці прыйшоў, даражэнькі, частуй хутчэй. Я чакаю цябе з паўдня.

— Што ж цябе прыгнала так да мяне? Напэўна, справа. Так ты ніколі дабравольна не зайшоў бы.

— Чаму? Захацелася цябе проста паглядзець… А потым, і праўдлова — справа ёсць. Вось, грамадзяне ўкраінцы, — пачаў ён голасна, — у гэтую нядзелю беларусы наладжваюць вечарыну. У Чэшска-Рускай еднасці[9]. Вельмі просім вас усіх з'явіцца і падтрымаць сваёй прысутнасцю.

— А што там будзе? — запытаў Серада.

— Выступае квартэт чэшскай філармоніі, будуць спевы беларускага хору, сольныя нумары, дэкламацыя беларускіх вершаў. Студэнт Тамашэвіч будзе іграць на дудзе. Бачылі калі-небудзь беларускую дуду, грамадзяне?

— Што гэта за дзіва? — смяяліся ўкраінцы.

— Вось пабачыце… Прыходзьце. Ну а цяпер пойдзем крыху пагутарым, — сказаў айцец Кірыла, устаючы і перадаючы мандаліну Серадзе. Яны выйшлі ў даўгі калідор інтэрната і пачалі хадзіць з кута ў кут.

— Ну, шмат навін табе прывёз, — казаў Кірыла. — Папершае, ты, напэўна, ужо ведаеш, што Загорскі зрабіў сваю бліскучую кар'еру і закахаўся ў багатую чэшку. Цяпер ён з'яўляецца ў Студэнцкі дом толькі ў возуўцы…

— Я гэта чуў, — зазначыў пахмурна Тугоўскі.

— Дык вось, цяпер Вярхоўская засталася без жаніха, — засмяяўся ён. — Ну, а як у цябе справа з каханнем? Студэнты смяюцца, што ты закахаўся ў Вярхоўскую, нават яна сама зазначае, што вельмі любіць гутарыць з табой. Ні з кім ёй няма такой прыемнасці гутарыць, як з табой. Хе-хе-хе!

— Ты што? — паглядзеў на яго, пільна зварушаны і ўсцешаны, Тугоўскі. — Не можа быць!

— Правідлова! Толькі я хачу запытаць цябе: ты сур'ёзна кахаў яе?..

— Я? Як сказаць, — засаромеўся і пачырванеў Тугоўскі.

— Кінь, браце, — сур'ёзна прамовіў, сплёўваючы на падлогу, айцец Кірыла, — нічога з твайго кахання не будзе. Яна — інтэлігентка. Дачка папа…

— Дачка папа? — ледзь не ўскрыкнуў Тугоўскі. — Дазволь, я нічога не разумею: як жа яна, сацыялістка, пры гэтым з'яўляецца яшчэ сябрам прэзідыума — і паступовага!

— Сацыялісты? Правадыры народу — брахуны, — пачаў лаяць Кірыла, — ідуць у народ, нясуць яму кніжачкі. У кніжачках — пра свабоду. Дзеля чаго? Дзеля таго, каб потым сядзець на шыі гэтага народу. «Прыхільнікі народу — дабрадзеі пакрыўджаных працоўных мас». Толькі паслухаць іх, як яны гавораць у сваіх перадвыбарчых прамовах, як яны стараюцца атуманіць народныя мазгі — і ўсё толькі для таго, каб потым стаць дэпутатамі. Дзе ж праўда пасля гэтага?

— Айцец Кірыла, ты — анархіст. Ты нічога не прызнаеш, у табе жыве нейкая брутаўская жылка…

— Хто б я там ні быў — гэта ўсё роўна. Толькі гэта маё перакананне. Усе гэтыя — Тамашэвіч, Вярхоўская, Загорскі — ягадкі аднаго поля — інтэлігенты. Жывуць для народу! Падумаеш, якія прарокі… Ведаем… — Пільна паглядзеў на Тугоўскага: — Калі на вечарыне ў маёй кватэры Тамашэвіч гутарыў аб ластаўках культуры, якія паляцяць на Беларусь, я не хацеў спрачацца дзеля свята. Падумай толькі: яны панясуць культуру ў народ… Ды запытаць іх, ці ведаюць яны гэты народ, ці жылі яны хоць раз яго жыццём, у яго брудных хатах, ці зрасліся яны з ім, як дрэва зрастаецца каранямі з грунтам? Не, браце, тысячы разоў не. Не гэтым Тамашэвічу і Вярхоўскай, не гэтым інтэлігентам быць ластаўкамі. Грош ім цана…



— Ого-го, — засмяяўся Тугоўскі. — Ты сапраўдны прарок… На другіх нападаеш, а сам?

— Не, выбачай: я не прарок. Што ў каго баліць, той аб тым і пачынае гаварыць, кажа прыказка. А справа баліць. Як падумаю часам, што будзе з намі, з той масай, якая сапраўды павінна быць ластаўкамі на Бацькаўшчыне, — і, ведаеш, страшна стане. Бедная, няшчасная Беларусь: якую будучыню яна мае?

— Ты вельмі згушчаеш фарбы, айцец Кірыла. Не думаю, каб так было страшна!

— Не страшна? Згушчаю фарбы? — узвысіў голас Кірыла. — Ты падумай, да чаго дайшлі нашы сябры. Паглядзі на моладзь з сялян і работнікаў: аб чым гаворка? Аб вечарах, аб кар'еры… Яна думае стаць багатай і паказацца на Бацькаўшчыну нават няведанай, беларускай буржуазіяй. Разумееш, каб гэтыя кар'ерысты былі тыпу Станкевіча, Малевіча, іншых нашых моцных трывалых мужычкоў, — я б не сказаў нічога. Гэта было б нармальна. Багаты бацька пасылае свайго сына ў Прагу вучыцца на доктара ці інжынера, зарабіць капітал, каб потым павялічыць сваю гаспадарку. Але калі аб гэтым думае наш брат беззямельны і малазямельны, калі ён пачынае ганяцца за ўсімі «арыстакратамі», і носіць фракі, і пераймае, забываючы аб вонкавых манерах, — тады гэта смешна да брыдкасці. Хочацца смяяцца ім у твар. Учора прыходзіць да мяне Бурак і кажа, што ён пазнаёміўся з нейкай графіняй. Я так і пакаціўся са смеху. Кажа: «Маленькая жанчына, можа, і кухаркі іншай не варта, але затое, браце, зямлі — больш 600 гектараў па старым часе. Яна нават збіралася на мае дакументы перапісаць. Хто ведае, можа быць, старыя часы вернуцца і яна атрымае зямлю…»

«А ты станеш графам», — засмяяўся я і паглядзеў на яго даўгія работніцкія рукі, на якія былі нацягнуты вузкія, гатовыя трэснуць рукавічкі. Добры «граф», няма чаго казаць… Я катаўся на пасцелі са смеху.

— А між тым, калі падумаць, братка, гэта вельмі сумна, — сказаў Тугоўскі. Нарэшце размова скіравала на цікавіўшую яго дарогу. — Думаў на лекцыі залатазубага прафесара капіталістычнай эканомікі. Той самы Бурак не хацеў нават размаўляць аб змесце лекцыі прафесара і запісваў яго кожнае слова — як папугай. Прафесар казаў аб патрэбе багацець і карысці ад гэтага для ўсяго грамадзянства…

— Ну, вось і маеш. Бурак затое і думаў разбагацець.

— А можа быць, айцец Кірыла, гэта і трэба? Я заўсёды зайздросціў такім людзям, як Бурак, якія ні аб чым не думаюць, з неба зор не хапаюць, у пясок філасофіі і непатрэбных пытанняў галовы не сунуць, а жывуць сабе толькі для таго, каб жыць. Яны бяруць ад жыцця яго насалоды, яны смяюцца здаровым смехам, і здаровы румянец грае на іх тварах. Яны гатовы нават пакахаць графіню, зусім не бачачы ў гэтым нічога камічнага. Бурак так перакананы ў сваім праве на жыццё і яго радасці, што над сабой зусім не раздумвае. Калі б яго прывялі ў паркетную залю, напоўненую арыстакратамі, дык, я думаю, ён спакойна глядзеў бы навокал сябе і спакойна калупаў пальцам у сваім носе.

— Не ў гэтым справа, — прадоўжыў Кірыла. — Калі б гэты Бурак заставаўся сабой і нават сярод арыстакратаў калупаў пальцам у носе, гэта можна было толькі вітаць. Але калі гэты просты палескі мужык Бурак нацягвае на сваю шырокую руку рукавічкі, калі ён хоча курчыць з сябе арыстакрата, графа, — тады гэта толькі маўпаванне. Над гэтым трэба смяяцца, праз слёзы. Чаму? Таму, што гэты чалавек — косць ад косці, кроў ад крыві простага народу, не хоча ісці з ім, не думае змагацца за яго долю, не хоча стаць у шэраг грамадскіх працаўнікоў. Не хоча ў імя агульнага шчасця… А калі гэта думае Бурак — самы сапраўдны тыповы беларус-селянін, дык што казаць тады пра нашых людзей мясцовай культуры… Сапраўды, дзядзька Тугоўскі, стане страшна, калі падумаеш над лёсам беларускай грамады ў Празе. Мы хочам, каб запахла мёдам, каб сонца заглянула, нарэшце, у шырокае вакно новай сялянскай хаты, але скажы ты мне: хто будзе той Майсей, які выведзе нас з цемры няволі ў зямлю абяцаную?

— Ты, я бачу, вельмі расчараваўся, айцец Кірыла. Няўжо ў нашай грамадзе толькі кар’ерысты ды здраднікі? Няўжо не знойдзецца з пражскіх студэнтаў ні адной значнай сілы, якая потым аб’яднае нас усіх пад адзіным сцягам і павядзе за сабой, як Масей? Не, даражэнькі: я хачу яшчэ верыць, што гэта будзе.

— Эх, дзядзька Тугоўскі, памятаеш біблейскі выраз, што можа быць добрага? Павер мне, з нашага пражскага Назарэту не выйдзе ні аднаго прарока.

— А наша Сацыялістычная грамада, айцец Кірыла?

— Наша Грамада? — усміхнуўся Кірыла. — Яе ўжо больш няма.

— Як так? — ад здзіўлення спыніўся ў калідоры Тугоўскі.

— Яна развалілася, даражэнькі. Мы больш не можам давяраць Тамашэвічу. Што Тамашэвіч? Беларуская балалайка і ўсё. Я хачу стварыць новую грамаду з моладзі, якая яшчэ не памерла ў балоце кар’еры і асабістых спраў. Вось з гэтай мэтай я і прыйшоў да цябе. Я хачу, каб ты запісаўся ў нашую новую, сапраўды працоўную групу.

— Дзякую за давер. Калі я падыду да вас, тады запісвай. А Вярхоўская як?..

— Вярхоўская? Што пра яе ўспамінаць? Дачка папа-інтэлігента. У нашай групе не будзе ні аднаго, хто радніўся ад гэтых інтэлігентаў.

— Чаму ты інтэлігентаў так не церпіш? — здзівіўся Тугоўскі.

— Мне здаецца, ад іх усё няшчасце на зямлі. Ты падумай: капіталістаў на ўсім свеце, можа быць, набярэцца дзясятак, не болей. Іх бы лёгка было знішчыць, дык яны не маглі б шкоды такой вялікай даць, каб не гэтая мільённая армія інтэлігентаў, гэтых служак капіталізму. Яны прызвычаіліся жыць у лепшых умовах, чым іншыя, яны крычаць аб камфорце, яны тварылі буржуазную культуру. Яны, гэтыя інтэлігенты, я перакананы, абселі каля смачнага капіталістычнага пірага. І спрабуй зараз гэты пірог знішчыць, што стане з гэтай чорнай, тараканавай арміяй?

— Айцец Кірыла, — здзівіўся Тугоўскі такому парадоксу Кірылы, — мне здаецца, у цябе неправідловае разуменне слова «інтэлігент». Спачатку трэба высветліць, каго ты так называеш.

— Ай, мне ўжо не хочацца спрачацца. Мы з табой столькі прагутарылі на палітычныя тэмы, аж вусны перасохлі. Пойдзем у пакой.

— Інтэлігент, — казаў ён, уваходзячы ў інтэрнат, — памойму, той чалавек, які прадае сваю ўмысловую працу.

Яны разам увайшлі ў шумны цёплы пакой. Спевы, смех, лаянкі зноў агарнулі іх і прымусілі запамятаць аб усёй размове. Калі пасцелі астральнага чалавека стаяла некалькі чалавек, якім ён глядзеў на руку.

— Астролаг, — шапнуў на вуха Кірылу Тугоўскі. Кірыла падышоў і скептычна пачаў усміхацца. Астральны чалавек заўважыў гэта і павярнуўся да яго:

— Вы скептык… Але вы дарэмна ўсміхаецеся. Я бачу на вашым твары ўвесь ваш лёс. Я ведаю ваш характар, хоць бачу вас першы раз. Хочаце, я пагадаю вам?

— Ну, ну, калі ласка, спрабуйце, — засмяяўся Кірыла.

Астральны чалавек дастаў з-пад падушкі кніжачку, якую калісьці даваў Тугоўскаму, на вокладцы якой быў намаляваны Сатурн з кальцом, і пачаў шукаць, пад якой планетай ён радзіўся.

— Ведаеце што, — праз хвіліну падняў на Кірыла задуманыя вочы астральны чалавек, — вы радзіліся пад Сатурнам!

— І я радзіўся пад Сатурнам! — засмяяўся Кірыла. — Тугоўскі, чуеш?

— Так, так, як і грамадзянін Тугоўскі. Выходзіць, у вас аднолькавая доля з грамадзянінам Тугоўскім.

— Вось як… А што значыць наогул: радзіўся пад Сатурнам, як вы кажаце?

— Гэта значыць: мець у сабе такія рысы характару, якія з старых часоў людзі прыпісвалі гэтай планеце. У пэўныя часы, калі планета Сатурн знаходзіцца ў найвышэйшым пункце сваёй кульмінацыі, яна аказвае на нас свае ўплывы, як Месяц аказвае ўплывы на прыліў і адліў мора, і тады ў чалавека праяўляюцца вось гэтыя сатурнаўскія рысы характару. Што гэта за характар, я вам магу таксама сказаць. Людзі, якія радзіліся пад Сатурнам, звычайна не выносяць падуладнасці, не пужаюцца думкі аб сабе грамады, але разам з тым баяцца быць смешнымі, недаверлівыя, працавіты, любяць земляробства і навукі, не любяць войны і жаўнераў…



— Вось гэта правідлова, — перабіў астролага Кірыла. — Я цярпець не магу ні вайны, ні жаўнераў…

— Пачакайце, слухайце далей… Людзі, якія радзіліся пад Сатурнам, абыякавыя да сям'і і дзяцей.

— Гэта неправідлова, — зазначыў Тугоўскі.

— Маўчы… Правідлова! — крыкнуў Кірыла. — Я цярпець не магу ні сям'і, ні дзяцей. Мяшчанства, брат!

— Людзі, якія радзіліся пад Сатурнам, цікавыя да ўсяго і разам з тым сумныя. Меланхолія заўсёды кладзе на іх твар сваю пячатку. Гэтыя людзі таксама нічым не задаволены, ні адна партыя не будзе ім да душы, ні адзін палітычны лад не задаволіць іх. Гэта вечна ўсім незадаволеныя, усё крытыкуючыя людзі, рэвалюцыянеры па духу!

— Брава! — закрычаў Тугоўскі. — Вось гэта правідлова. Бачыш, айцец Кірыла, як цябе разабралі па костачках! Ты вечны рэвалюцыянер. Што ты на гэта скажаш? Знамяніта ён гадае. Няма чаго казаць.

— Ну, а цяпер, — прадоўжыў астральны чалавек, — дазвольце вашую левую руку, прыцісніце вялікі палец да далоні.

Кірыла не мог.

— Вось так, вось так, — паказваў астролаг. — Ну добра. — Ён пачаў пільна ўглядацца ў рысы на руцэ. — Вось што я вам скажу, — прарваў ён цішу. — Як вы сабе хочаце: верце ці не верце, а вы доўга жыць не будзеце. Лінія жыцця ваша вельмі кароткая і паказвае, што вы будзеце хварэць. Вы памрэце ад цяжкой хранічнай хваробы, запэўніваю вас. Мне здаецца, я ўгадаю нават, ад якой хваробы… У вас хворыя лёгкія. Скажыце, вы кашляеце?

— Кашляю…

— І макрота ёсць?

— Ёсць.

— Правідлова. Значыць, угадаў… Паверце мне, старому сухотніку: я не хачу вас пужаць. Я не хачу вам пагоршыць настрой… Я бачу на вашым твары ўсмешку, але вы носіце ў сваіх грудзях сум! Будзь я не астролаг, калі гэта не так!

— Ну, адносна хваробы, я думаю, вы памыліліся, — сплюнуў Кірыла. — Характар яшчэ азначылі туды-сюды.

— Не думаю, каб я памыліўся… Ну добра… Я быў бы вельмі ўсцешаны, каб я памыліўся і каб уся навука астралогія і хірамантыя, разам узятыя, нічога не значылі б.

Кірыла падзякаваў і выйшаў, таксама скептычна ўсміхаючыся.

— А ўсё ж ткі лоўка ён гадае, — казаў Тугоўскі.

— Дурніца, — кінуў сярдзіта Кірыла, — так вось, значыць: у нядзелю прыходзь на вечарыну ў Чэшска-Рускую едноту. Тамашэвіч хоча здзівіць чэхаў. Пагледзім, што з гэтага будзе. Ён хоча зацягнуць на беларускі грунт аднаго расійца-прафесара, беларуса па паходжанні[10], які возьме на сябе кіраванне вечарам. Дэкламаваць будзе таксама Вярхоўская… Словам, прыходзь. — Ён развітаўся, паціснуў руку астральнаму чалавеку і выйшаў з інтэрнату.

## V

«Дачка папа, — думаў Тугоўскі, застаўшыся адзін пасля адходу Кірылы. — Ну няўжо такое магчыма? Як жа пасля гэтага растлумачыць яе сацыялістычныя перакананні? Магчыма, нейкія вялікія рэвалюцыйныя падзеі мелі ўплыў на яе жыццё і вытвар яе светапогляду». І ён пачаў маляваць сабе гумарыстычны малюнак свайго кахання да дачкі папа. Сапраўды, як быў бы здзіўлены поп, каб яго дачка прывяла ў хату мужа — сына чорнаработніка, з якім яна ўзяла шлюб па правілах царквы. Магчыма, як сацыялісты яны запісаліся б толькі ў шлюбным аддзеле пражскай мясцовай управы.

Тугоўскі маляваў сабе малюнак за малюнкам свайго побыту ў доме Вярхоўскай і ўсё больш пачынаў разумець, што каханне яго безнадзейнае, што кахаць дачку папа ён не можа. Але, з другога боку, ён адчуваў, што каханне не так лёгка адкінуць, што Вярхоўская напоўніла ўсю яго істоту, усе яго думкі сваім прыгожым вобразам, што ён кахае яе незалежна ад таго, хто яна такая: дачка папа ці якога-небудзь чорта. Калі б толькі на яго каханне яна адказала ўзаемнасцей, калі б яна пакахала яго, тады не страшны былі б лаянкі яе бацькі-папа ці якія-небудзь іншыя перашкоды на свеце. У яе каханні засталася цяпер яго адзіная надзея. Што значыла для яго грамадская справа і ўсе справы яго як грамадскага дзеяча, калі ён быў



нешчаслівы, калі яму бракавала самага звычайнага маленькага асабістага шчасця. Урэшце, кожны чалавек жыве для самога сябе. Праўда, ён згодны з Кірылам, што не ўсё толькі для самога сябе, — трэба падумаць аб агульных справах, трэба думаць тады, калі палагоджана сваё асабістае. Пакуль чалавек чуе сябе нешчаслівым, ніякія грамадскія справы не дадуць яму шчасце. «Людзі на зямлі адны — вось бяда!» — казаў калісьці філосаф, і сапраўды, нягледзячы ні на якія грамадскія арганізацыі, справы, хаўрусы, — у кожнага чалавека ёсць куток свайго «я», цёмны куток, куды ніхто не заглядвае. Чым больш чалавек нешчаслівы — тым больш ён адчувае адзіноту, тым больш ён бачыць, што грамадскія арганізацыі — пусты гук, простая фікцыя! Але ён не хоча быць адзінокі, ён не хоча быць нешчаслівы.

Ён усё ж ткі хоча мець асабістага шчасця толькі ў такой меры, каб мець цвёрды грунт для змагання за шчасце ўсіх, за шчасце цэлага народу. А гэтае жаданне не такое ўжо вялікае: толькі б яго пакахала Вярхоўская. Яму здавалася, тады ён паверыў бы ў сваю вартасць, тады быў бы шчаслівы — і тады мог бы стаць сябрам Грамады Кірылы. Ён пачаў дзейна рыхтавацца. Яго лёс — там ён пабачыць, ці можа кахаць Вярхоўская. Першы раз у сваім жыцці Тугоўскі рашыў ужыць парфумаў. Але студэнцкія рэсурсы дазволілі яму купіць толькі маленькую бутэлечку самых дрэнных пахучых зёлак. Перад ад’ездам на вечарыну ён выліў усю бутэлечку на свой касцюм, выпрасаваны ўласнай рукой, і, стаўшы нейкім дзівам, — ад паху такога трэба было ўцякаць за вярсту, — ён выйшаў вясёлы з інтэрнату. Каб не спазніцца, ускочыў у трамвай, адразу заліўшы яго сваім пахам. Нейкі стары, які сядзеў каля яго, аж пачаў задыхацца і, увесь зморшчаны, некалькі разоў азірнуўся на Тугоўскага. Нарэшце ён не выцерпеў і голасна на ўвесь трамвай прахрыпеў: «Фуй, сядзець няможна. Вы так напарфуміліся, чалавеча, што я дыхаць не магу». Усе засмяяліся на чале праважатага вагона. Тугоўскі пачырванеў. Ён толькі засмяяўся і адсеў далей ад ненавіснага старога. Нарэшце трамвай спыніўся каля блішчэўшага агнямі вялікага будынку Чэшска-Рускай едноты. Прыгожыя сінія і чырвоныя ліхтары качаліся каля пад’езду і лілі на белы снег свае дзіўныя чырвона-сінія праменні. Некалькі аўтамабіляў стаялі каля ўваходу, выстраіўшыся ў

адну лінію. Разубраны шумны натоўп падымаўся ўверх па засланай каберцам драбіне ў залітую святлом залю. Дамы ў раскошных вячэрніх туалетах, мужчыны ў фраках, візоўках і смокінгах, вайсковыя ў сваіх бліскучых мундзірах, студэнты ў простых, выдадзеных камітэтам касцюмах; усе плылі з шумам, з смехам, знаёмячыся і затрымліваючыся на хаду, плылі безупынна, запаўнялі ўсё да кружэння галавы пахам парфумы. Заля была невялікая, пры гэтым большасць з'явіўшыхся была ўжо знаёма паміж сабой, так што тут адразу запанавала атмасфера сяброўскай утульнасці. У першых радах, перад невялікім памостам для сцэны, расселіся прафесары універсітэта, чэхі і расейцы. Перад імі стаяў чырвоны і прыгожы, з бела-чырвона-белым беларускім значком у пятліцы фрака, прафесар расейскай літаратуры Карлава ўніверсітэта крытык і публіцыст Ляцкі[11]. Каля яго ўвесь час круціўся вясёлы «даўгагрывы» беларускі студэнт Тамашэвіч, гаспадар сённяшняга вечара. Ён аб нечым радзіўся з прафесарам Ляцкім, нешта весела тлумачыў яму, падыходзіў да чэшскай і расейскай прафесуры ў першых радах. Беларускія студэнты ў поўным сваім ліку размясціліся сярод гасцей у розных месцах залы. Тугоўскі агледзеўся. Ён убачыў толькі што ўваходзіўшую Вярхоўскую і падышоў да яе, каб дапамагчы распрануцца. Яна была ў раскошным бальным убранні, з голымі рукамі, з вялікімі бантамі, з нейкімі хвастамі і стужкамі, з гарэўшымі на ўбранні брошкамі і перламі. Як перлы, можа быць, яшчэ больш яскрава, гарэлі яе глыбокія вочы. Яны ўвайшлі разам у залю, і дзясяткі вачэй акінулі іх. Па залі адразу панёсся шэпт беларускіх студэнтаў: «Тугоўскі з Вярхоўскай». У гэткім шэпце пачуліся быццам злосныя насмешкі, і сэрца Тугоўскага сціснулася ад болю. Ён крадком зірнуў на Вярхоўскую, але яна была занята сваімі думкамі, а можа быць, выдавала так, што была чымсьці занята, і яны моўчкі падышлі да крэслаў і селі. У зале пагасілі агні. Знакаміты чэшскі квартэт філармоніі пачаў свой канцэртны выступ. Такой музыкі яшчэ не чуў Тугоўскі. Ён слухаў, як заварожаны, падымаючыся на такую нябесную вышыню, што запамятаваў аб усім на зямлі, нават аб тым, што побач з ім сядзела Вярхоўская. Калі квартэт закончылі граць і ў залі стала зноў светла, гром воплескаў загрымеў з усіх куткоў. Чэхі



пакінулі залю пад буру авацый. У гэты час падняўся на сцэну высокі і прыгожы прафесар Ляцкі. Ён паведаміў прысутным, што зараз выступяць беларусы, што беларусы — адзін з славянскіх народаў, які мы яшчэ мала ведаем. Ён доўга гутарыў аб беларусах, аб беларускай літаратуры, аб беларускім руху.

— Будзем спадзявацца, — закончыў ён, — што новае пакаленне беларусаў, узгадоўваючыся ў Празе Чэшскай, не будзе належаць да тых, якія супольнічаюць з іншымі, больш старымі суайчыннікамі…

— Ты чуеш, што ён кажа? — досыць голасна абярнуўся да Тугоўскага сядзеўшы спераду Станкевіч. — Гэта ж, я разумею, з такімі асобамі можна арганізоўваць вечарыну? Тамашэвіч — здраднік пасля гэтага.

Ён пачаў шукаць сярдзітымі вачамі Тамашэвіча, гатовы, здаецца, накінуцца на яго. Тугоўскі спужаўся, думаючы, што Станкевіч зараз падыме скандал і ўстане з прафесарам у спрэчкі. Але прафесар скончыў пажаданнем поспеху беларусам у іх культурнай працы. Станкевіч змаўчаў; прафесару плёскалі ў далоні ўсе, апрача беларусаў. Як толькі ён сышоў са сцэны, пачаў збірацца беларускі хор. Па тварах яго здольнікаў было відаць, што яны прыкметна ўзрушаны перад незвычайнымі слухачамі. Хваляванне хору перадалося ўсім беларускім студэнтам.

— Ах! — зашаптала Вярхоўская. — Маё сэрца замёрла: сапсуюць.

— Ну, не будзем хвалявацца, — шапнуў Тугоўскі, пахісняючыся да яе, — можа быць і нічога.

Паволі, крыху хвалюючыся, хор пачаў:

Не загаснуць зоркі ў небе,
Покі неба будзе… [12]

І ўсё вышэй падымаўся, здаецца, у самае неба і з моцнай верай загрымеў голас, патрасаючы сцены залі і людскія душы:

Не загіне край забраны,
Покі будуць людзі…

Першае хваляванне прайшло. Вярхоўская ўздыхнула і прашаптала: «Нічога. Я думала, будзе горш». Хор усё больш і больш прамаўляў да слухачоў; здавалася, што з грудзей

кожнага спевака вырывалася слова з асаблівым націскам, з асаблівай верай у прыгожасці песні.

Хацелася верыць, хацелася плакаць ад радасці, што гэта так будзе, інакш і не можа быць:

Зацвіце наш край, як сонца,
Пасля непагоды…

І разам з хорам уся істота — радасная, шчаслівая, узмацаваная — падымалася на крылах да сонца з гімнам неўміручай праўды:

Ў роўнай сіле, ў роўнай праўдзе,
Між усіх народаў…

Загрымелі воплескі. На ўсіх слухачоў, ніколі не чуўшых беларускай песні, хор зрабіў добрае ўражанне. Прафесары ўніверсітэту зашапталіся, сталі пахіляцца да прафесара Ляцкага і аб нечым пытаць яго. Хор пачаў новую песню, народную: «У гародзе рута-мята». Вельмі прыгожа і міла тэнары пачалі:

У гародзе рута-мята засаджоная.
Маладая дзяўчынанька, заручоная…

Ураз усе весела і бадзёра падхапілі:

Часалася, умывалася,
На рынак пайшла…

Спачатку было смешна. Тугоўскі пераглянуўся з Вярхоўскай, усміхаючыся, калі тэнары пачалі зноў:

Як сустрэла дзяўчыначка
Ды трох малайцоў…

І зноў усім хорам, асабліва падтрыманыя добрымі басамі, падхапілі:

Адзін вядзе за ручаньку,
Другі за рукаў.
Трэці стаіць, сэрца баліць:
— Любіў ды не ўзяў!

З гэтымі словамі ў сэрца Тугоўскага папоўз, як шэры туман, няўцешны сум. Яму пачало здавацца, што спяваюць якраз пра яго. Ён напружана прыслухоўваўся да слоў песні:



Карміў, паіў дзяўчынаньку,
Чаіў за сябе,
Засталася дзяўчынанька
Людзям, ды не мне…

І зусім сумна, так, што нават у яго накруціліся на вачох слёзы, — толькі добра, што ў залі было цёмна і ўсе глядзелі на сцэну, — ён прыняў апошнія словы песні:

Шкада, шкада маіх ручак,
Што я абымаў.
Шкада, шкада маіх губак,
Што я цалаваў…

А басы яшчэ больш прабівалі сэрца, падхопліваючы далікатныя гукі тэнараў:

Ой, шкада, шкада…

Сапраўды, Тугоўскаму было шкада, шкада таго, што яго каханне заставалася яшчэ не пачутае, не зразумелае, не разгаданае. Нарэшце, хор скончыў. Воплескам не было канца. Вярхоўская пляскала ў далоні і, смеючыся, казала Тугоўскаму:
— Крычыце «біс».
— Не, — адказваў Тугоўскі, — змест песні вельмі закранае мяне асабіста, не хачу больш яе. Інакш вы прымушаеце мяне плакаць.
— Праўда? Я б хацела гэта пабачыць, — засмяялася яна зноў.

У гэты момант яе вочы на кімсьці спыніліся ў залі, і яна раптам замоўкла і стала сур'ёзнай. Тугоўскі з трывогай паглядзеў у той бок, куды глядзела яна, і заўважыў Загорскага. Ён быў прыгожы і бліскучы ў гэты момант. Ядвабныя лацканы смокінга блішчэлі пры святле электрычных лямп, як стужкі якога-небудзь дыпламата, працягнутыя праз грудзі. Ён сам азіраўся па ўсёй залі, шукаючы кагосьці і робячы выгляд, што яму на гэтым беларускім вечары вельмі сумна. Па яго блукаючых поглядах было відаць: ён напэўна не заўважыў Вярхоўскую.

А ў гэты момант Тамашэвіч думаў здзівіць Прагу: ён чытаў толькі беларускія казкі. Тугоўскі мала слухаў яго чытанне. Ён толькі ўглядаўся ў сядзеўшую Вярхоўскую і дзівіўся

таму, што яна стала сур'ёзнай і маўклівай. Відаць, і яе мала цікавіла чытанне Тамашэвіча. Яе думкі лёталі, як птушкі, далёка ад гэтай залі, ад гэтых казак, дзесьці ў мінулым. Але яна смяялася разам з усімі ў тых месцах, дзе чытальнік смяяўся сам. «Хутчэй бы скончыў, — падумаў, гледзячы на яго, незадаволены Тугоўскі. — Сапраўды — "беларуская балалайка"», — успомніў ён словы айца Кірылы. Тамашэвіч, нарэшце, скончыў. Вярхоўская вітала яго воплескамі, але відалася, што яна была зусім абыякавай да выступу Тамашэвіча. Зараз жа быў абвешчаны перапынак на паўгадзіны. Публіка, быццам толькі гэтага чакаючы, хлынула ў дзверы. Бліскучыя дамскія туалеты і вайсковыя мундзіры зліваліся з простымі студэнцкімі касцюмамі. Пары рабілі туры па прыгожай невялікай зале з калонамі. Тугоўскі ішоў у пару з Вярхоўскай. У гэты вечар ён не мог скардзіцца на свой лёс. Ён нават прайшоў некалькі тураў, як раптам здарылася зусім неспадзяванае. Прарываючы натоўп, паспешна, хутка, як разразаючы ваду, нёсся да іх праз залю бліскучы, прыгожы, чуўшы сябе на вечарах як рыба ў вадзе, Загорскі. Ён падышоў да іх неяк бокам і, не гледзячы на Тугоўскага, не прывітаўшыся з ім, быццам там было пустое мейсца, паглядзеў з усмешкаю на Вярхоўскую і сказаў:

— Выбачайце, Галена Уладзіміраўна…

Па яе твары Тугоўскі заўважыў, што яна адклікнулася з радасцей.

— Выбачайце, — прамовіла яна і пайшла з Загорскім рабіць колы па залі. Тугоўскі адышоў да адной з калон, адразу губляючы ўсю сваю прысутнасць духу, якая з'явілася ў ім, калі ён гуляў па залі з Вярхоўскай. Яму зноў здалося, што рукі ў яго доўгія, ногі крывыя і ён сам зараз вельмі смешны ў гэтай зале з калонамі. Яму здавалася, што ўсе глядзяць на яго, смяюцца. Ён аканчальна змяшаўся. Ногі яго сталі быццам свінцовымі і прыраслі да падлогі, рукі прыліплі да калоны: ён стаяў, упіўшыся поглядам у Загорскага. Хвіліны здаваліся доўгімі, як вечнасць. Тугоўскі спадзяваўся, што непрыемнае становішча скончыцца: яшчэ хвіліна, другая, і Вярхоўская вернецца да яго. Але праходзілі хвіліны, а Вярхоўская ўсё гуляла па залі з Загорскім; здавалася, Загорскі дэманстратыўна і насмешліва праходзіў блізка да калоны, каля якой сумна стаяў Тугоўскі. Ён аб нечым рухліва апавядаў, аб нечым смяяўся,



ідучы ў нагу і далікатна падпіраючы локаць яе левай рукі. Вярхоўская, здавалася, была рада. Яна часта смяялася і кідала на Загорскага здзіўленыя погляды. Здавалася, яна таксама не бачыла Тугоўскага.

Ён пару разоў глянуў на яе, быццам жадаючы даведацца, што творыцца ў яе душы, але яна заставалася для яго далёкай. Тугоўскі ўжо больш не мог выцерпець, хвіліна перайшла ўжо ў доўгую гадзіну. Ён сабраў усю сваю сілу волі і пусціўся праз фае ў залю. Ён бачыў, як насмешліва глядзелі на яго дамы і як шапталіся студэнты. Загорскі, здавалася, зноў нанёс яму ўдар па твары пры ўсіх, так, як калісьці даўно выцяў яго па твары і кінуў ганебнае слова «плебей». Цяпер гэта паўтарылася. Нібыта наўмысля пры ўсіх Загорскі назваў яго «плебей» і адабраў ад яго Вярхоўскую. Абражаны, ён сеў у крэсла і паглядзеў навокал сябе ў пустату, жахлівую прорву жыцця. Што яму цяпер заставалася ў гэтым жыцці? Ён зразумеў, што яна яго не можа кахаць, яна яго не кахае. У вушах стаялі гукі толькі што спяванай песні:

Шкада, шкада майго сэрца,
Што я так любіў.
Шкада, шкада маіх ножак,
Што я к ёй хадзіў…

«Ой, шкада, шкада…» — загучэла ў вушах. Загучэў званок. Публіка зноў хлынула хвалямі ў залю. Загорскі з Вярхоўскай увайшлі раней усіх і селі ў другім канцы залі, далёка ад Тугоўскага. Тугоўскі больш не мог сядзець і цярпець. Ён толькі чакаў, калі ў залі пагасяць агні, каб выйсці нікім не прыкмечаным. Нарэшце, сцямнела. Пачалася дэкламацыя. Галевіч пры гэтым барытонам пачаў верш Гаруна:

У гэту ноч мне няўмоч —
Няма сілы чакаць і маліцца…[13]

Тугоўскі не вытрымаў. Ён ускочыў, як ранены, і паляцеў на выхад. Няхай прадаўжаецца ўрачыстасць без яго, няхай выступае з дэкламацыяй Вярхоўская. Яму няма чаго больш рабіць на гэтым свеце…

## VI

Дзіўная марозная ноч агарнула Тугоўскага. Снег скрыпеў пад яго нагамі і больш, чым калі-небудзь, пераліваўся сваімі дзіўнымі перламі, зоры шапталіся ў небе. Вялікае места спала, зачараванае сном. А ён ішоў. Ішоў адзін, як воўк, вялікай і пустыннай дарогай, і яму заставалася толькі завыць. Завыць, як воўк. Ён прыйдзе ў сваю інтэрнацкую кануру, адзінокі, не абласканы, не абагрэты. Ён акіне вокам свой кут і не знойдзе там нічога, што б сведчыла аб прысутнасці любімай рукі. Ні адной кветкі, ні адной прыкметы. Пуста… Так заўсёды. Ён ідзе па жыцці ўсё той самай пустыннай дарогай, як воўк. Ён радзіўся, напэўна, для таго, каб блукаць па свеце з сумам у грудзях і не знаходзіць нідзе ні спакою, ні радасці, ні шчасця. Яго шлях акрэслены, як рэчышча ракі, акрэслены з самага дзяцінства. Ён радзіўся пад праклятай планетай Сатурнам. І чаму ён яшчэ тварыў гэтую камедыю з таго часу, як даведаўся аб сваім жыцці, чаму ён паслухаў Кірылу, паступіў ва ўніверсітэт, закахаўся і натварыў столькі зусім непатрэбных дурніц? Чаму ён не скончыў жыццё тады, калі пісаў сваю «Споведзь самагубцы. Кнігу для ўсіх і ні для кога»? Як пуста, як брыдка ў яго на сэрцы. Зноў раскрылася рана, не зажыўшая пад уплывам часу. Адвечная рана сэрца. Ён адзінокі! Ён ні для кога не цікавы. Так што ён, значыць, нікому больш не патрэбны? Да ўсіх чартоў і ўніверсітэт са стыпендыяю, і каханне… Універсітэт! Ха-ха! Чаго варты ён, калі не дае чалавеку магчымасці палепшыць сваё жыццё? Сапраўды, лацінскае слова і гісторыя яшчэ не робяць з селяніна інтэлігента, мужык і пасля ўніверсітэта застаецца тым самым мужыком, як і да паступлення ў яго. Які-небудзь Загорскі заўсёды будзе стаяць вышэй, нават нічога не скончыўшы, бо свецкасць у яго ў крыві з дзяцінства, здабыта выхаваннем. Выхаваннем!

Усё залежыць ад выхавання… Можа быць, некалі новае пакаленне сялян, працаўнікоў, работнікаў будзе мець такія школы, дзе зможа выхоўвацца з малых дзён свецкім, яму дадуць тое, чаго не маглі даць бедныя сяляне; можа быць, нарэшце, частка сялян будзе самавыхоўвацца, як, напрыклад, Бурак, будзе выхоўвацца пакахаўшай яго графіняй, але ён ужо не можа заняцца выхаваннем. Позна, позна! Ён павінен кінуць



універсітэт. Стаць грузчыкам, возчыкам — усё роўна калі, толькі нічым, як нічым быў яго бацька. Скончыць універсітэт і насіць у кішэні дыплом, накінуўшы на сябе маску пана, ён не можа. Ён павінен застацца чэсным з сабой. І тады, можа быць, ён пакахае якую-небудзь сялянку. Хіба мала ёсць прыгожых дзяўчат, на якіх не звяртаюць увагі «інтэлігенты», асабліва тыя «інтэлігенты», якія ствараюць Беларускую грамаду ў Празе? Ім патрэбны графіні, багатыя чэшкі, студэнткі, і ні адзін з іх не падумае, што ёсць тысячы прыгожых беларускіх сялянак, якія могуць быць прыгожымі жонкамі і добрымі гаспадынямі. Так, апрасціцца! Скінуць з сябе гэты горды і брыдкі ярлык «інтэлігента», а стаць простым работнікам і мазолістай рукой тварыць сапраўдныя вартасці. Так, не патрэбны яму болей гэты ўніверсітэт, і не патрэбна яму дачка папа Вярхоўскага! Паехаць куды-небудзь далёка-далёка і ў якой-небудзь палескай глушы тварыць сваё жыццё. Можа быць, такім чынам ён атрымаў бы патрэбную палёгку для сваёй змучанай душы, можа быць, там, у глушы, ён нарэшце супакоіўся б ад шуму, енкаў сучаснай культуры. Апрасціцца. Выйсці з гэтага свету з новым сэрцам, з новымі думкамі, выйсці з гэтых шумных гарадоў, каб ніхто не ведаў, дзе загінуў, як скончыў сваё карыснае жыццё Тугоўскі. Бывайце, блакітныя вочкі Вярхоўскай. Не бачыць вас болей, не лавіць вашых усмешак, не дрыжаць пад вашым святлом, не шукаць у вас пацехі і забыцця… Бывайце. Свяціце іншым людзям, якія пойдуць на ваш блеск, як магніт на далонь. Свяціце! Красуйцеся!

Вось праявіўся ў цемры яго інтэрнат. Адзін ліхтар блішчыць толькі каля варотаў… Каб не званіць тоўстаму, у акулярах швейцару, які зараз спіць на сваіх пуховых пярынах, і каб не плаціць яму лішняй чэшскай кроны, Тугоўскі пералез праз плот у сад і пайшоў спакойна дахаты. У пакоі ўсе спалі. Ён лёг на пасцель, паляжаў, потым устаў, дастаў са свайго чамадана свечку і выйшаў у калідор пісаць ліст Вярхоўскай. Ён доўга сядзеў перад белым аркушам паперы. Жыццё пранеслася перад яго задумнымі вачыма. Ён углядаўся ў свае адносіны да Вярхоўскай і бачыў, што нямала прыгожых падзей было раскінута там, нямала было горычы і слёз — і ўсё ж такі апошняя горыч перапоўніла чашу. Ён пачаў пісаць: «Высокапаважаная Галена Уладзіміраўна! Я дазволю сабе патурбаваць

Вас гэтым лістом, бо пасля таго, што здарылася на сённяшняй вечарыне ў Чэшска-Рускай еднаце, я не магу маўчаць. Можа быць, не прыдалі свайму ўчынку ніякага значэння; можа быць, Вы так зацікавіліся Загорскім, што забыліся, дзе знаходзіцеся, і запамяталі, што ўсяго дзве хвіліны таму Вы сядзелі і гулялі са мной. Вы не бачылі, як я стаяў каля калоны пад насмешкай залі і студэнтаў, пад насмешкай Вашага «сябры» і, можа быць, пад скрытай Вашай насмешкай, насмешкай Вас саміх. Вы не зразумелі, колькі горычы і абразы нанеслі мне, калі пры ўсіх селі ў другім канцы залі — быццам дэманстратыўна, не жадаючы больш гутарыць са мной. Вы не зразумелі. А можа быць, Вы і зразумелі, а можа быць, Вы рабілі ўсё гэта свядома Вашаму сябру Загорскаму і ў павучанне мне. Так, для мяне гэта добрая навука! Цяпер я зразумеў, што павёў сябе як хлопчык, як закаханы гімназістык, калі думаў аб Вас, сваім каханні да Вас. Што, не? Я на Вас ніколькі не злуюся і не наракаю. Было б з майго боку глупствам нападаць на Вас за тое, што Ваша сэрца не ляжыць да мяне. Вы — вольныя. Голас Вашага сэрца для Вас — адзіны закон. Гэты закон сёння выявіўся яскрава. Вы ляціце ў абоймы Загорскага, як матыль на вагонь, і не думаеце, што апаліце крылы. Вы маеце на гэта права. Я пішу Вам гэта не з дакорам. Пішу таму, што я больш не жадаю заставацца ў Празе і таму, што хачу сказаць Вам толькі некалькі апошніх развітальных слоў…

Бывайце, паважаная Галена Уладзіміраўна! Жадаю Вам шмат шчасця і поспеху ў жыцці. Памятайце толькі, што ў тыя даўгія зімовыя ночы, калі ўсе будуць спаць, калі толькі я адзін запалю лямпу ў сваім пакоі і пачую, што я адзін на свеце, абсалютна адзін, што няма тых дзіўных вочак, у якія я любіў глядзець у цяжкія, бяссонныя ночы, я ўспомню пра Вас як аб адзінай жанчыне, каторай я пісаў ліст і ад каторай хацеў бачыць пацеху і шчасце. Хачу скончыць свой ліст уласным перакладам знакамітага ўкраінскага паэта Франка:

Як пачуеш ўначы за сваім ты вакном,
Што хтось плача і клікае цяжка, —
Не ўзірайся туды, не дрыжы, не глядзі,
Не глядзі ты ў той бок, мая пташка!
То не ёсць сірата, што без бацькі блука,
Не галодны бядняк, мая зорка:



Гэта плача мая неўцішыма туга,
То каханне маё плача горка…[14]

Не звяртайце ўвагі на слова “пташка”: па-беларуску будзе “птушка”. Зразумейце маю думку. Так, яшчэ раз жадаю, жадаю Вам усяго найлепшага. Пётра Тугоўскі».

І так, усё скончана. Ён пакіне Вярхоўскую, пакіне Прагу, усё пакіне, толькі зараз адмовіцца ад стыпендыі. Раз ён пакідае ўсё, было б нячэсна яшчэ лічыцца стыпендыятам.

Ён крыху падумаў і напісаў другую паперу ў Чэшска-Украінскі камітэт: «Прашу мяне выключыць з дапамогі па майму ўласнаму жаданню». На адну хвіліну яму самому стала жудасна. Што ён зрабіў? Ён, фактычна, канчаў самагубствам. Ён нішчыў тое, да чаго сам імкнуўся, што было мэтай яго жыцця, у імя чаго ён ехаў у Прагу. Якой барацьбой, якімі мукамі была даступна стыпендыя, і цяпер ён так лёгка ўласнай рукой адкідваў яе. Слёзы навярнуліся на яго вачох. Успомніў ён, як благаслаўляла яго старая матка на станцыі, як плакала, жадаючы яму шчасця. Бедная матка! Дзе яна цяпер? Ён даўно не пісаў ёй, бо не мог яе чым пацешыць… Цяпер яна, можа быць, не перанесла б удару, каб даведалася, што зрабіў яе сын. Можа быць, сапраўды не рабіць гэтага кроку, можа быць, не пісаць у камітэт? Слёзы стаялі на вачох. Але скончыць з усім аканчальна і беспаваротна праз хвіліну рашыў ён, бо жыццё згубіла для яго ўсякую ілюзію. Ён сабраў паперы, адрасаваў у Студэнцкі дом і вярнуўся ў пакой, не жадаючы, каб яго хто-небудзь пабачыў у калідоры.

## VII

Уся Беларуская грамада ў Празе была абражана і зварушана. Па ўсім Студэнцкім доме былі расклеены абвесткі Чэшскага ўніверсітэцкага камітэта[15] аб сваёй дзейнасці, і ў адным з паведамленняў было сказана, што беларускі студэнт Тугоўскі быў звольнены са стыпендыі па ўласным жаданні. Студэнты сабраліся ў гурток і абгаварвалі навіну. Больш за ўсіх гарачыўся студэнт Тамашэвіч:

— Чорт ведае, што такое творыцца ў нас, — лаяўся ён. — Беларусы згубілі для сябе цэлую стыпендыю.

— Сапраўды, у нас справа з гэтай стыпендыяй не пастаўлена яшчэ на належны грамадскі грунт, — сумна зазначыў Кірыла. Ён больш за ўсіх быў зварушаны ўчынкам Тугоўскага. Ён ніколі не мог чакаць гэтага.

— Вядома, — падхопліваў Тамашэвіч. — На Бацькаўшчыне ёсць дзясяткі здольных маладых беларусаў, якія жадаюць вучыцца пры ўсякіх варунках, перабіваюцца, што завецца, з хлеба на квас, каб толькі ўлезці ў вышэйшыя школы. Замест таго, каб іх падтрымаць, мы падтрымліваем нейкіх Тугоўскіх, якія прыносяць нам толькі шкоды.

— І хоць бы, дурань, парадзіўся з Грамадой, — сказаў Малевіч, — хоць бы даў магчымасць замяніць яго кім-небудзь з іншых, але так, каб для нас заставалася яшчэ стыпендыя… Цяпер жа мы аўтаматычна ўсё загубілі.

— Сапраўды — як па прыказу, — сказаў Тамашэвіч, — адзін дурань у ваду камень кіне, а дзесяць разумных выцягнуць… Цяпер нельга зусім нічога зрабіць у гэтай справе. Я думаю, яшчэ можна зазначыць кіраўніку камітэту, што Тугоўскі зрабіў гэта з якіх-небудзь чэсных матываў. Грамадзяне, трэба ўсё ж такі прызнаць, што ён сапраўды зрабіў гэта пад уплывам якіх-небудзь дзіўных перажыванняў. Зусім чэсна. Я думаю, нячэсны які-небудзь авантурна стараўся б усімі сіламі атрымаць стыпендыю, а не адмаўляцца ад яе.

— Добрая чэснасць, — засмяяўся Тамашэвіч, папраўляючы свае даўгія валасы, — адняць кавалак хлеба ад другіх, яго жадаючых.

— Што зробіш, грамадзяне, — спакойна зазначыў Кірыла, — бываюць розныя выпадкі… Бывае, напрыклад, што чалавек памірае. Мала было ў іншых Грамадах выпадкаў, каб паміралі студэнты? Так уявіце сабе, што Тугоўскі памёр. Памёр для беларускай Грамады, і памяць нават па сабе не кінуў. Уявілі — і не будзем варушыць цені нябожчыка.

— Ты заўсёды ўсіх абараняеш, айцец Кірыла, — засмяяўся Малевіч.

— Што? Перад тым, як чалавека абвінавачваць, трэба яго зразумець. Можа быць, каб мы маглі яго абвінавачваць…

У гэты момант падышла да гутарыўшых Вярхоўская.

— Аб чым шуміце вы, народныя трыбуны? — засмяялася яна.



— Вы чулі? — пачаў Тамашэвіч. — Гэты таўкач Тугоўскі скончыў жыццё самагубствам.

— Як самагубствам? — успыхнула Вярхоўская. Яна ўспомніла, што ў Чэшска-Рускай едноце потым не магла знайсці яго ў залі.

— Вельмі проста. Узяў ды дабравольна адмовіўся ад стыпендыі.

— Адмовіўся ад стыпендыі? — засмяялася Вярхоўская. — Адмовіцца, грамадзяне, не страшна, але ж трэба мець якія-небудзь перспектывы. Трэба ж ведаць, што рабіць далей.

— Напэўна, Тугоўскі мае пэўныя перспектывы, — сказаў Бурак. — Я думаю, грамадзяне, што Тугоўскі зрабіў вельмі хітра: усё роўна вясной, пры праверцы экзаменаў, яго маглі б прагнаць са стыпендыі. А так, калі ён адмовіўся ад стыпендыі дабравольна, яму па закону павінны былі выдаць наперад за месяц. Палітыка!

Усе прысутныя засмяяліся і паглядзелі на Бурака.

— Сапраўды, так магло быць… Хітрыя беларусы, — засмяяўся Тамашэвіч. — Новую рысу характару адкрылі мы ў Празе.

— Грамадзянка Вярхоўская, — перабіў смех сур’езны Кірыла, — вам ёсць ліст у Студэнцкім доме.

— Мне ліст? — здзівілася Вярхоўская. — Ад каго ён мог быць?

Яна хуткім крокам пайшла ў канцылярыю дому і зараз жа па атрыманні ліста рушыла дахаты.

Ліст Тугоўскага яе зварушыў. Па ім яна зразумела: ува ўсёй сваёй трагедыі Тугоўскі віну пакладзе на яе. Яна вінавата ў тым, што ён адмовіўся ад стыпендыі. Так можна было зразумець па тону ліста. Што было рабіць ёй? Яна ішла, трывожная і здзіўленая, дахаты. Яна нічога дагэтуль не ведала аб каханні Тугоўскага. Хто такі быў Тугоўскі? Магла яна пакахаць яго? Яна ўспамінала яго вобраз. Ён не быў горш за іншых. У ім было нешта, магчыма, вышэйшае за іншых студэнтаў. Ён адзін з тых нямногіх, якія з самага пачатку гутарылі з ёй не аб стыпендыі, не аб сваёй кар’еры, але аб літаратуры і грамадзянскіх справах. Мяркуючы па лісце, можна было падумаць, што ў ім яшчэ было нешта жывое, прыгожае, можа быць, нават паэтычнае. Яна заўсёды гутарыла вельмі ахвотна з ім і аб тым нават зазначала студэнтам. Але пры ўсім гэтым

у яго былі вялікія недахопы. З ім чулася нейкая няпэўнасць, у грамадзянстве з ім было непрыемна сядзець у якім-небудзь рэстаране ці на якім-небудзь канцэрце. Наогул, праз некалькі дзён ён, напэўна, стаў бы нецікавым і шэрым, як пажоўклая старая кніга. Зусім іншая справа з Загорскім. І ўсё ж такі пасля гэтага ліста нейкая жаласць дарухалася да яе сэрца. Такіх шчырых лістоў яшчэ ніхто да яе не пісаў, пакуль яна жыве на свеце. Відалася, што ён глыбока кахаў яе, і ёй было шкода яго, шкода свайго, можа быць, сапраўды непрыгожага ўчынку. У той час яна проста не звярнула на яго ўвагі, ён не падабаўся ёй з сваёй няпэўнай і нязграбнай фігуры. Ёй падабаўся больш Загорскі, якога хоць можна заўсёды з гордасцей паказаць грамадзянству. Што рабіць? Ёй шкода Тугоўскага, вельмі шкода. Яна зусім не думала, што прычыніць яму болі, прымусіць яго ледзь не плакаць у сваім лісце… Трэба напісаць яму адказ. Дома яна зараз жа дастала блакнот і пачала пісаць: «Паважаны грамадзянін Тугоўскі! Ваш ліст вельмі здзівіў мяне: здзівіў таму, што Вы мяне абвінавачваеце ў непрыгожым учынку. Калі я пайшла з Загорскім пагутарыць, дык таму, што ў яго была да мяне справа (ён гутарыў аб тым, што думае пераходзіць да нас на філасофію), і я хутка не магла з ім скончыць размоў. Вам заставалася толькі пачакаць мяне і не ўцякаць з вечара, як зрабілі Вы. Што зробіш? Сталася так. Цяпер не час разважаць аб тым. Мне толькі шкода Вас, шкода, як дзіця, ад якога аднялі цацку. Я хачу спадзявацца, што мы яшчэ з Вамі спаткаемся і вы не пакінеце Прагі, як пагражаеце ў лісце.

Жадаю ўсяго найлепшага — Вярхоўская.

*P. S.* У гэтую нядзелю ў Студэнцкім доме ўлаштоўваюць карнавал. Калі хочаце правесці са мной час, абавязкова прыходзьце. Пагутарым аб усім пад гукі джаз-банду. Г. В.»

Яна злажыла свой ліст, з трывогай пачала перачытваць ліст Тугоўскага. Як дзіўна: гэты ліст прымушаў мацней біцца яе сэрца і пакрываў чырвоным колерам яе прыгожы твар. Што было рабіць ёй з такімі непрыгожымі, надакучлівымі прызнаннямі ў каханні ўзбаламучаных мужчынскіх слоў?

Ёй было смешна чуць цэлы паток лірычных слоў, якім ніколькі не верыла. Калі б яна паверыла кожнаму мужчыне, які абяцаў быць яе рабом, што б тады было? Не… Яна ведала цану мужчынскім словам!.. Яна смяялася над іх спробай паэтычных ашуканстваў і смяялася ім у вочы, як ёй падчас неслі ўвагі і



кампліменты. А цяпер, чытаючы ліст Тугоўскага, адчула, як у яе сэрцы прабудзілася жаласць да мужчыны, у шчырасць якога паверыла. І яна з жахам пачала думаць, ці ёсць у яе хоць кропля пачуцця да яго, ці можа яна адказаць яму ўзаемнасцей. Ёй было шкода яго, шкода, можа быць, таму, што яго каханне магло застацца без водгуку. Яна задумалася і моўчкі прасядзела за сталом, пакуль не сцямнела ў пакоі.

## VIII

Тугоўскі, хаваючыся ад усіх універсітэцкіх, круціў у руках сіненькі аркуш паперы, спісаны дробненькімі літарамі: сорам залівў чырвоным колерам яго твар. Ён некалькі разоў перачытваў адзін і той самы сказ: «Мне шкода вас, як дзіця, ад якога аднялі цацку». «Падумаеш, якая дарослая грамадзянка, якая разумная пані… Не, паважаная грамадзянка Вярхоўская! Можаце мяне не шкадаваць. Я не патрабую вашай жаласці. Я не дзіця, які лёг бы на падоле вашай спадніцы, каб вы гладзілі яго галоўку! Я шукаю не вашай жаласці, а вашага кахання!» У сэрцы Тугоўскага рос папрок, чаму ён пісаў ёй столькі шчырых радкоў, з такім паэтычным натхненнем. Пісаў ёй толькі для таго, каб яна потым пасмяялася з яго і назвала б яго дзіцем, ад якога адабралі цацку? Як сумна і як абразліва! І няўжо не магла знайсці лепшага месца для гутарак, як карнавал? Эх, якая нягодная яна пасля ўсяго гэтага. Ён атуліў яе такім паэтычным арэолам, ён асвяціў яе такім дзіўным святлом — як Рафаэль сваю секстынскую Мадонну[16], а яна была меленькай, сухой студэнткай, маленькай, звычайнай шэранькай душанькай, якая напісала яму гэткі ж звычайны шэры ліст. Ён успомніў канец аднаго верша Янкі Купалы: «Гэткім шчырым каханнем яе атуліў… А яна… А яна была толькі… дзяўчынай!..»[17]

Зразумела, ён рашыў не ісці на гэты карнавал. Нашто ўсе гэтыя інтэлігенцыі! Ён будзе мужчынам! Няхай ветры пакоевай глушы спяваюць паніхіду па яго мінулым і па яго сучасным. У глушы родзіцца новы чалавек з новай верай, з новым сэрцам, родзіцца сапраўдны сын беларускага народу. Да новага жыцця, развітаўшыся з усімі Вярхоўскімі, з усёй мяшчанскай Прагай!

Ён схапіў ліст Вярхоўскай, каб яго парваць, але ў гэты момант спыніўся: «Мы можам быць добрымі сябрамі», —

успомніў ён словы з ліста. На хвіліну ён задумаўся. Але потым схапіў ліст і парваў яго. «Не, мы не можам быць добрымі сябрамі, — казаў ён сабе, — дачка папа і сын чорнаработніка! Лацінская мова і геаметрыя не маглі дасыпаць рову, які ляжыць паміж дзвюма паласамі. Дык грайце марш, Вярхоўская! Можа быць, яшчэ спаткаецеся на карнавале з Загорскім! Жадаю поспеху!» Ён горка ўсміхнуўся і пачаў хадзіць па сваім пакоі ўзад і ўперад, раздумваючы над тым, як выехаць з Прагі на Бацькаўшчыну.

І ўсё ж такі ў дзень карнавалу ён не вытрымаў. Цікавасць перамагла ўсе яго разважанні і ўвечары прымусіла падысці да Студэнцкага дому. Студэнцкі дом ніколі не выглядаў такім бліскучым, як у гэтую марозную ноч. Дзіўныя агні розных колераў пераліваліся сваімі праменнямі на бліскучым снезе. Прыгожая музыка неслася праз дзверы залі ў сваім нястрыманым шалёным скоку і прымушала кружыцца да забыцця. Па ўсіх залах скакалі карагоды масак, быццам гэта быў велізарны звярынец. Дэкальтэ дам і крыклівыя маскі вабілі «звяроў» усялякіх гатункаў і прымушалі асабліва часта раздавацца з канфеці і развівацца стужкам.

Тугоўскі спыніўся, нікім не прыкмечаны ў цёмным кутку залі. Міма яго праносіліся вясёлыя карагоды. Адна нейкая маска з шырокай спадніцай балерыны вышэй кален, з голымі рукамі пранеслася міма яго так блізка, што ён аж уздрыгнуў: ці не заўважыла яна яго. Праз хвіліну ўбачыў стаяўшага, як і ён, чалавека.

— Кірыла! Айцец Кірыла, — прамовіў Тугоўскі шэптам.

— А, гэта ты, Тугоўскі, — ледзь не крыкнуў ад здзіўлення Кірыла. — Якім ты чынам тут? Вось так спатканне.

— Ціха, — шаптаў Тугоўскі, — нас пабачаць. Скажы ты мне, што гэта за пара: вось гэта балерына і гэты…

— У касцюме П’еро? А ты хіба не ведаеш? — усміхнуўся Кірыла. — Прыслухайся да іх голасу.

Тугоўскі пачаў прыслухвацца. Белы, як смерць, ад пудры, з чырвонымі дзвюма малінавымі лініямі ля вушэй, з намалёванымі вачыма і наведзенымі маршчынамі на чале, П’еро быў не хто іншы, як Загорскі. Даму ён пазнаў хутка: гэта была Вярхоўская.



— Ну? — прадаўжаў смяяцца Кірыла. — Бачыш? Ні даць ні ўзяць: П’еро і Каламбіна.

— Пойдзем адсюль, — крыкнуў Тугоўскі. — Купіць, айцец Кірыла, купіць. Тугоўскі хоча купіць.

— Ты звар’яцеў, — схапіў яго за рукаў Кірыла, — апамятайся.

— Адсюль хутчэй, айцец Кірыла, да Флэка, гора замачыць.

Піўная «У Флэка» была любімым месцам спаткання студэнтаў і разам з тым знакамітай піўной у Празе. На сценах яе залаў было нямала старажытных афарызмаў.

Публіка ведала, што тут можна трымаць сябе зусім вольна, і таму сядзела і смяялася, і спявала песні, як у сябе ў хаце. Шматлікія кельнершы ў чорных, як ноч, шоўкавых халатах лоўка ставілі на стол літровыя куфлі чорнага піва, самага лепшага ў Празе. У адной з заляў Тугоўскі заўважыў некалькі прафесараў тэхнікі з дамамі.

— Глядзі! — сказаў ён Кірылу. — Бачыш, чым займаюцца прафесары.

— А што ж, хіба яны не людзі? — зусім не дзівуючыся, зазначыў Кірыла. — Іх тут заўсёды бывае шмат.

За кожным столікам часта сядзелі студэнты адной нацыянальнасці. За адным — чэхі, за другім — балгары, за трэцім — расейцы, за чацвёртым — украінцы, і ўсе яны стараліся спяваць свае народныя песні.

На гэты раз студэнтаў было мала. Яны селі каля нейкае сямейнае пары, якая спажывала прынесеныя з сабой «вуршты». Жонка не адставала ад мужа і са смакам цягнула піва.

— Ты глядзі, што гэтая тоўстая чэшка, — шапнуў Кірыла, — паб’е рэкорд і вып’е ўсіх іх куфляў. Ты ведаеш, тут ёсць традыцыя, — прамовіў ён грамчэй, — хто выпівае 17 куфляў за адзін вечар, той робіццаа ганаровым госцем піўной і можа піць далей піва бясплатна.

— Праўда? — усміхнуўся Тугоўскі.

— Праўда! Гэта сапраўды геройства. Нармальна досыць чатырох куфляў піва, каб пачуць, што Капернік меў рацыю і зямля кружыцца каля Сонца.

Прыгожая кельнерша паставіла ім на стол піва. Тугоўскі ўпіўся ў яе вачыма.

— Якія прыгожыя жанчыны гэтыя чэшкі, — уздыхнуў ён.

— Ты нешта зашмат думаеш аб іх, — засмяяўся Кірыла, — плюнь, дружа! Не варта думаць аб гэтым.

— Як не думаць, айцец Кірыла, мяне ж ніхто яшчэ ў жыцці не кахаў. Ты разумееш, што гэта значыць? Дваццаць чатыры гады я рос на зямлі, не ведаючы, што такое каханне цела, — як пчала, што ўпіваецца ў кветку, не маючы магчымасці пацалаваць пах, каб на вуснах засталася кроў.

— І ты здольны на такое каханне? — засмяяўся Кірыла. — Кінь ты, не смяшы людзей.

— Я? — крыху абразіўся Тугоўскі. — Так ты лічыш, як і ўсе нашыя беларусы лічаць мяне, напэўна, няздольным ні да чаго? Не, брат, я належу да тых людзей, якія здольныя на безразважнасць. Слабыя людзі моцныя сваім адчаем. І сёння, калі я ў адчаі, я моцны.

— Кінь ты, Гамлет[18] няшчасны! Зноў пачынаеш плясці дурніцы. Выпі піва лепш, супакойся.

— Ах, айцец Кірыла! Справа не ў Гамлеце, не ў піве, справа ў маім жыцці… У мяне самім… Паслухай мяне. За піўным сталом заўсёды лепш кідаць філасофскія думкі і спавядацца. Дык вось… Мне здаецца, што я маю права рваць яблыкі ў тым садзе, які завецца жыццём. Тысячы розных гатункаў яблык у гэтым садзе, толькі ўмей іх зрываць. А між тым не зрываю… Калі прыйдзе ноч і я застаюся адзін, я думаю: «Чаму?» Я пытаю сябе: «Чаму?» І адказваю цяпер: «Таму, што мяне ніхто не кахае…» Не смейся, айцец Кірыла, не смейся. Гэта факт. Каханне — атэстат спеласці, які выдае жанчына мужчыне. Там прастаўляюцца розныя адзнакі за яго поспехі і здольнасці, там відаць, хто з'яўляецца найбольш здольны, каму даць сярэбраны ці залаты медаль. Чым больш у гэтым пасведчанні медалёў, тым, значыць, больш здольны чалавек, тым больш кахае яго жанчына. Раней, чалавеча, у маёй маладосці я думаў, што бегаюць за жанчынамі пустыя людзі, без творчай карыснай працы. Тады я не мог глядзець на іх інакш, як зверху ўніз, але цяпер усё змяшалася: я гляджу на іх знізу ўверх. — Ён глытнуў крыху піва і прадоўжыў: — Я цяпер ведаю, што чым больш кахае жанчына мужчыну, тым ён здольнейшы, тым лепшы яна выдае яму атэстат.



— Дурніцы! — перабіў яго Кірыла. — Хіба мала на свеце дурняў, якіх кахаюць жанчыны, мала п'яніц азартных, гуляк жанатых? Дык наогул ёсць розныя жанчыны, і іх ацэнка не можа быць зусім аб'ектыўнай — яна заўсёды будзе суб'ектыўнай. Так, напрыклад, нямала ёсць жанчын-п'яніц… Значыць, яна будзе цаніць у мужчыне тыя самыя якасці, што і ў самой сабе.

— Не ведаю. Але мне здаецца, ёсць мужчыны, каторыя падабаюцца жанчынам без вынятку. У іх ад прыроды ёсць такія «мужчынскія» якасці, што яны прымушаюць біцца любое жаночае сэрца. Агулам я хачу даказаць, што людзі са здольнасцямі могуць мець самую прыгожую жанчыну на свеце. Паглядзі, які-небудзь музыкант, інжынер, вучоны, словам, той, аб якім перадаецца з вуснаў у вусны, — як карае ён жанчын, як кідае ён іх, бы кветкі, і ляціць у новыя абоймы. Цяпер вазьмі другую крайнасць: які-небудзь дурань, які выклікае толькі насмешкі ад гэтых самых жанчын, як адпіхваюць яны яго самыя шчырыя прызнанні, як ганебна адкідаюць яго пачуцці. Словам, жанчына жыве агульнай тэорыяй, яна фактычна кахае не мужчыну, а яго грамадскае палажэнне. Праўда ці не? Я думаю: будзь ты самым першым прыгажуном у свеце, але служы ты ў абозе, ні адна жанчына не гляне на цябе. І, наадварот, будзь ты самой пачварай, але займай міністэрскае крэсла, — ты не адаб'ешся ад чароўнага полу. Такім чынам, мне здаецца, ясна, што жанчыны кахаюць не самога мужчыну, а толькі яго палажэнне ў жыцці. І вось таму я кажу, што жанчына — гэта нейкі барометр, па якім можна азначыць грамадзянскую вартасць чалавека, і каханне — гэта атэстат вартасці, які яна ведае. Па каханні можна ацаніць чалавека. Скажы, хто цябе кахае, і я скажу, хто ты.

Кірыла голасна рассмяяўся:

— Філосаф-самавук, — казаў ён праз смех.

— Не смейся, айцец Кірыла, — усміхаючыся таксама, зазначыў Тугоўскі. — Кожны па-свойму разумны. Адно табе скажу я: вельмі нізкае грамадскае палажэнне такога, хто не быў каханы. Я цвярджу, што якая-небудзь «старая дзева» — абсалютна нуль у параўнанні з той жанчынай, якая выйшла замуж і стала маткай, бо ў ёй было шмат недахопаў, якія не дазвалялі ёй кахаць. Тое самае: грош цана таму чалавеку, які на ўсё жыццё застаўся халасцяком.

— Мне здаецца, твая памылка ў тым, што ты абагульваеш тое, што з'яўляецца выпадковым, асобныя факты ўзводзіш у закон. У гэтай заблытанай цямніцы, якой з'яўляецца полавае пытанне, цяжка выводзіць што-небудзь агульнае. Напрыклад, ёсць «старыя дзевы», якія засталіся выпадкова такімі. Можа быць, яны былі шмат вышэй за тых жаніхоў, якія іх сваталі, за той асяродак, у якім яны жылі. Па-мойму, лепш зусім не выходзіць замуж, чым выходзіць абы-як. Ты глыбока памыляешся. Але наогул скажы мне, для чаго ты гутарыш на гэтую тэму? Мне дагэтуль няясна, які вывад ты хочаш зрабіць?

Тугоўскі маўчаў.

— Мне здаецца, адзіны вывад, — прадоўжыў Кірыла, — што каб кахаць і быць каханым, трэба зрабіць добрую кар'еру.

— Вось праўду кажаш, айцец Кірыла, — прамовіў Тугоўскі, ставячы куфаль на стол. — У наш капіталістычны век сапраўды так: каб быць каханым, трэба мець капітал або займаць высокае палажэнне на грамадскай драбіне. Але ў тым вось і бяда, што я не магу ісці па шляху нашых беларускіх студэнтаў у Празе. Адзін хоча стаць інжынерам, каб пабагацець і пакахаць графіню. Другі — пабудаваць уласную вілу, трэці — стаць доктарам і купіць уласны аўтамабіль. Кожны думае аб сваёй кар'еры. На жаль, у мяне гэтых думак няма, бо каб у мяне гэтыя думкі былі, напэўна, я быў бы больш шчаслівым, зрабіў бы кар'еру, разбагацеў бы, як іншыя, і знайшоў бы нарэшце прадмет кахання. А зараз я памёр: я кінуў вышэйшую школу, бо яна рыхтуе толькі кар'ерыстаў і лёкаяў для капіталістаў, да чаго калісьці заклікаў залатазубы прафесар палітычнай эканоміі. Я кінуў прадмет кахання, які таксама, мне здаецца, думае аб кар'еры і аб мужу-кар'ерысту. Я вырваў з болем сваё каханне, кажу табе шчыра, айцец Кірыла, пакінуў у сваім сэрцы глыбокую рану, якая вечна застанецца са мной, пакуль будзе цячы кроў у жылах. Я памёр для гэтага свету, памёр для інтэлігенцыі, якая панясе еўрапейскую панскую культуру на Беларусь. Я сам сябе зажыва пахаваў у яму, каб не стаў тым, каго болей усяго ненавіджу: інтэлігентам, які ненавідзіць рабочых, бо яны смярдзяць. Не ведаю, што такое творыцца са мной: можа быць, я вар'яцею, але я кахаю яго, чалавека паніжанага і абражанага. Сам я паніжаны і абражаны, сам я ўсё жыццё рос у склепах, пад падлогай тых, хто саладзіўся жыццём, сам я насіў на сваім твары пляму «плебей», і таму як мне не стаць у шэраг паніжаных і абражаных? Так, чалавеча, я звар'яцеў. Я стану работнікам — у той час, як сябры зробяцца капіталістамі. Праз шмат гадоў, калі я пайду па вуліцы ў чорнай куртцы работніка, я, напэўна, убачу дом Бурака, можа, вілу Тамашэвіча ці Станкевіча, убачу вялікія фіранкі на вокнах, убачу, як будзе стаяць Бурак з сваёй прыгожай жонкай і будзе глядзець на вуліцу. Убачу, як Бурак пазнае мяне і з трывогай адвернецца да сваёй жонкі, пытаючы яе паглядам: ці не пазнала яна таго, хто быў яго сябрам. А я пайду міма, міма… Але я не буду шкадаваць гэтага, айцец Кірыла. Вып'ем за маю смерць! Ну, падымай куфаль за духовую смерць Тугоўскага!

Кірыла маўчаў. Ён задумана глядзеў у туманную піўную жыжку ў шклянцы і нешта крэсліў на мокрым следзе піва пальцам па стале. Ён доўга маўчаў.

— Ты паэт, Тугоўскі, — нарэшце вымавіў ён. — Гэтым усё сказана. І ў гэтым тваё няшчасце. Паэт не такі, які творыць сабе славу і славу свайму народу вершам, але паэт па натуры, па свайму ўспрыманню свету, па свайму падыходу да жыцця. Ты безумоўна загінеш… А шкада, мне ўсё ж такі падабаецца твой падыход да сацыяльных пытанняў, да работніка. — Ён хлябнуў некалькі глыткоў піва.

— Чаму я загіну? — трывожна запытаў Тугоўскі.

— Ты зрабіў велізарную памылку, што пакінуў універсітэт. Памятаеш, як табе казаў калісьці астральны чалавек: «Канчайце універсітэт. Атрымайце дыплом. Інакш вас затруць дыпламаваныя дурні ў жыцці». Памятаеш гэта? І ты не паслухаў. Ты паэтычна падышоў да лекцый, да таго самага залатазубага прафесара, ты занадта блізка прыняў да сэрца яго сцверджанні і паэтычна абурыўся. Ты занадта паэтычна аднёсся да Вярхоўскай. Падумай, каго там кахаць? Па-мойму, гэта толькі пахучы кавалак мяса. А ты паэтычна ідэалізаваў яе, ты закахаўся ў яе — што з-за яе пайшоў бы скочыць, як баран, у ваду.

— Не, брат, Вярхоўскай ты не ведаеш, — абараняўся Тугоўскі. — Аб ёй мы не будзем гутарыць… Не хачу хаваць, што з-за яе я галоўным чынам кінуў універсітэт, што калі б яна кахала мяне, я гатоў бы прыносіць сябе нават у ахвяру і зрабіць якую-колечы кар'еру, як іншыя беларускія студэнты. Можа быць, не ведаю. Але цяпер універсітэт для

мяне на замку: я хачу апрасціцца. Я даўно хацеў апрасціцца. Вярхоўская толькі дапамагла мне ў гэтым, разбіўшы мае апошнія надзеі. Вярхоўская была б мейсцам, злучыўшым мой свет работніка з тым светам інтэлігента. Мне да апошняга часу яшчэ здавалася, што гэта магчыма. Я думаў праз сябе апрасціць Вярхоўскую. Я думаў, яна пакахае мяне як чалавека. Але я бачу, што для яе я павінен таксама стаць кар'ерыстам, таксама, скончыўшы ўніверсітэт, павінен стаць панам, запамятаць аб сваім сацыялізме і купіць сабе аўтамабіль. Не… Не хачу. Я яшчэ знайду ў сабе досыць сілы, каб адкінуць такое жаданне. Я памёр для тых, хто прывёў мяне ў Прагу, каб я вяртаўся назад прафесарам. Аказваецца з мяне выйшаў не прафесар — бадзяга… Дык вып'ем за новага Тугоўскага! За новага чалавека, які пойдзе ў народ, каб самому стаць народам, а?.. Падымай куфаль…

— Не… не… За бадзягу Тугоўскага? Не… Я падымаю свой куфаль за Тугоўскага-прафесара.

— І ты, айцец Кірыла, — схапіў яго за рукаў Тугоўскі, — і ты належыш да таго лагера, да тых інтэлігентаў? Значыць, і ты, жывучы ў Празе, ува ўсім расчараваўся, ува ўсёй беларускай справе, ува ўсім народзе, значыць, і па-твойму трэба зрабіць кар'еру?

— Так, чалавеча, каб біць буржуазію, трэба мець яе зброю ў руках — культуру. Без гэтага ўся наша зброя — толькі кардонны меч, якім мы па-дзіцячаму размахвалі ў паветры.

Яны зноў пачалі спрачацца, усё больш блытаючыся ў сваіх спрэчках.

Тугоўскі першы зразумеў, што іх размова ні да чаго не прыводзіць і што ён сам увесь быў сатканы з гэтых супярэчнікаў.

— Вы'ем, айцец Кірыла, усё ж ткі за маю смерць. Вып'ем за маю будучую жонку — простую сялянку.

— Во, за тваю жонку-сялянку п'ю. Проці гэтага нічога не маю. Я думаю, што ты можаш быць прафесарам і мець жонку-сялянку.

— Не, я хачу знайсці такую жанчыну, якая кахала б мяне як чалавека, незалежна ад таго, якое палажэнне я займаю. Без кахання, без жанчыны я жыцця сабе не ўцямлю… Я хачу яшчэ выпіць гэтую чару кахання да дна.



— Паэт ты, Тугоўскі, паэт… У гэтым тваё няшчасце, — паўтараў Кірыла. Яны выпілі апошні куфаль.

Калі ж усталі ад стала, зямля акрэслена калыхалася пад іх нагамі. Вялікі гадзіннік на якары перад уваходам у піўную паказваў далёка за поўнач.

— Я думаю, ты не паедзеш з Прагі, — казаў Кірыла, паціскаючы руку Тугоўскаму, — я думаю, мы цябе яшчэ ўлаштуем на стыпендыю.

— Не, айцец Кірыла, дзякую за ласку. Усё скончана. Я еду на гэтых днях на Бацькаўшчыну. Шчаслiва заставацца.

Яны пайшлі рознымі дарогамі.

## IX

Студзёны марозны вецер гнаў капялюш з галавы Тугоўскага. Ён ішоў па шумных асветленых вуліцах апошні, як яму здавалася, раз, стараючыся ўдыхаць водар начнога жыцця вуліц. Ісці дахаты не хацелася. Інтэрнат здаваўся пеклам, у якое ён трапіў для пакуты. Ён ішоў і бачыў, як усё жыццё начной Прагі круцілася каля аднаго цэнтру — жанчыны. Усе дбалі аб ёй, усе ішлі з ёй, усе шукалі яе. Ён зноў пачуў сябе адзінокім… Ён успомніў, што ўцёк да Флэка таму, што на карнавале пабачыў Вярхоўскую з Загорскім. Як весела цяпер у Студэнцкім доме! Як, напэўна, смяецца Загорскі, цалуючы яго каханне… А ён ідзе адзін, не маючы магчымасці схапіць яе ў свае абоймы… Няўжо гэта так будзе вечна? Ён успомніў надпіс Флэка пра дары кахання. Для каго гэтыя дары?

Няўжо ён не атрымае іх? «Эх, цяпер бы прыгожую дзяўчыну, назло Вярхоўскай», — думаў Тугоўскі, назло сваім змучаным нагам без мэты ідучы па Празе. Начныя жанчыны на кожным кроку прапаноўвалі яму сваё каханне. Ён з жахам уцякаў ад іх. Яны хрыпелі нейкімі мужчынскімі галасамі, яны былі бледныя і страшныя, як сама смерць…

Было ўжо каля гадзіны ночы, калі ён пабачыў, што ўсе яго блуканні і шуканні жанчыны не дадуць ніякіх вынікаў. Ён павярнуўся дахаты.

Шумнае Вацлаўскае намнесці засталося далёка ззаду. Ён выйшаў у цёмны правулак, які злучаў шумнае намнесці з другой шумнай вуліцай. Ішоў, пільна ўглядаючыся ў цемру. У правулку гарэў адзіны маленькі газавы ліхтар. Тугоўскі ўглядаўся,

каб дзе-небудзь не спатыкнуцца. Раптам ён нават спыніўся ад здзіўлення: праз самую асветленую частку завулка ляцела з голай галавой, у адной блузцы жанчына. Яна бегла досыць доўга, а потым, відаць, у яе не хапіла сілы, і яна прытулілася да цёмнай сцяны дому. «Якая-небудзь трагедыя, — падумаў Тугоўскі. — Зімой адной блудзіць і з голай галавой — гэта што-небудзь значыць». Ён паспяшыў на дапамогу жанчыне.

— Што з вамі? — спытаў ён, падыходзячы да яе. Жанчына маўчала. Толькі чулася яе парывістае дыханне. — Што з вамі? — паўтарыў пытанне Тугоўскі.

— Ох, — толькі праенчыла яна ў адказ. — Ох, мне дрэнна.

— Вы хворая? — спужаўся Тугоўскі. — Што з вамі, кажыце.

— Ох, не магу. Я зараз звалюся. Паглядзіце, як б'еццa маё сэрца.

Ён пачаў шукаць яе сэрца. Алкаголь прымушаў яго хістацца, як матроса на параплаве, і пакуль ён рукой трапіў на належнае мейсца, прайшло нямала часу. Яна енчыла, пакуль яго рука блукала па яе целе, і нарэшце замоўкла.

— Што з вамі? Я зараз жа пабягу да тэлефону, пазваню за карэтай Чырвонага Крыжа.

— Ох, не трэба, — праенчыла яна. — Нічога не трэба… Адвядзіце мяне толькі дахаты.

— З прыемнасцей, — прамовіў ён. Яна абаперлася ўсім сваім целам на яго руку, ціхім крокам ледзь рухалася побач з ім і цяжка дыхала. Тугоўскі маўчаў. Ён вёў яе, як дарагі скарб, з свядомасці важнасці свайго ўчынку. Як будуць уцешаны яе бацькі, калі ён прывядзе яе дахаты. Як будуць удзячны яны Тугоўскаму, як будуць пацiскаць яму руку, паставяць гарбаты, будуць запрашаць яго, і хто ведае, можа быць, ён стане сапраўды іх госцем…

— Вам далёка яшчэ да хаты? — запытаў ён, нахіліўшыся да яе.

— Не, — прамовіла яна. — Зараз будзе, — і пайшла значна болей бадзёра. Правулак канчаўся. У канцы яго бачыўся заліты святлом дом і шумная вялікая вуліца. Дзяўчына раптам пайшла зусім бадзёра. Яна сціснула руку настолькі моцна, што ён здзіўлена паглядзеў на яе. Яны пайшлі да залітага святлом дому. Правулак кончыўся.



— Ну, цяпер куды? — спытаў Тугоўскі. — Далёка да вашага дому?

— А вось ён, — паказала яна на асветлены дом.

— Тут? — са здзіўленнем спыніўся Тугоўскі і вырваў сваю руку з рукі дзяўчыны. Ён нават адступіў некалькі крокаў назад. На дзвярох дому было напісана: «Рэстаран».

— Гэта ваш дом, вы тут жывяце? — спытаў, не верачы сваім вачам.

— Так, — засмяялася яна. — Пойдзем… Сумаваць не будзеце.

— Дык вось як, — вырвалася з вуснаў Тугоўскага. — А я думаў…

— …Што я хворая? — засмяялася яна. — Ну нічога, мой хлопчык, мой студэнцік. Вы, я бачу, студэнт. Па вашым акцэнце чую, што не чэх. Ну што ж, зойдзем. Студэнты мае частыя і каханыя госці. — Яна ўзяла яго пад руку. Ён пярэчыў слаба. Ён спомніў, як яму было прыемна, калі ён шукаў яе сэрца… Ён першы раз слухаў жаночае сэрца. Алкаголь рабіў свае ўплывы на яго разбітае, не паспеўшае расквісці каханне… Эх, што будзе, то будзе. Ён увайшоў з сваёй паненкай. Высокі, выцягнуты ў струну лёкай паказаў ім дарогу ўніз па шырокай драбіне, засланай чырвоным каберцам. Яны прайшлі міма ў невялікі — паўкругам — пакой, абіты светла-нябеснымі шпалерамі, пасярэдзіне якога стаяў круглы чорны столік, уздоўж сцяны вылучалася мяккая канапа. За сцяной то аслабявала, то шырылася п'яная музыка…

Не паспелі яны зачыніць за сабой дзверы, як у пакой зайшоў лёкай, той самы, што паказваў дарогу, і паставіў паднос з бутэлькай віна і бакаламі на стол. У тую самую мінуту ён моўчкі працягнуў Тугоўскаму рахунак на буйную суму ў сто чэшскіх крон. Як ні быў ахоплены флэкаўскім півам Тугоўскі, ён зразумеў, што ўся гэта бутэлька не варта гэтых грошаў. Ён рашуча запратэставаў…

— Гэта самы лепшы партвейн, — прамовіў ласкава лёкай.

— Мілы! — абвіла паненка за шыю рукамі. — Сорам было б займацца гэтай сумай.

Тугоўскі перастаў пярэчыць, выцягнуў партманет і паклаў на паднос зялёненькую паперку ў сто крон.

— Ого, у цябе шмат грошай, — прамовіла паненка, заглянуўшы ў яго партманет. — Купі мне папярос.

Лёкай, не чакаючы адказу Тугоўскага, зараз выцягнуў з кішэні фрака пачку папярос. Тугоўскаму гэта не падабалася. Усё ж ён не такі п'яны быў, каб не зразумець, што з ім робяць нешта нядобрае. Але, не жадаючы больш спрачацца, ён моўчкі заплаціў за папяросы. Нарэшце яны засталіся адны. Можна было рабіць, што яны жадалі, схаваныя ад усіх людзей, ад усяго свету, ад усіх маральных законаў. З кожным выпітым бакалам ён рабіўся больш і больш прагавітым да ласкі, да жанчыны, каторую шукаў цэлае жыццё, а яна рабілася больш студзёнай, мармуровай. Яна смяялася студзёным каменным смехам.

— Ну, цалуй мяне, мой мілы студэнцік… Бяры маё сэрца.

Але ні адзін мускул яе не ажывіўся, ні адна частка цела яе не магла жыць, не магла адчуваць. Ён цалаваў мяккі студзёны камень, і пакуль у яго яшчэ была памяць, ён адчуваў нейкае незадавальненне. Але потым усё стала яму прыемным. Потым усё злілося ў густы туман.

Калі ён прабудзіўся, то ўбачыў, што ўжо свет льецца адкульсьці з вышыні. Праз вузкую палоску шкла ў столі віднеліся ногі прахожых, шыны аўтамабіляў, фурманак. Жыццё кіпела, вуліца рухалася, як велізарны мурашнік, ні на хвіліну не спыняючы сваёй бегатні. Дзесь было змаганне, была чэсная праца, дзесьці біліся за існаванне людскае, а ён ляжаў, згубіўшы ўсякае разуменне аб прасторы, аб часе, аб тым нават, дзе ён. Як папаўся ён сюды? Ускочыў на канапе і пачаў шукаць тую, якая прывяла яго ў гэты пакой. Яе і след прастыў. Ён з жахам схапіўся за сваё партманет. Толькі два даляры сіратліва ляжалі сярод дакументаў. Тыя грошы, якія ён атрымаў у лік стыпендыі за паўтара месяцы, зніклі невядома як, толькі адны ўспаміны ў выглядзе рахункаў, напісаных алоўкам, сведчылі аб іх колішнім існаванні. Ён схапіўся за галаву. Што ён будзе рабіць зараз у Празе з двума далярамі? І як ён паедзе цяпер на Бацькаўшчыну? Што ён нарабіў?

Тугоўскі ўскочыў з канапы. Трэба шукаць каго-небудзь, трэба атрымаць тлумачэнне. Ён выйшаў з пакою, падняўся па драбіне з чырвоным каберцам, заглянуў у розныя пакоі, але нідзе не найшоў ніводнай душы: здавалася, што гэта быў нейкі загавораны дом. У адным пакоі ён убачыў нейкую тоўстую бабу з закасанай спадніцай, якая мыла падлогу.



— Вам што трэба? — запытала яна.

— Я шукаю адну паненку, — пачаў Тугоўскі.

— Ніякай паненкі тут няма. Я тут адна. — Яна павярнулася і ляснула перад яго носам дзвярамі. Ён стаяў і раздумваў. Раптам нешта кальнула яго. Ён ледзь не прысеў ад болю. Заразіўся! Студзёны пот выбіла на чале. Задрыжэлі рукі і ногі. Ён сеў у стаяўшае зблізу крэсла. Галаву калола неадступная думка: «Схапіў дурную хваробу. Першы раз у сваім жыцці прытуліўся да жанчыны, згубіў нявіннасць дзеля таго, каб згубіць усё жыццё. Як дзіка! Хутчэй адсюль…» Ён апрануў сваё зімовае паліто і выйшаў на вуліцу. З жахам заглянуў на гэты дом, дзе было напісана «Рэстаран», і дрыжачаю рукой запісаў адрас: калі-небудзь, калі, можа быць, выявіцца сапраўды, што ён атрымаў дрэнную хваробу, ён пацягне рэстаран да судовай адказнасці. «Хаця, — падумаў зараз жа, — што я магу зрабіць з рэстаранам? Скажуць, што я прывёў дзяўчыну з вуліцы, а за гэта і самому несці адказнасць». Як дзіка! Як страшна! Мала таго, што няма грошаў, але няма больш чыстаты, няма здароўя. Кажуць, ад такой хваробы можа праваліцца нос. Ах, хоць бы мінула яго гэтая кара. Ён ляцеў, як непрытомны, у інтэрнат, спадзеючыся, што там знойдзецца нямала спецыялістаў па венерычных хваробах. Але каго запытаць?

У інтэрнаце яму трапіўся спявак Серада, чалавек, у каторага не кожны дзень бываў палудзень, чалавек, каторы жыў тым, што хадзіў па рэстаранах і пад час абеду падсаджваўся да сваіх сяброў, спяваючы ім свой сібірскі раманс: «Ах, Соня, мая чэшска Соня». Гэты чалавек, зразумела, ведаў аб розных хваробах. Але запытаць яго, каб ён расказваў з насмешкай па ўсім інтэрнаце, што ў Тугоўскага дрэнная хвароба, было б глупствам. Ён звярнуўся да астральнага чалавека.

— Скажыце, як з'яўляецца сіфіліс?

— А што? — здзівіўся астролаг. — Чаму вас гэта зацікавіла? Схапілі?

— Не ведаю, — чырванеючы, сказаў Тугоўскі.

— Хвароба з'яўляецца на другі тыдзень, — сказаў астролаг, —— з'яўляюцца падазроныя гнойныя плямы.

— Ах так… Дзякую… — І ён супакоены пайшоў хадзіць па калідоры.

Тугоўскі нідзе не мог знайсці мейсца. Што нарабіў ён, што будзе зараз з яго паездкай на Бацькаўшчыну, з яго апрашчэн-

нем? Ён збіраўся ехаць чыстым, ідэальным юнаком, а зараз ён павязе з сабою бруд, ён павязе з сабой жахлівую хваробу вялікага места. Фактычна, ён ніколькі не лепш за тых, на якіх ён нападаў як на кар'ерыстаў, буржуазных «інтэлігентаў»… Ён брудны, нягодны, няварты насіць імя чалавека.

Тугоўскі доўга лаяў сябе і доўга хадзіў па калідоры інтэрната. Але нарэшце холад прымусіў яго вярнуцца да рэчаіснасці і ўспомніць пра палудзень. Аднак на гэты раз задаволіўся толькі адной сардэлькай з хлебам і ўвесь апошні дзень праляжаў, як хворы, у пасцелі.

## X

У гэты самы час беларускія студэнты безупынку грызлі граніт навукі. Іх рэдка можна было ўбачыць у Студэнцкім доме, мала і рэдка яны спыняліся для гутарак і толькі па некалькі хвілін пасля дзяліліся ўражаннямі ад экзаменаў. Момант быў вельмі сур'ёзны. Канчалася зіма, у паветры ўжо насіліся цёплыя вясновыя вятры, прафесары заканчвалі чытальныя курсы другога, апошняга семестру. Адны студэнты павінны былі прайсці на наступныя курсы, другія ўжо падыходзілі да дыпломных прац і дактарату. Праца кіпела. Нават хто цэлы год гуляў па Празе, больш паглядаючы за яе цікавасцямі, чым за навукай, то ў апошні момант схапіўся, каб вярнуць загубленае. Пачыналіся сапраўды скокі з перашкодамі. У гуртах збіраўшыхся хто-небудзь заўсёды апавядаў смешныя выпадкі, як валіліся студэнты.

— За кожны экзамен трэба было плаціць грошы. Так што правам «Мяне ўжо зазначыў высокі турак» другі раз не пакарыстаешся. Касір на тэхніцы ўсіх ведае па прозвішчы. Як толькі я прыходжу плаціць грошы за экзамен, ён голасна пытае мяне: «Вы ізноў праваліліся на экзаменах?»

Студэнты рагаталі.

— А прафесары, грамадзяне, — смяяўся маленькі чорненькі тэхнік Жук, — ужо робяць скідкі: бяруць толькі два разы за экзамен. На трэці раз студэнт ідзе ўжо экзаменавацца бясплатна.

— Не махлюй, — казаў абражаны Бурак пад рогат.

— Ну, вось, скажы ты мне, — запытаўся яго насмешліва Кірыла, — ты здаваў заалогію?



— Здаваў.

— Ну вось скажы тады: амёба будзе такая? — Ён расшырыў рукі на чвэрць аршына.

— Зразумела, будзе, — адказаў Бурак. — Вось дзіва: амёба — не аднаклетная жывёліна.

Кірыла ўзяў аловак, зрабіў кропку на паперы і прадаўжаў:

— Вось такая, як кропка, і то не будзе. Іначай магіла.

Студэнты паміралі са смеху.

— А, ну вось, — махнуў рукой Бурак і пайшоў ізноў у студоўню.

— Пачакай, — смяяўся наўздагон Малевіч, — што скажа твая графіня, калі пачуе, што ты не ведаеш амёбы?

Бурак выйшаў з залі. Размова на хвіліну спынілася. Усе смяяліся, дзівуючыся, як Бурак мог здаць заалогію. Нарэшце размова перайшла на прафесара.

— Э, здаць лёгка, — казаў Жук, — прафесару толькі трэба казаць усё дрэннае пра вераб'я. Трэба казаць, што ён самы найгоршы шкоднік з усіх птушак на свеце, што вераб'я трэба нішчыць як шкодніка — і ўсё будзе добра. Прафесар вам скажа, што вельмі добра ведаеце заалогію.

— Чаму ён так нападае на вераб'я? — дзівіліся ўсе.

— Таму, што калісьці прафесар зрабіў вельмі каштоўны прэпарат, паклаў на вакно, расчыніў. Заняты працай, ён не заўважыў, як верабей-злодзей падляцеў да прэпарату, схапіў яго і панёс да сваіх вясёлых сяброў… Калі прафесар схапіўся, вераб'я ўжо не было. Бедны стары бегаў па пакоі і ледзь не рваў на сабе валасы. З той пары няма больш шкоднай птушкі, як верабей.

— Здорава, — засмяяўся Тамашэвіч, — у кожнага прафесара сваё.

— А ў нас на тэхніцы, — казаў Кірыла, — адзін стары дзівак-прафесар вельмі любіць слабы пол. Калі да яго ідуць экзаменавацца выключна студэнты, ён бывае вельмі сур'ёзны, сярдзіты. Дае такія пытанні, на якія ніхто не можа адказаць, і ён неміласэрна гоніць усіх з кабінета. Але калі толькі з'явіцца маладая студэнтка, прафесар маладзее: ён ходзіць усміхаючыся, рассыпае жарты направа і налева, ставіць простыя пытанні, а калі нават на іх студэнтка не можа адказаць, ён адказвае сам за яе і ставіць ёй «вельмі добра». Дзеля гэтага, перш чым ісці

на экзамен, запісваюць у спіс больш жанчын і сваю карту стараюцца выставіць пасля іх.

— Таўкач ваш прафесар, — махнуў рукой Тамашэвіч. — Значыць, толькі ў нас на філасофіі ідэальная прафесура.

— Вам, філосафам, добра, — засмяяліся тэхнікі, — прафесары з вас нічога не вымагаюць, але што вы есці будзеце пасля сканчэння школы?

— Нічога, вашых дзяцей вучыць будзем, — адказаў Тамашэвіч, папраўляючы сваёю рукой «грыву» на галаве.

На спрэчках канчаліся размовы. Студэнты разыходзіліся па студоўнях. Ізноў безупынку пачыналі працаваць над кнігамі. Ніхто не заўважыў, як экзамены адбіваліся на здароўі, як усе твары жоўклі, як у аднаго ці ў другога з'яўляўся сухі, ледзь прыкметны кашаль. Бывалі часы, калі некаторыя кідалі палудзень, абмяжоўваючыся гарбатамі і сухой каўбаскай. Больш усіх змарнеў Кірыла. Ён не звяртаў увагі, што кашаль яго мацнеў, што нават часамі ў яго круцілася галава і яму рабілася дрэнна на вуліцы, ён не звяртаў увагі на тое, што ў яго пад вечар нават бывала высокая тэмпература.

Усе ведалі, што Прага — адзін з самых найвялікшых еўрапейскіх цэнтраў па смяротнасці ад туберкулёзу, але ніхто не звяртаў увагі на сваё здароўе. Арганізмы ўва ўсіх слабелі, марнелі: усё ж такі неміласэрна займаліся працай. І вось сказалася. Быў прыгожы вясновы ранак, калі Кірыла Бурачэўскі выйшаў на экзамен. Маладое сонца так ласкава свяціла і грэла зямлю. У пражскіх садах спявалі птушкі. Усё гутарылася аб жыцці, аб красе і шчасці. Толькі Кірылу ў грудзёх было цяжка. Ён чуў, як балела яму ў левым баку. Усё ж такі ён ішоў, бо гэта быў яго апошні экзамен. Як толькі ён яго вытрымае, то скончыць апошні курс тэхнікі, стане інжынерам і зможа адпачнуць і лячыцца, толькі б вытрымаць.

Ён увайшоў у вялікі будынак, на дзвярох якога была прыбіта чырвоная таблічка з надпісам: «Устаў ставобноў механікі»[19]. Некалькі студэнтаў-чэхаў прайшлі міма яго. Ён падняўся за імі на другі паверх. Раптам закашляўся. Нешта шатліва пачало хрыпець у левай палове грудзей. Ён задыхаўся, яму не хапала паветра. Нарэшце адкашляўся: кроў. Што такое? Ён раптам пабачыў, што ўвесь рот яго поўны салёнай гарачай крыві. Галава яго закруцілася, у вачох стала цёмна. Зазвінела ў вушах у тысячы дробных звонаў, быццам у нейкія стаканы аб трывозе.



Ён, як падкошаны, без памяці зваліўся на зямлю. Кроў заліла драбіну. Чэхі, якія ішлі папераздзе, кінуліся ды паднялі трывогу, выклікалі хуткую дапамогу і адвезлі яго ў шпіталь…

## XI

…Веснавое сонца даўно глядзела праз фіранкі ў прыгожую вілу, у адзін з тых дамоў, якімі пакрывалася пасля вайны Чэхія. Залацістыя праменні сарамліва заглядвалі ў спальню, асвятлялі мармуровы ўмывальнік, ручнік, каберац на падлозе і пару мяккіх двайных крэслаў. Вялікае люстра пералівала ўсімі колерамі вясёлкі: ад чырвонага да цёмна-зялёнага. Загорскі прыемна пацягваўся ў пасцелі пад белай пярынай і праціраў вочы. Яму не хацелася ўставаць. Зноў пачынаўся дзень, такі самы, як учарашні, такі самы, як тыдзень назад. Прызнацца, яму ўсё гэта досыць абрыдла. Усе дні былі такія аднастайныя, цягучыя, як туга. Усе яны пачыналіся аднолькава: спачатку ён ішоў у Студэнцкі дом, потым куды-небудзь у тэатр ці кіно, потым, увечары, забіраўся ў інтэрнат пагуляць у карты. Рэдка ён праводзіў ночы ў сваёй прыгожай віле. Прызнацца, і гэта чэшка таксама яму ўжо абрыдла, і віла, і ўся сямейная ўтульнасць. Магчыма, ён не радзіўся, як іншыя, сем'янінам. У дадзеным выпадку ён нагадваў кавалерыйскага каня, якому хамут прычыняў болі. А з другога боку, ён мог быць спакойным, калі яго прыгожая чэшка штодня за сваімі ласкамі нагадвала яму аб экзаменах, аб тым, што трэба, нарэшце, стаць доктарам. Так доўга прадаўжацца не можа! Яго брала злосць, ён сярдзіта кідаў сваёй прыгожай пані: «Не муч мяне», — і запіраўся ў сваім пакоі. Самымі горшымі днямі для яго былі субота і нядзеля, калі ён павінен быў пражыць з сваёй паняй цэлы дзень. Звычайна яшчэ збіраліся госці: прыязджаў яе брат з Пільзена, інжынер-хімік. Пачыналіся размовы аб кар'еры, аб жыцці пад гукі мяшчанскага патэфону. Затое ў звычайныя дні яму было спакайней. Чэшка ішла рана ў свой магазін, і ён бачыў яе толькі ўвечары. Ён адчуваў сябе поўным гаспадаром вілы. Урэшце, ён нядрэнна ўладкаваўся. Ён мог бы жыць, нягледзячы на ўсю сваю нелюбоў да чэшкі. Але так доўга прадаўжацца не магло. Экзамену ён не думаў трымаць. Значыць, рана ці позна надзея ў чэшкі стаць «пані доктаравай» будзе разбіта, а гэта прывядзе да катастрофы… Ён павярнуўся на пасцелі, усміхаўся і казаў

сам сабе: «Ну што ж, хай заўтра смерць, а сёння мы жывём». Ён ляжаў, з прыемнасцю ўспамінаў карнавал. З Вярхоўскай ён правёў нямала прыемных гадзін. Праўда, сама па сабе яна не цікавіла яго, хоць пасля чэшкі ўсё ж такі была больш рухлівая і маладая. Але ён ладзіў з Вярхоўскай хутчэй на злосць дзіваку Тугоўскаму.

— Ну што ж, — засмяяўся ён, — калі яна і трапіцца ў рукі Тугоўскаму, дык ува ўсякім выпадку не першай свежасці.

Ён яшчэ паляжаў, паглядзеў праз вакно, дзе ўжо даўно рухаліся людзі, і нарэшце пачаў апранацца. Ён думаў аб тым, што сёння пойдзе гуляць у карты ў інтэрнат. Толькі дзе б дастаць болей грошаў?

— Ага — дзе, — рашыў ён, — мая чэшка, напэўна, яшчэ не пайшла на працу. Папрашу ў яе 600 корун, быццам на запіс для дзяржаўнага экзамену.

Ён хутка апрануўся і зазірнуў у пакоі да чэшкі. Яна была апранута і збіралася ўжо адыходзіць.

— Ach, dobre jitro, Bozena![20] — прамовіў Загорскі, цалуючы яе руку. — Ты ўжо ідзеш? А я да цябе. У мяне сёння экзамен, і мне патрэбны грошы на запіс.

— Колькі?

— 600 корун…

— Езус-Марыя! На што такая сума вялікая? Ты звар'яцеў…

— Дзяржаўны іспыт… Разумееш, такая сума пры паступленні ў школу, — змахляваў Загорскі.

— У мяне няма такой сумы, — яе поўны твар заліўся чырвоным румянцам, вочы сярдзіта глянулі на Загорскага.

— Ды што ж тады я буду рабіць? — рабіў трагічны выгляд Загорскі. — Зразумей, без гэтага я не магу трымаць экзаменаў, што ж тады будзе з маім доктарам… Няўжо ты мне не верыш?

— Я думаю: усё ж ткі ты махлюеш. Ну добра, я табе гэту суму дам, але ты мне прынясі квітанцыю ад касіра.

— Квітанцыю? Як нізка, — наморшчыўся Загорскі. — Ды я табе дваццаць квітанцыяў прынясу. Якое мяшчанства! І ты сапраўды ад мяне патрабавала б квітанцыю?

Чэшка стаяла, адвярнуўшыся да вакна, і маўчала. Ён падышоў да яе, схапіў за плечы і прытуліў яе галаву да сваіх вуснаў.



— І ты патрабавала б ад мяне квітанцыю? — казаў ён паміж пацалункамі.

Яна нарэшце вырвалася з яго абоймаў і, смеючыся, пайшла ў другі пакой.

— Ну, — сказала яна, выходзячы з купкай зялёненькіх крон, — вось табе грошы, але каб ты вытрымаў экзамены.

Ён падзякаваў і пацалаваў яе рукі.

— Ах, мне трэба ісці, — спомніла яна і, наспех накінуўшы капялюш, у дзвярах пажадаўшы яму ўсяго найлепшага на экзаменах, паляцела на працу. Загорскі перагортваў пачку крон і, смеючыся, думаў аб сваёй лоўкай выдумцы. Сёння ўвечары ў інтэрнаце ён будзе мець магчымасць добра пагуляць у карты.

Увечары інтэрнат ажывіўся. У адным з яго пакояў, уведзеных для студоўні, хоць звычайна тут ніхто не вучыўся, сабралася шматлікая грамада няведама з якіх краёў. Тут былі чэхі і расейцы, украінцы і немцы і наогул міжнародныя аматары пашукаць шчасця ў картах. Інтэрнат быў прадстаўлены самымі лепшымі гульцамі. Серада і балетмайстар Садоўскі запалілі свечкі. У пакоі стала ціха, урачыста і важна. Усе твары напружана і сярдзіта сачылі за картамі, углядаючыся ў рукі суседзяў. Загорскі сядзеў на краі стала і ўносіў у банк вялікія сумы. Ён гуляў азартна. Сёння, яму здавалася, ён павінен быў выйграць.

— Банк! — крычаў ён, ні на адну хвіліну не задумваючыся. І ён зайграў.

Праз некалькі гадзін у банку было ўжо больш за 300 крон. У пакоі было так ціха, быццам ува ўсіх людзей страх адняў усякую магчымасць гутарыць і рухацца.

— Банк! — крыкнуў Загорскі і ў першы раз за ўсю гульню адчуў, што ён задрыжэў усім целам.

— Вока, — сказаў трымаўшы банк Садоўскі і паказаў дзясятку з тузам. Усё было скончана. Загорскі прайграў. З той пары ён пачаў хвалявацца…

* * *

Тугоўскі не мог спаць гэту ноч. Як ранены, як ахоплены агоніяй, ён кідаўся на пасцелі, уставаў, хадзіў па пакоі і ўсё думаў аб тым, што ён заразіўся. Ён глядзеў на тое мейсца, дзе, па словах астральнага чалавека, павінна была з'явіцца жоўтая

пляма, і чуў зуд, нейкае паленне-казытанне болю. Калі ён лажыўся на пасцель, то ўскокваў увесь абліты студзёным потам. Нарэшце ён не вытрымаў, выйшаў у калідор. Што такое? У студоўні праз дзверы бачылася святло. Хто мог так позна вучыцца? Ён з цікавасцю прыадчыніў дзверы — і адступіў назад ад здзіўлення. За сталом пры свечках гулялі ў карты. Усе кінулі на яго сярдзітыя погляды і зноў прыняліся за гульню.

— Як вы сюды трапілі? — выгукнулі за сталом.

— Якая вам справа? Я вас не пытаю, як вы сюды трапілі, — адказаў Тугоўскі, становячыся ў цёмны кут стала, каб пасачыць за гульнёй. Загорскі ў гэты момант прайграў якраз усіх 600 крон.

— Я папрашу вас выйсці, — сказаў Загорскі. — Інакш мы вас адсюль выкінем, як шмаццё.

Тугоўскі пачынаў увесь дрыжэць ад злосці.

Бяссонная ноч, мукі нейкай хваробы, разбітая свядомасць — усё разам прыводзіла яго ў адчай і рабіла з яго чалавека, якому нічога не было страшнага. Але ён не адказаў Загорскаму. На гэты раз ён толькі сціснуў зубы і прамаўчаў.

— Што за ідыёт, — не супакойваўся Загорскі. — Паглядзіце, стаіць.

— Ах так, — прарвалася ў Тугоўскага. І не паспелі апамятацца прысутныя, як звонкі ўдар па твары прарэзаў цішу пакою. Усе паўскоквалі з мейсца. Загорскі падляцеў да Тугоўскага, але ў гэты момант другі ўдар разнёсся ў паветры з не меншай сілай.

— Вось табе, — крычаў Тугоўскі. — За ўсё, за плебея і за ідыёта!

Пачалася сапраўдная бойка. Тугоўскі быў у перавазе. Ён біў Загорскага па спіне, па руках, па твары, куды толькі даставалі яго доўгія рукі, біў са смеласцю адчайнага чалавека. Іх разнімалі, але доўга не маглі разняць, пакуль у справу не ўмяшаўся нейкі Геркулес-украінец і не вывеў за каўнер з пакою Тугоўскага.

«Памсціцца, — падумаў Тугоўскі, застаўшыся адзін у калідоры. — Цяпер Загорскі будзе памятаць мяне на ўсё жыццё. Плебей памсціцца патрыцыю...» Ён хутка апрануўся і выскачыў з інтэрнату на вуліцу. Швейцар доўга корпаўся ў хаце і не хацеў адчыняць яму брамы.



— Вы не зачыняйце брамы, — сказаў Тугоўскі, — я зараз вярнуся з адной дамай. Яе муж сёння ў інтэрнаце гуляе ў карты, разумееце?

— А-а, — працягнуў швейцар.

Тугоўскі паляцеў на кватэру Загорскага. Віла стаяла недалёка ад інтэрнату, на прыгожай гары сярод елак і зеляніны. Ён пазваніў. Ніхто не адгукнуўся. Дзесьці спрасонку забрахаў сабака. Яшчэ раз пазваніў... Ён званіў без упынку, пакуль нарэшце не пачуў шлёпанне пантофляў каля дзвярэй.

— Хто тут? — пачуўся жаночы голас, і прамень электрычнай лямпачкі трапіў проста ў вочы Тугоўскаму.

— Студэнт Тугоўскі, калі ведаеце.

— Я такога не ведаю. — Святло слізганула ўздоўж яе фігуры. — Я вас не магу пусціць.

— Не трэба. Толькі выслухайце мяне. Пан Загорскі ёсць у хаце?

— Не, яшчэ не прыходзіў.

— Дык вось, пан Загорскі зараз знаходзіцца ў Украінскім інтэрнаце, адзін квартал ад вас, і грае ў карты. Ён прайграў ужо 600 корун.

— Ах... — ускрыкнуў жаночы голас.

— Калі хочаце яго ратаваць, дык зараз жа мусіце ісці ў інтэрнат са мной, інакш ён аканчальна прайграецца і аддасць свой апошні касцюм.

— Зараз. Хвіліну пачакайце...

Тугоўскі спакойна застаўся чакаць. Помста яго нарэшце дасягнула мэты. Праз нядоўгі час прыгожая, поўная чэшка ў чорным паліто адчыніла дзверы вілы. Яны паспешна накіраваліся ў інтэрнат. Тугоўскі маўчаў. Няхай яна сама пабачыць абстаноўку, у якой апынуўся яе будучы муж. Які гэта будзе дзіўны момант.

Яны прайшлі праз браму, дзе швейцар ёй нізка пакланіўся і зняў шапку, потым падняліся па драбіне і... Яна адчыніла дзверы пакою. Напэўна, узрыў бомбы зрабіў бы лепшае ўражанне, чым з'яўленне жанчыны ў дзвярох інтэрнату. Усе ігракі, якія здаваліся яшчэ больш жахлівымі пры паўцёмным асвятленні свечак, замёрлі, не ведаючы, што рабіць, як зразумець з'яўленне гэтага прывіду. Адкуль і хто яна?

— Пан Загорскі, я прашу вас зараз жа вярнуцца дахаты, — голасна прамовіла яна, адчаканьваючы кожнае слова. Загорскі ўстаў, бледны, як папера, і паспешна падышоў да яе.

— Бажэна! — цалаваў ён яе рукі. — Я зараз… Дазволь мне тут адыграцца. Я зараз выйграю шмат грошай.

— Ах, нягодны. Ты не маеш права называць мяне па імені. Зараз жа збірайся са мной дахаты.

— Ну гэта яшчэ паглядзім, — успыхнуў Загорскі. — Можаце ісці. Я вас не трымаю. — Ён нізка пакланіўся ёй і зноў пайшоў да стала. Яна ляснула дзвярыма і выйшла. Упоцемках ішла, хіляючыся, і Тугоўскі падляцеў дапамагчы ёй сысці з драбіны. Калі святло ліхтара асвяціла яе твар, ён убачыў вочы, поўныя слёз.

— Ну, бывайце, — працягнула яна руку на развітанне Тугоўскаму. — Дзякую вам вельмі, што мяне выручылі з бяды… Вельмі дзякую. — І яна, плачучы, пайшла з інтэрнату. Тугоўскі не вярнуўся ў пакой. Ён ведаў, што Загорскі з карцёжнікамі пастараюцца памсціцца яму, і таму правёў бяссонную ноч у альтанцы. Сапраўды, праз паўгадзіны ён пачуў, як з інтэрнату выйшаў Загорскі з натоўпам прыяцеляў і злосна сказаў:

— Яго шчасце, што мы яго не знайшлі…

— Адламалі б мы яму рэбры, — прамовіў праз зубы нейкі густы нізкі бас.

Яны пералезлі праз плот, каб не званіць швейцару, зніклі ў цемры ночы. Тугоўскі з палёгкай уздыхнуў. І пасля з непрыемнасцю падумаў: «Ужо ўся кар’ера Загорскага загінула, больш ён не будзе гаспадаром у прыгожай віле».

## XII

Пад ранак Тугоўскі паглядзеў на сябе і ледзь утрымаўся на нагах: на тым месцы, пра якое казаў астральны чалавек, з’явілася вялікая жоўтая пляма. Не заставалася больш ніякага сумлеву. Апошні валасок, за які ён быў учапіўшыся, абарваўся, і Тугоўскі ляцеў у прорву. Як жахліва. Як ён ні хацеў калісьці скончыць жыццё самагубствам, але зараз, калі ён бачыў, што гіне, нейкі жывёльны страх перад загубай апанаваў ім. «Загінуць, — думаў Тугоўскі, — так, загінуць. Не!.. Гэта дзіка! Невымоўна дзіка. Як-небудзь схапіцца за жыццё».



Ён ляцеў, як непрытомны, да доктара.

У вялікім шыкарным пакоі з усялякімі інструментамі высокі, у белым халаце, спакойны, як Бог, доктар запісваў усе прыкметы хваробы Тугоўскага. Ён ціскаў яго, круціў, прыглядаўся і больш усяго хацеў даведацца, калі гэта было. Тугоўскі пачынаў ужо думаць, што ён дарэмна перапужаўся, калі доктар прамовіў сам сабе:

— Так… Сіфіліс — слова грэцкае і азначае: сіф — свіння. Значыць: свінячае каханне.

— Магчыма, доктар. Але дзе ж узяць сапраўднае каханне, калі яго няма? Я ўсё жыццё сваё шукаў сапраўднае каханне, але не мог знайсці, — патэтычна казаў Тугоўскі, — вось цяпер я маю сіфіліс…

— Не, чалавеча. На гэты раз Бог мілаваў, але другі раз вы не хадзіце да гэтых начных паненак, асабліва пад уплывам алкаголю. Другі раз вы так лёгка не прыйдзецца…

— Дык я здаровы? — з радасцю ўскрыкнуў Тугоўскі.

— Так. У вас ёсць адна нязначная хвароба, фактычна, яе і хваробай няможна назваць. Я б назваў яе па-французску, але вы па-французску не разумееце. Гэта хвароба ад таго, што вы даўно не мелі жанчыны…

— Праўда?

— Так, каб вы аканчальна сталі здаровы, я магу вам прыпісаць толькі адно лякарства: жанчыну…

— Вельмі дзякую, доктар, — засмяяўся Тугоўскі, — але дзе яе ўзяць?

— Ну, што ж… Знайдзіце сабе якую-небудзь бабульку і жывіце з задавальненнем. Тут ужо медыцына бяссільна штонебудзь дапамагчы, — жартам параіў доктар.

Тугоўскі выйшаў ад доктара быццам перароджаны. Ён ляцеў, нібыта на крылах. Яму было ўсё прыемна і радасна, нібы ён бачыў жыццё першы раз пасля даўгога сядзення ў турме. Ён весела ўвайшоў на двор Студэнцкага дому. Яму здалося, што ўсё прасвятлела, што веснавое сонца наўмысля так міла і прыемна грэе і залоціць вершаліны дрэў, выбіваецца на канаўках. Спяваюць пеўні на платах, усё шуміць новым маладым жыццём. «Жыць, жыць, я яшчэ буду жыць!» — казала сэрца, і ад гэтага простага слова слёзы нагортваліся на вачох. «Усё ж ткі хачу жыць, — казала істота, — хоць цярпець, але каб жыць…»

Ён быў у такім павышаным настроі, што не звяртаў увагі на адносіны да сябе сяброў. Толькі калі спаткаў двух-трох беларусаў, якія прайшлі міма, не прывітаўшыся з ім, тады ён зразумеў людскія адносіны да сябе, пахмурнеў. Ён увайшоў у шумную залю, сеў у куток і задумаўся. Як дзіўна створаны гэтыя людзі! Яны мяняюць свае адносіны залежна ад поспеху чалавека. Яны лашчацца, яны каля яго, пакуль грыміць слава, пакуль чалавек ідзе ўгару і высока нясе сваё імя, але трэба яму крыху спатыкнуцца, як усе пакідаюць яго, і чалавек застаецца адзін. Як брыдка, што ўсе гэтыя маленькія людзі, усе гэтыя тэхнікі Жукі, Буракі, Малевічы ставяць сябе вышэй за яго, з нейкім пачуццём першынства, смеючыся, падаюць яму руку:

— Здароў, Тугоўскі! Ну, што ты цяпер: ні Богу свечка, ні чорту качарга?

Эх, хацелася б яму кінуць у іх вочы ганебны крык з горыччу і злосцю, але ён прымушаны маўчаць, ён прымушаны цярпець іх насмешкі. Усё роўна трэба выпіць свой келіх жыцця ўвесь да дна: «Ці з вадой жыватворнай, ці з ядам успамінаў…» — згадаў ён словы Янкі Купалы і маўкліва глядзеў, як рухаўся стракаты студэнцкі натоўп у залі.

— Тугоўскі! — пачуў ён раптам каля сябе голас і абярнуўся. Перад ім стаяў вясёлы, квяцісты, з даўгімі валасамі Тамашэвіч.

— Ну, як жывём?

— Па-старому… Як гарох пры дарозе.

— Эх, біць цябе трэба, — казаў ён, падсядаючы да Тугоўскага. — Адмовіцца ад стыпендыі і кінуць вышэйшую школу… Гэта нешта нечувана. Што за прычыны? Слухай… Я ніяк не магу зразумець.

— Дык і не старайся. Нічога не зразумееш на гэтым свеце. Хачу апрасціцца, дзядзька Тамаш, — засмяяўся Тугоўскі.

— Апрасціцца ці ўдасканаліцца? Гэта такая праблема, што над ёй варта паламаць галаву ўсёй нашай маладой інтэлігенцыі.

— Ах, не кажы гэтых высокіх слоў: «інтэлігенцыя»… Ва ўсякім выпадку, я да яе сябе не далучу.

— Чаму? Дарэмна… Кожны чалавек, хто задумваецца над самім сабой, над людскім існаваннем, хто жыве не толькі для бруха, але крыху і для духа, ужо ёсць думаючая частка народу. А я спадзяюся, што ты сябе адносіш да гэтай думаючай часткі, праўда?



— Значыць, тады і ўсе нашыя студэнты ў Празе, — не адказваючы проста на пытанне Тамашэвіча, зазначыў Тугоўскі, — таксама інтэлігенцыя? Кінь, дзядзька Тамаш…

— Зразумела, што інтэлігенцыя, — рабіўся сур'ёзным Тамашэвіч. — Але ж вось адсюль і выцякае заданне нашай інтэлігенцыі: як жа апрасціцца, калі мы ўсе выйшлі з простага народу і з пункту гледжання якога-небудзь расейца і так вельмі «простыя»? Перад намі ўсімі стаяць велізарныя шляхі ўдасканалення, такія велізарныя, што мне падчас хочацца сказаць словамі Максіма Багдановіча[21]: «Брацця! Ці хопіць нам сілы?!» Удасканаліцца, — [казаў] дзядзька Тамаш, — калі заглушыць у сабе тое простае, што яшчэ звязвае нас з народам, значыць, адысці ад народу… Так трэба зразумець гэта ўдасканаленне.

— Удасканаліцца, каб стаць дырэктарам фабрыкі, ці што?

— Зусім не… Нашто так спрошчваць сваё думанне? Удасканаленне ёсць удасканаленне. Гэта ёсць даўгі, паслядоўны шлях развіцця ўсіх духоўных элементаў чалавека… Карацей і ясней кажучы, рост яго.

Сапраўды, мы павінны яшчэ шмат над сабой працаваць, каб у нас было больш чалавечага твару. Мець сваю індывідуальнасць, свой чалавечы твар — гэта наша найвялікшае заданне. Толькі ў людных адзінках — наш ратунак. Як жа стаць моцным, дзе тое лякарства, якое магло б дапамагчы і даць моц? Старому Фаўсту, памятаеш, чорт даў лякарства, чароўную Маргарыту, амаладзіў яго, зрабіў моцным і прыгожым, хоць узяў яго душу[22]. Ты ведаеш, што сталася потым з Фаўстам?.. Так вось, Маргарыта якая-небудзь не ёсць у нашы часы лякарства, якое зробіць нас маладымі і моцнымі. Адзіны лек для нас, каб стаць моцнымі, — гэта праца над самім сабой — культурная праца ў культурнай абстаноўцы. Сярод грамадзянства. Мы павінны ісці ў грамадскія арганізацыі, закладаць гурткі, таварыствы, партыі, каб удасканальвацца, бо ніхто так не развівае чалавека, як грамада і жыццё.

— «Моцны той, хто адзін», казаў філосаф, — зазначыў Тугоўскі. — Мне здаецца, грамада не можа тварыць індывідуальнасць.

— Правідлова. Адна грамада не створыць індывідуальнасці. Калектыў часта прыгнятае адзінку, але трэба прызнаць, што без грамады таксама не можа быць развіцця адзінкі. Рабінзоны Круза[23] аджылі свой век.

— Потым, не ўсякая грамада можа навучыць чаму-небудзь. Сапраўды, наша пражская Грамада можа навучыць толькі гуляць у карты, п'янстваваць і рабіць кар'еру.

— Юпіцер, ты злуешся, значыць, ты не правы, — засмяяўся Тамашэвіч. — Адкуль такія чорныя фарбы, даражэнькі? Наша моладзь не горш усякай іншай моладзі. Ёсць тыпы адмоўныя, безумоўна, але ёсць і дадатныя.

Тамашэвіч спрачаўся менш упарта. Ён бачыў, што Тугоўскі мае нейкую сваю думку і не хоча з ім падзяліцца. Тугоўскі затое наўмысля хацеў быць упартым — хоць у душы шмат згаджаўся з Тамашэвічам.

— І ўсё ж такі не ў гэтым справа, — прадаўжаў Тамашэвіч, — справа не ў нашай Грамадзе. Справа ў грамадзе наогул. Нашто табе наша Грамада? Калі ты чуеш сябе настолькі вышэй за нашую Грамаду, што можаш кідаць яе, дык маеш магчымасць знайсці Грамаду іншую, чэшскую, напрыклад, балгарскую, украінскую… У Празе, дзякаваць Богу, ёсць дзе ўдасканаліцца. Можна сапраўды развіцца і стаць культурным ува ўсіх адносінах чалавекам. Наша заданне, паўтараю, наогул стаць у свеце з векам нараўне.

— Добрая рэч — асвета, — усміхнуўся Тугоўскі. — Добрая рэч паставіць сабе адно ці тысячы самых добрых заданняў, але пытанне — як іх дасягнуць. І потым, я не ведаю, чым гэта растлумачыць, я не бачу ніякага задавалення ад таго, што я іх дасягну. Я ўдасканалюся па тваім рэцэпце — магу скончыць вышэйшую тэхнічную школу. Нарэшце, гэтага можна дасягнуць. Людзі нават без здольнасцяў могуць скончыць курс 8-мі гадоў. Так, дапусцім, што я стану інжынерам. Я шукаю спакою: правінцыі, палескай глушы.

— Сну, паспаць хочацца? — засмяяўся Тамашэвіч. — Тады, брат, нічога не зробіш. Тады, можа быць, табе сапраўды трэба чароўнай Маргарыты, як таму старому Фаўсту. А вось і яна, Маргарыта…

Да іх падыходзіла Вярхоўская.

— Лёгкая на ўспамін, — жартаваў Тамашэвіч, — а мы толькі што гутарылі аб Маргарыце і аб Фаўсце.



— Ого, — усклікнула Вярхоўская, сядаючы з другога боку, каля Тугоўскага. — Відаць, што ў каго баліць, той аб тым і зачынае гаварыць.

Тугоўскі пачырванеў да вушэй.

— Ужо ж, — падхапіў жарт Тамашэвіч, — нам гэта вельмі баліць. Вось, ведаеце, спрачаліся мы з грамадзянінам Тугоўскім… Ён добры хлопец, як вы думаеце?

— Нічога, — засмяялася Вярхоўская. — Калі спіць… Тады добры хлопец, але вось любіць паспаць. Хто яго так сагнуў, не ведаю. Па-мойму, яго трэба было б добра страсянуць, як грушу. Тады з яго выйшаў бы чалавек. Хлопец ён нічога. Хоча быць толькі арыгінальным. Але гэта не бяда.

Тугоўскі канфузліва ўсміхнуўся.

— Я вось што хачу, — казаў, устаючы, Тамашэвіч, — каб з цябе, братка, выйшаў беларус-дзеяч. Кінь свае арыгінальнасці, будзь як усе і паступай да нас на філасофію. Гэта будзе лепш, чым на тэхніку. Стыпендыю як-небудзь улаштуем.

— Правідлова! — падтрымала Вярхоўская. — Улаштуем. Скажам, што ты беларускі паэт, кінуў тэхніку і па чэснасці не захацеў атрымліваць стыпендыю. А начальнік Чэшска-Украінскага камітэту, палкоўнік, які любіць часам быць ліберналам, зжаліцца — і ўсё. Дык як, згодны?

Тамашэвіч глядзеў на яго пільнымі бліскучымі вачыма. Вярхоўская ўсміхалася, з цікавасцю аглядала яго фігуры.

Тугоўскі адварочваў ад яе твар і маўчаў.

— Маўчанне — знак згоды. Значыць, скончана, — падхапіў Тамашэвіч. — Я пайду, а вы паўплывайце на яго, Галена Уладзіміраўна.

Вярхоўская з Тугоўскім засталіся адны. Настала непрыемнае маўчанне.

— Ну, што новага? — запытаў ён нарэшце.

— Новага? Здаецца, нічога новага, апрача таго, што ведаеце. Экзамены… Вось памірае айцец Кірыла.

— Што? — ледзь не ўскочыў Тугоўскі. — Айцец Кірыла памірае?

— Так, доктар сказаў, што спадзявацца на яго выздароў немагчыма. У яго сухоты. Здаровых лёгкіх засталіся толькі маленькія кавалачкі. Увесь час павышаная тэмпература — да 39. У яго шмат крыві выйшла.

— Скажыце! — дзівіўся Тугоўскі і з шчырым сумам спамінаў Кірылу. Ён пазбавіўся цяпер самага лепшага сябра, якога знайшоў у сваім цяжкім жыцці ў Празе.

— Роджаны пад Сатурнам, — усё ж такі прабурчэў ён больш для сябе і спомніў прароцтвы астральнага чалавека, які казаў, што Кірыла памрэ ад сухотаў. — Роджаны пад Сатурнам… Чалавек памірае, калі яму застаўся адзін дзень да дыплому. Памірае ў росквіце сілаў, не маючы магчымасці вярнуцца на Бацькаўшчыну, якую ён хацеў бачыць квятучым садам. Хіба гэта не няшчасце? Хіба гэтыя людзі не радзіліся пад няшчаснай планетай Сатурн? Хіба не цягне іх гэты пракляты Сатурн да магілы, калі яны самі цягнуцца да жыцця? А колькі іх? Колькі іх у Празе, што імкнуцца, можа быць, шчыра, да палепшання свайго палажэння і нават цэлага народу, церпяць фіяска ў разгар сваёй працы? Колькі іх, гэтых працавітых павукоў, павуціну каторых так злітасна змятае мятла выпадку? Я пачынаю думаць, што мы ўсе тут, у Празе, — роджаныя пад Сатурнам, што ўсе мы загінуўшыя для Бацькаўшчыны людзі, і, можа быць, не адзін з нас пойдзе па дарозе айца Кірылы… Хто выйдзе прарокам з нашага пражскага Назарэту? Я думаю — ніхто. Большасць з нас пакладзе свае косці на чужыне, меншасць будзе стыдацца апрануцца ў бацькавы кажух, бо ён смярдзіць. Так пройдзем мы, пражане, па свеце, як пыл, — не нацешыўшы нікога ні сваім росквітам, ні сваёй моцай, толькі жаласцю ці праклящцямі.

Вярхоўская маўчала. Яна аб нечым думала. Аб сваім Тугоўскім, ці аб яго словах. Цяпер толькі ён спыніўся, каб падумаць, якое ўражанне зрабіў на яе. Праз хвіліну яна падняла на яго ласкавыя вочы і прамовіла:

— А ўсё ж ткі, я думаю, што і наша зямля можа радзіць быстрых розумам Ньютонаў і Платонаў. Я думаю, што і ў нашай Грамадзе ёсць людзі, якія могуць быць прарокамі; напрыклад, Тамашэвіч…

— А Загорскі? — Ён паглядзеў на яе насмешліва. У гэты момант яна чамусьці здалася яму такой маленькай, звычайнай дзяўчынай. Яна здзіўлена паглядзела на яго і пачырванела.

— Загорскі?.. Што вы? Ні ў якім разе…

— Чаму? — усміхаўся Тугоўскі. — Яны вельмі падобны адзін на аднаго: Тамашэвіч, напрыклад, беларуская рэвалюцыйная балалайка… А Загорскі грае на скрыпцы… і на жаночым сэрцы… Як бачыце, абодва музыканты, і абодва вам падабаюцца.

— Кіньце вы, — казала яна, гледзячы на яго крыху спуджана, — вы сёння нейкі насмешлівы, рашучы, якім я вас ніколі не бачыла.

— Жыць буду, разумееце? Сёння мне доктар сказаў, што жыць буду. Вясна ідзе. Ручайкі звіняць. Тугоўскі жыць будзе назло Сатурну, назло прыкрасцям Загорскіх і іх паненак. Разумееце?

— Зноў Загорскі… Мне гэта імя не зусім прыемна, — прамовіла яна.

— Ах, вось як. Даўно? Вітаю, Галена Уладзіміраўна. Магу паведаміць, што грамадзянін Загорскі больш не будзе спаць у прыгожай віле. Сёння яго жонка-чэшка знайшла ў інтэрнаце сярод карцёжнікаў, калі ён прайграў усе свае грошы.

— Што? У яго была жонка? Чэшка? Ён іграў у карты? Нічога не разумею, — бляднела Вярхоўская.

— Хіба вы не ведаеце, Галена Уладзіміраўна? — усмяхаўся Тугоўскі. — Увесь Студэнцкі дом трубіў аб гэтым.

— Першы раз чую. Але мне ўсё роўна. Якая справа мне да Загорскага. — Яна ўстала сур'ёзная і бледная. Тугоўскі глядзеў на яе і бачыў задаваленне ў тым, што першы раз яна стаяла перад ім не каралевай, гордай і недаступнай, а звычайнай жанчынай, не могшай схаваць сваёй жаночай слабасці. — Правядзіце мяне дахаты, — прамовіла яна, робячы над сабой высілак волі і сумна ўсміхаючыся.

— Дахаты? — рэзка, нават, як яму самому падалося, груба засмяяўся Тугоўскі. — А што там будзе? Вы мне пакажаце цацкі, як заплакаўшаму дзіцяці?

— Так… Можа быць, пакажу дзіўныя цацкі, — горда і са смехам у адказ на яго рэзкасць зазначыла яна.

— Не… Тады… вельмі дзякую. Які я ні ёсць, а вашай жаласці не патрабую, і дзіцём я не хачу быць. Бывайце… — Ён зняў свой капялюш і, рэзка павярнуўшыся, выйшаў з Студэнцкага дому.

# КВАДРА ТРЭЦЯЯ

## I

Кірыла Бурачэўскі паміраў, шчыра аплакваемы сябрамі. У яго не было ворагаў. За ўсё жыццё ў Празе ён стварыў толькі цёплыя адносіны да сябе: ён змог да кожнага сэрца працягнуць шчырыя чалавечыя ніткі дабрыні і сімпатыі. Усе шкадавалі яго. І тое, што зараз парваліся ніткі повязі яго з усімі, і тое, што ён больш не пацяшаў нікога сваім гумарам, і тое, нарэшце, што хвароба яго была нейкім жорсткім, дзікім з'явішчам, вырваўшым на чужыне аднаго з самых старых сяброў Грамады, рабіла велізарны сум на ўсіх і прымушала ледзь не штодня адпраўляцца да Кірылы ў санаторыю. Ён ляжаў сярод сасновага бору, спяваў яму старыя, знаёмыя, блізкія яго беларускаму сэрцу песні. І, можа быць, таму, што песні бору такія блізкія, родныя, як на Беларусі, ён увесь час думаў аб родных палёх, аб роднай хаце, дзе чакала яго старэнькая матка… Ён вельмі шкадаваў, што памірае на чужыне, як эмігрант. Бывалі часы, калі ён думаў, што смерць немагчыма: яна была б жорсткай у гэты момант, калі ён быў яшчэ малады, задорны, калі жыццё толькі пачынала адчыняць яму свае прыгожыя дарогі, калі фартуна павінна была пакрыць яго дыпломам інжынера. Тады ён падымаўся з пасцелі насуперак усім медыцынскім прадпісам, падыходзіў да адчыненага вакна, каб схапіць у свае хворыя лёгкія свежага паветра. Вакно выходзіла ў сад, за якім стаяла веранда, дзе спаў сухотнік. А за верандай скакала па камянях рака. Ён стаяў і глядзеў, як зачараваны, на вясёлую раку, ляцеўшую кудысь у невядомую даль, і думаў пра другую раку, пра свой родны Нёман. Там, на яго берагах, ён правёў сваё дзяцінства, там вырас, слухаючы яго казкі і легенды, і там не можа ляжаць вечна, каб бачыць яго берагі і слухаць яго журчанне. Ён стаяў нядоўга, бо зараз пачынаў адчуваць, што ногі яго дрыжаць, у грудзёх пачынае нешта клекатаць і хрыпець і жахлівы кашаль ахоплівае яго настолькі, што ён не можа адкашляцца, тады бяссільна валіўся на пасцель. Некалькі разоў паўтаралася такое хлябанне паветра, але нарэшце ён зразумеў, што доктар мае рацыю, што медыцынскіх прадпісаў зневажаць няможна і што трэба легчы ў пасцель і прымірыцца з тым, што ён памірае. З кожным днём ён сох усё больш і больш, ён мог пра сябе сказаць, што быў запаленай свечкай, якая гарэла ў цемры, і гас з кожнай гадзінай. Ён бачыў, што жыццё дагарала, і толькі з жахам думаў, што будзе, калі яго свечка пагасне і стане зусім цёмна, як уначы. Ён баяўся ночы і прасіў доктара даць як мага мацнейшых лякарстваў, каб заснуць і не бачыць жахлівых кашмараў. Ён прабуджаўся пад ранак увесь у поце, увесь пад уплывам начных прывідаў і толькі ўцешаны днём радасна глядзеў на сонца і супакойваўся. Днём заўсёды было весялей, днём прыходзілі сябры, днём каля пасцелі была сядзелка і вязала панчоху, днём у садзе спявалі птушкі і працавалі людзі, а ўначы ён быў адзін. Толькі званок, працягнуты да пасцелі, дазваляў яму выклікаць сястру ці доктара. Часам яму рабілася настолькі страшна, што ён хацеў адчыніць вакно і крыкнуць у начное паветра: «Грамадзяне! Мне страшна! Ведаеце вы, што значыць паміраць пры поўнай свядомасці з цвяроза гледзячымі на ўсё вачыма?» Але ён ведаў, што людзі не чуюць, яны не разумеюць слоў аб смерці. І ён маўчаў, чакаючы, калі яго ахопіць ноч, ноч у нейкай яме, дзе можна шукаць і крычаць у сцены — ніхто не пачуе. Нарэшце ён прымірыўся з лёсам.

Ён толькі хацеў, каб канец прыйшоў хутчэй, каб скончыліся мукі чакання. Але смерць не ішла. Яна, як жорсткі кат, цягнула дні, з гадзіны на гадзіну адкладваючы сваё з'яўленне.

І вось аднаго разу нехта пастукаў у дзверы. Бурачэўскі ляжаў у пасцелі распалены, цяжка і перарывіста дыхаючы, ужо мала пазнаючы людзей. Сядзеўшая каля пасцелі сястра ўскочыла і адчыніла дзверы. Увайшоў Тугоўскі з букетам пахучых кветак, ззаду за ім стаяў малады, чырвоны, у белым халаце доктар. Сястра ўпусціла наведвальнікаў, узяла кветкі, паставіла ў ваду, выйшла з пакою. Прынесеныя кветкі былі вельмі дарэчы, бо ў пакоі несла непрыемным пахам ад хворага. Бурачэўскі глядзеў на Тугоўскага і не мог пазнаць.

— Ну што, айцец Кірыла, не пазнаеш Тугоўскага? — спытаў той.

— Тугоўскі, дружа, гэта ты? — ледзь чутна прамовіў Бурачэўскі і, робячы над сабой высілкі, пры дапамозе Тугоўскага сеў на пасцелі.

— Так, брат, прыйшоў праведаць цябе і бачу, што ты вельмі непрыгожую рэч задумаў — хварэць. Як гэта сталася, айцец Кірыла?

Бурачэўскі крыва ўсміхнуўся.

— Бачыш, — ледзь чутна прахрыпеў ён, прарываючы свае словы кароткім, сухім кашлем. — Можна сказаць, мая смерць вельмі прыгожая: памёр, так бы мовіць, пры выкананні сваіх абавязкаў. Падымаючыся па драбіне на экзамен. Ці ж не праўда, што да апошняга, як жаўнер, стаяў на сваёй службовай варце, га?

— Праўда, айцец Кірыла, вельмі прыгожая з твайго боку такая, ну, як бы мовіць, цярплівасць… Але лепш было б, каб ты раней падумаў пра сваё здароўе. Памятаеш, ужо даўно астральны чалавек прадугадаў, што ты памрэш ад сухотаў, што ты радзіўся пад Сатурнам.

— Правідлова, брат, радзіўся пад праклятым Сатурнам. Усё жыццё аддаў беларускаму руху, а чаго я дасяг… Паміраю, не дайшоўшы да зямлі абяцанай, паміраю дзесьці ў пустыні, адзін, пакінуты дзікім птушкам і звярам, як падаль… Эх, мілы сябра Тугоўскі… — Ён спыніўся на хвіліну, каб перавесці дух пасля доўгай прамовы. — Я памру, — прамовіў ён.

— Ну, — пастараўся яго супакоіць Тугоўскі, — не раз наведаюся яшчэ да цябе.

— Не, памру. Хутка памру. Дык вось ты, паэт Тугоўскі, ты зразумееш, што, як Тарас Шаўчэнка хацеў бы напісаць свой «Заповіт» перад смерцю, так і я хацеў бы, каб мяне пахавалі на высокім беразе Нёмана, каб заўсёды быў бачны камень, каля якога бурліць яго сярдзітае цячэнне, каб у часы сваіх разліваў ён абмываў мае косці, як абмываў цела дзіцяці, калі я купаўся ў ім у залацістыя сонечныя дні маёй вясны. І яшчэ хацеў бы я, каб на гэтым камяні былі высечаны словы аб памёршай ластаўцы, што не дачакалася вясны на беларускіх палёх… — Ён забіўся ў сухім кашлі.

— Ну, — супакойваў яго Тугоўскі, — чаму такія думкі, айцец Кірыла? Яшчэ паправішся і прыедзеш на Бацькаўшчыну інжынерам.

— Эх, — праенчыў Бурачэўскі, крыху супакоіўшыся ад кашлю, — усё скончана… Не будзем больш гутарыць аб смерці. Ну скажы, як ты жывеш, як улаштаваўся?



— Я? — усміхнуўся Тугоўскі. — Як бачыш, яшчэ боўтаюся ў Празе, хоць збіраўся ехаць на Бацькаўшчыну ў якую-небудзь палескую глуш, далей ад праклятай культуры… Хоць да эскімосаў якіх-небудзь на паўночны полюс, толькі б далей ад гэтых подлых масак, якія называюць сябе людзьмі. А цяпер вось жыву таксама сярод іх, стаў чорнаработнікам: нашу цэглы, мяшаю ванны на будынкі і не думаю больш аб універсітэце, аб нашых беларускіх кар’ерыстах і палітыцы.

— Ну, і ты шчаслівы?

— Вось у тым і бяда, — уздыхнуў Тугоўскі, — што шчасця няма ў маёй душы. Будую чужыя вілы, чужыя палацы, чужое шчасце, а свайго ўласнага не знайшоў…

У гэты момант Бурачэўскі раптам схапіўся за грудзі і заваліўся на пасцель.

— Ох, мне дрэнна, — ледзь чутна прахрыпеў ён, — звані хутчэй доктару.

Тугоўскі перапужана ўскочыў і без пярэрвы пачаў націскаць кнопку званка. Прыляцеў, запыхаўшыся, доктар.

— У чым справа? — запытаў ён. І ў гэты самы момант, зірнуўшы на хворага, прамовіў: — Выходзьце хутчэй! Чакайце мяне ўнізе, у чакальні.

Тугоўскі спусціўся ў паркетную, з мяккай мэбляю і прыгожымі малюнкамі ў вялікіх бронзавых рамках, залю. Хвіліны былі непрыемныя і даўгія, як туга. Нарэшце ўвайшоў доктар. Тугоўскаму кінулася ў вочы, што ён быў больш бледны і сур’ёзны, чым звычайна.

— Вось што, у яго ёсць якія-небудзь крэўныя ў Празе? — спытаў ён, не гледзячы на Тугоўскага.

— Не, няма. Ёсць толькі сябры, бо ён быў сябрам Беларускай грамады ў Празе, — стрывожана, чуючы нешта нядобрае, адказаў Тугоўскі.

— Тады скажыце ім, што ўсё скончана. Скажыце ім: няхай яны пад’едуць сёння ўначы ў лес, спыняцца каля санаторыі… з трунай…

— З трунай? — крыкнуў Тугоўскі.

— Так, з трунай. А ўсе гэтыя меры засцярогі мне патрэбны дзеля таго, каб хворыя не даведаліся, што нехта памёр у санаторыі. Смерць пакідае на хворых вельмі непрыемнае ўражанне. Разумееце?

Тугоўскі вылецеў з санаторыі, як непрытомны, і як мага хутчэй, наняўшы аўто, панёсся ў Прагу. Праз некалькі гадзін шмат сяброў Бурачэўскага было паднята на ногі і рыхтавалася адправіцца ў санаторыю. Санаторыя ўжо спала, калі велізарны аўтамабіль хаўтурнага бюро затрашчаў сваім маторам у сасновым лесе. Запаліліся факелы. Некалькі работнікаў у цяжкіх ботах, падбітых жалезам, падкрадаліся, як злодзеі, да дзвярэй санаторыі і, як злодзеі, ціха падымаліся па скрыпучай драбіне. Каля кожных дзвярэй стараліся не выпусціць ні аднаго хворага на той выпадак, калі б ён высунуў галаву даведацца, што гэта за шум у санаторыі. Трывогі доктара былі дарэмныя. Санаторыя спала салодкім моцным сном — нават і не падазраючы, што тут творыцца апошні акт жыццёвай трагедыі. Таксама асцярожна, хоць не раз стукнуўшы жалезам ботаў аб драбіну, работнікі вынеслі труну і пры святле факелаў паклалі ў аўтамабіль. Усё было скончана. Ніхто не плакаў, не спяваў песні — толькі агні велізарных факелаў, як хаўтурныя свечкі, трашчалі ў начной цемры і асвятлялі ўвесь малюнак трайным чорным святлом.

— Не біў барабан перад сумным палком, як сябру свайго мы хавалі, — прамовіў Тугоўскі, але не атрымаў водгуку. Усе маўчалі. Нарэшце развіталіся з персаналам санаторыі і рушылі ў дарогу. Лес быццам жахліва задрыжэў ад затрашчаўшага матора, быццам мацней і сумней хіснуліся сосны і зашумелі сваімі галасамі.

Калі там стала спакойна, ужо ўсё было скончана. Ад Кірылы Бурачэўскага не засталося ні следу.

## II

На другі дзень рана Тугоўскі ішоў на працу. Смерць Бурачэўскага была такой раптоўнай і неспадзеўнай, што ён не меў магчымасці наперад паведаміць сваю адміністрацыю і не мог пакінуць працы.

Ён плыў за велізарнай работніцкай арміяй на трамваі, ішоў у сваім запэцканым вапнай і глінай касцюме, ішоў, паслушны нейкай гонячай сіле. Вочы яго ў гэты дзень глядзелі ў другі бок, рукі адмаўляліся працаваць. Ён думаў аб смерці самага лепшага і вернага сябра і мучыўся, што не мог ісці за катафалкам на могілкі. Яму рабілася сумна. Ён моўчкі глядзеў на вясёлыя,



загарэлыя твары маладых работнікаў і моўчкі прыслухваўся да іх жартаў. І не мог супакоіцца. Ён пачынаў думаць аб сваім жыцці. Кірыла Бурачэўскі памёр, ён адправіўся на вечны спачынак, але ці не быў гэта самы найлепшы выхад з таго жыцця, каторае прыводзіць людзей у тупік. Ён чуў, што прыйшоў у тупік, жахлівы, безнадзейны тупік, і так цяжка яму было адчуваць, што ён гіне, што ў яго няма будучыні, што больш у яго не засталося мэты, у імя чаго жыць і змагацца. Сёння, якраз разам з Бурачэўскім, ён мог справіць юбілей: прайшло ўжо 6 месяцаў з таго часу, як ён дабравольна адмовіўся ад стыпендыі і стаў чэшскім работнікам. Ён стаў работнікам таму, што, па-першае, проста матэрыяльнае становішча яго прымусіла. У кішэні пасля памятнай ночы ў рэстаране з «начным матылём» сіратліва боўталіся 2 даляры, а на гэтую суму можна было пражыць не болей як тры дні. Па-другое, ён стаў работнікам і па разважаннях: жадаючы, сам зазначаў, апрасціцца. Ён хацеў унутрана перарадзіцца, стаць лепшым праз пeражытыя самім здзекі. Хацеў пражыць па формуле «Пакутай усё ачышчаецца». Усе гэтыя паўгода толькі пакутаваў. Ён цярпеў здзекі ад майстра і чэхаў-работнікаў. У яго былі акрываўленыя рукі ад шурпатых цаглін, якія браў голай рукой. У яго балела пасля працы ўсё цела, быццам пабітае неміласэрна палкамі, як у арыштанта на катарзе. Бывалі дні, калі не мог устаць і ішоў на працу зусім разбіты. Праўда, пазней усё гэта знікла. Ён прызвычаіўся да працы, да пераноскі цаглін, сам пашыў сабе скураныя рукавіцы, прымірыўся з сябрамі-чэхамі і завёў добрыя знаёмствы, але ўсё ж яго жыццё заставалася такой самай пакутай, добраахвотна пакладзенай на сябе, як і раней. І вось, што ж «ачысцілася» яго пакутай? Стаў ён лепшым, ці пачуў сябе перарадзіўшымся, новым чалавекам, пачуў у сабе новыя сілы да змагання? Ён мог толькі адказаць: «Не!» Пакута ачысціла ў ім яго дробныя інтарэсы, дробныя адносіны да людзей — яна падняла ў яго вачох значэнне і вагу чалавека, але пакута забіла ў ім самім чалавечы гонар, прытупіла яго адчуванне болю і здзеку, зрабіла з яго пакорнага чалавека. Болей таго, праз сваю абразу, праз выпітае да дна гора ён пазнаў чалавека ў іншым свеце, чым раней, і пабачыў, што людзі паважаюць толькі сілу і грамадскае становішча чалавека. Яны здзекуюцца з тых, хто па волі лёсу апынуўся ніжэй, аблытаны сеткай няшчасця.

Тады, ён пытаецца, для чаго яго пакута? Нашто добраахвотна мучыцца, калі гэта нікому не прыносіць карысці? Кінуць нарэшце пакутаваць. Спачыць так, як спачыў Кірыла Бурачэўскі. Другога выхаду няма.

Ішоў на працу — і думаў аб тупіку жыцця. Як на злосць, яму ўсюды трапляліся кантрасты.

Ён прыйшоў на працу, на сваю цагельню, і пачаў вазіць тачкі з глінай, абліваючыся потам. Частка ваганетак неслася з грукатам у паветры па нацягнутым жалезным канаце. Ваганеткі праносіліся над вялікім садам інжынера цагельні. У гэты самы час у садзе сядзела сям’я інжынера і прымала сонечныя ванны. Болей за ўсіх звяртала на сябе ўвагу жонка інжынера, вельмі поўная дама, якая ляжала сярод яблыняў у гамаку ў адным купальным касцюме. Яна не звяртала ніякай увагі на работнікаў, нібы гэта былі дзікуны, нічога не разумеўшыя і нічога не вартыя. Тугоўскаму было брыдка глядзець на гэтае поўнае, мяккае цела, быццам нейкі цяльпук падстаўляў сябе пад сонца, і яшчэ больш брыдка, калі гэтая напалову голая пані надзявала на нос ларнет, каб прачытаць кнігу. Непадалёку ляжалі ў крэслах яе дзеці — прыгожыя дзяўчаты з доўгімі косамі і сын-студэнт у белым касцюме. Тугоўскі не мог вытрымаць гэтага малюнку, напоўненага вясёлымі сонечнымі фарбамі, сваім задаваленнем жыцця. Ён з напружаннем цягнуў тачку з глінай, ледзь піхаючы яе на гару, валіўся пад непасільнай працай у той час, як хтосьці смяяўся, хтосьці паўнеў, жывучы з яго працы і поту. Хіба гэта не рабства? Калі раней людзі павінны былі працаваць на пана па прымусе, «на прыгоне», дык цяпер яны працуюць добраахвотна, але ўсё роўна грошы пана робяць іх рабамі! Сапраўды, правідлова: рабства на свеце не мяняецца, мяняюцца толькі яго формы.

Тугоўскі быў і застаўся рабом. Ён нічым не лепшы за тых, якія былі прыкаваны жалезам да тачак і пад пякучым сонцам вазілі іх на гару. Не, ён не мог вытрымаць працы ў гэты сумны дзень. Усё яго калола: і сонца, і смех сям’і інжынера побач з смерцю яго сябра, побач з яго потам, працай, і нават спакой сяброў-работнікаў прыгнятаў яго.

У палудзень ён пайшоў да інжынера прасіць на паўдня водпуску пахаваць свайго сябра. Падышоў да шыкоўнай вілы



інжынера, агорнутай яблынямі, падняўся на ганак і пазваніў. Адчыніла тая самая прыгожая дама, што прымала сонечныя ванны, але цяпер ужо ў чырвоным лёгкім халаце. Яна змерыла Тугоўскага з ног да галавы і сярдзіта запытала:

— Co se přejete[1]?

Тугоўскі пакорна зняў свой капялюш і трымаў пад час размовы ў руках, комчачы яго ад хвалявання. Дама ўзяла ад Тугоўскага запіску, працадзіўшы праз зубы:

— Peckejte[2], — сярдзіта ляснула дзвярыма перад самым яго носам.

«Вось як, — успыхнуў Тугоўскі, — нават у калідор не ўпусціла. Яна, напэўна, не ведае, што я — студэнт». Тут жа падумаў, стоячы на ганку, што сам вучыўся на інжынера, што яму ўжо няшмат заставалася часу, каб прыбіць на сваіх дзвярах такую самую таблічку: «Інжынер».

А між тым, ён адмовіўся ад гэтага сам, і вось яго выкідваюць за дзверы, як смярдзючага і бруднага. Цяпер ён зразумеў, што ўсё ж ткі адзіны выхад — самаму стаць інжынерам. Што ён аддаў бы таму чалавеку, які зноў вярнуў бы яго на шлях навукі і адчыніў бы дзверы вышэйшай школы? Больш пакутаваць не было сілы. Калі звычайны работнік церпіць сваё становішча як сацыяльнае зло і прыміраецца з ім, дык у яго дамешваюцца яшчэ маральныя мукі. На кожным кроку ўспамінае, што ён былы студэнт. Калісьці ў яго былі надзеі, а зараз ён раб, і вастрыё сучаснага ладу накіравана якраз на яго. «Але, з другога боку, быць інжынерам — значыць, жыць вось так, як жыве гэты інжынер, — казаў яму нейкі сярдзіты голас. — Хіба ты мог бы так жыць?» — «Не, гэта не значыць яшчэ так жыць, — пярэчыў ён. — Можна быць інжынерам… Але як стаць?»

У гэты момант прыадчыніліся дзверы, запіску падала, прасунуўшы праз іх брудную руку, маладая кухарка. Тугоўскі пайшоў абражаны. Ён быў настолькі маленькай велічынёй, што яму запіску маглі падаць толькі праз кухарку. Смейся, Тугоўскі, над сваімі поспехамі.

Ён сумна ішоў дахаты. «Роджаныя пад Сатурнам…» — неслася ў яго галаве. І столькі няўдач, столькі адхілак ад шчаслівай дарогі, нічога не ўдаецца ў жыцці. Успомніў, дастаў з кішэні свае запіскі «Споведзь самагубцы. Кніга для ўсіх і ні для кога». Цяпер усё скончана. Цяпер ён [не] будзе больш

рабіць «перадышкі», пярэрвы, як рабіў калісьці раней. Цяпер [не] захоча жыць толькі для эксперымента… Скончана. Ён ведае, што такім людзям няма мейсца на зямлі. Ім не варта жыць, у іх няма мэты, для якой варта жыць. І рашуча пастанавіў у гэтую ноч застрэліцца.

Толькі дзе дастаць рэвальвер? Успомніў, што ў гэтай справе мог бы дапамагчы хто-небудзь у інтэрнаце, хутчэй усяго, Серада. Сапраўды, лоўкі Серада мог яму дастаць які-небудзь рэвальвер, якім усё ж ткі можна было б скончыць разрахубы з жыццём. З цвёрдым жаданнем пакончыць з сабой улез у трамвай, набіты людзямі, і забіўся ў кут на заднім пляцы, не жадаючы ў сваім брудным работніцкім касцюме выпаўзаць наперад. Яму таксама вельмі не хацелася спаткацца з кім-небудзь поглядамі, з кім-небудзь пачаць размову, як гэта любяць рабіць балбатлівыя чэхі. Трамвай праязджаў праз самыя рухлівыя і вялікія вуліцы. На адной з іх у вагон увайшла паненка. Народу done набілася столькі, што, нягледзячы на ўсе крыкі кандуктара прасунуцца далей, ніхто не мог зварухнуцца, паненка была прымушана застацца на заднім пляцы.

Тугоўскі выйшаў з роздуму толькі тады, калі паненка спынілася побач і стала да яго спіной. Ба! Ды гэта Вярхоўская! Ад такой неспадзяванай сустрэчы ён нават пачырванеў і рашыў рабіць выгляд, што яе не пазнае. Яны праехалі, як чужыя, некалькі прыпынкаў. Раптам на адным прыпынку трамвай рэзка затармазіў, яна не паспела ўхапіцца за скураную ручку і паляцела на Тугоўскага.

— Prominte[3]! — прамовіла яна па-чэшску і, усміхаючыся, глянула на таго, каго яна так недалікатна зачапіла. Што такое? Яна, здаецца, гатова была крыкнуць ад здзіўлення і стала, гледзячы на яго нерухомымі вачыма. Няўжо гэта Тугоўскі? Ці яна не абазнаецца? Ці не галюцынацыя гэта якая-небудзь? Не можа быць, каб гэта быў Тугоўскі. У такім страшэнным касцюме… Яна зноў павярнулася спіной, але праз хвіліну, не верачы сабе, зноў паглядзела на яго. Тугоўскі глядзеў у вакно трамвая, быццам яе не прыкмячаючы.

— Выбачайце, ці не грамадзянін Тугоўскі? — спытала яна па-беларуску.

Тугоўскі ўсміхнуўся:

— Пазналі ўсё ж ткі… Дабрыдзень.



— Дабрыдзень, — працягнула яна яму далікатную ручку ў рукавічцы.

Усе ў трамваі глянулі на іх з здзіўленнем.

— Як вы змяніліся! — прамовіла Вярхоўская, не звяртаючы ўвагі на погляды чэхаў.

— Прашу выбачэння за свой касцюм, — усміхнуўся Тугоўскі. — Працую ўсё.

— Працуеце? Несяце дабравольныя ахвяры? Вельмі добра!

— А вы адкуль?

— Я толькі што з могілак. Хавала айца Кірылу. Апошні друг, самы любімы наш сябар, здаецца, адзіны чалавек, які заслужыў аб’ектыўную пашану. Як сумна ўсё ж ткі, што ён памёр на чужыне, жахлівая ахвяра. Хай мёртвыя спакойна спяць, а мы будзем думаць аб нашым жыцці… Ага, успомніла. — Яна падняла сваю прыгожую ручку да галавы і прамовіла: — Добра, што я вас спаткала. Якраз зараз Тамашэвіч турбуецца аб тым, каб вас улаштаваць зноў на стыпендыю.

— Што вы?! — недаверліва пакруціў галавой Тугоўскі.

— Так, так. Ён вельмі шкадаваў, што вас не было на хаўтурах, ён хацеў з вамі вельмі сур’ёзна перагутарыць. Справа ў тым, што ў Прагу наехала шмат новых нашых эмігрантаў — зялёнай моладзі, і нашыя старэйшыя грамадзяне — былыя міністры ўрада БНР — узяліся іх улаштоўваць на ўкраінскую і часткова чэшскую стыпендыю[4]. Сродкі ёсць, цяпер толькі не трэба спаць.

— Я пэўны, што да шчаслівіцаў не належу, — іранічна зазначыў Тугоўскі.

— Не, не. Тамашэвіч якраз запэўніў, што вам стыпендыя будзе. Вось што… Калі хочаце мець стыпендыю, заўтра зранння ідзіце на кватэру да міністра і абавязкова з ім перагутарце. Заўтра паседжанне Беларускага камітэта[5], дзе будуць разглядацца ўсе заявы. Ведаеце, дзе ён жыве, ці не? Я вам напішу. — Яна хутка выбрала з партфеля блакнот, хутка напісала ў ім адрас і хутка, падаўшы яму руку, выскачыла на першым прыпынку. Тугоўскі застаўся ледзь не з расчыненым ротам. Усё гэта было так нечакана, так хутка.

Ён усміхнуўся. «Быццам насмешка чыясьці нада мной, — падумаў. — Трэба камусьці падаслаць яе з надзеяй на стыпен-

дыю, калі я думаў якраз аб рэвальверы. Чым горш, тым лепш. І так заўсёды ў жыцці. Як толькі, здаецца, зусім гінеш і няма выхаду, глядзіш — які-небудзь выхад і знаходзіцца. Хаця, можа быць, гэта толькі чыясьці насмешка — і тое, што адчыняецца, зусім не шчасце, а толькі прывід яго. Можа быць, сапраўды, як у адной беларускай п'есе: "У іншым шчасці — няшчасце схавана"».[6]

Не. Скончана. Сёння ўначы застрэліцца. Ён больш не будзе рабіць глупства, як рабіў калісьці, і, паслухаўшы Кірылу, жыў. Што стала з яго жыццём? Ці магло яно звацца жыццём? Ён ехаў і думаў аб тупіку жыцця.

А ў гэты час нейкі Мефістофель дражніў яго, як бяссільнага старога Фаўста, прыгожым вобразам Маргарыты-Вярхоўскай. Мілая, вясёлая жанчына. Колькі жыцця ў ёй, яно б'е крыніцай. І як спяшалася яна паведаміць яму — і дапамагчы, чым магла. Урэшце, яна не такая дрэнная, як здалося яму пасля таго выпадку, яна вельмі сардэчная асоба — не пасаромелася падаць яму руку нават зараз, калі ён сапраўды выглядаў як бадзяга. Няўжо ж ён застрэліцца, не выкарыстаўшы тых надзей, якія яна адчыняла яму, няўжо ён будзе легкадумам і не выкарыстае ўсіх магчымасцяў у жыцці да канца?

Пачаў думаць, што б магло быць пасля яго смерці… Здаецца, на свеце нічога не змянілася б. Таксама людзі смяяліся б, плакалі, таксама адны ашуквалі другіх, таксама ляцелі б па вуліцы фурманы і трамваі, таксама сядзелі б у садах на лавах закаханыя пары, шапталіся аб вечным каханні… Усё заставалася б, як цяпер, бо Тугоўскі быў маленькім, нікому непатрэбным вінцікам велізарнай машыны, і калі ён вываліўся — машына прадаўжала ісці сваім ходам, нават не ведаючы, ці быў такі вінцік. Як смешна! Застрэліцца! Страляюцца ці наогул канчаюць самагубствам з мэтай, каб зрабіць сваёй смерцю нешта жахотнае, нейкую дэманстрацыю, спадзеючыся, можа, хоць пасля смерці знайсці спачуванне таго, каторы быў студзёным і жорсткім пры жыцці. А які ж пратэст мог ён зрабіць сваім стрэлам у сэрца? Пратэст проціў таго, што ён маленькі, непатрэбны вінцік велізарнай машыны? Пратэставаць проціў гэтага было б смешна. Ці, можа быць, пратэставаць проціў усяго сусвету, проціў таго капіталістычнага ладу, які накіраваў на яго свой цяжар і цісне яго, як прэс, выціскаючы пот? Ізноў



смешна было б пратэставаць проціў сцяны толькі таму, што яе няможна разбіць лобам. Нарэшце, можна страляць колькі заўгодна разоў у грудзі, а сцяна як стаяла, так і будзе стаяць. Чаго ж ён дасягне тады сваім стрэлам? Можа быць, узбудзіцца грамадзянства? На першых часах — зразумела, але потым скажуць: «Ах, дурны Тугоўскі, і сапраўды, відаць было, што з яго нічога добрага не выйдзе». Яшчэ які-небудзь насмешнік толькі пасмяецца над яго трупам. Не… Застрэліцца не шутка. Гэта ніколі не позна. Але вось выжыць, паказаць на здзіўленне ўсіх, што і пры цяжкіх абставінах Тугоўскі выжыў, што ўсё ж ён можа быць прадметам людской павагі — вось гэта было б геройствам. Пакута навучыла яго, што трэба жыць так, каб людзі зайздросцілі, а не шкадавалі. Так! Да ўсіх чартоў з самагубствам! Ён выхапіў свой сшытак «Споведзь самагубцы. Кніга для ўсіх і ні для кога», сшытак, які ён насіў пры сабе заўсёды, як запісную кніжку, і ужо зрабіў некалькі рухаў рукамі, каб парваць яго на дробныя кавалкі, як зноў спыніўся. Нейкая думка ўкалола яго: «Але ж няма выхаду… А што, калі надзеі Вярхоўскай на стыпендыю былі толькі балотнымі агнямі?.. Тады зноў застаецца цагельня. І так да смерці павінен буду застацца работнікам!» Ён зноў схаваў свой сшытак у кішэню. І сумна думаў аб тым, што няма выхаду.

## III

Міністр Случанін[7], былы міравы суддзя, герой тамтэйшага Слуцкага паўстання, быў вельмі падобны да Сабакевіча. Ці паядаў яго літаратурны сабрат ледзь не цэлы бок барана адразу, невядома, але памераў ён быў настолькі велізарных, што выклікаў здзіўленне. Здавалася, з такой велізарнай грудной клеткі, як у яго, павінен быў вырвацца голас, што з ерыхонскай трубы, ад якога павінны валіцца сцены і ў страху дрыжаць людзі. А між тым, калі на пяцігодках усвяткавання памяці абвяшчэння незалежнай Беларусі выступіў з дакладам аб Слуцкім паўстанні, апавядаючы, колькі было ў паўстанцаў кулямётаў, колькі стрэльбаў, колькі жаўнераў, — ён казаў такім нявінным тоненькім дыскантам, што ўсім стала смешна. «І як такога мядзведзя, — усміхаўся Тугоўскі, — ні адна куля не зачапіла».

Што было не менш дзіўна і прымушала Тугоўскага заўсёды смяяцца ў душы, гэта тое, што ў гэтага мядзведзя была вельмі прыгожая і досыць маладая жонка, таленавітая артыстка і арганізатарша беларускіх тэатраў. Як яна жыла з такім мужам, як ёй было сорамна праходзіць з ім разам на якіх-небудзь балях ці дакладах паміж цікаўнага натоўпу і як магла проста сужыцца з ім, як яна магла дастаць хоць бы пацалаваць яго, гэта было загадкай для ўсіх. Тут можна было даваць поўную волю сваёй фантазіі. Тугоўскі ўсё ж ткі на другі дзень ішоў да знакамітай гістарычнай асобы, вырашыўшы, што трэба яшчэ спрабаваць усе магчымасці.

Праходзіў праз шумны горад, глядзеў на балбатлівых і сварлівых чэшскіх гандлёвак, праходзіў праз самыя рухлівыя гандлёвыя рады ў Старой Празе і дзівіўся, што міністр забраўся ў такую глушу, пачуўшы сімпатыі да чэшскага гандлю. Увайшоў у нейкі драўляны дом, драбіна якога была, напэўна, зроблена яшчэ да часоў Аўстрыі і трашчэла, так жалячыся на свой лёс, што ў чалавека мімаволі паўзлі мурашкі па целе. Тугоўскі падняўся ў нейкую кватэру, дзе ўсе дзверы былі адчынены, пакуль нарэшце не наткнуўся на саму жонку міністра. Яна не ведала Тугоўскага і з стрыманай гордасцю, праз якую прабіваліся турботы, прамовіла:

— Вы да нас? Выбачайце. Адну хвіліну…

Тугоўскі стаяў у калідоры і бачыў у дзверы, як яна выносіла нейкую бялізну, розныя рэчы, прыводзячы пакой у парадак. Нарэшце адчыніла дзверы і больш ласкава запрасіла:

— Калі ласка, заходзьце.

Пакой быў вялікі, у поўным ранішнім беспарадку. Герой слуцкі ляжаў у пасцелі бясформеннай велізарнай масай і пільна глядзеў на ўвайшоўшага.

— Калі ласка, сядайце, — прамовіў ён, паказваючы валасатай рукой на крэсла. — Што скажаце?

Прыгожая жонка яшчэ ў начным капоце села на крэсла пад вакном і стала слухаць.

Тугоўскі расказаў сваю гісторыю як мага больш жаласна.

— Вы даўно ў Празе? — спытаў міністр сваім дыскантам праз хвіліну паўзы.

— Ужо тры гады…



— Тры гады?! О, вы тады маеце прва на стыпендыю ў першую чаргу. Тады ідзіце ў Беларускую грамаду, там зараз пачнецца паседжанне, і я там буду праз паўгадзіны.

Аўдыенцыя скончылася. Тугоўскі ўстаў, падаў руку міністру, прычым той так павярнуўся, што пасцель трэснула і ледзь не разваліласе пад ім, падышоў да ручкі жонкі і весела выйшаў з пакою.

«Герой Случанін не хоча браць на сябе ўсёй адказнасці, — усміхнуўся Тугоўскі. — Незнаёмы я з ім, але паглядзім, што будзе далей».

Ён прайшоў у памяшканне Беларускай грамады. Там ужо сабраліся ўсе прадстаўнікі Рады рэспублікі разам з прадстаўнікамі ад студэнтаў. Былы міністр Заяц[8] з маленькай казлінай бародкай гутарыў аб нечым з былым старшынёй, які ўвесь час пагладжваў сваю даўгую сівую бараду. Адзін з студэнтаў падышоў да гутарыўшых і далажыў аб Тугоўскім і яго просьбе атрымаць стыпендыю. Заяц зараз жа выйшаў у другі пакой і падаў руку Тугоўскаму. Той адрэкамендаваўся.

— Як ваша прозвішча? — гучна перапытаў Заяц. — Тугоўскі? Гм… у вас такое дзіўнае прозвішча?

— Не ведаю, — усміхнуўся Тугоўскі.

— Тугоўскі… Гм… У вас, напэўна, часта туга бывае, дзеля таго і прозвішча такое. — Ён кашлянуў, дастаў з кішэні сіненькую баначку, не спяшаючыся адвінціў накрыўку і плюнуў. Тугоўскі паморшчыўся, бо Заяц рабіў гэтую працэдуру перад самым яго тварам. Былы міністр гэтак жа спакойна завінціў накрыўку, спакойна паклаў у кішэню і спакойна папытаў Тугоўскага:

— А чаму ад вас аднялі стыпендыю?

— У мяне не аднялі, я сам адмовіўся.

— Ах, самі адмовіліся, — зрабіў Заяц вялікія, артыстычныя вочы. — Вось як… А цяпер зноў жадаеце. Ну ведаеце, так мы не можам. Вы будзеце адмаўляцца, потым зноў прасіць, потым зноў адмаўляцца. Не… Мы не можам. Стыпендыя не футбольны мячык. Не. Не.

У гэты момант увайшоў, пыхкаючы, як паравоз-машына, міністр Случанін:

— У чым справа? — спытаў на хаду. Ён узяў Зайца пад руку і знік з ім у другім пакоі. Тугоўскі застаўся адзін чакаць выра-

шэння свайго лёсу. Ён чуў, як там шумелі і спрачаліся. Чуў, як прадстаўнік студэнтаў прамовіў: «Паэт…» Спрэчкі замоўклі. Нарэшце выйшаў, пагладжваючы сваю бараду, Крэчэўскі[9] і, усміхаючыся, запытаў:

— Вы паэт? Пішаце вершы?

— Не… Нічога не пішу.

— Прыходзьце заўтра да мяне на кватэру, пагутарым аб выданні новага беларускага часопіса ў Празе[10].

— Выбачайце. Я не маю часу, — зазначыў Тугоўскі. — Я не магу так вольна разгульваць, бо ў мяне заўтра праца. Я прашу вас вырашыць мой лёс ці ў той, ці ў іншы бок. Я павінен мець адказ сёння.

— Гэтую справу я думаю як-небудзь улаштаваць, — пагладжваў сваю бараду Крэчэўскі. — Вы маглі б зарабіць больш, чым на вашай цагельні, супрацоўнічаючы ў «Славянскай кнізе»[11]. «Славянская кніга» — бібліяграфічны часопіс на рускай мове, вельмі добра аплачвае працу. Я там маю беларускі аддзел. Збірайце бібліяграфічныя весткі і прыносьце да мяне.

— Не ведаю, магчыма, у будучым, а што будзе са мной? — спытаў Тугоўскі.

— Прыходзьце заўтра, усё роўна сёння на паседжаннях мы нічога не вырашым. Дык заўтра.

Ён, усміхаючыся, працягнуў яму руку і крэпка пацiснуў.

Крэчэўскі жыў, як і міністр Случанін, каля рынку, хоць з другой часткі, недалёка ад знакамітай чэшскай рэстарацыі і гатэля «Барандаў». У раскошных залах гэтага гатэля часта прымалі прыязджаўшых у Прагу беларускіх гасцей.

Каб трапіць у пакой Крэчэўскага, трэба было прайсці праз хату нейкага эмігранта з усходнім тварам — армяніна ці грузіна, які дакладваў аб наведвальніку. Пакой Крэчэўскага быў вельмі дэмакратычны, зусім не падобны да міністэрскага. На ўсіх крэслах, пасцелі, сталах ляжалі велізарныя кіпы газет і часопісаў, болей усяго «Савецкай Беларусі». Тутсама на маленькай плітцы яго жонка пякла бліны. Стары сядзеў за кіпай газет і чытаў ці пісаў вершы пад трэскат пліты. Гледзячы на гэты пакой, на згорбленага аслабелага старога, Тугоўскі яшчэ раз успомніў: «Гэта хутчэй Афанасій Іванавіч Таўстагуб[12], чым тварэц усёй палітычнай беларускай справы ў Празе».



— Ну, магу вас прывітаць, — казаў ён, паціскаючы руку, — стыпендыі мы вам дабіліся. Цяпер толькі трымайцеся. Вам, магчыма, было б лепей на філасофію, але мы змаглі вас улаштаваць толькі на тэхніку, як і было раней.

Бабулька таксама трэсла яго руку, нягледзячы на тое, што ў гэты час бліны гарэлі на пліце. Тугоўскі глядзеў на яе ледзь не са слязамі на вачох, думаў: «Мілая, мілая Пульхерыя Іванаўна…»[13]

На радасцях яна нават пачаставала яго блінам, начыненым тварагом. І ён з’еў яго з такім апетытам, быццам быў некалькі дзён галодным. Размова перайшла на пражскую беларускую калонію.

— Чаму наша беларуская моладзь ледзь не ўся пачынае хварэць туберкулёзам? — запытаў стары і сам жа сабе адказаў: — Таму што наша моладзь вядзе неправідловае жыццё. Я вас запэўніваю: каб наша моладзь рэгулярна і нармальна ела бы палудзень — ніякага туберкулёзу не было б.

— Хто ведае, — адказаў Тугоўскі, не жадаючы зусім згадзіцца. І ўсё ж ткі часткова Крэчэўскі меў рацыю.

— Я ўжо стары стаў, — прадаўжаў ён праз хвіліну, — цяпер, можа, ужо не патрэбны нікому, але я ведаю больш і бачыў больш, чым гэта зялёная моладзь, якая мяне лае. Мяне лаюць, ведаеце вы гэта, бо і ў нас, беларусаў, згуртаваўся камуністычны гурток моладзі — камсамол. І яны лаюць.

— Ды што на іх звяртаць увагі, — зазначыў Тугоўскі. — Старога льва і асёл хоча пабіць капытом.

Крэчэўскі не звярнуў увагі на гэтыя словы і упэўнена сказаў:

— Але мы яшчэ будзем змагацца.

Вочы яго заблішчэлі. Мяккія рысы шырокага твару сталі больш рэзкімі і грубымі. Гэта ўжо не быў стары Афанасій Іванавіч. Гэта ізноў быў палітык, былы старшыня Беларускай Народнай Рэспублікі, як барадаты Майсей — правадыр свайго народу.

Ён падняўся з крэсла, стаў чытаць вершы, гатовыя палітычныя агляды, дакументы і матэрыялы для новага часопіса[14]. Ён памаладзеў. Вочы ў яго гарэлі фасфарыстычным блескам. Мімаволі зацягваў Тугоўскага ў свае палітычныя сеткі, хоць той стараўся знайсці яшчэ пункты апоры, каб не

быць злоўленым. Затрымаў Тугоўскага да цёмнага і пачаставаў гарбатай на развітанне. Тут ён зноў быў ціхім, дабрадушным Афанасіем Іванавічам, быццам між іншым стаў прасіць Тугоўскага стаць карэктарам новага часопіса. Як ні была прыемнай такая прыпазыка Тугоўскаму, ён ад яе адмовіўся: у яго зараз будзе шмат працы з навукай. Але, адыходзячы ад добрых і мілых старых, Тугоўскі не чуў пад нагамі зямлі. Першы раз у сваім жыцці пазнаў, што ён камусьці патрэбны. І гэта свядомасць сваёй патрэбнасці, гэта адсутнасць думкі «лішняга чалавека»[15] напаўняла яго сілай і верай.

## IV

Рака часу плыла безупынна. Усё мянялася: пад вечар, як казаў адзін філосаф, няможна было выкупацца ў той самай рацэ, у якой купаўся зрання. Беларуская грамада, у якую ўступіў калісьці Тугоўскі, не была падобная да той Грамады, якую ён пабачыў цяпер, калі яго зноў прынялі на стыпендыю. Усё змянілася. Шмат сяброў ужо не мог палічыць: «Адных ужо крыюць курганы-магілы, другія сасланы за краты ў турму». Усё ж ткі знайшліся і сярод знаёмых адзінкі, якія, пакорныя нейкаму маладому запалу, пакідалі свае факультэты і ехалі на палітычную працу па беларускіх вёсках і мястох. Некаторым з іх заставаліся ўсяго некалькі месяцаў да таго, каб атрымаць дыплом доктара ці інжынера, некаторыя толькі ўступалі ў жыццё. Маладыя, яшчэ не паспеўшыя аперыцца птушаняты, але яны ішлі, пакорныя голасу свайго сумлення, ішлі і гінулі ў турмах за кратамі.

Беларускі рух не стаў настолькі шырокім і моцным, каб з ім лічыліся, як з вялікім культурным з'явішчам. Яшчэ трэба несці шмат мук, трэба праліць нямала крыві, каб нарэшце рух стаў не толькі «крамолай», не толькі «бунтам» незадаволеных галодных мас, але каб ён стаў моцным і глыбокім, як само жыццё, як патрэба жыць і дыхаць, каб ён атрымаў усясветную сімпатыю.

Толькі кроў, гэта неўміручае каханне, можа выклікаць сімпатыю людзей; толькі ахвяры могуць прыняць вянок перамогі, і толькі жывыя людскія ахвяры могуць прымусіць схіліць галаву самых заўзятых ворагаў. Болей ахвяр! І яны



неслі ахвяры, гэтыя маладыя беларускія рыцары, гэтыя бяздумныя гладыятары, не шкадаваўшыя свайго жыцця. Яны гінулі ў турмах і ўміралі ў турэмных шпіталях як арыштанты.

Трывожныя весткі ішлі з Бацькаўшчыны. Стала ведама, што памёр адзін з самых маладых і надзейных сяброў Грамады […][16]. Тугоўскі добра ведаў яго. Ён памятаў, што гэты юнак, яшчэ нават дзіця, нядоўга гутарыў аб сваіх медыцынскіх марах, яшчэ нядаўна гарэў жыццём і блішчэў пенснэ сваіх блізарукіх вачэй.

Юнак, надзея беларускага медыцынскага гуртка, стаў палітычным вязнем, памёр у турэмным халаце на дошках. Трагічны лёс. Сэрца Тугоўскага міжволі спачувала ўсім гінуўшым за грамадскую справу, і вусны мімаволі шапталі ім апошняе прывітанне: «Героі!»

Гінулі ластаўкі, захопленыя зімой на Бацькаўшчыне, а ў той самы час у Празе ішла ўнутраная барацьба. Людзі падзяліліся на розныя гурткі і партыі: марксісцкі гуртох, заграні́чны камітэт партыі эсэраў, з'явіліся клерыкалы і нават манархісты. Справа даходзіла часам да таго, што спрэчкі канчаліся фізічнай бойкай і судамі гонару. Кожная партыя хацела зацягнуць да сябе Тугоўскага. Цяпер, калі справа залежыць ад аднаго ці двух галасоў, Тугоўскі стаў раптам усім патрэбным. Але Тугоўскаму было цесна ў рамках адной партыі. Ён думаў шырэй, ён думаў, што зараз можа быць толькі адна беларуская партыя змагароў, і рашуча адмаўляўся ўступаць у якую бы то ні было. Сярод грамадзян пачалася бура, асабліва пасля таго, як стала вядома, што марксісцкі гурток выліўся ў камуністычную арганізацыю. Адзін з сяброў гуртка, лысы філосаф Дзягцяр[17], выступіў на свяце Кастрычніцкай рэвалюцыі ад імя беларускіх студэнтаў. Зразумела, што гэты Дзягцяр унёс лыжку дзёгцю ў бочку мёду агульнай беларускай справы.

У Студэнцкім доме зашумелі. Калі ўвайшоў Тугоўскі, па ўсёй залі былі раскіданы гурткі беларусаў, шумеўшых, моцна размахваючых рукамі. Дзягцяр, чырвоны, як мак, стаяў у групе з Тамашэвічам, Бураком, Малевічам і аб нечым голасна спрачаўся.

— Калі так, — пачуў толькі Тугоўскі, — дык я з вамі больш размаўляць не жадаю.

І, збляднеўшы, раптам павярнуўся і падышоў да Тугоўскага.

— Давайце з вамі пагутарым, — сказаў ён і адвёў Тугоўскага ўбок. — Я чуў, грамадзянін Тугоўскі, што вы сын работніка, што вы па сваёй філасофіі павінны ісці з намі, моладдзю з сялян і работнікаў, якая аб'ядналася ў марксісцкі гурток. Дык вось я хачу пачуць ад вас, як вы адносіцеся да гэтых апошніх падзей у Грамадзе.

— Бачыце, даражэнькі, — пачаў Тугоўскі, — вашага выступу ад імя ўсіх беларускіх студэнтаў я не адабраю. Вы не мелі права гэтага рабіць, калі на гэта вас ніхто не ўпаўнаважваў. Што датычыць адчынення марксісцкага гуртка, дык я думаю, што яго адчынілі зарана. А трэба было лепш адчыніць гурток беларусазнаўства, бо прыкмячаеце, грамадзянін Дзягцяр, што ў нашых студэнтаў штодзённай мовай робіцца расейская і яны ўсё больш і больш расчароўваюцца вашым палітыканствам, адсюль беларускай справай. Агулам я скажу: кожны імкнецца да таго, каб правесці толькі свае асабістыя перакананні ў жыцці і не думае зусім аб цэлым.

— Добра, — адказаў у здзіўленні Дзягцяр. Ён не чакаў, што Тугоўскі ўступіць з ім у сур'ёзныя спрэчкі. — Разбяром, што ж гэта ёсць цэлае і ёсць камуністы…

— Грамадзянін Дзягцяр! — паклікалі яго ў гэты час сябрымарксісты на нейкую нараду, і ён пакінуў Тугоўскага аднаго сярод залі.

Тугоўскі стаяў і пільна глядзеў услед гэтым маладым сілам, якія растуць дзеля таго, каб нішчыць сучасны лад. У іх было шмат нахабства, яны былі простыя, як сама вёска, яны былі дрэнна памыты, дрэнна прычасаны і дрэнна апрануты, і ўсё ж ткі ім не было як адмовіць у здольнасці і працавітасці ў дасягненні сваёй мэты. І можна было не спачуваць у іх імкненні да лепшай будучыні, да светлых ідэалаў, за палепшанне жыцця галодных мас — няхай хоць на паперы, а не ў жыцці. Але ім не можна было спачуваць за іх нахабства, грубасць, за тое, што ў іх усё было спрошчана, аголена, абарвана. Яны здаваліся Тугоўскаму тым, чым быў ён сам, пакуль не стаў чэшскім работнікам, пакуль не выпіў да дна горкую чарку пакуты. Ім, гэтым камсамольцам, трэба было б спачатку працярпець і тады зразумець, што шлях да вызвалення чалавека ляжыць праз яго духоўнае ўдасканаленне. Ім трэба было б самім спачатку вырасці культурна да буржуазіі, каб потым



быць яе ўласнай зброяй. Нішчыць і ламаць — вельмі лёгкая штука. Але каб што-небудзь стварыць, трэба культура. Цяпер гэта зразумеў Тугоўскі. Цяпер ён гатоў быў гутарыць аб гэтым з усімі і кожным.

Пакуль ён стаяў сярод Студэнцкага дому і думаў, да яго падышоў, як заўсёды ўсміхаючыся, Малевіч і пачаў на чысцейшай расейскай мове.

— Ты што? — запытаў Тугоўскі, — ужо забыўся гутарыць па-беларуску?

— Які патрыёт! Ха-ха! — засмяяўся Малевіч. — Усе вы, патрыёты, пасля свайго палітыканства кончыце там, дзе пачнеце. «Гутарыць па-руску»… — і ён, смеючыся, адышоў ад пабляднеўшага Тугоўскага.

«Якая бестыя, — падумаў Тугоўскі. — Ён яшчэ мае беларускую стыпендыю. Вось да чаго даводзяць спрэчкі сярод беларусаў. Вось вынік гэтай праклятай хваробы — "дыферэнцыяцыі". Што было б брудна і маўчала, цяпер як […] усплыло на паверхню». З цяжкім сэрцам выйшаў з Студэнцкага дому, рашыўшы прыходзіць сюды як мага радзей. Ён паабяцаў сабе быць далей ад гэтых спрэчак і палітычнай валтузні, каб мець свежую галаву і з усіх сілаў аддацца навуцы. І ўсё ж ткі думаў аб прыгожым вобразе тых, якія загінулі на Бацькаўшчыне, усім сэрцам спачуваючы іх геройству.

## V

Тугоўскі, не шкадуючы сябе, займаўся падрыхтоўкай да экзаменаў. Ён штодня сядзеў у садзе інтэрнату за якім-небудзь прадметам і так зацікаўліваўся ім, што большай часткаю запамятаваў аб полуднях. У садзе інтэрнату, у адведзеным студэнтам раёне, агароджаным дротам, дарога была пакрыта дробным каменем, толькі высокія ліпы давалі хараство і зелень. Сам сад пачынаўся за дротам, там прыгажэлі кусты ружаў, клумбы, там цвілі яблыні. Там, за дротам, была сапраўдная прырода. Там у гарачыя летнія дні можна было лёгка схавацца дзе-небудзь пад ліпай. Навокал саду хадзілі сляпцы, часам падыходзілі да дроту і, згубіўшы арыентацыю, блудзілі, каб выйсці на дарогу. Выгляд гэтых няшчасных людзей заўсёды прымушаў Тугоўскага адварочвацца ад іх і пільней працаваць.

У адзін прыгожы летні дзень, калі так голасна чырыкалі птушкі над ліпай і так звонка звінелі цвіркуны ў густой траве, вельмі лёгка ішла праца над самым цяжкім спецыяльным прадметам. Ён лёгка выводзіў матэматычныя формулы, лёгка разумеў канструкцыі розных інструментаў і так задаволена самім сабой перагортваў старонку за старонкай падручніка, што не заўважыў, як прасядзеў да поўдня. Раптам яго нешта кальнула ў левую палову грудзей настолькі моцна, што ледзь не крыкнуў ад болю. Ён крыху расшпіліў касцюм і пабялеў ад жаху: усе грудзі яго былі пакрыты велізарнымі ружовымі і чырвонымі плямамі. Што гэта магло быць? Безумоўна, сіфіліс у другой стадыі. Ён успомніў, як бачыў у кіно такое самае здарэнне з адной дзяўчынай, успомніў, як бачыў у кніжцы аб гэтых хваробах фатаграфію юнака ўва ўвесь рост, пакрытага з ног да галавы жахлівымі і страшнымі плямамі. І яму стала ясна, што той вясёлы стары лекар, які так пацешыў яго, аднёсся да яго вельмі легкаважна і не зразумеў самой хваробы. Цяпер ён павінен будзе расплаціцца за яго дыягназ сваім жыццём. Як жахліва! Другая стадыя не так лёгка паддаецца лячэнню, і невядома, ці чалавек будзе далей жыць і развівацца, ці яго навекі загубяць націранні скуры жывым серабром. Ён загінуў, цяпер ён назаўсёды загінуў. Яго кінула ў студзёны пот. Каму прызнацца ў тым, што нажыў сабе хваробу толькі дзеля распусты, толькі дзеля свайго няўмення жыць? У яго пачыналі дрыжэць рукі і ногі. Ён схапіў тоўсты падручнік, ускочыў у інтэрнат і, дзівуючы ўсіх, як непрытомны, з голай галавой паляцеў у Прагу шукаць добрага доктара. На жаль, усе дактары прымалі цяпер толькі з паўдня, бо ранішні прыём быў прапушчаны — і самым раннім быў прыём у дзве гадзіны. Ён чуў, як жахліва часаліся яму грудзі, на тым месцы маляваў сабе жахлівыя раны, прагрызеныя бацыламі. Нарэшце, дачакаўся жаданай хвіліны, з замерлым сэрцам увайшоў да доктара. Малады асістэнт знакамітага доктара акінуў яго пільным поглядам і папрасіў прысесці. Відаць было, што ўзрадаваўся прыходу Тугоўскага, бо пацыентаў у прыёмнай не было, і, напэўна, яго задаволіла б, каб у Тугоўскага была хвароба.

— Скажыце, доктар, — пачаў Тугоўскі трывожна, — як з'яўляецца другая стадыя сіфілісу?

— Другая стадыя? З'яўляюцца цёмныя каштанавыя плямы па баках, пад мышкамі і на руках.



— А вось скажыце, што гэта за хвароба? — Ён паказаў свае грудзі і сам з цікавасцю глядзеў на іх. Думаў: можа, на яго шчасце, плямы ўжо прапалі. Але плямы, ружовыя і чырвоныя, красаваліся на грудзёх, толькі ў меншым ліку і менш яскрава.

— Вось гэта? — здзівіўся доктар і пачаў пільна разглядаць плямы. Тугоўскі стаяў ні жывы, ні мёртвы, чакаючы, як засуджаны на смерць, свайго прыгавору.

— Ну, гэта не сіфіліс… Гэта проста так плямы, нічога небяспечнага не маючыя.

— Ад чаго яны з'яўляюцца? Яны свярбяць мне.

— Гэта ведаеце ад чаго? Ад нерваў. Вы студэнт? Так. Ну дык вось, колькі мне ні прыходзілася бачыць, дык у гэтых эмігрантаў-студэнтаў страшэнна расшатаныя нервы. Хочаце, нараблю вам гэтых плям па ўсяму целу? — Ён пачаў рукой рабіць плямы, і яны сапраўды былі вельмі падобныя да толькі што высыпаўшых. — Я вам магу напісаць цэлае прозвішча, — сказаў доктар і сапраўды нешта напісаў пазногцем на скуры. — Гэта не сіфіліс. І чаму вам улезла ў галаву, што ў вас можа быць другая стадыя? А першая стадыя ў вас была? У вас быў які-небудзь нарыў, які-небудзь прышч?

— Здаецца, нічога не было. Я быў у лекара, але ён нічога тады не знайшоў. Аднак у мяне пэўнасці няма.

— Ну, давайце паглядзім. — Ён пільна агледзеў Тугоўскага, потым нешта распаліў на спіртоўцы, дастаў нейкую іголку і, прамовіўшы: «Толькі не пужайцеся», падышоў і ўзяў на канец іголкі крыху эпітэлію. Потым доўга разглядаў гэтую пробу над мікраскопам. — Па-мойму, у вас нічога няма, — сказаў ён сумна, быццам не задаволены тым, што нічога не знайшоў. Але неасцярожна кінутае слова «па-мойму» зноў запоўніла Тугоўскага смуткам. «Па-мойму» — сведчыць аб недасканалым доследзе гэтага маладога доктара, а сапраўды могуць быць у яго жахлівыя бацылы. Дзе ж тады аб'ектыўная пэўнасць?

— А ўсё ж ткі баюся, доктар, — сумна-сумна ўсміхнуўся Тугоўскі. — Можа быць, я нашу ў сабе бацылы, толькі іх не ўдаецца знайсці?

— Ну, вы дарэмна так думаеце. Але калі вы так думаеце — можна зрабіць вам Васерманавы аналіз крыві.

— Во, калі ласка, — радасна ўчапіўся за гэтую думку Тугоўскі.

Доктар паклаў яго на аперацыйны стол, перавязаў руку вышэй локця, нацёр добра ватай з эфірам і потым усунуў у жылу іголку, падставіўшы пад яе прабірку. Чорная густая кроў плыла дарагімі кроплямі. Доктар нарэшце заляпіў рану пластырам і ўзяў прабірку. Усё было скончана.

— Праз чатыры дні будзе гатова, — сказаў доктар і наляпіў яго прозвішча на прабірку.

Тугоўскі выйшаў ад доктара няпэўны. З аднаго боку, здавалася, не павінна быць трывогі, але, з другога, чатыры дні яшчэ трэба чакаць, каб ведаць свой лёс. Хто ведае, чым можа скончыцца ўся гэта гісторыя. І чаму ён ішоў за той паненкай у рэстаран? Як дзіка, як жахліва… Згубіў сваю нявіннасць і навекі згубіў сваё здароўе. Як трагічна… Загінуў не ў імя вялікіх ідэй, дзе-небудзь у турме, у барацьбе, як тыя героі-беларусы, аб якіх несліся чуткі з Бацькаўшчыны, а як брудны чарвяк у памыйнай яме жыцця. Ах, смейся, паяц, над каханнем Тугоўскага!

Цяпер чатыры дні ён будзе вісець над прорвай, чатыры дні ён не зможа думаць ні аб чым іншым, як аб тым цёмным дне, куды можа зваліцца.

Сумна і нічога не заўважаючы навокал сябе ён ішоў па вуліцах Прагі. Непрыкметна выйшаў на бераг Влтавы. Купальны сезон быў у самым разгары. На вялікім паўвостраве пад назвай Цэсарска лоўка знаходзіўся шумны пляж, на якім грэліся на сонцы разам мужчыны і жанчыны ў купальных касцюмах. Дзесьці ўдалечыні чуліся гукі патэфону і хлопалі адчыняемыя бутэлькі піва і ліманаду. Усё клікала да жыцця, усё было ахоплена радасцю жыцця і раскідвала навокал пырскі смеху.

«Хоць бы пайсці пасядзець на пляжы, пабачыць, як людзі жывуць», — падумаў Тугоўскі і пераехаў на лодцы на вясёлы паўвостраў. Не паспеў вылезці на бераг, як ужо нехта махаў яму рукой і клікаў па прозвішчы. Тугоўскі пазнаў Тамашэвіча. Чырвоны, загарэлы, прыгожы і малады з сваімі даўгімі кудрамі, ён выклікаў здзіўленне і зайздрасць Тугоўскага. Цела — гэта, як чытаў Тугоўскі ў кнізе аб венерычных хваробах, яднанне чыстаты і характва — было сапраўды прыгожае ў Тамашэвіча, а не такое, як у яго, пакрытае жахлівымі плямамі.



— Ну што, купацца прыйшоў? — весела спытаў Тамашэвіч, пацікаючы руку Тугоўскага.

— Не, хачу пагрэцца на сонцы і на людзей паглядзець.

— Добрая рэч… Ну, вітаю са стыпендыяй. Як жа цяпер, будзеш працаваць?

— Так. Цяпер трэба вярнуць загубленае.

— Ага… Памагла, напэўна, Маргарыта?

— Ды ну іх да ўсіх чартоў, гэтых Маргарыт, — махнуў рукой Тугоўскі, — дзеля іх толькі адно мучэнне і турботы.

— Ага… Значыць, перамог мой погляд. Значыць, ты становішся на грамадскі грунт. Вітаю.

Тугоўскі ведаў, што за апошнія часы Тамашэвіч змяніў сваё адносіны да яго, жадаючы зацягнуць яго ў загранічны камітэт партыі эсэраў. Дзеля гэтага ён стараўся гутарыць з ім па-сяброўску, прыносіў тоўсты часопіс камітэту і расейскі часопіс. Але Тугоўскі і не думаў паддавацца яго ўплывам.

— Маё заданне цяпер — пільна вучыцца, — прамовіў Тугоўскі.

— Ну, а што будзе з Маргарытай? Як я чуў, ты быў вельмі ў яе закаханы.

— Што было, то сплыло. Гэта няма чаго спамінаць.

— А ўжо ж, — засмяяўся Тамашэвіч. — Толькі вось цікава… Ага… Яшчэ ўспомніў. Навіны пра Загорскага ведаеш?

— …

— Цяпер ён іграе бадзяжным музыкантам па рэстаранах. Усё спамінае цябе моцным словам за тое, што ты выгнаў яго з інтэрнату.

— Спамінае, — засмяяўся Тугоўскі, — гэта вельмі добра.

— Так… Ён перажыў цэлую трагедыю. Адзін раз уначы сяджу я на адной станцыі ў Сміхаве. Гляджу, ідзе Загорскі з чамаданам. «Куды так?» — пытаю. — «Эх, разбіта маё жыццё і каханне. Чэшка мяне прагнала. Прыехаў яе брат-інжынер і зазначыў мне, што я павінен выбрацца падабру-пaздарову, адкуль прыйшоў, інакш падасць мяне ў суд за шантаж. Ну што ж, сабраў свае інструменты ды вось і еду. На тое мы эмігранты, каб раз’язджаць».

Тамашэвіч засмяяўся. Тугоўскі не мог схаваць свайго задавальнення і праз усмешку казаў:

— Так і трэба такім здраднікам…

— Так што ты зараз не маеш канкурэнта, і твая Маргарыта можа табе належаць цалкам, — засмяяўся Тамашэвіч.

— Я спаліў усё, чаму пакланяўся, — зазначыў Тугоўскі.

— А ўсё ж такі… Чаго не бывае. А вось яшчэ навіна… Між іншым, твая Маргарыта стала камсамолкай і запісалася ў марксісцкі гурток.

— Вярхоўская? — здзівіўся Тугоўскі. — Яна, дачка папа?

— А ўжо ж, — засмяяўся Тамашэвіч, — дачка папа — і камсамолка.

І ён, смеючыся, пакінуў Тугоўскага і пайшоў купацца. Тугоўскі глядзеў, як ён лёгка плыў па Влтаве, і думаў аб кінутай ім загадцы: дачка папа і камсамолка. Яна заставалася для яго маўклівым сфінксам, і ніякія, напэўна, сілы не маглі прымусіць яе раскрыць свае тайны. Устаў і, не чакаючы, пакуль Тамашэвіч вылезе з вады, пайшоў у самы цэнтр паўвострава, дзе гучаў патэфон і стаялі столікі з настаўленымі бутэлькамі. Хадзіць у вопратцы па пляжы было нязручна: ужо не адна жанчына касілася на яго, думаючы, што ён прыйшоў паглядзець на іх. Сеў за столік і папрасіў сабе бутэльку піва. У той самы час, як ён пачаў аглядаць навокал столікі, яго погляд спаткаўся з пільным поглядам знаёмай жанчыны: за суседнім сталом сядзела ў купальным касцюме Вярхоўская. Яна была як русалка, і яе чырвоная шапачка вельмі ішла да ружовага і поўнага твару. Мокры касцюм шчыльна аблягаў яе стройную фігуру і выдзяляў высокі бюст, ад усяго вобразу несла маладым шалам і моцным здароўем.

Тугоўскі ад нечаканасці пачырванеў і змяшаўся. Ён нават не адразу павітаўся з ёй. У яго не было ніякага жадання пераходзіць да яе за столік і пацешыць яе сваёй размовай. Але што было рабіць? Ён падышоў да яе.

— Вось так сустрэча, — прамовіла яна смеючыся, — а я даўно тут сачу за вамі. Я думала, вы не захочаце падысці…

— Што вы… Чаму б я не захацеў?

— Хто ведае, можа быць, вы яшчэ на мяне злуецеся? — Яна засмяялася. — Калі ласка.

Ён перанёс сваё піва і пачаставаў яе.

— Дазвольце наліць вам за нашу сустрэчу…

— Так, за вашы поспехі, за адраджэнне грамадзяніна Тугоўскага! — падняла яна шклянку.



Яны выпілі піва, задаволеныя і ўзбуджаныя ўзаемнымі наглядамі. Тугоўскі стараўся не глядзець на яе. Яму было крыху сорамна бачыць яе ў такім выглядзе, але як на злосць вочы яго мімаволі ўпіраліся ў яе прыгожы і высокі бюст. Ён нікуды не мог схаваць сваіх вачэй.

Яна сама прыкмячала гэту яго сарамлівасць, што прымушала яе чуць сябе няпэўнай.

— Пачакайце, — прамовіла яна нарэшце, — за намі пільнуюць. Крыху нязручна. Адну хвіліну — я апрануся.

Вярхоўская вярнулася ў капелюшу, у прыгожым летнім убранні, і яны пайшлі ўглыб паўвострава, удаль ад людзей па высокай і густой траве. Яна ішла блізка каля яго, і ён чуў яе пах, які ўзбуджаў яго, як тады, калі ён першы раз пакахаўся з ёй. Яна змяніла цяпер адносіны да яго, і па ўсім ён бачыў, што яна гатова была абаперціся аб яго руку і ісці блізка каля яго ўсю дарогу. Якая насмешка лёсу. Цяпер ён пачуў узаемнасць жанчыны, каторую калісьці кахаў, цяпер, калі ў яго з'явіўся сіфіліс у другой стадыі. Яна ішла як ахвяра, не ведаючы, каля якой жахлівай небяспекі ішла, на каго хацела абаперціся, да каго даткнуцца сваімі гарачымі вуснамі. Яму стала шкода яе. Ён быў бы злачынцам, яго можна было б па закону пасадзіць у турму, каб зараз ён даткнуўся да яе і перадаў ёй жахлівую пошасць.

Але яна ўзбуджала яго. Яна сама, быццам назло, вяла яго праз паўвостраў, далей і далей ад людзей — у поле, аблытваючы свядомасць сеткай граху. Яны выйшлі ў поле і селі на траву. Стала цямнець. Ён узяў яе мяккую руку, каб пагадаць, як раптам, быццам непрыкметна, яго рука слізганулася па ўсёй фігуры. Яму падалося, што гэта будзе груба і яна за гэта можа непрыемна адудзячыць яму, але яна не зварушылася. Ён схапіў яе стан і, як непрытомны, прыціснуў свой твар да яе пахучых валасоў.

— Што вы робіце? — шаптала яна, але не зварухнулася ні адным мускулам, яе рука пакорна ляжала ў яго руцэ, толькі яе рот сох і гарэлі вочы.

«Што сапраўды я раблю! Я злачынца, я арыштант, я заражу яе сіфілісам», — стукала калючымі малаткамі ў мазгу, але пасмы валасоў прыемна казыталі вуха. Ён, не памятаючы сябе, схапіў яе галаву, упіўся ў яе вусны гарачым даўгім пацалункам.

«Няхай, — стукала ў скроні, — заражу яе моднай хваробай. Усё роўна яна камсамолка… Гэта ёй узнагарода за яе буржуазнае паходжанне, за яе здраду з патрыцыем Загорскім». І ён доўга цалаваў яе твар, быццам жадаў ува ўсе месцы пацалункаў уліць кроплі жахлівага яду.

## VI

Тугоўскі не паказваўся ў Студэнцкім доме. Яму сорамна было паказацца на чужыя вочы, яго грызла безупынна сумленне, што ён заразіў Вярхоўскую. Думка аб тым, што калі-небудзь Вярхоўская пабачыць на сваім целе жахлівую прыкмету хваробы, не давала яму ні днём, ні ўночы спакою. Што ён нарабіў? І чаму, уласне, лёс, ці выпадак, ці пракляты Сатурн зрабіў так, што яна ўзбудзіла ў ім пачуццё ў той момант, калі ён быў хворы, што яна пачула да яго нейкі наплыў сімпатыі і каханне ў той момант, калі ён быў ахоплены новым росквітам хваробы? Ці не была зноў тут чыясьці злая і злачынная насмешка? Хаця якая насмешка? Такая самая насмешка, як тая сіла прыроды, што гоніць чамусьці матыля на вагонь і прымушае яго апаліць крыллі? Разумнага ў гэтым няма нічога, а між тым, гэта імкненне матыля, і яго спыніць бяссільна якая-небудзь логіка. Так сталася! Можа быць, не чуў бы ў сабе ён гэтай жахлівай хваробы, не меў бы крыху злосці на жанчын наогул, віноўніц мужчынскіх мук і хвароб, і не насі ў сабе помсты да яе, Вярхоўскай, як адзінай віноўніцы таго, што ён адважыўся ісці да начной дзяўчыны, — не быў бы такім смелым, грубым, і, магчыма, усё пайшло б інакш. Але так сталася: чыясьці рука і ўплывы нейкага Сатурна звілі іх шляхі разам і прывялі да трагічнай развязкі. Цяпер, здавалася, усё было скончана. Калі б выявілася, што Вярхоўская сапраўды захварэла, яму ў Празе заставацца больш няможна было б. Не толькі таму, што пачаліся б сцэны, слёзы, лаянка, нараканні, крыкі загубленай маладой жаночай душы, але і таму, што самы закон прывёў бы яго на турэмную лаву. Ён павінен быў бы ехаць як мага хутчэй. Яго стыпендыя і асвета была б закінута ўжо канчаткова і беспаваротна.

Але куды ён мог бы паехаць з свядомасцю таго, што ў Празе ён зрабіў вельмі брудную і ганебную авантурную справу, куды ён мог бы паехаць з бацыламі хваробы, што развівалася безупынна па ўсім целе? Дзе, на якой частцы зямной кулі ён мог бы пачаць новае жыццё? Тады ўжо, напэўна, яму заставалася б толькі скончыць сваё жыццё.

З такімі думамі ён хадзіў па ваколіцах Прагі, па садзе інтэрнату і нідзе не мог знайсці спакою. Адзін раз за Прагай, на мурах старой крэпасці Вышаграду, спаткаў ён беларускага студэнта Каруся[18].

— Ты як трапіў сюды? — спытаў той сваім моцным, як ерыхонская труба, голасам.

Пачалася размова. Мімаволі Тугоўскі, чые думкі былі заняты толькі сваёй хваробай і тым жахлівым становішчам, з якога, напэўна, дрэнная дарога, прызнаўся, што яму прыйдзецца страляцца.

— Страляцца? — здзівіўся Карусь. — І ў цябе сапраўды гэтая знакамітая хвароба ў другой стадыі?

— Так. Я думаю — сапраўды, хоць трэба будзе пачакаць яшчэ некалькі дзён да аканчальнага высвятлення справы…

— Гм… Слухай… Вось што… Чым так страляцца, дык лепш загінуць у імя якой-небудзь ідэі. Усё роўна гінуць, дык лепш гінуць так, каб цябе хоць успомнілі будучыя пакаленні. Слухай, дружа. — Ён паклаў сваю моцную і вялікую руку на плечы Тугоўскага і пільна пачаў глядзець у вочы. — У адной з суседніх з Чэхаславакіяй дзяржаў у мяне ёсць пэўныя людзі — загартаваныя ў барацьбе паўстанцы[19]. Табе давядзецца нелегальна перайсці граніцу і наладзіць з імі сувязь і сетку паўстанцкай арганізацыі… Калі б мы маглі аднавіць ува ўсёй дзяржаве тэрор з дапамогай украінскіх арганізацый, мы маглі б сказаць, што зрабілі вялікую беларускую справу. Кроў чалавека мы пералілі б на алтар Бацькаўшчыны. А людская кроў ніколі не гіне дарэмна і на гістарычных вагах важыць вельмі шмат. Дык чым губляць сваё маладое жыццё бяссэнсава, лепш загубіць яго з карысцю для грамадзянства, у імя гісторыі. Праўду я кажу ці не?

Тугоўскі, каторы за ўсё жыццё і мухі не забіў, слухаў разважанні Каруся аб тэроры зусім сур’ёзна, не бачачы ў іх нічога фантастычнага. Яму здавалася, што ўсё ж ткі ў словах Каруся ёсць логіка: замест таго, каб прыставіць дула рэвальвера да свайго чала, лепш прыставіць яго да чала ворага і ўжо

потым скончыць з сабой. Прыдаць свайму жыццю апошнюю і прыгожую вартасць.

— Праўду ты кажаш, — махнуў галавой Тугоўскі.

— Дай руку, — радасна прамовіў Карусь і пацiснуў яго руку сваім жалезным уціскам.

— Слухай, дружа: ад гэтага часу я цябе буду лічыць сваім і запішу ў сваю вайсковую арганізацыю. Толькі дысцыпліна: каб аб гэтым нікому ні слова, нават сваім бліжэйшым сябрам. Ні адзін беларус не павінен ведаць аб нашай арганізацыі, асабліва з гэтага інтэрнату. Згодзен?

Тугоўскі задумаўся. Пакуль справа не выходзіла за рамкі агульных слоў аб гісторыі, аб беларускіх ахвярах, усё было добра: ён разумеў, што так трэба было, што гэта было нават прыгожа. Але калі яму трэба было практычна ўвайсці ў нейкую тайную арганізацыю, ён пачуў нешта непрыемнае, арганічна яму няздатнае, быццам яго прымушалі спусціцца ў цёмны склеп, напоўнены трупамі.

— Не, пачакай, братка, — прамовіў Тугоўскі ў роздуму. — Я павінен пачакаць яшчэ некалькі дзён, пакуль атрымаю ад доктара канчатковую вестку аб сваёй хваробе. Толькі тады я магу ўступіць у тваю арганізацыю, бо так ісці на верную смерць я ўсё ж ткі не згодзен. Гэта вельмі пахне авантурай. — І, каб змякчыць сваё апошняе слова, ён усміхнуўся і дадаў: — Я ж страляць яшчэ не ўмею.

— Не ўмееш? — засмяяўся Карусь так, што па ўсім полі панесліся раскаты смеху. — А як жа ты думаў сябе застрэліць? Ну, гэта нічога. Будзеш прыходзіць да нас, мы цябе страляць навучым. — І праз хвіліну сур'ёзна зазначыў: — Слухай, дружа, я ўсё ж ткі буду цябе чакаць. Я сёння выдаў табе тайну аб існаванні нашай арганізацыі, а гэта, сам ведаеш, да чаго-небудзь цябе абавязвае. Пакуль што я ад цябе зараз не адстану. Дык дам тры дні на разважанне. Ну, пакуль што бывай, даражэнькі. — Ён пацiснуў руку Тугоўскага так, што ў таго хруснулі ў пальцах суставы.

Тугоўскі застаўся адзін на мурах старой крэпасці, з якой людзі ўнізе віднеліся маленькімі мурашкамі. Ён глядзеў уніз, і яму ўсё жыццё стала цяпер здавацца толькі маленькім мізэрным ломцікам. Быццам ён вельмі вырас над усімі і глядзеў на ўсё з вышыні птушынага палёту. Карусь напоўніў



яго такім нечаканым ідэалам, што ўвесь яго светапогляд, усё яго «я» раптам перавярнулася дагары нагамі. Ён прыдаў нечаканы змест яго жыццю, ён паклаў на Тугоўскага нават місію, вялікую гістарычную місію палітычнага змагара.

Што заставалася яму рабіць?

Праз некалькі дзён ён пачне гніць, і кавалкі яго цела будуць адвальвацца, значыць, ён павінен будзе прыняць якія-небудзь рашучыя меры. Гінуць — дык ужо сапраўды лепш так, як зазначыў Карусь. Вялікія палітычныя змагары сучаснай рэвалюцыі былі такімі смелымі таму, што былі хворыя гэтай самай моднай хваробай.

Але каб дапусціць, што ён зусім здаровы, ці не мог бы, правідловей, ці не павінен быў бы ён і тады стаць на той шлях, на які прапанаваў яму стаць Карусь?

Што такое быў ён, Пётра Тугоўскі, у велізарнай чашы жыцця? Адзінокая пясчынка, якая ляжала без усякага руху ў агульнай масе пяску. Адзінокі чалавек, не знайшоўшы свайго ўласнага шчасця. Разбітая маладосць, што прадвяшчала жахлівую, сумную і студзёную старасць. Студзёная вясна, у каторай замерзлі кветкі, пажоўклі лісты, як увосені, і ніколі не ўстануць да жыцця.

Сапраўды, што такое быў ён, Пётра Тугоўскі? Для чаго ж радзіўся ён? У імя чаго прыйшоў у гэты свет? У імя якой-небудзь мэты ці проста так сабе, як непатрэбнае пустазелле на полі? Ува ўсякім выпадку, ён не прыйшоў у свет, як іншыя: думаць аб сваёй гаспадарцы і аб сваіх агародах. Яму брыдкае гэтае людское імкненне разбагацець — накупіць болей зямлі, пабудаваць больш дамоў, на вокнах паставіць герані, павесіць клеткі з канарэйкамі і, шчасліваму, сытаму, хадзіць па пакоях і слухаць прыбой людскога гора, можа быць, паплакаць, можа быць, кагосьці пашкадаваць, камусьці працягнуць руку дапамогі. Ён усімі нервамі сваёй душы ненавідзеў гэтых сытых і задаволеных людзей, якімі бы здольнасцямі яны ні блішчэлі, і называў іх мяшчанамі.

Мяшчане — гэта самы брыдкі від чалавека, які нагадвае, што чалавек недалёка адышоў ад жывёлы. Тугоўскі не радзіўся для таго, каб хваліць гэты свет толькі таму, што ў яго быў белы хлеб. Ён не крычаў бы так, як крычаў гэты мешчанін у Харкаве пад час улады дабравольчаскай арміі, калі па

вуліцах вялі на расстрэл сотні людзей, не крычаў бы толькі таму, што ў яго з’явіўся кавалак булкі. Тугоўскі не ведаў, што такое ўласнасць, ніколі не імкнуўся да яе. Бацька яго не мог пакінуць яму ні пакою, ні якой-небудзь мэблі, ні якога-небудзь кавалачка агарода. Нічога не было ў жыцці ў Тугоўскага. Ён быў вольны, абсалютна вольны, па-евангельску, як птушка нябесная. І галоўнае, што ў яго не было ніякага жадання завесці сабе ўласны дом, шыкарную мэблю, добры аўтамабіль. Ён ненавідзеў усіх, хто думаў аб гэтым, асабліва тых, хто сам, заводзячы ўласныя дамы і мэблю, лічыў сябе пры гэтым рэвалюцыянерам і сацыялістам.

Словам, Тугоўскі быў, з пункту гледжання большасці людзей, дзівак, абсалютны нуль у практычных адносінах. Самая простая баба на рынку магла яго засмяяць і абдурыць.

Так, не для гаспадаркі прыйшоў у гэты свет Тугоўскі. Ён быў «лішні чалавек», нікому не патрэбны, ні для каго не цікавы, не для гэтага свету створаны. Яго пацягнула ў «вышэйшыя сферы», хапаць зоры з неба, але, на жаль, ён не радзіўся ў сям’і барона, яму, як на злосць, давялося штодня змагацца з чорным практычным жыццём, самому рабіцца практычным і вечна думаць аб кавалку хлеба. У гэтым было яго няшчасце. Ён бачыў, што дзеля яго непрактычнасці яму нічога не ўдаецца. Справа якая-небудзь, за якую ён браўся, гінула праз нейкі час праз яго кіраванне. Адсюль ён стварыў тэорыю, што яму нічога не ўдаецца, і на падставе гэтага паверыў астральнаму чалавеку, што радзіўся пад планетай, якая прыносіла няшчасці — пад Сатурнам.

А калі гэта ўсё так, дык што рабіць яму? Усе лішнія людзі канчалі жыццё самагубствам або шукалі якога-небудзь сэнсу жыцця. Знакаміты літаратурны бацька лішніх людзей Рудзін Тургенева, напрыклад, памёр ў Францыі на барыкадах. І чаму ж, нарэшце, яму, Тугоўскаму, лішняму чалавеку, не знайшоўшаму нідзе ўласнага шчасця, не аддаць свайго жыцця для шчасця іншых, для агульнага шчасця пакрыўджаных, абражаных і галодных мас? Што было ў яго жыцці такога, чым ён мог яшчэ даражыць? Сваё гняздо, дзе было б цёпла і міла, куды б ляцелі адусюль успаміны? Дык ён яго не меў з дзяцінства. Багацце заслужанае, імя, слава — назовы, аб якіх ён не меў ніякага паняцця.



Можа быць, ласкі жанчын? Можа быць, яны маглі яшчэ даць яму ў жыцці насалоды і радасці? Ах, гэтыя ласкі… Колькі ён імкнуўся да іх, як прагавіта раскрываў свае вусны, але кожны раз дарэмна! Аднойчы, толькі некалькі дзён назад, ён пакаштаваў гэты салодкі напітак — ласку, і вось якім горкім ён аказаўся! Словам, нічога ў яго жыцці не было такога, чаго ён мог чакаць, чым даражыць. І, можа быць, таму ён павінен, па Евангеллі, пастаяць «за другі свая»? Можа быць, у гэтым і ёсць сэнс, у імя якога прыйшоў ён у гэты свет? Можа быць, таму ён і створаны лішнім чалавекам, каб, не маючы пры сабе ні агароду, ні хаты, ні канарэйкі, з вольным сэрцам і з светлымі думкамі мог пайсці на смерць за тых, у каторых, як і ў яго, таксама няма ні агароду, ні свайго мейсца на свеце? Можа быць, тыя людзі, якія памерлі дзеля рэвалюцыі, былі таксама лішнімі?.. Можа быць, у тых людзей быў адзін прынцып, адно жаданне — увайсці ў жыццё, той самы ідэал, каторы абвясціў ён, Тугоўскі, у сваёй прамове на акце ў беларускай гімназіі.

Успаміны палезлі ў галаву. Успаміналася далёкая Бацькаўшчына, зялёны стол у паркетнай зале, залітыя святлом твары педагогаў і вучняў, музыка і бадзёрыя прамовы. Усё цяпер улівала яму сілы, усё давала яму веру ў тое, што нарэшце яго жыццё атрымае сэнс, ён здабудзе тое, аб чым з запалам зазначаў перад педагогамі і вучнямі…

На мурах Вышаграду сцямнела. Трэба было вярнуцца дахаты. Тугоўскі ішоў, чуючы, што на яго грудзёх гарэлі чырвоныя і ружовыя плямы. Што будзе з ім, сіфілітычным? Але ён ужо не баяўся: ён бачыў, што выхад знойдзены. У Празе ён быў ахоплены шумным жыццём, разбіўшым яго пэўнасці…

На момант яго зачапіла думка: ці хопіць у яго сілы, ён жа радзіўся пад Сатурнам? Будзе тое, што ён загубіць усю арганізацыю… Але праз хвіліну рашыў, што як бы там ні было, загіне ён сам, а не арганізацыя. Ува ўсякім выпадку, што б ні здарылася, які бы адказ не даў доктар, праз некалькі дзён ён зазначыць Карусю, што згодзен уступіць у яго арганізацыю.

# ЭПІЛОГ

I

Белым снегам пакрылася вуліца Залатой Прагі. Вулічныя ліхтары матавым блескам разлівалі сваё святло і здаваліся толькі светлымі плямамі ў крузе, заслаўшым усё неба. Адзінокія людзі стараліся хутчэй праляцець па вуліцах і знікнуць у спакойных мурах будынкаў. У гэты час на рагу вуліцы каля Народнага дому спыніліся два чалавекі: адзін быў вельмі высокі, голас яго гучэў раскатамі грому, другі больш нізкі і спакойны, і больш слухаў, чым гутарыў.

— Значыць, браце Тугоўскі, — зазначыў раскацісты голас, — заўтра спаткаемся на станцыі? Ты заедзеш у Падкарпацкую Русь, а там праз Карпаты і праз граніцу мы ўжо ўмовіліся… Вырашана?

— Так, цвёрда і беспаваротна, Карусь. — І большы паціснуў руку меншаму. Яны ўвайшлі, весела размаўляючы зусім не аб сваёй паездцы, у асветлены Народны дом. Там было поўна народу. Па ўсіх залах чуліся самыя розныя мовы, і самыя стракатыя вопраткі эмігрантаў спатыкала вока. Сёння ў Народным доме мелася адбыцца лекцыя расейскага прафесара Мілюкова[20] па нацыянальным пытанні ў Расеі, а пасля яе павінны былі пачацца дыскусіі. Па тых настроях, якія чуліся ў гуляўшай па залі таўпе, можна было чакаць, што дыскусіі будуць вельмі цікавыя.

У натоўпе бачылася нямала беларусаў. Старшыня Рады БНР Крэчэўскі насіўся па залі, патрасаючы сваёй біблейскай барадой. Міністры Заяц і Случанін з жонкай разгублена азіраліся па баках і сарамліва ўсміхаліся знаёмым. Вярхоўская гуляла ў натоўпе камсамольцаў, але вочы яе шукалі Тугоўскага. З таго часу, як іх вусны зблізіліся на пляжы каля Цэсарскай лоўкі, яна мімаволі цягнулася да яго і думала аб ім. Тугоўскі ўвайшоў у залю і спакойна акідваў поглядам прысутных. Яго вочы гарэлі, але ў іх не было трывогі. Нарэшце ён пабачыў Вярхоўскую.

— Пойдзем на гару, на балкон, — прамовіў, прывітаўшыся з ёй. — Там будзе лепш відаць.



Яны прайшлі па засланай шырокім каберцам драбіне на балкон і селі ў ложу над самай сцэнай. Тугоўскі глядзеў на яе з цікаўленнем, чуючы, што глядзіць на яе ў апошні раз. Ён быў спакойны. Доктар сказаў, што ў яго ніякай хваробы няма, і, значыць, ён не мог заразіць Вярхоўскую. Уся дарэмная трывога прайшла.

Але, нягледзячы на тое, што ён здаровы, уступіў у тайную арганізацыю Каруся і заўтра адпраўляўся ў дарогу.

— Вы даўно ўжо не паказваліся ў Студэнцкім доме. Зноў з вамі якая-небудзь гісторыя? — засмяялася яна, акідаючы яго сваімі прыгожымі вачыма.

— Вы правы, гісторыя, — неахвотна зазначыў Тугоўскі і пачаў глядзець на сцэну. Якраз у гэты момант зазвінеў званок і старшыня папрасіў усіх заняць свае мейсца. Прафесар Мілюкоў сеў за столікам каля кафедры.

— Слова мае былы старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Крэчэўскі.

Стары Крэчэўскі сканфужана ўзлез на сцэну і, відаць, хвалюючыся, што атрымаў слова першым, пачаў:

— Буду гутарыць менш за ўсіх, таму што паважаны дакладчык менш усяго гутарыў аб беларусах. На працягу сваёй гісторыі мы чулі на сабе цяжкую руку Масквы, знішчыўшую нашу культуру. А між тым, гэта культура была ў той час, як Масква пачыналася, і ў Полацку ўжо была гімназія, і з Полацку адпраўляліся маладыя людзі вучыцца за граніцу. Масква знішчыла ўсё, у 1859 годзе было забаронена друкаваць беларускія кнігі…

Крэчэўскі адным вокам усё паглядваў на Мілюкова, быццам баяўся, што той зараз выступіць з абвяржэннем прыведзеных ім фактаў. Але Мілюкоў толькі спакойна запісваў усё ў сваю кніжку.

— Мы заяўляем, — закончыў Крэчэўскі, — што пакуль ёсць раб і пан, супольнай размовы і супрацоўніцтва быць не можа.

І ён пакінуў сцэну пад гром воплескаў. За Крэчэўскім выступіў прадстаўнік каўказскіх горцаў. Высокі, у новай чэркесцы, з кінжаламі, сваёй прамовай ён зрабіў велізарнае ўражанне на прысутных.

— Мы, каўказскія горцы, заяўляем, што Расея нішчыла цэлыя плямёны горцаў. Грамадзяне, — ён стукнуў пальцамі

па нейкай паперцы, — я вам пакажу карты, дзе вы пабачыце, што зараз няма шмат назоў нашых плямён. Дзе яны? Яны знішчаны расейскай уладай з твару зямлі. Але, грамадзяне, у нашых сэрцах яшчэ жывуць запаведзі вялікага Шаміля, іншых нашых правадыроў. Мы вымагаем, каб нам далі магчымасць збудаваць сваю саклю на скале, няхай недасканалую, але каб гэта была наша ўласная сакля.

За прадстаўніком каўказскіх горцаў выступіў прадстаўнік Грузіі:

— Мы ніякая не Расея, ні Жоўтая Расея, ні Маларасея… Мы — Грузія, — казаў ён. — У нас была высокая культура, нашыя грузінскія цары пасылалі сваіх жыхароў вучыцца за граніцу, калі Масква была цёмнай вёскай. Што сталася цяпер з Грузіяй пасля доўгага панавання Расеі?.. — Грузін намаляваў жахлівы малюнак. — Пасля гэтага, я думаю, — закончыў ён, — што ў нас не будзе ніякага жадання яшчэ раз увайсці ў склад Расеі.

За грузінам пачалі свой арганізаваны паход украінскія прафесары. Адзін з іх, выдатны гісторык у залатых акулярах, пачаў даўгую лекцыю аб тым, як развівалася ў украінцаў нацыянальная свядомасць, і потым закончыў:

— І пасля гэтага паважаны дакладчык мае яшчэ смеласць заявіць, што ўвесь украінскі рух пачаўся на нямецкія грошы.

— Правільна! — закрычалі з усіх бакоў расейцы.

— Ганьба! — не стрывалі ўкраінцы і ўскочылі са сваіх месцаў.

У залі падняўся перапалох. Адна хвіліна — і ўсё магло скончыцца агульнай бойкай. Але, дзякуючы прысутнасці духу старшыні, усё скончылася добра. Дыскусіі маглі прадаўжацца.

Зноў выступілі ўкраінцы і грузіны. Усе аднадушна выступалі процiў улады Расеі і заяўлялі аб тым, што жадаюць незалежнасці.

Нарэшце, слова атрымаў сам дакладчык Мілюкоў. Ён падняўся страшэнна сканфужаны і некалькі хвілін не ведаў, што яму казаць. Ён пачаў аб дэмакратыі з дыскусіі некаторых прамоўцаў, а потым зазначыў:



— Тое, што мы чулі сягоння тут, безумоўна, вельмі нас здзівіла. Ну што ж, грамадзяне, з тым і разыдземся. Але думаю, што ўсё ж ткі вы без Расеі не абыдзецеся.

Усе пачалі разыходзіцца. Крэчэўскі выйшаў, вітаемы ўсімі беларусамі і знаёмымі эмігрантамі. Міністры Заяц і Случанін чулі сябе больш пэўна і рухліва, аб чымсьці гутарылі з украінцамі. Тугоўскі правёў Вярхоўскую праз таўпу і выйшаў з ёй з багатага і пышнага Народнага дому на вуліцу.

— Дазвольце вас падтрымаць, — прамовіў Тугоўскі, нахіляючыся да яе.

— Калі ласка, — яна падала яму сваю руку. Яны пайшлі, не спяшаючыся, адны па цёмных вуліцах.

— Ну як вам падабаецца сённяшні мітынг? — спытаў Тугоўскі.

— Мне? — у яе голасе чулася радасць. — Гэта было нешта надзвычайна прыгожае па сваёй аднадумнасці. Падумаць, 23 аратары, усе, як адзін чалавек, заявілі: не хочам больш Расеі.

— Так… Сапраўды прыгожа. А мне гэты мітынг падабаецца зусім па іншай прычыне, — задуменна сказаў Тугоўскі, гледзячы ў цёмную залю. — Таму, што апошні раз бачыў я раскошны будынак, сцены ў люстэрках, драбіны, засланыя каберцамі, і ў апошні раз сядзеў з вамі.

— Як у апошні раз? Што вы гаворыце?

Тугоўскі замаўчаў. Ён падумаў: «Сказаць ёй усю праўду, ці прамаўчаць?»

— Так, праўда, — засмяяўся ён. — Я крыху займаюся магіяй і магу прадбачыць будучыню. Я чую, што заўтра нешта будзе са мной. Можа быць, захочуць абрабаваць, можа, нават забіць, але заўтра нешта будзе са мной благое.

— Што вы кажаце глупства… Кіньце. А то я пачну пазяхаць.

Яна стала гутарыць аб выступленні Крэчэўскага, аб беларускіх міністрах Зайцу і Случаніну і аб тым, як іх абсмяялі ў толькі што выйшаўшым камсамольскім часопісе[21].

Тугоўскі слухаў мала. Ён толькі прыслухваўся, наколькі яна жыва ўваходзіла ўва ўсю справу, аб якой гутарыла. Наколькі яна ўсё блізка прымала да сэрца.

— Для мяне вы ўсё ж ткі загадка, — прамовіў ён. — Наколькі я ведаю, вы дачка папа і разам з тым крайне левая марксістка. Я гэтага не разумею.

— Так, — успыхнула яна, і голас яе задрыжэў. — Я дачка папа. Здаецца, гэта нічога не значыць. Ленін[22] быў дваранінам. Усё залежыць ад таго, якія абставіны акажуцца рашаючымі і зробяць уплыў на чалавека. Я расла ў абставінах поўнай свабоды. Мой бацька-поп ніколі не хадзіў за мной па слядах і ніколі не пярэчыў мне, таму што вельмі любіў мяне. Пры тым трэба зазначыць, што я вырасла і мой ідэал аформіўся ўжо ў часе рэвалюцыі. Я вырасла на кнігах Пісарава[23], Чарнышэўскага[24], Маркса[25]. У Харкаве, куды мы пераехалі пад час вайны, на мяне вялікія ўплывы мелі педагогі, першымі вітаўшыя рэвалюцыю. Потым я прыняла чынны ўдзел у грамадскай справе і была старшынёй рады старастаў нашай гімназіі. З бацькам у мяне па гэтым выпадку мала было канфліктаў. Пры радзянскай уладзе стала горай, і мы пераехалі зноў на Бацькаўшчыну, якая ўжо апынулася пад Польшчай. Цяпер, зразумела, я стала іншай, і ў мяне з бацькам былі жахлівыя канфлікты. Я думаю, мы не зможам з ім жыць пад адной страхой.

Тугоўскі глядзеў на яе збоку і ўспамінаў.

— Вы былі ў Харкаве? — запытаў ён. — Мне здаецца, я вас бачыў тады. Я быў вучнёўскім камісарам і прыйшоў у вашу гімназію запрашаць на свята адзінай працоўнай школы. Вы аказаліся адны ў класе, і я вам перадаў плакаты і адозвы.

— Так, так. Прыгадваю. Гэта былі вы. І вы настрашылі тады ўсю гімназію і прымусілі заўтра ў поўным складзе на чале з дырэктаркай з’явіцца пад пагрозай зачынення школы.

Тугоўскі засмяяўся.

— Так, так, — кіўнула Вярхоўская. — Ах, як гэта далёка. І як даўно мы знаёмыя з вамі.

— І як мы мала ведаем адзін аднаго, — дадаў Тугоўскі.

— Чаму, можа быць, пачынаем ужо разумець? А вось мы і прыйшлі.

Яны спыніліся каля вялікага каменнага будынку, асветленага агнямі.

— Зайдземце да мяне. Адпачнем. Вы ў мяне не былі. Адзін раз вы так груба адмовіліся.

— Ах, выбачайце. На гэта былі свае прычыны.



— Ну так, магчыма… Я на вас не злуюся. Заходзьце, калі ласка.

— Ведаеце, крыху нязручна. Такі позні час. Што можа падумаць ваша гаспадыня?

— Нічога. У мяне заўсёды бываюць да позняга студэнты.

Яны падняліся на другі паверх і пазванілі. Згорбленая старая ветліва адчыніла дзверы і ветліва пакланілася Тугоўскаму. Пакой Вярхоўскай быў вельмі прыгожы, з шырокай пасцеллю, пакрытай пышнай пярынай, з вялікімі люстрамі, белай туалетнай скрыняй, з пісьмовым сталом і мяккай мэбляю. Пахла прыемна парфумамі.

— Распранайцеся, — прамовіла Вярхоўская, — вось вешалка, а я тым часам падрыхтую гарбаты.

— Выбачайце, я доўга не магу ў вас быць.

— Ну нічога. Я зараз. — Яна выйшла, пакінуўшы Тугоўскага аднаго, і хутка вярнулася. — Ну вось і гарбата, — прамовіла, несучы дзве шклянкі. Старая ззаду несла пячэнне.

— Вы ідэальна ўладкаваліся ў Празе, — сказаў Тугоўскі, калі старая выйшла.

— Так, пакой добры, цёплы. Адна бабулька, якая не лянуецца мне зварыць гарбату і зранння каву… Нічога, я задаволена. Ну, калі ласка. Піце. Будзьце як дома. Мы належым да народу, каторы сёрбае, — засмяялася яна, глытаючы гарбату. — Памятаеце ў Гарэцкага ў «Дзвюх душах»: прапаршчык Абдзіраловіч сербануў гарбаты…[26]

— Так, — усміхнуўся Тугоўскі, — што зробіш: беларусам не прыходзіцца блішчэць манерамі. З пражскіх беларусаў манеры былі хіба ў Загорскага.

— Ах, не спамінайце болей мне гэтага імя. Я цярпець яго не хачу.

— Але ж вы кахалі яго, Галена Уладзіміраўна?

— Кахала, не хаваю. Але цяпер ён мне брыдкі такі, што я проста ўспамінаю часы, каторыя праводзіла з ім разам, з дрыжыкамі па целе. Якія ўсё ж ткі мы дурныя. Мы, жанчыны, не бачым, што пад маскай часта хаваецца пусты чалавек…

— Такое прыемна чуць зараз. А колькі я мучыўся з-за гэтага. Колькі мук перацярпеў ад вас. І цяпер мучуся. І нават сёння, у гэтай ночы, не ведаю нічога пра сваё каханне.

— Каханне трэба заслужыць, — пачырванеўшы, прамовіла яна.

— Правідлова, Галена Уладзіміраўна, але мне некалі будзе служыць.

— Як гэта некалі?

— Заўтра я еду ў Карпаты, каб у Карпатах перайсці польска-чэшскую граніцу.

— Заўтра вы едзеце ў Карпаты? — прыўстала ад здзіўлення Вярхоўская.

— Еду, Галена Уладзіміраўна. Я прыйшоў да вас, каб сказаць вам апошняе «даруй».

— Як жа так? Выбачайце, не разумею. А вашая навука, а ваш дыплом інжынера?

— Вы хочаце, напэўна, сказаць: а вашыя засеяныя агароды, а вашыя ўтульныя пакоі з наседжанымі гнёздамі, цяпло, канарэйкі на вокнах? Мяркую, аб іх не думаў, калі ўзрываў Зімні палац, аб гэтым не думаў Каліноўскі, студэнт з-пад Вільні…

— Эх, вось як… Дык, значыць, вы хочаце быць новым Каліноўскім?

— Я не думаю, Галена Уладзіміраўна, аб вялікай ролі… Можа быць, мая праца будзе зусім маленькай, нявартай нават увагі, можа быць, я нават загіну яшчэ ў снягах Карпат пры самым пераходзе граніцы, але я сваё бязлітаснае жыццё пакладу ў імя справы. «Сваю кроў аддай за свайго меншага брата, народ, каторы я не перастаў кахаць са ўсімі яго заганамі…» Вы, крайне левыя, вы, рашучыя рэвалюцыянеры, кахаеце народ толькі тэарэтычна, але самі баіцеся ўвайсці ў яго брудную хату і апрануць яго кажух, бо ён смярдзіць. Я не баюся жывога народу. І калі яму патрэбна маё жыццё, калі для таго, каб ён вярнуўся да жыцця, патрэбна мая ахвяра, я аддаю сябе ўсяго з рашучай гатоўнасцю. Вы маеце здзіўлены твар, Галена Уладзіміраўна. Вы хочаце, напэўна, сказаць: як гэты неўрастэнік Тугоўскі, гэта забітая істота, гэты некультурны дзікун, раптам апынуўся ў ролі рэвалюцыянера? Вы правы, можа быць, гэта дзіўна. Але гэта лагічна, калі вы, прыпомніце, што ў гэтага неўрастэніка больш нічога каштоўнага не засталося ў жыцці. Засталася адна глыбокая нянавісць да сучаснага ладу і да ўсіх сытых мяшчан.



Вярхоўская яго ўважна слухала.

— Усё гэта так, — прамовіла яна сур’ёзна. — Ваша нянавісць да сучаснага ладу пахвальная, але хіба дзеля гэтага трэба пераходзіць Карпаты, трэба ў кагосьці кідаць бомбы і выбіваць шкло ў будынках? Няўжо няма іншых спосабаў выявіць сваю нянавісць, хаця б, напрыклад, культурным спосабам? Мне здаецца, якраз для беларускай справы вы былі б больш карысны як інжынер, чым як бомбакідальнік.

— Аб гэтым не будзем спрачацца, — спакойна, але цвёрда зазначыў Тугоўскі. — Вы мне ні ў чым не пара. Ну дапусцім, што страляць у іншых, каб потым быць самому расстрэляным, ёсць асаблівы від самагубства. Я выбраў сабе гэты від самагубства, бо лепшага не знайшоў, і ўсё. Якія тут могуць быць яшчэ гутаркі? Так што, Галена Уладзіміраўна, — ён падняўся з крэсла, — дзякую вам за гарбату, за вашую ласку… — Ён узяў яе мяккую руку і пацалаваў пальцы працяжным даўгім пацалункам. — Бывайце. Не хачу казаць — назаўсёды, але — навекі… Болей мы ніколі, ніколі не спаткаемся. — Ён пачаў апранацца, каб схаваць свае слёзы. Яна адвярнулася з поўнымі слёз вачыма. — Што ж, яшчэ раз, Галена Уладзіміраўна, хачу развітацца з вамі, — сказаў ён ужо апрануты, павяртаючыся да яе. — У даўніх апавяданнях герой перад расставаннем прасіў ад сваёй гераіні які-небудзь талісман на дарогу і паміраў з імем каханай на вуснах. Праўда? — ён засмяяўся.

— Праўда! — адвярнулася яна, сумна ўсміхаючыся. — Толькі каб не выглядала вельмі смешна…

— Так, можа быць… і без талісману… Калі-небудзь у турме я буду думаць аб вас. Ну, бывайце. — Ён працягнуў ёй руку.

— Памятайце, калі вы ўжо сталі на такі шлях, будзьце больш цвёрдымі і адважнымі. Жадаю вам поспеху.

Ён не вытрымаў. Прыцягнуў яе да сябе, апошні раз пацалаваўшы яе гарачыя вусны, калі яны выйшлі разам на вуліцу. Прага спала спакойным сном.

Яна доўга глядзела ў цёмную далеч. Ён усё аддаляўся ў чорныя нетры, пакуль не схаваўся ад яе навекі…

* * *

У Карпатах бушавала мяцеліца. Нехта крычаў, нехта валіўся бяссільны ў снег, зноў падымаўся, і зноў ішоў, і зноў крычаў. Але голасу яго не чулася за выццём ветру ў гарах. Нарэшце чалавек зваліўся ў снег. Ён зразумеў, што заблудзіўся і што больш не мае сілы змагацца з бурай. Усё было скончана. Ён зняў дарожную сумку, выбраў усе дакументы, каторыя маглі паказаць, хто ён, дастаў сернікі і пачаў паліць усё, што было з ім. Вецер сярдзіта раздзімаў полымя і раскідаў іскры па глыбокім снезе.

— А цяпер, — сказаў ён сам сабе, калі ад паленай паперы засталіся на снезе толькі чорныя кавалкі попелу, — будзем замярзаць у Карпатах. Кажуць, што замерзнуць — самая лёгкая смерць. Паглядзім…

Ён сеў у гурбіну снегу, паправіў кажух, лепш наставіў каўнер і прыгатаваўся да смерці.

Вецер кружыўся над ім, кідаў у яго велізарнымі кавалкамі снегу, злосна свістаў над яго галавой і доўга рагатаў над ім, як над сваёй бяссільнай ахвярай. Чалавек думаў. Мозг працаваў востра і напружана, чакаючы жаданы і хутчэйшы сон смерці, але ён не ішоў. Толькі жахліва студзянелі пальцы рук і ног.

«Я замерзну няхутка, — думаў чалавек, — але мяне можа занесці гэтым снегам, — і ён жахліва паглядзеў каля сябе на ўсё растучую снегавую гару. Ён зрабіў апошні высілак волі, паспрабаваў падняцца, але зараз жа зноў утапіўся ў снегавой яме. Ісці не было магчымасці. Ён заваліўся і заплакаў. І адразу ж спомніў усё-ўсё сваё жыццё. Яно пранеслася адной электрычнай іскрай, успыхнула, як магній пры фатаграфіі, і пагасла ў цемры… Яму падалося, што ён бачыць асветленыя вокны, хату на далёкай Бацькаўшчыне, сваю старую матку за калаўротам, якая апавядала яму казкі. І раптам уся Беларусь з дымам печак, з пахам вячэры, з яе святамі, з п'янымі вечарынамі вырасла перад яго вачыма. Ён чуў усю горыч свайго становішча, увесь жах сваёй смерці пад навалай снегу. Слёзы жалю накручваліся на вачох. «Эх, шкода, — з адчаем падумаў ён, — што скончана пытанне. Няма больш на свеце Тугоўскага, і добра ці дрэнна гарэла свечка яго жыцця, па насмешцы лёсу яна дагарэла ў Карпатах. Яна кончыла гарэць не там, дзе ёй трэба было, не на алтары беларускага народу.



І, можа быць, калі-небудзь, калі будучыя пакаленні выйдуць у белай вопратцы з сцягамі і штандарамі вітаць новае жыццё вольнай і братэрскай сям'ёй, калі ў велізарнай храміне, на франтоне якой літарамі будзе напісана «Вольная Беларусь», запаляць свечкі на ахвярніку — напэўна, ні адна свечка не запаліцца за яго, невядомага Тугоўскага, невядомую ахвяру цемры.

Ну што ж… Няхай дарue яму Бацькаўшчына за тое, што ён не зрабіў для яе. «За кроў яго, агульную з народам, даруй, о родны край, даруй…»

Снег яшчэ больш густымі камякамі пачынаў кружыцца над яго галавой. Вецер смяяўся. Як бязлітасны кат, ён чакаў яго смерці і рагатаў над яго апошнімі думкамі.

«Бывай, Карусь. Ах, не выканаў тваіх заданняў. Бывай, Вярхоўская… Цяпер, напэўна, цёпла і ўтульна ў тваім пакоі. Вось за сталом у кампаніі Бурак з сваёй графіняй. Ён цяпер, напэўна, інжынер, працуе ў чэшскай фірме і будуе масты. А вось стары знаёмы, медык Загорскі. Ён застаўся халасцяком. Ён цяпер працуе як казённы лекар, спецыялізуецца па жаночых хваробах. У яго ўжо ўласны аўтамабіль, і хто ведае, можа быць, хутка будзе ўласны дом.

Як міла, як утульна ім, мяшчанам, у сваіх гнёздах…

А я замярзаю…»

Ён дастаў качанеючымі пальцамі запіскі «Споведзь самагубцы. Кніга для ўсіх і ні для кога» і чорнымі літарамі прыпісаў: «Я не дайшоў да хаты. Перад сваёй смерцю заяўляю: а ўсё ж ткі ёсць людзі, над якімі смяецца лёс, а ўсё ж ткі ёсць людзі, каторыя радзіліся пад Сатурнам».

Снег усё ішоў. Снег засыпаў белай прасцінай жыццёвыя пытанні…

У Карпатах безупынна бушавала бура…

* * *

Споведзь самагубцы
Кніга для ўсіх і ні для кога

Сёння, калі прыгожы восеньскі дзень разалье сваю чырвоную кроў на захадзе, і калі ён пачне сінець, і калі наступіць вечар, у лес да соснаў прыйдзе чалавек, каб пагутарыць апошні

раз. Ён скажа так: «Роўна 24 гады таму назад у маленькім месцы, у сям'і работніка, у склепе, радзіўся чалавек». Ці ведаеце вы, дзеля чаго радзіўся гэты чалавек? Кажуць: «Чалавек родзіцца для шчасця, як птушка для палёту». Але пароды птушак бываюць розныя, і палёты бываюць розныя…

Людзі, як птушкі, бываюць рознай пароды. Адны роджаны дзеля таго, каб стаць вераб'ямі, і як бы яны ні хацелі, ім не падняцца вышэй страхі маленькай хаты, не адляцець далей гнойнага мейсца чалавечага жытла. Другія ж родзяцца сакаламі, каб лётаць высока ў небе і клікаць да гордай волі і святла. Такі закон жыцця. Але не ўсімі ён пазнаецца і прызнаецца. Ёсць такія людзі, каторыя толькі на канцы свайго шляху, перад адчыненай труной, даведваюцца, што яны былі вераб'ямі, а ёсць такія, што насуперак фактам не хочуць прызнацца, што яны — маленькія вераб'і…

Ад гэтага трапляюцца часта розныя трагедыі. Бяда, калі ў чалавека-вераб'я жаданні непамерныя з яго крыллямі. Бяда, калі законы жыцця кожны раз ламаюць яго пёры і прымушаюць апускацца ніжэй і ніжэй…

Бяда таксама тым, каторыя вельмі рана пазнаюць гэтыя законы жыцця і апусцяць крылы. Блаславенны тыя, каторыя нічога не ведаюць, бо яны будуць у царстве сну і здароўя…



# КАМЕНТАР

У зборнік выбраных твораў Віктара Вальтара ўвайшло ўсё з паэзіі, прозы, публіцыстыкі пісьменніка, што было знойдзена на старонках беларускіх газет і часопісаў, што выходзілі ў Празе, Вільні, Дзвінску і Коўна, і ў рукапісах. Некаторыя з твораў друкуюцца ў гэтым выданні ўпершыню.

Тэксты змяшчаюцца згодна з правіламі сучаснай арфаграфіі і пунктуацыі з захаваннем асаблівасцяў аўтарскай мовы.

## ДУХ ЧАСУ
*Паэзія, пераклад*

### *Покліч сялянскага сына (с. 13)*

Верш-зварот да беларускай нацыянальнай меншасці, напісаны Віктарам Вальтарам у Празе напярэдадні выбараў у Латвійскі сейм і іншыя органы мясцовага самакіравання.

Друкуецца паводле выд.: «Першы крок: зборнік вершаў гуртка маладых беларускіх паэтаў ў Латвіі», Рыга, 1926, дзе ўпершыню апублікаваны.

### *Новы Агасфер (с. 14)*

Друкуецца паводле выд.: «Замежная Беларусь: зборнік гісторыі, культуры і эканомікі» (пад рэдакцыяй П. Крачэўскага), кн. 1, Прага, 1926, дзе ўпершыню апублікаваны.

[1] Агасфер, альбо Вечны жыд — персанаж сярэдневяковай заходнееўрапейскай легенды, паводле якой Агасфер не дазволіў адпачыць Ісусу Хрысту ў час яго пакутніцкага шляху на Галгофу. За гэта ён быў асуджаны на безупыннае жыццё, чакаючы другога прышэсця Хрыста, які здолее даць спакой магіле і яго душы. Да вобраза Агасфера

(Вечнага жыда) неаднаразова звярталіся ў сваёй творчасці многія вядомыя еўрапейскія паэты.

### *«Хмары страшныя навіслі...» (с. 14)*

Друкуецца паводле выд.: «Замежная Беларусь: зборнік гісторыі, культуры і эканомікі» (пад рэд. П. Крачэўскага), кн. 1, Прага, 1926, дзе ўпершыню апублікаваны.

### *У лесе (с. 15)*

Друкуецца паводле газ. «Голас беларуса», 1926, 20 кастрычніка, дзе ўпершыню апублікаваны.

### *Не плач, матанька! (с. 16)*

Друкуецца паводле час. «Покліч», 1926, № 1, дзе апублікаваны ўпершыню пад псеўданімам Я. Палын.

### *Дух часу (с. 19)*

Упершыню — час. «Родныя гоні», 1927, № 5.
Друкуецца паводле выд.: «Крывіцкія руны: беларускія пісьменнікі Латвіі» (уклад. С. Панізнік), Мінск, 2003.

### *З Івана Франко.*
### *«У тую ноч, з цяжкою думкай пры акне...» (с. 20)*

Друкуецца паводле выд.: «Замежная Беларусь: зборнік гісторыі, культуры і эканомікі» (пад рэдакцыяй П. Крачэўскага), кн. 1, Прага, 1926, дзе ўпершыню апублікаваны.



## АДЧУВАЮ ЦЯБЕ, АЙЧЫНА!
## *Проза, публіцыстыка*

### *Аднабочнікі (с. 23)*

Друкуецца паводле час. «Крывіч», 1923, № 4, 5, дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўданімам Янка Палын.

Жанрава твор пазначаны як літаратурны нарыс, хоць па ўсіх мастацкіх параметрах яго варта аднесці да невялікай псіхалагічнай аповесці. У аснову аповесці пакладзеныя ідэі нямецкага філосафа Фрыдрыха Ніцшэ аб слабасці і моцы чалавечага духа, яго маральнай дэградацыі, якая адбываецца, на яго думку, пад уздзеяннем распаўсюджвання дэмакратычных і культурных ідэй, хрысціянскіх каштоўнасцяў, аб кволасці чалавечых памкненняў да стварэння індывідуалістычнага культу моцнай і самадастатковай асобы.

[1] Цэзар Гай Юлій (100–44 гг. да н. э.) — старажытнарымскі дзяржаўны дзеяч, палкаводзец, пісьменнік. З патрыцыянскага роду Юліяў. Праводзіў палітыку цэнтралізаванай аднаасобнай улады, устанавіў вайсковую дыктатуру (быў абвешчаны пажыццёвым дыктатарам), імкнуўся да поўнай ліквідацыі рэспубліканскіх правоў грамадзян і ператварэння рымскай дзяржавы ў адкрытую манархію.

[2] Клеапатра VII (69–30 гг. да н. э.), старажытнаегіпецкая царыца, апошняя з дынастыі Пталамеяў. Вызначалася розумам і адукаванасцю, незвычайнай знешняй прыгажосцю. Вяла актыўную палітычную барацьбу за ўладу супраць свайго мужа Пталемея XIII. Была ў выгнанні ў Сірыі. Вярнулася на трон з дапамогай Юлія Цэзара, які захапіўся яе прыгажосцю і розумам. Праз нейкі час яна стала яго жонкай. Паводле падання, памерла ад укусу ядавітай змяі.

[3] Ньютан Ісаак (1643–1727), англійскі фізік, матэматык і астраном, стваральнік класічнай механікі і асноў сучаснага прыродазнаўства. У гумарыстычнай форме аўтар аповесці абыгрывае вядомы выпадак, які адбыўся з І. Ньютанам, пасля чаго, як мяркуюць даследчыкі, быў адкрыты закон сусветнага прыцягнення.

[4] Tabula rasa (з лац. «чыстая дошка») — філасофскі тэрмін, называе стан свядомасці чалавека, які яшчэ не валодае ніякімі ведамі. Свядомасць параўноўваецца з дошкай, на якую досвед наносіць свае знакі.

[5] Выгрык — магчыма, памылка друку. Трэба «Тыгрык» (пар. далей: «…Вашым тыгравым ножкам калі-небудзь злажыў бы паэму…»).

[6] Мефістофель — дэман, персанаж трагедыі ў вершах «Фаўст» нямецкага пісьменніка, аднаго з заснавальнікаў нямецкай літаратуры новага часу Ёгана Вольфганга Гётэ (1749–1832).
[7] У час грамадзянскай міжусобнай вайны войскі рымскага палкаводца Гая Юлія Цэзара знаходзіліся ў правінцыі Галія, якую аддзяляла ад усёй Італіі рэчка Рубікон. Тут Цэзар і даведаўся аб рашэнні сената адхіліць яго ад камандавання. Ён пераехаў цераз раку і сказаў звяртаючыся да войска: «Рубікон пяройдзены. Жэрабя кінута». З цягам часу гэтыя словы ператварыліся ў афарызм, які абазначае пераход апошняй мяжы, канчатковае рашэнне пэўнага пытання.
[8] Гэндзікі — плытагоны.
[9] Каін — паводле біблейскай міфалогіі, старэйшы сын Адама і Евы, земляроб. Забіў з зайздрасці брата Авеля, пастуха. Пракляты Богам за братазабойства (асуджаны на вечнае блуканне) і адзначаны асобым знакам (Каінава пячатка). Стаў вобразам усяго здрадлівага, нікчэмнага, зайздрослівага і бесчалавечнага.

### *Песня гладыятараў (с. 72)*

Друкуецца паводле час. «Студэнцкая думка», 1924, № 1, дзе ўпершыню апублікаваны пад псеўданімам Янка Палын.
[1] Калізей (ад лац. «colosseus» — аграмадны, каласальны) — амфітэатр Флавіяў у Рыме, які быў пабудаваны ў 75–80 гады н. э. у часы імператараў Веспасіяна і Ціта. Прызначаўся для тэатралізаваных паказаў і разнастайных відовішчаў.
[2] Spolarium (лац.) — месца для размяшчэння забітых у час гладыятарскага бою.

### *Аб прафесійных школах (с. 75)*

Упершыню — час. «Школа і жыццё», 1930, № 1.
[1] Кіршэнштэйнер (Кершэнштэйнер) Георг (1854–1932) — нямецкі педагог, тэарэтык працоўнай школы і грамадзянскага выхавання. Свае тэарэтычныя ідэі рэалізоўваў у школах Мюнхена. Ён перабудаваў вучэбны план народных школаў, адводзячы ў ім вялікае месца матэматыцы, прыродазнаўству і маляванню, спрыяў уводзінам актыўных метадаў навучання з шырокім выкарыстаннем наглядных дапаможнікаў, экскурсіяў і практычных работаў. Значную цікавасць для свайго часу ўяўлялі арганізацыйны і метадычны бок пастаноўкі ручной працы ў народных школах і прафесійнага навучання ў датковых школах. Вопыт мюнхенскай школы Г. Кіршэнштэйнера атрымаў распаўсюджанне як у Нямеччыне, так і за яе межамі.



[2] Латгалія — адзін з этнаграфічных і адміністрацыйных рэгіёнаў Латвіі.
[3] Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы — грамадская асветная арганізацыя, якая была створана 22 верасня 1921 года па загадзе міністра асветы тагачаснай Латвіі. У яе функцыю ўваходзіла адкрыццё і апека над беларускімі пачатковымі школамі, курсамі для падрыхтоўкі настаўнікаў, беларускімі гімназіямі. Першым кіраўніком Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы быў прызначаны вядомы грамадскі дзеяч, дырэктар Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі Сяргей Сахараў, а з 1927 года — Уладзімір Пігулеўскі. Зачынены Беларускі аддзел у другой палове 1930-х гадоў пасля прыходу да ўлады дыктатара Ульманіса.

### *Леснікова сена (с. 79)*

Упершыню — газ. «Наша доля», 1930, № 4 пад назвай «З-за сена».
Друкуецца паводле выд.: «Крывіцкія руны: беларускія пісьменнікі Латвіі» (уклад. С. Панізнік), Мінск, 2003.
[1] Plusguamperfectum (ням.) — дзеянне, якое адбылося ў мінулым.

## **РОДЖАНЫЯ ПАД САТУРНАМ**
## *Раман*

Раман «Роджаныя пад Сатурнам» (1902–1931, Дзвінск) знаёміць чытачоў з дзейнасцю беларускай эміграцыі ў Чэхаславаччыне, прэзідэнтам якой стаў Тамаш Масарык. Твор у многім гісторыка-аўтабіяграфічны. Са старонак рамана паўстаюць каларытныя фігуры тагачасных дзеячаў Беларускай Народнай Рэспублікі, якія знайшлі тут сталы прытулак — П. Крачэўскага, Т. Грыба, Я. Станкевіча, П. Вяршыніна. Ды і ў асобе галоўнага героя твора Пётры Тугоўскага даволі лёгка пазнаецца сам аўтар

Рукапіс рамана знойдзены і захоўваецца ў Вільні. Мікрафільм рукапісу рамана Віктара Вальтара быў заказаны ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Акадэміі навук Летувы (аддзел рукапісаў, фонд 21, адзінка зберагання 716) стараннямі дырэктара Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны сп. Адама Мальдзіса. Тэкст рамана перапісвалі пасля смерці аўтара некалькі вучняў

гімназіі ў Дзвінску, таму ў многіх месцах почырк быў нечытэльны і асобныя словы засталіся нерасшыфраваныя.

Лёс рамана «Роджаныя пад Сатурнам» складваўся не лепшым чынам. Яшчэ ў 1932 годзе часопіс «Беларуская школа у Латвіі» ў пятым нумары паведамляў, што ў Латвіі рыхтуецца выданне рамана, і запрашаў яго падтрымаць: «Адзін пай каштуе 20 лат». Але, відаць, сродкаў не знайшлося. І толькі ў 1991–1992 гадах сем з паловай месяцаў з нумара ў нумар рэдакцыя газеты «Голас Радзімы» знаёміла сваіх чытачоў з раманам Віктара Вальтара «Роджаныя пад Сатурнам».

Рэдактар газеты Вацлаў Мацкевіч у нумары за 27 ліпеня 1995 года згадзіўся надрукаваць такую абвестку:

*«Некалькі гадоў назад Сяргей Панізнік на старонках “Голасу Радзімы“ “адкрыў” для людзей імя цікавага самабытнага беларускага пісьменніка Віктара Вальтара. Газета друкавала яго раман “Роджаныя пад Сатурнам”. Высілкамі таго ж С. Панізніка раман быў падрыхтаваны да друку і меўся быць выдадзены Згуртаваннем беларусаў свету “Бацькаўшчына” і выдавецтвам “Юнацтва”. Аднак, калі кніга была ўжо амаль гатовая, высветлілася, што тыраж яе такі нязначны, што выпускаць твор няма магчымасці. У бібліятэках няма грошай на набыццё новых кніг, адпаведныя арганізацыі, што павінны займацца прапагандай і распаўсюджваннем кніг, не зацікаўлены ў творах на беларускай мове. І таму мы звяртаемся да магчымых чытачоў, каб тыя, хто хацеў бы набыць яе, пісалі на адрас “Юнацтва” (220600, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Машэрава, 11).*

*Такая заяўка дапаможа набраць неабходны тыраж, і цікавая кніга пабачыць свет».*

Заявак набралася многа. Праўда, не набралася столькі, колькі абвяшчалася ў выдавецкім плане «Юнацтва» на 1995 год: 12 тысяч. 9 студзеня 1997 года выдавецтва «Юнацтва» выдала загад № 1 «Аб перадачы права на выданне кнігі Вальтара В. “Роджаныя пад Сатурнам”». У сувязі са згодай ВЦ «Бацькаўшчына» забяспечыць выданне кнігі, правы выпуску яе перадавалася гэтай грамадскай арганізацыі. Ануляваліся дагаворы з аўтарамі, выстаўляўся рахунак ВЦ «Бацькаўшчына» для пагашэння выдаткаў на выплату мастацкага ганарару.

Але кніга ізноў не выйшла. Наступная заяўка — Сяргея Панізніка — у выдавецтва «Мастацкая літаратура» пачыналася такімі словамі: «Лёс выдавецтва “Юнацтва” не дазволіў, каб раман на стадыі карэктуры пабачыў свет…» Тым не менш, і тут яе не падтрымалі. Не дапамагло нават і тое, што да тэксту рамана былі далучаны



апавяданне аўтара, яго вершы, пераклад з І. Франко. Праз нейкі час тэкст рамана быў прапанаваны часопісу «Полымя». Але вызваленне з пасады галоўнага рэдактара Сяргея Законнікава перашкодзіла публікацыі рамана і ў гэтым выданні.

І толькі ў 2005 годзе часопіс «Дзеяслоў» у некалькіх нумарах выдрукаваў падкарочаны тэкст рамана Віктара Вальтара з прадмовай Алеся Пашкевіча.

Друкуецца паводле газ. «Голас Радзімы», 6 чэрвеня – 26 снежня 1991; 2 студзеня – 16 студзеня 1992, дзе ўпершыню апублікаваны.

### *Квадра першая (с. 87)*

[1] Беларуская грамада ў Празе — грамадская ўстанова, своеасаблівы каардынацыйны орган беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацыяў у Празе ў 1920–1925 гг. У склад кіраўніцтва ўваходзілі Мікалай Вяршынін (старшыня), Янка Станкевіч (намеснік), Янка Ермачэнка, Міхась Каберац, Сяргей Бусел ды інш. Пры грамадзе дзейнічала студэнцкая секцыя, якая налічвала да 100 чалавек.

[2] Дырэктарам Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі з 1922 па 1925 год быў Іван Ігнатавіч Краскоўскі. Нарадзіўся ён у 1880 годзе на Гродзеншчыне. Вучыўся ў Пецярбургу. Працаваў у Кіеве. Служыў украінскаму, беларускаму нацыянальна-дэмакратычнаму адраджэнню. З лета 1925 года, вярнуўшыся з Латвіі, працаваў у БДУ. Быў рэпрэсаваны ў 1930 і ў 1937 гадах. Вызвалены са зняволення ў 1940 годзе. Выехаў да дачкі ў Брацiславу, дзе і памёр ў 1959 годзе. Пасля І. Краскоўскага дырэктарам гімназіі ў Дзвінску стаў С. П. Сахараў.

[3] Старшынёй Беларускай грамады ў Празе быў грамадскі і палітычны дзеяч, консул Беларускай Народнай Рэспублікі ў Чэхаславакіі Мікалай Вяршынін (1878–1934). У другой палове 1920-х гг. уваходзіў у склад пражскай Беларускай рады, быў адным з ініцыятараў стварэння Беларускага замежнага (загранічнага) архіва, першым яго старшынёй. Герой рамана П. Тугоўскі ішоў да яго на вуліцу Вендзігаву, 4.

[4] Чэхаславацкая рэспубліка Т. Масарыка з гуманітарных меркаванняў дапамагала ўсходнеславянскай эміграцкай моладзі, а таксама юнакам і дзяўчатам з акупаваных Польшчаю зямель Заходняй Украіны, Заходняй Беларусі (у тым ліку і беларусам з латышскай Латгаліі), набываць прафесіі, прызначала стыпендыі для іх у многіх навучальных установах краіны.

[5] Размова ідзе пра раман Ф. Дастаеўскага «Запіскі з Мёртвага дома» (1862), які па сіле выкрыцця чалавечых заганаў А. Герцэн параўноўваў з «Страшным судом» Мікеланджэла.

[6] Вобраз, падказаны п'есай М. Горкага «На дне» (1902).

[7] Студэнцкі дом у Празе — грамадска-культурны клуб, што аб'ядноўваў шматнацыянальнае студэнцтва, якое вучылася ў пражскіх вышэйшых навучальных установах у міжваенны час. Сябрамі гэтай установы лічыліся звыш 3 тысяч чалавек каля 30 нацыянальнасцяў. У склад яго кіраўніцтва ў 1920-я гг. уваходзіў і беларускі студэнт Мікалай Ільяшэвіч. Размяшчаўся Студэнцкі дом у Празе ў Альбяртове на вуліцы «На Слупі», а ў мястэчку Езафова-над-Мэтам працавалі падрыхтоўчыя курсы для будучых студэнтаў.

[8] Ціхо дэ Браге (1546–1601) — дацкі астраном, які даказаў, што каметы — нябесныя целы, склаў зорны каталог. На аснове яго назіранняў Марса нямецкі астраном Ёган Кеплер (1571–1630) адкрыў законы руху планет.

[9] На думку былой супрацоўніцы Славянскага музея ў Браціславе Людмілы Іванаўны Краскоўскай (дачкі І. І. Краскоўскага), прататыпам Галены Вярхоўскай з'яўляецца Любоў Вернікоўская — яе каляжанка па вучобе ў Празе. Яна скончыла Навагрудскую беларускую гімназію, была студэнткай пражскага Карлавага ўніверсітэта. Даводзілася дачкой вядомаму беларускаму дзеячу паланафільскай арыентацыі Тодару Вернікоўскаму. Далейшы лёс «дачкі папа», у якую закахаўся Пётра Тугоўскі, такі. У 1930-х гадах яна пабралася шлюбам з украінцам. Маладая сям'я пакінула Прагу і выехала ў Нямеччыну. Люба Вернікоўская, несумненна, была студэнткаю з прыгожым сэрцам і светлай галавой. У. Калеснік у кнізе «Усё чалавечае» прыводзіць пісьмо У. Жылкі да А. Луцкевіча, у якім паэт упрошвае, каб той прысылаў на вучобу ў Прагу самых здольных выпускнікоў віленскай гімназіі: «…Прысылайце разумных, думаючых хлопцаў, чэсных і любячых, якія маглі б потым з гонарам заступіць Вас, старшых. Я асабіста рад быў бы бачыць такіх, як Ільяшэвіч, Дыліс, Мэнке, Вернікоўская… Ім бы Еўропа шмат чаго дала…»

[10] Станкевіч Янка (1891–1976) нарадзіўся ў вёсцы Арляняты, што на Смаргоншчыне. Скончыў Віленскую беларускую гімназію (экстэрнам) і пражскі Карлаў універсітэт (1926). Пад час навучання ў Празе актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным і культурным жыцці беларускай дыяспары. Адзін з кіраўнікоў Беларускай грамады ў Празе, старшыня студэнцкага Беларускага сялянскага саюза, рэдактар часопіса «Беларускі студэнт», сябра Беларускага (Крывіцкага) культурнага таварыства імя Ф. Скарыны ды інш. Атрымаўшы званне



доктара філалогіі, вярнуўся ў Заходнюю Беларусь, дзе працаваў выкладчыкам у Віленскім універсітэце імя С. Баторыя. З 1944 г. — на эміграцыі. Аўтар шматлікіх кніг па гісторыі, культуры і мовазнаўстве Беларусі. Памёр і пахаваны ў ЗША.

[11] Генрых Гейнэ (1797–1856) — нямецкі паэт-рамантык, публіцыст і крытык.

[12] Аляксандр Пушкін (1799–1837) — адзін з пачынальнікаў рускай класічнай літаратуры.

[13] Чэшска-Украінскі камітэт (ЧУК) — грамадская дабрачынная арганізацыя, якая была створана ў лістападзе 1921 г. Камітэт фінансаваўся з дзяржаўнага бюджэту Чэхаславакіі, таму маладыя беларусы і ўкраінцы атрымлівалі з яго фонду стыпендыі і аднаразовыя грашовыя дапамогі. У пункце 3 статуту ЧУК запісана: «Несці матэрыяльную і маральную дапамогу студуючым украінцам і беларусам». У яго кіруючы склад уваходзілі: 8 чэшскіх прафесараў і студэнтаў, 8 украінскіх прафесараў і студэнтаў, а таксама 8 прадстаўнікоў Украінскага грамадскага камітэта і 2 чалавекі — ад арганізаванага беларускага грамадства. Камітэт актыўна і дзейна падтрымліваў бедных і малазабяспечаных студэнтаў, ствараў для эмігрантаў студэнцкія інтэрнаты, дапамагаў вопраткай, лекамі, забяспечваў вучэбнай літаратурай, арганізоўваў для іх лячэнне ў санаторыях, пад час вакацыяў ладзіў экскурсіі па краіне, турыстычныя вандроўкі за межы.

[14] Аўтар рамана памыляецца: п'есу для віяланчэлі з аркестрам «Песня трубадура» напісаў расійскі кампазітар А. Глазуноў (1865–1936).

[15] «Брацці-разбойнікі» — драма нямецкага паэта і драматурга, аднаго з пачынальнікаў нямецкай літаратуры новага часу Фрыдрыха Шылера (1759–1805).

[16] Затонскі Уладзімір (1888–1938), украінскі савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч, акадэмік АН УССР. Скончыў Кіеўскі універсітэт (1912). Пасля кастрычніцкага перавароту займаў розныя пасады ў савецкіх і дзяржаўных органах кіравання. Быў старшынёй кіеўскага камітэта РСДРП (б), потым наркамам асветы Украіны, прадстаўніком УССР у Саўнаркаме РСФСР, сакратаром ЦК КП(б)У. У другой палове 1930-х гадоў рэпрэсаваны.

[17] Дзянікін Антон (1872–1947), расійскі военачальнік, адзін з кіраўнікоў белай гвардыі ў часы грамадзянскай вайны ў Расіі, пісьменнік.

[18] Гаворка вядзецца пра кіраўнікоў белай гвардыі генералаў Куцепава Аляксандра (1882–1930?) і Май-Маеўскага Уладзіміра (1867–1920), войскі якіх захапілі Харкаў.

[19] Ракоўскі Хрысціян (1873–1941) — украінскі савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч, дыпламат. У 1918 г. ён быў абраны старшынёй Часовага рэвалюцыйнага ўрада Украіны, а з 1919 — старшынёй Савета народных камісараў. У другой палове 1930-х гадоў рэпрэсаваны.

[20] Шэкспір Уільям (1564–1616) — класік англійскай літаратуры, паэт і драматург.

[21] Гаўс Карл Фрыдрых (1777–1855) — нямецкі матэматык, астраном і фізік. Стварыў абсалютную сістэму адзінак (міліметр, міліграм, секунда), разам з В. Веберам пабудаваў першы ў Нямеччыне электрамагнітны тэлеграф.

[22] Тургенеў Іван (1818–1883) — расійскі пісьменнік. Аўтар шматлікіх вершаваных, драматычных і празаічных кніг. Стварыў вобраз «лішняга чалавека», псіхалагічна дакладна вымалёўваў глыбокія жаночыя характары, гісторыі трагічнага і нераздзеленага кахання.

[23] Дантэ Аліг'еры (1265–1321) — італьянскі паэт. Аўтар значных вершаваных і маральна-філасофскіх працаў, але вяршыняй яго творчасці лічыцца «Боская камедыя». Гэты манументальны твор позняга сярэднявечча ўяўляе сабой энцыклапедыю філасофіі, касмагоніі, гісторыі, рэлігіі, маралі, палітычных поглядаў еўрапейскага чалавека напярэдадні Адраджэння.

[24] Сакрат (каля 470–399 да н. э.), старажытнагрэчаскі філосаф. Спосаб жыцця, паводзіны і характар гутарак, выслоўі Сакрата яшчэ ў старажытнасці сталі эталонам філасофскай мудрасці.

[25] Цытуюцца радкі з верша М. Багдановіча «Рушымся, брацця, хутчэй…», які быў упершыню надрукаваны ў «Нашай Ніве» за 4 сакавіка 1910 года з паметкай «Яраслаўль».

[26] Талстой Леў (1828–1910) — расійскі пісьменнік, аўтар шматлікіх кніг прозы, якія ўвайшлі ў залаты фонд сусветнай літаратуры

[27] Дастаеўскі Фёдар (1821–1881) — расійскі пісьменнік. Ягоны род паходзіць з беларускай шляхты. Аўтар аповесцяў і раманаў «Бедныя людзі» (1846), «Запіскі з Мёртвага дома» (1862), «Прыніжаныя і абражаныя» (1861), «Злачынства і пакаранне» (1866), «Браты Карамазавы» (1880) ды інш.

[28] Майце такую ласкавасць. Смялей! Бо сербская ёсць сербская (*серб.*).

[29] Прататыпам героя рамана студэнта Тамашэвіча быў вядомы дзеяч беларускага адраджэння Тамаш Грыб (1895–1938). Нарадзіўся ў в. Паляны, што на Смаргоншчыне. Вучыўся ў Санкт-Пецярбургу, быў удзельнікам Першай сусветнай вайны. З'яўляўся адным з арганізатараў Першага Усебеларускага кангрэса, абвяшчэння БНР, лідарам партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, рэдактарам перыядычных выданняў. З 1921 года — у Празе. Вучыўся у Карлавым універсітэце, быў адным з кіраўнікоў беларускіх студэнцкіх арганізацыяў, рэдактарам часопіса «Іскры Скарыны», сакратаром-кіраўніком Беларускага навуковага кабінета, загадчыкам Беларускага заграніічнага архіва. Абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Пытанне народа і нацыі». Быў мужам Паўліны Мядзёлкі (1893–1974).

[30] Скарына Францыск (1490(?)–1551(?)), беларускі першадрукар і асветнік. У 1517–1919 гг. упершыню ў перакладзе на беларускую мову надрукаваў у Празе «Псалтыр» і 20 асобных кніг Бібліі, а ў пачатку 1520-х гадоў у Вільні заснаваў першую на тэрыторыі ВКЛ друкарню. Дзейнасць Скарыны спрыяла фармаванню літаратурнай мовы і нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

[31] Пшчолка Аляксандр (1869–1943) — беларускі пісьменнік, этнограф, фалькларыст. Пісаў на беларускай і расійскай мовах. Аўтар кніг «Нарысы з жыцця беларускай вёскі» (1899), «Беларускія апавяданні» (1901) ды інш. Для літаратурнай і нацыянальнай дзейнасці А. Пшчолкі характэрны супярэчлівасць і неакрэсленасць аўтарскай пазіцыі.

[32] Радкі з верша Янкі Купалы «Годзе», які быў напісаны ў 1912 годзе. Упершыню надрукаваны ў газ. «Беларусь», 1919, 20 лістапада.

[33] «Пад гоман вясёлы» — песня, створаная Паўлінай Мядзёлкай-Грыб напрыканцы 1921 года ў вагоне, калі яна ехала ў Кракаў на спатканне з мужам Тамашом, які быў на той час у турме. І хаця аўтарка звяртаецца ў сваім творы да канкрэтнага чалавека, вобраз вязня стаў сімвалам беларуса, які аказаўся за кратамі-межамі — пад белапольскай акупацыяй. У Заходняй Беларусі песня «Пад гоман вясёлы» займела незвычайную папулярнасць. Адзін з яе варыянтаў такі:

Пад гоман вясёлы, пад звон чары поўнай,
Пры зборы ўсіх нас на бяседзе такой
Успомнім мы, брацці, аб долі няроўнай,
Пра ўсіх тых, хто церпіць за край родны свой.
З гарачай душою ўсе лепшыя сілы,
Што выйшлі з народу, з сялянскай сям'і.
Адных ужо крыюць курганы-магілы,
Другія — у мурах за кратай турмы.
У Познань і Кракаў, ў далёку чужыну,
Загнаны ў няволю ён быццам навек,
Бацькоў старых кінуў і мілу дзяўчыну,
А сам церпіць голад, і холад, і здзек.
І тварам збялелым прынікшы да кратаў,
Ён зоркі шукае на небе глухім,
Каб думкі занесла да роднае хаты,
Каб кліч перадала сабрацціям сваім.

Змагайся, мой дружа, з тыранам народу,
Змагайся з наезнікам-панам, як можаш,
Змагайся за лепшую долю-свабоду,
Хоць цяжка змаганне, а усё ж такі зможаш.
Пад гоман вясёлы, пад звон чары поўнай,
Пры зборы ўсіх нас мы прысягу даём:
«Не зломяць нас віхры у бітве няроўнай,
За здзек з нашых брацціяў мы помсту нясём».

[34] Беларускі народны танец.

[35] «Адзінства рускай культуры» — аб'яднанне студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Чэхаславакіі, выхадцаў з Беларусі, Расіі, Украіны. Утворана ў 1925 г. пасля злучэння шэрагу «русафільскіх» студэнцкіх арганізацыяў. У гэты час у кіраўніцтва ўваходзілі Хіцькоў (старшыня), Дзяменчык, Гуліп, Клім, Целех ды інш. Адстойвала ідэі адзінага расійскага народа, што ўлучаў у сябе тры адгалінаванні: рускіх, беларусаў і ўкраінцаў, выступала за адзінства расійскай культуры. Актыўна супрацоўнічала з правымі манархічнымі расійскімі эміграцкімі коламі, варожа ставілася да ўсіх плыняў беларускага і ўкраінскага нацыянальна-вызваленчых рухаў як сілаў «федэрал-сепаратысцкіх», што выступалі за падзел «адзінай і недзялімай» Расіі на нацыянальныя дзяржавы.

[36] Размежаванне беларускіх студэнтаў пачыналася спакваля. З канца 1921 г. усе яны ўваходзілі ў арганізацыю, якая называлася Сувяззю нацыянальнай беларускай моладзі, пазней — Таварыствам беларускіх студэнтаў, а з 1922 года — Студэнцкай секцыяй Беларускай грамады. У палітычных адносінах студэнцкае згуртаванне на той момант стаяла на выразна незалежніцкіх, антысавецкіх і хрысціянскіх прынцыпах. Але пачынаючы з 1923 года, калі ў Прагу пачалі прыязджаць прадстаўнікі леваэсэраўскай Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, іншых радыкальных партыяў і групаў, беларускае студэнцтва перастала быць такім маналітна адзіным, а стала ўсё больш размяжоўвацца па ідэйных і палітычных поглядах і перакананнях. І ў хуткім часе ў процівагу групоўцы студэнтаў, якую ўзначальваў Янка Станкевіч, першы старшыня беларускай студэнцкай арганізацыі, утварылася альтэрнатыўная арганізацыя левасацыялістычнага кірунку «Новая грамада». Яе лідэрам стаў Тамаш Грыб, кіраўнік беларускіх эсэраў, падпольшчык і рэвалюцыянер. Аб'яднанне Я. Станкевіча выдавала часопіс «Беларускі студэнт», а студэнты, якія аб'ядналіся вакол Т. Грыба, «неперыядычную часопісь» «Прамень» («Наш прамень»).

[37] Маюцца на ўвазе партрэты імператара Франца-Ёзэфа I.

[38] Аб'яднанне беларускага паступовага студэнцтва ў Празе (АБПС) — беларуская студэнцкая арганізацыя левасацыялістычнага кірунку. Утворана ў 1923 годзе. У кіраўніцтва ўваходзілі Ігнат Дварчанін, Тамаш Грыб, Язэп Мамонька, Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Міхась Каберац ды інш. У складзе аб'яднання было каля 60 студэнтаў-беларусаў. Пры АБПС былі створаны гурток марксістаў, філія ТБШ, літаратурны і музычна-драматычны гурткі. У 1925 годзе з-за палітычных разнагалоссяў раскалолася на некалькі груповак.

[39] Масарык Тамаш (1850–1937) — прэзідэнт Чэхаславакіі ў 1918–1935 гг., старшыня Чэхаславацкага нацыянальнага савета, доктар філасофіі. Дзякуючы палітыцы, якую праводзіў урад Т. Масарыка, многія беларускія і ўсходнеславянскія эмігранты атрымалі ў Чэхаславакіі прытулак, магчымасць набыць вышэйшую адукацыю, захоўваць сваю нацыянальную адметнасць, займацца развіццём нацыянальнай культуры і выдавецкай дзейнасцю на роднай мове.



### *Квадра другая (с. 149)*

[1] Адзін з пражскіх студэнтаў беларускага паходжання. Менавіта пра такіх, як ён, беларускі паэт У. Жылка, звяртаючыся з Прагі да А. Луцкевіча, пісаў: «Калі ж глянуць, што за народ ціснецца сюды, то становіцца сумна і боязна за нашу справу — розныя [неразб.] Баевічы, Конюхі, Буракі — убоства, тупалоб'я, мізэрнасць, беспрынцыпнасць, безыдэйнасць…»

[2] Кошыць Аляксандр Антонавіч (1875–1944) — украінскі харавы дырыжор і кампазітар. У 1919 годзе выехаў за мяжу. Памёр у Канадзе.

[3] Украінскія грашовыя адзінкі, якія мелі хаджэнне ва Украіне падчас кіравання ўрада Дырэкторыі (1919–1921).

[4] Пятлюра Сымон (1879–1926) — украінскі палітычны, вайсковы і дзяржаўны дзеяч. З 1918 г. уваходзіў у склад урада Украінскай Дырэкторыі і быў галоўным атаманам узброеных сілаў Украінскай Народнай Рэспублікі. Забіты ў 1926 г.

[5] Магчыма, намёк на герояў п'есы Л. Родзевіча «Конскі партрэт».

[6] Ліга Нацыяў (1919–1946) — міжнародная арганізацыя, якая ставіла за мэту, згодна з статутам, развіццё супрацоўніцтва паміж народамі і гарантыю «міра і бяспекі». Спыніла сваё існаванне ў 1946 годзе.

[7] Зыск — прыбытак.

[8] Лявіцкі Арэст (1848–1922) — украінскі гісторык, правазнаўца, археограф, архівіст і пісьменнік, акадэмік АН УССР (з 1919).

[9] Чэшска-Руская еднота — культурна-асветнае таварыства, якое было створана па ініцыятыве прадстаўнікоў чэшскай і расійскай

інтэлігенцыі. Ставіла за мэту захаванне нацыянальных і культурных асаблівасцяў расійскай эміграцыі пры яе натуральнай інтэграцыі ў жыццё міжваеннай Чэхаславакіі.

[10] Размова ідзе пра прафесара Яўгена Ляцкага.

[11] Ляцкі Яўген нарадзіўся ў 1868 годзе. Гадаваўся пад Барысавам. Даследчык беларускага фальклору і этнаграфіі. У Празе загадваў кафедрай гісторыі рускай мовы і літаратуры Карлава ўніверсітэта. Аўтар «Нататак па беларусазнаўстве». Курыраваў беларускае студэнцкае зямляцтва. Памёр у 1942 годзе. Пахаваны на Альшанах.

[12] Песня «Не загаснуць зоркі ў небе…» была напісана на словы Я. Купалы і выконвала ролю нацыянальнага гімна ў нашаніўскі і заходнебеларускі перыяды.

[13] Верш Алеся Гаруна «Ноч».

[14] Цытуецца верш І. Франко «Як пачуеш ўначы за сваім ты вакном…», які ўпершыню быў надрукаваны ў зборніку «Павялае лісце», што выйшаў у Львове ў 1897 г. Пераклад зроблены, напэўна, аўтарам рамана.

[15] Чэшскі ўніверсітэцкі камітэт (ЧУК) — самакіраўнічы орган, што супрацоўнічаў з адміністрацыяй універсітэта, дбаў пра матэрыяльнае забеспячэнне навучальнага і навуковага працэсу, развіццё культурна-асветніцкай самадзейнасці студэнтаў.

[16] Маецца на ўвазе італьянскі мастак эпохі Адраджэння Рафаэль Санці (1483–1520), які напісаў у 1513–1514 гадах алтарную кампазіцыю «Сікстынская мадонна» для бенедзікцінскага кляштара. Гэтая работа вызначаецца эстэтычнай дасканаласцю, гармоніяй, ідэальна-ўзвышаным выяўленнем жаночага характва.

[17] Радкі з верша Я. Купалы «А яна…». Упершыню надрукаваны ў газеце «Наша Ніва», 1915, № 28, з паметкай «Вільня, 7.VII.1915 г.».

[18] Персанаж з аднайменнай п’есы Уільяма Шэкспіра.

[19] Аддзяленне будаўнічай механікі.

[20] Добрай раніцы, Бажэна (*чэшск.*).

[21] Радкі з верша М. Багдановіча «Краю мой родны! Як выкляты Богам…» у крыху зменены выглядзе. У арыгінале яны гучаць так: «Брацця! Ці зможам грамадскае гора? / Брацця! Ці хваце нам сілы?!»

[22] Размова ідзе пра герояў трагедыі ў вершах «Фаўст» Ёгана Вольфганга Гётэ.

[23] Персанаж аднайменнага рамана ангельскага пісьменніка Даніэля Дэфо (1661–1731). Нягледзячы на тое, што Рабінзон шмат чаго дамогся на пустынным востраве адзін, яго час прайшоў, бо



толькі калектыўна і ў грамадзе можна дамагчыся яшчэ больш значных вынікаў.

## *Квадра трэцяя (с. 218)*

[1] Якія ў вас пажаданні? (*Чэшск.*)

[2] Пачакайце (*чэшск.*).

[3] Прабачце (*чэшск.*).

[4] Гаворка ідзе пра стыпендыі, якія выдзяляў для беларускіх студэнтаў Чэшска-Украінскі камітэт.

[5] Беларускі камітэт — прадстаўнічы орган беларускай эміграцыі ў міжваеннай Чэхаславакіі, які актыўна дзейнічаў у Празе ў 1920-я гады.

[6] Размова вядзецца пра п’есу Каруся Каганца «У іншым шчасці няшчасце схавана», якая пабачыла свет у 1919 годзе ў Вільні.

[7] Магчыма, правобразам міністра Случаніна стаў Пракулевіч Уладзімір (1887–1938), які прымаў удзел у Слуцкім паўстанні (1920), займаў розныя пасады ва ўрадзе БНР, а потым жыў у Празе, БССР. Рэпрэсаваны ў 1930 годзе.

[8] Заяц Леанард (1890–1935) — беларускі палітычны дзеяч. Скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт. Член партыі беларускіх эсэраў. З лютага 1918 года ў складзе БНР. Удзельнік Другой Усебеларускай канферэнцыі 1925 года ў Берліне. З 1925 — у БССР. У 1930 г. рэпрэсаваны савецкімі карнымі органамі.

[9] Крачэўскі (Крэчэўскі) Пётра Антонавіч — палітычны дзеяч, паэт, драматург. Нарадзіўся на Кобрыншчыне 7 жніўня 1879 года. Пасля сканчэння Віленскай духоўнай семінарыі працаваў настаўнікам. Удзельнік абвяшчэння БНР. 13 снежня 1918 года абраны старшынёй Народнай Рады дзяржавы (паводле іншых азначэнняў — прэзідэнтам). З 1920 года — у эміграцыі (Коўна). У 1923 годзе пераехаў у Прагу. Памёр там 8 красавіка 1928 года «ад сухотаў і тугі па Бацькаўшчыне».

[10] Напэўна, гутарка ідзе пра выданне зборніка «Замежная Беларусь», які выйшаў пад рэдакцыяй П. Крачэўскага ў Празе ў 1926 годзе.

[11] «Славянская книга» — прагрэсіўны часопіс славянскай бібліяграфіі, які выходзіў на расійскай мове пад рэдакцыяй Ф. Мансветава ў Празе.

[12] Персанаж аповесці М. Гогаля «Старасвецкія памешчыкі».

[13] Персанаж аповесці М. Гогаля «Старасвецкія памешчыкі».

[14] Размова ідзе пра матэрыялы для зборніка «Замежная Беларусь».

[15] Вобраз «лішняга чалавека» створаны ў рамане І. Тургенева «Рудзін».

[16] Гутарка, напэўна, ідзе пра смерць пражскага беларускага студэнта-медыка Вячаслава Макоўскага, які памёр у Вільні ва ўзросце 23 гадоў.

[17] Сапраўднае прозвішча Дзехцяроў Кастусь, студэнт агранамічнага факультэта Пражскага ўніверсітэта. Памёр у Чэхаславакіі ў другой палове 1920-х гадоў.

[18] Размова, напэўна, ідзе пра студэнта Пражскага політэхнічнага ўніверсітэта Васіля Русака (1896 — пасля 1946), які прымаў удзел у Слуцкім антыбальшавіцкім паўстанні 1920 года, быў актывістам беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. У 1934 годзе ў Празе ён выдаў пад псеўданімам Карусь Базыль кнігу «Беларускія (крывіцкія) песні для сола, дуэту, квартэту з акампанементам фартэпіяна і 4 народныя песні». Арыштаваны ў Празе органамі савецкай бяспекі. Далейшы яго лёс невядомы.

[19] Згаданая ў рамане падпольная група — не прыдумка аўтара. На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі партызанскія атрады К. Арлоўскага, С. Ваўпшасава. Іх камуністычнае кіраўніцтва разлічвала на паўстанцкую барацьбу як на адзіны сродак уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР.

У той жа час урад БНР арганізоўваў дружыны, мэта якіх — утварэнне беларускай дзяржавы, федэратыўна звязанай з Літвой. Паводле кнігі У. Калесніка «Усё чалавечае», у 1923 годзе польская контрразведка выкрыла на Беласточчыне на паўстанцкае падполле, якім кіраваў урад БНР з Коўна. Яно было разгромлена. Але перад гэтым былі выпадкі, калі леваэсэраўскія баявыя дружыны супрацоўнічалі з камуністычнымі атрадамі. Пры польскай акупацыі агульнанароднае супраціўленне на тэрыторыі Заходняй Беларусі каардынавалася з нацыянальным супраціўленнем на тэрыторыі Заходняй Украіны.

[20] Мілюкоў Павел (1859–1943) — рускі гісторык і палітычны дзеяч. Адзін са стваральнікаў партыі кадэтаў, міністр замежных спраў у Часовым урадзе А. Керанскага. У грамадзянскую вайну ідэолаг белага руху. З 1920 — у эміграцыі. У публіцыстычных працах прызнаваў права ўкраінцаў і беларусаў на нацыянальную культуру і тэрытарыяльную аўтаномію.

[21] Часопіс «Прамень».

[22] Ленін (Ульянаў) Уладзімір (1870–1924) — расійскі і савецкі палітык і дзяржаўны дзеяч, дзеяч міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, арганізатар кастрычніцкага перавароту ў Расіі ў 1917 годзе.



[23] Пісараў Дзмітрый (1840–1868) — расійскі публіцыст і літаратурны крытык, філосаф і рэвалюцыйны дэмакрат.

[24] Чарнышэўскі Мікалай (1828–1889) — расійскі філосаф, пісьменнік, літаратурны крытык, аўтар утапічнага рамана «Што рабіць?» (1863), у якім паспрабаваў стварыць вобразны малюнак «светлай і цудоўнай» будучыні чалавецтва пры сацыялізме.

[25] Маркс Карл (1818–1883) — заснавальнік навуковага камунізму. Распрацаваў тэорыю і тактыку класавай барацьбы пралетарыяту, даказваў гістарычную непазбежнасць сацыялістычнай рэвалюцыі.

[26] Размова ідзе пра аповесць Максіма Гарэцкага «Дзве душы», якая выйшла ў 1919 годзе ў Вільні.

# ПАСЛЯСЛОЎЕ

Былы беларускі настаўнік з Даўгапілса Аляксей Барткевіч у прадмове да апавядання В. Вальтара «Леснікова сена», якое было выдадзена ў Рызе «Беларускім выдавецтвам у Латвіі» ў 1932 годзе, успамінаў: «У 1931 годзе 20 сакавіка ён [В. Вальтар] захварэў на запаленне нырак. Нягледзячы на цяжкую хваробу, ён не кідаў працы ў школе. У працягу трох дзён ён не мог зняць боты, бо распухлі ногі, аднак у школу хадзіць ён не кінуў, і толькі 2-га красавіка адважыўся ён выехаць са школы ў Дзвінск, дзе зараз жа адвязлі яго ў бальніцу Чырвонага Крыжа».

У 1990 годзе ўсё той жа Аляксей Міхайлавіч Барткевіч паведаміў Сяргею Панізніку: «Віктара Вальтара я добра ведаю, бо ён працаваў у Даўгаўпілскай беларускай школе, кіраўніком якой быў я. Ён выкладаў беларускую мову. Быў добрым настаўнікам і добрым сябрам. Я прымаў удзел у яго пахаванні на каталіцкіх могілках разам з настаўнікамі і вучнямі беларускай гімназіі. З прамовай выступаў С. Сахараў. І хаця бацька В. Вальтара быў чалавекам рэлігійным, ксёндз адмовіўся пахаваць яго сына, спасылаючыся, што нябожчык не хадзіў да споведзі. Ну, пахавалі без ксяндза, што вельмі засмуціла бацьку Віктара Вальтара. Магілку знайсці не змагу: запамятаваў, стары. З раднёй Вальтара не знаёмы…»



# ЗМЕСТ

Рамантык з наддзвінскіх берагоў. *Лідзія Савік* ............ 3

**Дух часу**
Паэзія, пераклады

Покліч сялянскага сына ............ 13
Новы Агасфер ............ 14
* * * Хмары страшныя навіслі… ............ 14
У лесе ............ 15
Не плач, матанька! ............ 16
Дух часу ............ 19
*З Івана Франко*
* * * У тую ноч, з цяжкою думкай пры акне ............ 20

**Адчуваю цябе, Айчына!**
Проза, публіцыстыка

Аднабочнікі. *Літаратурны нарыс* ............ 23
Песня гладыятараў ............ 72
Аб прафесійных школах ............ 75
Леснікова сена ............ 79

**Роджаныя пад Сатурнам**
Раман

Квадра першая ............ 87
Квадра другая ............ 149
Квадра трэцяя ............ 218
Эпілог ............ 250

Каментар ............ 261

Пасляслоўе ............ 278

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Вальтар** Віктар Бенядзіктавіч

# Выбраныя творы

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *В. Аскерка*
Вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктар *В. Аскерка*

Падпісана да друку 22.06.2009.
Фармат 84х108 $^1/_{32}$. Папера афсетная.
Друк на рызографе. Гарнітура Times.
Ум. друк. 17,7 арк. Ул.-выд. 13,23 арк.
Наклад 300 ас. Зак. 534.

ПУП «Кнігазбор».
Ліцэнзія № 02330/0131712 ад 12.05.06.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск.
**Тэл./факс (017) 204-86-97, тэл. (029) 772-19-14.**

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў друкарні ПУП «Ходр» ГА «БелТІЗ».
ЛП № 02330/0150482 ад 25.02.09.
Вул. Вызвалення, 9, 220004, Мінск.